Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

КАФЕДРА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

ЗАХОДНІ РЭГІЁН БЕЛАРУСІ ВАЧЫМА ГІСТОРЫКАЎ І КРАЯЗНАЎЦАЎ

Зборнік навуковых артыкулаў

Гродна 2006

УДК 340
ББК 67
З-38

Рэдакцыйная калегія:
Каваленя А. А., дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар;
Крэнь І. П., заг. кафедры гісторыі Беларусі ГрДУ імя Я.Купалы, кандыдат гістарычных навук, прафесар (адк. рэд.);
Навіцкі У.І., нам. дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар (адк. рэд.);
Белазаровіч В.А., нам. дэкана па навук. працы гістарычнага факультэта ГрДУ імя Я.Купалы, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (адк. рэд.);
Коўкель І.І., нам. заг. кафедры гісторыі Беларусі ГрДУ імя Я.Купалы, кандыдат гістарычных навук, прафесар;
Сташкевіч М.С., навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычнх навук, прафесар;
Сорціна І.В., нам. заг. кафедры гісторыі Беларусі ГрДУ імя Я.Купалы па навук. працы, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі;
Сілава С.У., кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі ГрДУ імя Я.Купалы;
Ярмусік Э.С., кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі ГрДУ імя Я.Купалы.

Рэцэнзенты: доктар гістарычных навук, прафесар *А.М. Нечухрын;*
доктар гістарычных навук, прафесар *А.М. Лютый.*

Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краязнаўцаў : зборнік навук. артыкулаў / Гродз. дзярж. ун-т; рэдкалегія: І.П. Крэнь, У.І. Навіцкі, В.А. Белазаровіч (адк. рэдактары) [і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2006. – 422 с.
З-38

ISBN 985-417-834-X

Надрукаваны навуковыя артыкулы, прысвечаныя заходняму рэгіёну Беларусі, яго гістарычнаму развіццю, эканамічным і этнаканфесіянальным пераўтварэнням, шматграннасці культурнага працэсу ў ім.

Навуковыя артыкулы будуць карыснымі для навукоўцаў, выкладчыкаў, аспірантаў, магістрантаў і студэнтаў ВНУ, настаўнікаў гісторыі агульнаадукацыйных школ, ліцэяў, гімназій, спецыяльных навучальных устаноў, шырокага кола чытачоў і аматараў гісторыі роднага краю.

УДК 340
ББК 67

ISBN 985-417-834-X

© ГрДУ ім. Я.Купалы, 2006

УСТУПНАЕ СЛОВА СУСТАРШЫНІ АРГКАМІТЭТА КАНФЕРЭНЦЫІ ПРАФЕСАРА І.П. КРЭНЯ

Вельмі шаноўны прэзідыум!

Шаноўныя ўдзельнікі прэзідыума!

Глыбокапаважаныя прысутныя!

Дазвольце сардэчна прывітаць вас ад імя і па даручэнні арганізацыйнага камітэта. Скажу шчыра, мне вельмі прыемна бачыць усіх вас на старжытнай гродзенскай зямлі, у нашай Гародні, ва універсітэце – на канферэнцыі, прысвечанай даследаванню праблем гістарычнага, эканамічнага, этнаканфесіянальнага і шматграннага культурнага развіцця заходняга рэгіёна Беларусі.

Рэгіён гэты адметны як сваёй роллю ў развіцці беларускай дзяржаўнасці, у эканамічным развіцці, сваёй поліканфесійнасцю, так і сваім укладам у інтэграцыйныя працэсы паміж Заходняй і Усходняй Еўропай, перспектывамі развіцця і, самае галоўнае і істотнае, – людзьмі, іх жыццёвым і творчым шляхам, які пачынаўся на гэтай зямлі і звязаны з ёю.

Улічваючы, што храналагічныя рамкі канферэнцыі, згодна з праграмай, акрэсліваюцца ад глыбокай старажытнасці і да сённяшніх дзён, што ў ёй знайшлося месца для археолагаў, этнографаў, гісторыкаў, культуролагаў, сацыёлагаў, палітолагаў, што ў ёй прымаюць удзел як знакамітыя навукоўцы з Рэспублікі Беларусь і замежжа, так і маладыя гісторыкі, будучае нашай гістарычнай навукі – аспіранты, магістранты, студэнты, усё ж асноўная ўвага надаецца XIX – XX стагоддзям. Гэта ў многім звязана з тым, што на кафедры гісторыі Беларусі, іншых кафедрах нашага гістарычнага факультэта распрацоўваюцца дзяржбюджэтныя фінансуемыя тэмы менавіта па заходняму рэгіёну Беларусі ў гэтыя стагоддзі, рыхтуюць і абараняюць кандыдацкія дысертацыі, ужо не гаворачы пра магістарскія дысертацыі.

І мне асабліва прыемна падкрэсліць, што свае даследаванні, у тым ліку як па фундаментальнай, так і па прыкладной, рэгіянальнай тэматыцы мы праводзілі сумесна ці ў садружнасці з нашым флагманам гістарычнай навукі – Інстытутам гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. І гэтая канферэнцыя не з'яўляецца выключэннем.

Матэрыялы дадзенай канферэнцыі будуць апублікаваны асобным навуковым зборнікам у самым хуткім часе.

І апошняе. Наша канферэнцыя разлічана на адзін дзень. Пленарнае пасяджэнне працягнецца да першай гадзіны. З 13 да 14 гадзін будзе зроблены перапынак на абед у кафэ «Світанак», а з 14 да 18 гадзін пройдзе праца ў секцыях. У 18.00 падвядзем вынікі нашай працы.

Напрыканцы свайго ўступнага слова я хачу шчыра падзякаваць прысутным на канферэнцыі кіраўнікам універсітэта і аблвыканкама, падзякаваць усім вам за ўвагу, аб'явіць канферэнцыю адкрытай і прадаставіць слова ўдзельнікам пленарнага пасяджэння. Яго пачне доктар гістарычных навук, прафесар Уладзімір Фёдаравіч Ладысеў.

ПЛЕНАРНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

У.Ф. Ладысеў, БДУ, г.Мінск

СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў XX СТАГОДДЗІ (метадалагічны аспект)

Працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці напачатку XX стагоддзя праходзіў надзвычай складана. Гэта было звязана як з запазненнем працэсу фарміравання беларускай нацыі, так і з геапалітыкай яе суседзяў, у першую чаргу Расіі і Польшчы. Дзяржаваўтваральная дзейнасць беларускіх палітычных партый і арганізацый, а затым абвяшчэнне БНР паставілі пытанне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці ў парадак дня палітычнага жыцця Беларусі. Але станаўленне рэальнай беларускай дзяржаўнасці звязана з утварэннем Савецкай сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь. Прычым гэты працэс праходзіў не менш складана і драматычна, чым станаўленне БНР.

На наш погляд, у беларускай гістарыяграфіі ўстанавіўся некалькі спрошчаны падыход да праблемы стварэння беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове, які не ўлічвае асаблівасцяў палітыкі ўрада РСФСР да нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў заходнім нацыянальным рэгіёне былой Расійскай імперыі. Ён быў прадыктаваны як бягучымі, кан'юнктурнымі палітычнымі меркаваннямі, так і доўгатэрміновымі перспектыўнымі эканамічнымі і палітычнымі задачамі.

Неабходна адзначыць, што ўладныя структуры РСФСР на працягу лета–восені 1918 года не ішлі далей пазіцыі абласніцтва ў вырашэнні нацыянальнага пытання. Так, адміністрацыйная камісія УЦВК РСФСР прапанавала на тэрыторыі былой царскай Расіі ліквідаваць усялякі нацыянальны падзел і стварыць, акрамя Маскоўскай, яшчэ тры вобласці (камуны): Заходнюю, Паўночную і Уральскую. Заходнюю вобласць меркавалася стварыць у складзе Смаленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Чарнігаўскай, Віленскай і Ковенскай губерняў з абласным цэнтрам у Мінску. Такой пазіцыі прытрымліваліся кіраўнікі Паўночна-Заходняга абкама РКП(б) і Аблвыкамзаха на чале с А.Ф.Мясніковым, М.І.Калмановічам і іншымі, што знаходзіліся ў Смаленску.

Таму прынятыя канферэнцыяй беларускіх секцый РКП(б) рашэнні (адбылася 21–23 снежня 1918 г. у Маскве) аб неабходнасці стварэння Часо-

вага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі і скліканні усебеларускага з'езда камуністаў з мэтай арганізацыі нацыянальнага партыйнага цэнтра фактычна паставілі ЦК РКП(б) перад неабходнасцю вырашыць праблему беларускай дзяржаўнасці. 24 снежня праблема дзяржаўнасці Беларусі была разгледжана ЦК РКП(б).

На сённяшні дзень застаецца адкрытым пытанне, на якім узроўні прымалася рашэнне ў Цэнтральным камітэце РКП(б). Аўтары «Гісторыі Беларусі«, ч. II, Мн., 1998 г. (пад рэдакцыяй прафесараў Новіка Я.К. і Марцуля Г.С.) сцвярджаюць аб адбыўшымся 24 снежня 1918 г. Пленуме ЦК РКП(б). Але дакументальнага пацвярджэння аб пасяджэнні ЦК РКП(б) не выяўлена. Хутчэй за ўсё старшыня Наркамнаца РСФСР І.Сталін у сваёй размове па тэлефоне з А.Мясніковым 25 снежня, спасылаючыся на рашэнне ЦК, выконваў асабістае ўказанне У.Леніна па беларускім пытанні, якое было прынята шляхам апытання членаў ЦК па тэлефоне, як тады нярэдка практыкавалася.

На адбыўшыхся сустрэчах 25 снежня І.Сталіна з З.Жылуновічам, І.Дылам і іншымі адказнымі супрацоўнікамі Белнацкама і Беларускіх секцый РКП(б), а 27 снежня з А.Мясніковым і М.Калмановічам, былі вызначаны паўнамоцтвы і склад будучага ўрада, акрэслена тэрыторыя рэспублікі ў складзе 5-ці губерняў (Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай).

У сувязі з тым, што ў парадку дня VI-й Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б), якая пачала работу 30 снежня ў Смаленску, пытанне аб дзяржаўнасці Беларусі не значылася, у даклад А.Мяснікова па пытанні «Бягучы момант» быў уключаны пункт «Беларуская Савецкая Рэспубліка». Ён змяшчаў прапанову «абвясціць Заходнюю Камуну самастойнай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай». У якасці аргумента вылучаўся міжнародны фактар «замкнуць ланцуг самавызначаўшыхся ўтварэнняў» [1, с. 13]. Дэлегаты пагадзіліся з такой прапановай і без абмеркавання аднагалосна прынялі яе пры пяці ўстрымаўшыхся. Лагічней было б лічыць дату нараджэння рэспублікі 30 снежня, а не 1 студзеня – дзень абнародавання Маніфеста. У пастанове аб тэрыторыі рэспублікі асноўным ядром яе лічыліся Мінская, Смаленская, Магілёўская, Віцебская і Гродзенская губерні з прылеглымі да іх мясцовасцямі суседніх губерняў, населеных пераважна беларусамі.

Аднак і пасля гэтага пытанне аб беларускай дзяржаўнасці не было знята з парадку дня, а набывала ўсё больш драматычны характар.

І.Сталін, які неаднаразова асабіста ўладжваў узнікаўшыя канфлікты, у прыватнасці, 31 снежня і 1 студзеня 1919 г. паміж А.Мясніковым, З.Жылуновічам і іх прыхільнікамі па складу фарміраваўшагася тады Часовага ўрада Беларусі, меў намер прыехаць у Мінск, але быў вымушаны адмовіцца ад гэтага плана. 2 студзеня 1919 года ён тэлеграфуе Мяснікову і Калмановічу, што адкладвае сваю паездку ў Мінск на 10 дзён, бо па прапанове ЦК РКП(б) спешна выязджае на Усходні фронт у сувязі са склаў-

шайся там крытычнай сітуацыяй. «Праз 10 дзён, – маўляе далей Сталін, – буду ў Вас, вядзіце сябе спакойна і не біцеся, а то будзе дрэнна» [2, с. 1].

Парада была не выпадковая, бо немнагаслоўны Сталін ведаў больш, чым казаў. Прычым Сталін затрымаўся на фронце не на дзесяць, а больш чым на дваццаць дзён.

Менавіта у гэты адрэзак часу адбыліся падзеі, якія карэнным чынам паўплывалі на станаўленне дзяржаўнасці Беларусі. 16 студзеня 1919 года Пленум ЦК РКП(б) прыняў адмоўнае для беларускай дзяржаўнасці рашэнне: забраць у толькі што створанай Беларускай рэспублікі Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні і ўключыць іх у склад РСФСР, пакідаючы ў складзе Беларусі Мінскую і Гродзенскую. Я.Свярдлоў уласнаручна дапісаў пункт 7 пастановы пленума, які прадпісваў вынесці на з'езд Саветаў Беларусі рашэнне аб аб'яднанні апошніх з Літвой [3, с. 1].

У беларускай гістарыяграфіі існуе спрошчаны погляд, што гэтае рашэнне было прадыктавана прычынамі знешнепалітычнага характару, наступленнем войскаў Польшчы. Аднак наступленне польскіх войскаў пачалося пазней, 14 лютага 1919 года. Да апошняга часу беларускія гісторыкі не ведалі аб існаванні дакументаў Асобай нарады, па пытанні ўтварэння Беларускай рэспублікі, якія акцэнтуюць увагу даследчыкаў на прычыны ўнутрыпалітычнага і эканамічнага характару.

Асобая нарада была створана ў адпаведнасці з пастановай УЦВК ад 23 снежня 1918 г. пры Народным камісарыяце дзяржкантролю Расійскай Федэрацыі ў сувязі з утварэннем Латвійскай, Эстонскай і Літоўскай савецкіх рэспублік і прызнання іх незалежнасці.

У адрозненне ад прыбалтыйскіх рэспублік утварэнне беларускай дзяржаўнасці выклікала адмоўную рэакцыю ўдзельнікаў нарады як з пункту гледжання яе аб'ектыўнай абумоўленасці, так і фінансава-эканамічных адносін. Так, на пасяджэннях нарады ад 4 і 14 студзеня 1919 г. у выніку абмеркавання беларускага пытання яго ўдзельнікі прыйшлі да высновы, што «для ўтварэння незалежнай ад Расіі Беларусі асноў не маецца» [4, с. 21].

Матэрыялы нарады з'явіліся своеасаблівым тэарэтычным падмуркам для прыняцця вышэй прыведзенага рашэння Пленума ЦК РКП(б). Яно было прадыктавана ў першую чаргу прычынамі ўнутрыпалітычнага, эканамічнага характару. Ва ўмовах пачаўшайся грамадзянскай вайны, пераходу да палітыкі харчраскладкі асноўнай праблемай для Савецкай улады была харчовая. Выпадзенне з гаспадарчага разліку трох губерняў – Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай – стварала цяжкасці для функцыянавання традыцыйна склаўшыхся гаспадарчых сувязяў заходніх губерняў з Цэнтрам.

Для правядзення ў жыццё рашэння пленума ў Беларусь камандзіраваўся ўпаўнаважаны ЦК РКП(б) Ад.Іофе, які планаваўся на пасаду старшыні ЦВК ЛітБела.

Супраць штучнага дзялення этнічнай Беларусі пратэставалі не толькі група З.Жылуновіча, але А.Мяснікоў і яго прыхільнікі. Аб гэтым свед-

чыць пратакол пасяджэння Цэнтральнага бюро КП(б)Б ад 22 студзеня, на якім прысутнічаў Іофе. Усе 8 членаў Бюро адхілілі прапанову Іофе аб падзеле тэрыторыі рэспублікі і вырашылі звярнуцца ў ЦК РКП(б) з просьбай перарашыць пытанне аб усходніх губернях Беларусі [5, с. 20-21].

Таму Іофе ў вядомым пісьме Свярдлову ад 28 студзеня адзначыў, што абедзве групы нікуды не вартыя. Беларусы, ці група Жылуновіча, – нацыяналісты, а Мяснікоў і яго прыхільнікі, хаця і не нацыяналісты, але сепаратысты яшчэ горшай маркі. І раіў разагнаць іх, паслаць на працу куды-небудзь далей ад Беларусі.

Аднак ідэя дзяржаўнасці Беларусі знаходзіла ўсё большую колькасць сваіх прыхільнікаў і сярод савецка-партыйнага актыву былой Паўночна-Заходняй вобласці. Гэтыя настроі яскрава выявіліся на адбыўшайся ў канцы студзеня 1919 года Мінскай губернскай партыйнай канферэнцыі. У прынятай рэзалюцыі канферэнцыі за подпісамі членаў Бюро І.Рэйнгольда, Р.Найдзенкава і В.Кнорына выказваўся недавер прадстаўніку ЦК РКП(б) Іофе, змяшчалася патрабаванне адзыву яго з Беларусі. Сур'ёзныя папрокі ў адміністрыраванні былі зроблены і ў адрас Свярдлова.

Такая пазіцыя савецка-партыйнага кіраўніцтва Беларускай рэспублікі выклікала сур'ёзны непакой у ЦК РКП(б). Урэгуляванне канфлікту было ўскладзена на Сталіна, які ад імя Цэнтральнага камітэта РКП(б) адобрыў дзейнасць Іофе ў Беларусі і патрабаваў ад членаў Цэнтральнага бюро КП(б)Б, падпісаўшых рэзалюцыю, перагледзець свае пазіцыі. У той жа час у тэлефонаграме савецкаму ўраду Літвы ён паведамляў, што на кандыдатуры Іофе на пасаду старшыні ЦВК ЛітБела «не настойваем, няхай будзе Ціхоўскі».

Невыпадкова, што ў працы І-га Усебеларускага з'езда Саветаў 2–3 лютага 1919 года прыняў непасрэдна ўдзел Свярдлоў. З'езд Саветаў прадубліраваў прынятае раней у Маскве рашэнне аб утварэнні Літоўска-Беларускай савецкай Рэспублікі. А 27 лютага 1919 года ў Вільні на аб'яднаным пасяджэнні ЦВК Літоўскай і Беларускай ССР было прынята рашэнне аб аб'яднанні рэспублік Літвы і Беларусі.

З утварэннем гэтай штучнай дзяржаўнасці як бы здымалася з павесткі дня пытанне аб правамернасці далучэння этнічных беларускіх зямель да РСФСР.

У склад новага ўрада ЛітБела З. Жылуновіч не ўвайшоі, бо ў пачатку лютага быў накіраваны на журналісцкую працу ў Харкаў. А.Мяснікоў у маі 1919 года быў камандзіраваны на ўсходні фронт у рангу камандуючага Паволжскім фронтам. Яшчэ трагічней склаўся лёс Рыгора Паўлавіча Найдзенкава, які на І-м Усебеларускім з'ездзе Саветаў быі абраны членам ЦВК БССР і яго Прэзідыўма, а ў сакавіку – членам ЦК КП(б)ЛіБ. У маі 1919 года паводле пастановы ЦВК ЛітБела ён быў арыштаваны Вярхоўным рэвалюцыйным трыбуналам ЦВК ЛітБела па абвінавачванні ў тым, што выдаваў сябе за члена РСДРП з 1906 года, а адказныя пасады у Заходняй вобласці выкарыстоўваў для сваёй выгады. Таму і быў расстраляны.

Такі сумны вынік першапачатковага этапа стварэння беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Тагачаснаму савецка-партыйнаму актыву Беларусі быў дадзены прадметны ўрок пралетарскага інтэрнацыяналізму. Ён наклаў свой адмоўны адбітак на пазіцыю кіраўнікоў Мінскага губрэўкама ў ліпені 1920 года, калі ў другі раз вырашалася пытанне аб абвяшчэнні ССРБ і яе тэрыторыі.

Пасля вызвалення 11 ліпеня 1920 года Мінска, а затым большай часткі тэрыторыі Беларусі ад польскіх войскаў склаліся аб'ектыўныя прадпасылкі для аднаўлення беларускай дзяржаўнасці. Аднак праблема дзяржаўнасці Беларусі для кіраўніцтва Савецкакй Расіі і на гэты раз была падпарадкована ваенна-палітычнай мэце. Аб гэтым сведчыць падпісаны ў Маскве 12 ліпеня 1920 г. мірны дагавор паміж Літвой і РСФСР. Згодна з дагаворам частка этнічнай беларускай тэрыторыі з гарадамі Гродна, Шчучын, Ашмяны, Смаргонь, а таксама Віленскі край з Вільняй былі прызнаны часткай Літвы. Дагавор гарантаваў нейтралітэт Літвы ў ходзе савецка-польскай вайны, бяспеку правага фланга войскаў Заходняга фронту ў яго наступленні на Варшаву.

Для падрыхтоўкі дэкларацыі аб абвяшчэнні ў другі раз беларускай дзяржаўнасці, што атрымала таксама скажонае асвятленне ў беларускай гістарыяграфіі, была створана камісія. У яе склад увайшлі 4 прадстаўнікі ад БПС-Р (Я.Белькевіч, П.Берднік, У.Мамонька і М.Пашковіч), 2 ад КП(б) ЛіБ (А.Чарвякоі і В.Кнорын), ад БКА – У.Ігнатоўскі, ад Бунда – А.Вайнштэйн. Ужо на першым сходзе камісіі выявілася, што галоўным разыходжаннем БПС-Р з пазіцыяй камуністаў было пытанне аб межах Беларусі. Прадстаўнікі БПС-Р настойвалі, каб у акце абвяшчэння незалежнасці Беларусі быў ясна акрэслены прынцып этнічнага самавызначэння. Аднак прадстаўнік камуністаў В.Кнорын адказаў, што яны «не могуць дапусціць, каб Смаленская, Магілёўская і Віцебская губерні адыйшлі да Беларусі, таму што жывуць там рускія людзі і што там няма беларусаў» [6, с. 14-15]. Прадстаўнікі БПС-Р афіцыйна заявілі, што пад такой Дэкларацыяй аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ сваіх подпісаў не паставяць, а таксама адмовіліся ўвайсці ў склад Часовага рэвалюцыйнага камітэта.

ЦК КП(б)ЛіБ выказаўся за разрыў адносін з беларускімі эсэрамі. Далейшая гістарычная рэчаіснасць паказала шкоднасць такой палітычнай лініі. Ва ўмовах, калі пачаліся перагаворы ў Рызе паміж расійскай і польскай дэлегацыямі аб умовах прэлімінарнага мірнага дагавору, патрэбна была лінія на аб'яднанне палітычных сіл, якія адстойвалі тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі.

Таму не выпадкова, беларуская нацыя і яе этнічная тэрыторыя пасля заключэння 18 сакавіка 1921 г. Рыжскага дагавору аказалася раздзеленай на доўгі час на тры часткі. Як суверэнная дзяржава Беларуская рэспубліка існавала пасля другога абвяшчэння ў межах толькі 6 паветаў былой Мінскай губерні (Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, Мазырскі, часткова Мінскі і Слуцкі). Яе плошча складала 52,4 тыс. км^2, а насельніцтва 1.544.000 чалавек.

Такім чынам, працэс станаўлення дзяржаўнасці Беларусі быў надзвычай складаны і супярэчлівы, абумоўлены прычынамі геапалітычнага і эканамічнага характару. Цэнтральную ролю ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці адыграла імкненне кіраўніцтва Савецкай Расіі стварыць на заходніх рубяжах своеасаблівы бар'ер з нацыянальных савецкіх рэспублік, а таксама актыўныя дзяржаваўтваральныя дзеянні беларускіх нацыянал-камуністаў З.Жылуновіча, А.Чарвякова, У. Ігнатоўскага і інш.

Літаратура і крыніцы

1. Пратакол I з'езда Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. – Менск, 1934.

2. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ). Ф. 3. Воп. 1. Спр. 4671.

3. РДАСПГ. Ф. 17. Воп. 2. Спр. 8.

4. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). Ф. 4390. Вып. 2. Спр.61.

5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НА РБ). Ф. 4. Воп. 1. Спр.1.

6. Бюлетэнь загранічнай групы Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. – 1926. – №5.

А.А.Кавaленя, Інстытут гісторыі НАНБ, г.Мінск

МОЛАДЗЬ ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ БЕЛАРУСІ НАПЯРЭДАДНІ І Ў ПАЧАТКУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Пытанні дзейнасці моладзі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны даволі шырока прадстаўлены ў айчыннай гістарыяграфіі [1]. Шмат цікавых і раней невядомых фактаў аб дзейнасці маладых патрыётаў утрымліваюць выдадзеныя кнігі «Памяць» [2]. Напрыклад, у артыкуле «Юныя партызаны Слонімшчыны», які апублікаваны ў гісторыка-дакументальнай хроніцы Слонімскага раёна, распавядаецца аб актыўным удзеле ў барацьбе з германскімі захопнікамі многіх юных патрыётаў: Надзеі Антонік, Жэні Баранавец, Вані Дабрыяна, Колі Дабрыяна, Васі Крайняга і іншых [3]. Матэрыял «Паўтарыў подзвіг Матросава», што змешчаны ў гісторыка-дакументальнай хроніцы Мастоўскага раёна, асвятляе гераічны ўчынак маладога партызана атрада «Кастрычнік» партызанскай брыгады «Першамайская» Міхаіла Белуша. На баявым рахунку юнага патрыёта было ўжо 8 спушчаных пад адхон варожых эшалонаў. У баявой аперацыі, пры разгроме ваенна-паліцэйскага гарнізона ў вёсцы Купіск Навагрудскага раёна, ён накрыў сабой агнявую кропку ворага [4].

З прац, выдадзеных у апошні час, варта назваць гістарычны нарыс, які падрыхтавала Анна Афанасьеўна Грабёнкіна [5]. Станоўчым з'яўля-

ецца тое, што ў глыбокім і факталагічна насычаным даследаванні асвятляецца дзейнасць соцень патрыётаў, раскрываецца масавы патрыятызм юных герояў. Па сутнасці аўтар упершыню ў рэгіянальнай гістарыяграфіі імкнецца паказаць прычыны няўдач і трагедыі моладзі Брэста і яго аколіц у барацьбе з вопытным і жорсткім ворагам.

У прадстаўленым артыкуле намі асвятляюцца толькі некаторыя тэндэнцыі развіцця маладзёжнага руху ў заходніх рэгіёнах Беларусі напярэдадні і ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Зробленыя ацэнкі і высновы яскрава сведчаць аб неабходнасці паглыбленага вывучэння многіх пытанняў дзейнасці беларускіх юнакоў і дзяўчат у пераломны, гераічны і трагічны перыяд айчыннай гісторыі. Частка праблем аўтарам разгледжана ў пастановачным плане і патрабуе спецыяльнага навукова-тэарэтычнага асэнсавання.

Аналіз апублікаванай літаратуры і архіўных дакументаў сведчыць, што ўжо летам 1941 г. на захопленай германскімі войскамі тэрыторыі Беларусі атрымаў распаўсюджанне стыхійны рух моладзі супраць акупантаў. У шэрагу гарадоў і пасёлкаў, на чыгуначных станцыях па ініцыятыве маладых патрыётаў сталі ўзнікаць падпольныя арганізацыі і групы. Нашы даследаванні дазваляюць сцвярджаць, што стыхійны ўздым меў больш шырокі размах, асабліва ў першыя месяцы, у заходніх абласцях Беларусі. Дадзены феномен можна растлумачыць некалькімі абставінамі. Па-першае, тэрыторыя заходніх абласцей была акупіравана германскай арміяй празмерна імкліва. Загадзя перабудаваць работу ЛКСМБ, перавесці дзейнасць арганізацый на нелегальныя ўмовы ў большасці заходніх рэгіёнаў, за выключэннем шэрагу арганізацый Пінскай вобласці, аказалася немагчымым. Вызначальным, на наш погляд, было тое, што значная частка мясцовай моладзі заходніх абласцей мела некаторы вопыт дзейнасці ў нелегальных умовах супраць польскага акупацыйнага рэжыму, што з'явілася найважнейшым маральна-палітычным фактарам разгортвання антыгерманскага супраціўлення ў пачатку вайны. Многія маладыя патрыёты не разгубіліся, абапіраючыся на вопыт барацьбы з польскімі акупантамі, самаахвярна ўключыліся ў барацьбу з жорстскім і вопытным ворагам.

Ужо з чэрвеня 1941 г. у Брэсцкай вобласці ўзніклі першыя падпольныя камсамольска-маладзёжныя арганізацыі і групы. Напрыклад, з першых дзён вайны яны дзейнічалі ў Брэсце і былі створаны з вучняў старшых класаў школ горада. Арганізацыя ў хуткім часе была раскрыта, а яе члены знішчаны [6]. Аднак у жніўні 1941 г. на змену загінуўшым патрыётам прыйшлі новыя юныя мсціўцы. Падполле ўзначаліў У. А. Несцярэнка. Актыўнымі ўдзельнікамі былі Г. А. Аржанава, М. А. Жыгімонт, В. Н. Лупейка, Б. М. Пікус, Л. В. Папова ды інш [7].

Актыўны ўдзельнік падпольнай барацьбы ў Заходняй Беларусі былы член КСМЗБ Я. І. Гардзей, выступіў арганізатарам моладзі ў вёсцы Заполле Ружанскага раёна Брэсцкай вобласці. Узначальваемая ім «Баявая ленінская група» ў жніўні аб'ядноўвала 18 юнакоў і дзяўчат [8]. У вёсках Бярэзніца, Загалічы і Бойкі на Ружаншчыне падпольную арганізацыю

стварыў камсамолец А. М. Дурэйка. З канца чэрвеня на шлях барацьбы з ворагам уступілі юныя патрыёты вёскі Блудзень Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Былы сакратар школьнай камсамольскай ячэйкі Сяргей Руціч разам са сваімі школьнымі сябрамі Васілём Барушкам, Сяргеем Барушкам і іншымі на першым падпольным сходзе 24 чэрвеня прынеслі клятву адданасці сябрам і Радзіме і выканалі яе да канца [9].

Актыўнае супраціўленне моладзі разгортвалася на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці. Былыя студэнты Навагрудскага педвучылішча Іван Мацко, Уладзімір Калеснік, Канстанцін Балабановіч сумесна з сябрамі з вёсак Пагарэлкі, Сіняўская Слабада Мірскага раёна стварылі летам 1941 г. дзве маладзёжныя арганізацыі, якія сваім уплывам ахапілі многіх юнакоў і дзяўчат навакольных вёсак [10].

Падпольныя антыфашысцкія групы моладзі на тэрыторыі Шчучынскага раёна ўзніклі ў пасёлку Астрына, вёсках Алішкаўцы, Наргашы, Філіпаўцы, Рыбакі, Матылі і інш. Найбольш вядомым арганізатарам і актыўным ўдзельнікам камсамольскага падполля на тэрыторыі раёна быў Мікалай Слатвінскі – былы студэнт Гродзенскага педагагічнага вучылішча і сакратар камсамольскай арганізацыі. Першапачаткова ў яго групу ўваходзілі П.Жукоўскі, М.Ленінградскі, пасля В.Крывец, Я.Тарашчык, М.Корпусаў і іншыя маладыя патрыёты. Яны ўстанавілі сувязі і ўзаемадзеянне з партызанамі, забяспечвалі іх прадуктамі харчавання, зброяй і боепрыпасамі, вялі агентурную разведку, распаўсюджвалі сярод насельніцтва лістоўкі, выкрывалі хлусню фашысцкай прапаганды. У маі 1942 г. члены групы вымушаны былі перабрацца ў лес да партызан [11].

Непрымірымая барацьба разгортвалася на Вілейшчыне. Не паспеўшыя ўліцца дабравольцамі ў рады Чырвонай Арміі Г.Лысенак, М.Лысенак, Дз.Кухальскі, М.Каршакоў, С.Дзіковіч, І.Генко, Ф.Мурзёнак, М.Цітовіч, Э.Кухальскі, А.Міхасёнак склалі ядро разгалінаванай падпольнай маладзёжнай арганізацыі «За Радзіму». Пачынаючы з ліпеня, патрыёты ахапілі сваім уплывам моладзь вёсак Пятровічы, Алешкі, Васюкі, Жданы, Ляскова, Цяплыя, Пагорныя Чаромушкі і іншых населеных пунктаў Пастаўскага, Шаркаўшчынскага і Дунілавіцкага раёнаў [12]. На падставе архіўных і апублікаваных крыніц намі ўстаноўлена, што ў першыя месяцы Вялікай Айчыннай вайны ў заходніх раёнах рэспублікі стыхійна ўзнікла не менш чым 110 маладзёжных падпольных арганізацый і груп [13].

На фоне складанай ваенна-аператыўнай абстаноўкі, якая склалася на Беларусі ў пачатковы перыяд вайны, шырокага патрыятычнага ўздыму беларускай моладзі ў гэты час мелі месца і тэндэнцыі ідэйна-палітычнага размежавання грамадства, у тым ліку і ў маладзёжным асяроддзі. Аб'ектыўны і крытычны аналіз архіўных дакументаў, літаратурных крыніц канца 80-90-х гг. дае падставу сцвярджаць, што думка, якая ўстанавілася ў айчыннай гістарыяграфіі аб ідэйна-палітычным адзінстве беларускага народа ў пачатку вайны, не адпавядае рэчаіснасці. Зразумела, што ідэалагічная перакананасць грамадства ў значнай ступені вызначалася існаваўшай у СССР сацыяльна-палітычнай сістэмай. Аднак нельга не ўлічваць факт,

што рэальныя падзеі аказвалі значны ўплыў на паводзіны людзей, мянялі іх ранейшыя погляды. Факталагічныя матэрыялы сведчаць, што толькі мужная ды ідэйна перакананая частка людзей змагла захаваць і адстойваць свае пазіцыі, нават ва ўмовах жорсткага акупацыйнага рэжыму.

Безумоўна, што светапогляд большасці людзей, асабліва ў пачатку вайны, датэрмінаваўся тымі працэсамі, якія адбываліся на Беларусі ў перадваенны час. Зразумела, што на патрыятычны настрой моладзі Заходняй Беларусі безумоўна аказалі падзеі 1938-1939 гг. Так, неабгрунтаваны роспуск Выканкамам Камінтэрна Камуністычнай партыі Польшчы прывёў да спынення дзейнасці КПЗБ і КСМЗБ, выклікаў не толькі неразуменне, але разгубленасць і нават падазронасць да некаторых кіраўнікоў маладзёжнага руху Заходняй Беларусі. Як бачыцца, абвінавачванне ў тым, што ў рады кіруючых структур КПЗБ і КСМЗБ пранікла вялікая колькасць варожай агентуры, на доўгі час устанавіла недавер да многіх маладзёжных лідэраў КСМЗБ. Пацвярджэннем гэтаму з'яўляецца факт таго, што нават пасля ўз'яднання ў 1939 г. беларускіх тэрыторый, у заходнія вобласці Беларусі было накіравана 6200 камсамольскіх актывістаў з усходніх рэгіёнаў Беларусі і нават Расіі. Менавіта ім было даверана арганізоўваць работу сярод моладзі, ажыццяўляць разбудову камсамольскіх арганізацый. Сярод іх былі таленавітыя і ідэйна-перакананыя маладыя патрыёты Кірыла Мазураў, Фёдар Рома, Вольга Сысоева ды шмат іншых [14]. Аднак многія новыя лідэры моладзі былі незнаёмы з мясцовымі актывістамі, традыцыямі і склаўшыміся ўзаемаадносінамі ў асяроддзі моладзі падчас барацьбы супраць польскіх акупантаў, што не дазваляла ім быць сапраўднымі арганізатарамі, эфектыўна задзейнічаць мясцовых юнакоў і дзяўчат, асабліва польскай нацыянальнасці, у наладжванні маладзёжнага жыцця. Да гэтага неабходна дадаць, што нават вопыт работы камсамольцаў-дабравольцаў Заходняй Беларусі, якія складалі баявое ядро інтэрнацыянальнай брыгады імя Яраслава Дамброўскага і змагаліся ў свой час у Іспаніі, выкарыстоўваўся слаба.

Пры аналізе і ацэнцы стану дзейнасці моладзі ў заходніх рэгіёнах Беларусі нельга не ўлічваць і той факт, што светапогляд часткі юнакоў і дзяўчат у перадваенныя гады фарміраваўся пад уздзеяннем нацыянальна-адраджэнскай плыні. Найбольшае распаўсюджанне нацыянальна-незалежніцкія ідэі атрымалі тут у студэнцкім асяроддзі. У прыватнасці, да 1939 г. пэўны ўплыў аказвала дзейнасць Беларускага народнага аб'яднання (БНА). Ідэі незалежнасці і суверэнітэту прапагандаваліся маладзёжнымі часопісамі «25 сакавіка» і «Шлях моладзі» [15].

Дакументальныя крыніцы сведчаць, што яскравых і адметна-радыкальных нацыяналістычных тэндэнцый у маладзёжных колах заходніх абласцей не адзначалася, за выключэннем некаторых польскіх маладзёжных арганізацый. Зразумела, што пасля падзей, якія адбыліся ў верасні 1939 г., сітуацыя змянілася. Моладзь, якая кіравалася нацыянальна-незалежніцкімі ўяўленнямі, што паступова трансфарміраваліся з наіўна-спрошчаных да авантурна-радыкальных, была ў значнай ступені ўнутрана пад-

рыхтавана да супрацоўніцтва з замежнымі палітычнымі сіламі, арыентуючыся на іх дапамогу ў рэалізацыі пастаўленай мэты. Вопыт сведчыць, што некаторыя нацыянальныя лідэры з апазіцыйных Савецкай уладзе сіл, у тым ліку і з маладзёжнага асяроддзя, сталі схіляцца да думкі, што толькі вайна і германская армія змогуць прынесці рэальную незалежнасць Беларусі. Вось як уяўлялася гэта будучаму фюрэру беларускай моладзі М.Ганько: «Для нас, беларусаў, сучасная вайна не была нечаканай, мы верылі, што вайна павінна прынесці. Бо толькі вайна можа паправіць нашу крыўду» [16].

Зразумела, што дакладна вызначыць, якая частка падрастаючага пакалення падзяляла дадзеныя радыкальныя ідэі, сёння складана, ды і проста немагчыма. Як бачыцца, прыхільнікаў такога рацыянальнага падыходу ў вырашэнні пытання нацыянальнай незалежнасці Беларусі было невялікае кола не толькі ў маладзёжным асяроддзі, але наогул у беларускім грамадстве, калі не браць пад увагу вузкае кола радыкальна настроеных нацыяналістычных лідэраў.

Аналіз шырокага пласту архіўных матэрыялаў і апублікаванай літаратуры дазваляе сцвярджаць, што ў перадваенны час і ў пачатку вайны большая частка моладзі знаходзілася пад уплывам камуністычных ідэй. Яны з'яўляліся вызначальнымі, шырока распаўсюджанымі і найбольш уплывовымі сярод моладзі. На фарміраванне светапогляду падрастаючага пакалення Заходняй Беларусі аказаў значны ўплыў КСМЗБ, камуністычны падпольны маладзёжны друк. Дастаткова сказаць, што ў заходніх абласцях да верасня 1939 г. выдавалася 8 падпольных газет: «Малады змагар», «Пад сцягам камсамола», «Малады будаўнік», «Казематавец», «Комс фон», «Дэр юнгер кемпфер», «Сцяг піянера», «Малады камуніст» [17]. Разам з тым нельга не ўлічваць грамадска-палітычную сітуацыю, якая склалася ў пачатку вайны, асабліва ў заходніх рэгіёнах Беларусі, і ў некаторай ступені знаходзілася пад уплывам польскага нацыяналістычнага падпольнага руху Супраціўлення, які інспіраваўся і накіроўваўся эміграцыйным урадам Польшчы.

Факт уз'яднання заходніх этнічна-беларускіх тэрыторый з БССР у верасні 1939 г. неадназначна быў успрыняты прадстаўнікамі розных палітычных плыняў. Простыя беларускія людзі, камуністычна настроеная частка грамадства з вялікім уздымам сустрэлі гэту акцыю. «Ніякім зводкам, рэляцыям, больш познім сведчанням гісторыкаў не пад сілу перадаць той энтузіязм і радасць, з якімі працоўныя Заходняй Беларусі віталі Чырвоную Армію», – сведчыў удзельнік вераснёўскіх падзей 1939 г. Максім Танк [18].

Прапольскі настроеныя грамадзяне, асабліва польскай нацыянальнасці, адмоўна адрэагавалі на дадзеную падзею. Сітуацыю ўскладняла палітыка недаверу, падазронасці і рэпрэсій, якую праводзілі кіруючыя колы СССР у адносінах да часткі насельніцтва, якая негатыўна ставіліся да Савецкай улады. Аб'ектыўныя і суб'ектыўныя акалічнасці прывялі да развіцця на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі польскага нацыяналістычнага падполля.

Беларускі гісторык Я.Сямашка зазначае, што, нягледзячы на прынятыя меры з боку беларускага кіраўніцтва, нацэленыя на пазітыўнае вырашэнне польскага пытання і нават прымяненне рэпрэсіўных мер да актыўных удзельнікаў польскага падполля (толькі да ліпеня 1940 г. у Заходняй Беларусі былі арыштаваны 8815 членаў польскага падполля), яно не знікала. Наадварот, практычна ўся тэрыторыя Заходняй Беларусі была пакрыта глыбока заканспіраванай падпольнай сеткай польскага нацыяналістычнага Супраціўлення, прычым ячэйкі існавалі не толькі ў гарадах, але і ў мястэчках, вёсках [18, с. 36].

Безумоўна, гэты антысавецкі і антыбеларускі рух меў пэўную падтрымку ў некаторай часткі насельніцтва Заходняй Беларусі. Важна ўлічыць, што ў заходніх абласцях пражывала да аднаго мільёна палякаў, якія ў большасці адмоўна ставіліся да Савецкай улады. Сведчаннем таму з'явіліся выбары ў Народны Сход Заходняй Беларусі, на якіх, паводле афіцыйных звестак, выказаліся супраць кандыдатаў у дэпутаты і не прынялі ўдзел у галасаванні каля 400 тысяч чалавек.

Нагадаем, што некаторую частку антысавецкіх сіл складала моладзь. Так, актыўны ўдзельнік польскага падполля ў Гродне Зянон Унгар адзначаў, што «пасля падзення ачагоў змагання з бальшавікамі, многія прадстаўнікі моладзі, выхаванай на традыцыях паўстанняў на паўночна-ўсходніх землях, уцяклі ў лясы, стыхійна стварылі атрады супраціўлення» [18, с. 16]. Шэсць камендантаў Беластока, назначаныя польскім кіраўніцтвам Саюза ўзброенай барацьбы (СУБ), былі 22 – 29-гадовага ўзросту [19].

Прадстаўлены матэрыял пераканаўча сведчыць аб неадназначных працэсах, якія мелі месца ў асяроддзі моладзі заходніх абласцей Беларусі. Ход ваенных падзей паказаў, што большасць беларускай моладзі актыўна ўключылася ў барацьбу з ворагам у радах партызан і падпольшчыкаў. Разам з тым на тэрыторыі заходніх абласцей некаторая частка юнакоў і дзяўчат уступіла ў рады Саюза беларускай моладзі і Саюза татарскай моладзі.

Літаратура і крыніцы

1. Больш падрабязны аналіз гістарыяграфіі, якая асвятляе пытанні дзейнасці беларускай моладзі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, глядзі: Каваленя А.А. Моладзь Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны / Беларусь ў гады Вялікай Айчыннай вайны. – Мн. 1999. – С. 123-162; Каваленя А.А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі 1941 – 1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць. – Мн., 1999. – С.6-23.

2. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл. – Мн.: Белта, 1999; Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл. – Мн.: Ураджай, 1999; Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл. – Мн.: Белта, 1997; Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Брэсцкага р-на. – Мн.: Белта, 1998; Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Баранавічаў і Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. – Мн.: Белта, 2000; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. – Мн.: Ураджай, 1997; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Пінска Брэсцкай

вобл. – Мн.: Белта, 1998; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл. – Мн.: Беларусь, 1995; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Гродна. – Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1999; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Шчучынскага р-на Гродзенскай вобласці. – Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 2001; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл. – Мн.: Белта, 2002; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Столінскага р-на Брэсцкай вобл. – Мн.: Белта, 2003; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл. – Мн.: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1989; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Брэста. – Кн.1 – Мн.: Белта, 1997; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Брэста. – Кн.2 – Мн.: Белта, 2001; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл. – Мн.: Універсітэцкае, 1997; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл. – Мн.: Беларусь, 2004; Память: Ист. – докум. хроника Берёзовского р-на Брестской обл. – Мн.: Белорусская Советская Энциклопедия, 1987; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Гродзенскага р-на – Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1993; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл. – Мн.: Паліграфафармленне, 2002; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. – Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 2004; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл. – Мн.: Белта, 2002; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Бераставіцкага р-на Гродзенскай вобл. – Мн.: Белта, 1999; Памяць: Гіст.-дакум хроніка Слонімскага р-на Гродзенскай вобл. – Мн.: – Белта, 2004.

3. Памяць: Гіст. – дакум. хроніка Слонімскага р-на Гродзенскай вобл. – С.315-319.

4. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці. С. 206 – 207.

5. Гребенкина А.А. Брест непокренный. Антифашистское подполье г. Бреста и Брестского района в годы Великой Отечественной войны (1941 – 1944). – Мн., 2005.

6. Буг в огне. – Мн., 1977. – С. 331-332; Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. – С. 94; Гребенкина А.А. Брест непокоренный. Антифашистское подполье г. Бреста и Брестского района в годы Великой Отечественной войны (1941 – 1944). – С.155.

7. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне... – С. 94.

8. Годы комсомольские: Воспоминания. – Мн., 1988. – С. 63 – 77.

9. Рутич С. П. Навеки юные. – Мн., 1980. – С. 31-39.

10. Крамко Я. І. Атрад «Камсамольскі». – С. 18; Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне... – С. 365.

11. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Шчучынскага раёна Гродзенскай вобл. – С. 209.

12. Климов И., Граков Н. Партизаны Вилейщины. – Мн., 1970. – С. 4–95.

13. Каваленя А. А. Арганізацыйная структура камсамольска-маладзёжнага падполля на акупіраванай тэрыторыі Беларусі (1941-1942 гг.) // Беларусь у гады другой сусветнай вайны: Урокі гісторыі і сучаснасць. – Мн., 1995. – С. 206.

14. Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии. – Мн., 1975. – С. 258.

15. Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. – Мн., 1993. – С. 28.

16. Жумарь С. В. Оккупационная периодическая печать на территории Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. – Мн., 1996. – С. 88.

17. Зелинский П. И., Ракевич Н. А. Печать КПЗБ в борьбе за свободу. – Мн., 1977. – С. 9.

18. Сямашка Я. Армія Краёва на Беларусі.– Мн. 1994. – С. 8.

19. Ермолович В. И., Жумарь С. В. Огнем и мечом. – Мн.1994 – С. 14.

У.І. Навіцкі, Інстытут гісторыі НАНБ, г. Мінск

ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЛІТЫКА ДА РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1945 – 1955 гг.)

Першыя пасляваенныя гады азнаменаваліся паляпшэннем адносін дзяржавы з Рускай праваслаўнай царквой (РПЦ), чаго не назіралася ў адносінах з іншымі канфесіямі. Патрыятычная дзейнасць РПЦ у гады вайны, збор і адлічэнне сродкаў на абарону краіны адгукнуліся ўдзячнасцю Сталіна. Ён санкцыянаваў правядзенне ў Маскве Памеснага сабора, які пачаў работу 31 студзеня 1945 г. Набіралі дынаміку кантакты паміж атачэннем Сталіна і абраным на саборы Патрыярхам Маскоўскім і ўсёй Русі Алексіем І. Такая палітыка знаходзіла ўвасабленне ў дзейнасці новай дзяржаўнай структуры – Савета па справах Рускай Праваслаўнай Царквы пры СМ СССР, створанай 14 верасня 1943 г. [1]. Савет узначаліў 45-гадовы палкоўнік КДБ Г.Карпаў. Ён хутка ўстанавіў даверлівыя адносіны з Патрыярхіяй, што давала карысць абодвум бакам. Аб станоўчай пасярэдніцкай ролі паміж дзяржавай і Патрыярхам РПЦ сведчыла тое, што на гэтай пасадзе Г.Карпаў знаходзіўся да 1961 г. Савет ажыццяўляў дзейнасць праз інстытут прадстаўнікоў на месцах: Упаўнаважанага савета па справах РПЦ пры СНК СССР па БССР і ўпаўнаважанага пры аблвыканкамах.

Большай жорсткасцю, чым да РПЦ, адзначалася палітыка дзяржавы да іншых канфесій, і ў першую чаргу да рымска-каталіцкай. Яе ажыццяўляў Савет па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР, утвораны 29 мая 1944 г. Такія структуры разгарнулі дзейнасць на рэспубліканскім і абласных узроўнях. Галоўнай іх задачай з'яўлялася закрыццё каталіцкіх абшчын ва ўсходніх рэгіёнах БССР, разгарнуўшых дзейнасць падчас фашысцкай акупацыі. З гэтай мэтай пачалі ажыццяўляцца «зачысткі» ксяндзоў, праводзіўшых душапастарскую дзейнасць на акупаванай тэрыторыі. Пасля арышту служыцеляў культу закрываліся храмы.

Палітыка наступлення на каталіцкую царкву разгарнулася ў Заходняй Беларусі. У другі раз у руках органаў дзяржаўнай бяспекі апынуўся былы ўдзельнік судовага працэсу над каталіцкімі святарамі ў Мінску ў 1922 г. генеральны вікарый Пінскага дыяцэзу Я.Васілеўскі, арыштаваны 22 ліпеня 1945 г. На гэты раз лёс святара аказаўся трагічным. У сакавіку 1947 г., пасля двух гадоў знаходжання ў следчым ізалятары Мінска, яго прыгаварылі да 10 гадоў пазбаўлення волі. Праз год у лагеры Казачанск Краснаярскага края закончыўся жыццёвы шлях ксяндза. Некалькі раней быў арыштаваны настаяцель Пружанскага касцёла будучы кардынал К.Свёнтак. Пасля арышта касцёл быў закрыты.

Уціску падвяргаліся святары, якія выступалі супраць падпісання тыпавых дагавораў аб перадачы касцёлаў і прадметаў культу ў бестэрміновае і бясплатнае карыстанне. Кампанія нацыяналізацыі каталіцкіх хра-

маў і маёмасці пачалася ў студзені 1947 г. За рэдкім выключэннем служыцелі культу выступілі супраць гэтай акцыі, адкрыта заяўляючы аб тым, што касцёлы ў СССР належаць не савецкай дзяржаве, а папе рымскаму. Тым, хто не ішоў на рэгістрацыю, забаранялі праводзіць службы, апячатвалі касцёлы. Пад моцным уціскам супраціўленне было зломлена. З 272 прыходаў, якія дзейнічалі ў БССР, прайшлі перарагістрацыю 234. На верасень 1949 г. працягваў супраціўленне толькі ксёндз Хмелявец з вёскі Канстанцінава Свірскага раёна [2].

Улады БССР накіроўвалі намаганні на забарону правядзення касёламі рэлігійнага навучання дзяцей, што не забаранялася Масквой. Пасля нядзельнай службы у кожным касцёле Гродзенскай вобласці праводзіліся заняткі з дзецьмі, дзе прысутнічалі ад 45 да 60 чалавек. Агульная колькасць ахопленых навучаннем падлеткаў складала больш за 8 тыс. 23 ліпеня 1947 г. ЦК КП(б)Б накіраваў на імя Сталіна і галоўнага партыйнага ідэолага А.Жданава ліст аб фактах антысавецкай дзейнасці каталіцкага духавенства ў заходніх абласцях. Адзначалася, што касёлы «хочуць узяць пад свой уплыў дзяцей і моладзь як непасярэдна, так і праз бацькоў і тых настаўнікаў, якія выхаваны ў духу польскага нацыяналізму і рэлігійнай ідэалогіі» [3]. Падвяргаўся крытыцы Савет па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР, які дазволіў праводзіць рэлігійнае выхаванне. Кіраўніцтва рэспублікі прасіла Маскву даць устаноўку органам МДБ «узмацніць рэпрэсіўныя меры ў адносінах да той часткі рымска-каталіцкага духавенства, якая вядзе актыўную работу супраць Савецкай улады» [3; арк. 45].

У 1948 г., рэагуючы на просьбу Мінска, Масква забараніла правядзенне рэлігійнага выхавання дзяцей. У адказ служыцелі культу накіроўвалі намаганні на пашырэнне культурна-масавай работы сярод моладзі. У той год у 10 касцёлах Ваўкавыскага дэканата працавалі харавыя гурткі, у якіх прымалі ўдзел не толькі юнакі і дзяўчаты раённага цэнтра, але і вясковая моладзь.

З мэтай зніжэння ўплыву ксяндзоў улады садзейнічалі выезду каталіцкіх святароў у час перасялення польскага насельніцтва ў Польшчу. 19 лістапада 1947 г. у дакладзе кіраўніцтву ў Маскве ўпаўнаважаны па справах культаў К.Уласевіч тлумачыў праведзеную палітыку: «Мы пастараліся як мага больш адправіць ксяндзоў у Польшчу» [1; воп. 4, спр. 19, арк. 15]. У суседнюю дзяржаву выехалі 306 прадстаўнікоў каталіцкага культу. «Астатнія 246 ксяндзоў, а таксама многія іншыя служачыя культу засталіся на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі, – паведамляў у ліпені 1947 г. у Маскву М.Гусараў, – адмовіліся ад выезду ў Польшчу, матывуючы гэта наяўнасцю вернікаў у прыходах. У сапраўднасці, як высветлілася з агентурных матэрыялаў і размоў супрацоўнікаў Міністэрства замежных спраў БССР з упаўнаважанымі польскага ўрада, астаўшыяся ў заходніх абласцях БССР ксяндзы маюць прамую забарону Папы Рымскага выязджаць з тэрыторыі Беларусі» [3; спр. 543, арк. 27].

На справе абставіны складваліся не па сцэнарыю забароны выезда з боку папы, а жаданне працаваць з вернікамі застаўляла каталіцкіх святароў заставацца ў сваіх прыходах. Аб гэтым заявіў адмовіўшыся ад ад'езду ксёндз нясвіжскага прыхода Каласоўскі: «Я не ведаю, што мяне чакае ў Польшчы. Па меншай меры, я тут маю зарабак. Я ні ў якія палітычныя справы не ўмешваюся, і мне здаецца, пакуль будуць вернікі, мне дазволяць праводзіць службы, і я буду жыць нядрэнна» [1; спр. 19, арк. 494]. Так атрымалася на справе. Да 1989 г. – канца свайго зямнога жыцця ў дастатку – ксёндз працягваў службу ў нясвіжскім касцёле Божага цела, выхоўваючы пакаленні вернікаў на каталіцкіх традыцыях.

Халодная вайна, застаўшаяся значная частка каталіцкага духавенства ў Заходняй Беларусі і Украіне ўзмацнялі канфрантацыю паміж Масквой і Ватыканам. Напружанню адносін садзейнічала апублікаванне 13 ліпеня 1949 г. дэкрэта папы Пія XII аб адлучэнні ад РКЦ усіх каталікоўкамуністаў і спачуваючых ім [4]. Веруючым забаранялася ўступаць у кампартыю альбо падтрымліваць яе, выдаваць, распаўсюджваць і чытаць камуністычную літаратуру. Партыйная прапаганда рэспублікі заклятым ворагам лічыла каталіцкае духавенства. Узмацненню канфрантацыі садзейнічала пачаўшаяся калектывізацыя сельскай гаспадаркі. Нежаданне сялян абагульняць з цяжкасцю набыты інвентар і жывёлу звязвалася з «падрыўной» дзейнасцю касцёлаў. 23 студзеня 1949 г. у справаздачным дакладзе на Гродненскай абласной партыйнай канферэнцыі першы сакратар АК КП(б)Б С.Прытыцкі падкрэсліваў, што каталіцкае духавенства «вядзе шалёную барацьбу супраць мерапрыемстваў нашай партыі і савецкага ўрада... Амаль усе ксяндзы, якія пражываюць у нашай вобласці, звязаны з нацыяналістычным падполлем, з'яўляюцца ўдзельнікамі і арганізатарамі банд і са зброяй у руках выступаюць супраць Савецкай улады» [5]. Але канкрэтных прыкладаў у дакладзе не прыводзілася. Прычынай з'яўлялася не парушэнне сакрэтнасці аператыўнай абстаноўкі, а іх адсутнасць. Не былі яны названы і ў выступленні кіраўніка МДБ Л.Цанавы як члена бюро ЦК КП(б)Б, прымаўшага ўдзел у канферэнцыі. Такая версія супярэчыла ранейшай інфармацыі, накіраванай Гродзенскім абкамам партыі ў Маскву. «Маюць месца факты, калі асобныя кіраўнікі раёнаў (Шчучын, Воранава, Зэльва), знаходзячыся ў сёлах і вёсках, збліжаюцца з ксяндзамі і святарамі, – адзначалася ў інфармацыі, – затрымліваюцца ў іх і нават выпіваюць з імі» [4; воп. 8, спр. 721, арк. 4]. Прыведзеныя факты супярэчылі прапагандзе, якая агучвалася на абласной партыйнай канферэнцыі, сведчылі аб тым, што жыццё на месцах было больш шматгранным. У адносінах паміж мясцовымі кіраўнікамі і служыцелямі культу мелі месца такія каштоўнасці, як таварыства, духоўнасць, патрэбнасць сустрэчы, дзе падчас камандзіроўкі можна засцерагчыся ад усялякіх непрадбачных здарэнняў.

Між тым пачатак калектывізацыі азнаменаваўся масавымі арыштамі ксяндзоў. У 1949 г. на Гродзеншчыне былі арыштаваны настаяцелі прыходаў Лунна – М.Радзішэўскі, Тракелі – М.Шалкевіч, Сапоцкін – І.Нава-

садка, на Полаччыне – І.Грабоўскі з Параф'янава, П.Барташэвіч з Парплішчаў, А.Куява з Язно і інш. Не ўдалося застацца на свабодзе віднаму дзеячу РКЦ А.Станкевічу, арыштаванаму 13 красавіка 1949 г. у Вільні. Яго зямное жыццё абарвалося ў снежні таго ж года ў Тайшэтлагу [6].

Улады не ўтрымаліся ад арышту «лаяльнага» настаяцеля Параф'янаўскага касцёла І.Завістоўскага, асуджанага Полацкім абласным судом на 10 гадоў пазбаўлення волі. 8 ліпеня 1954 г. па рашэнню Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ён датэрмінова быў вызвалены ў сувязі з хадайніцтвам сястры асуджанага. Яна прыводзіла факты дапамогі ксяндза разведчыкам партызанскай брыгады прадастаўленнем звестак аб дыслакацыі нямецкіх часцей [7]. Калі ў 1946 г. у Гродзенскай вобласці налічвалася 75 ксяндзоў, у 1948 – 58, у 1949 – 56, у 1950 – 46, то ў 1952 – толькі 24. Агульная колькасць святароў у БССР скарацілася з 225 у 1946 г. да 111 на 1 студзеня 1950 г. Аб тым, што арыштаваныя каталіцкія святары не мелі дачынення да нацыяналістычнага падполля, а тым больш да дзейнасці бандфарміраванняў, сведчыў той факт, што пазней яны былі рэабілітаваны як незаслужана пакараныя.

Каб апраўдаць рэпрэсіўную палітыку да рымска-каталіцкай царквы, Масква патрабавала пацвярджэння з месц антысавецкай дзейнасці каталіцкага духавенства. Але факты гаварылі аб адваротным. Фінансавы аддзел Воранаўскага райвыканкама па праву мог залічыць у свой актыў настаяцеля касцёла раённага цэнтра Коўзу, які сваімі дзеяннямі дапамагаў папаўняць мясцовы бюджэт. Калі да святара звярталіся вернікі з асабістай просьбай, ён першапачаткова цікавіўся станам уплаты падаткаў. Калі ўстанаўлівалася нядоімка, вызначаўся тэрмін яе пагашэння і толькі пасля гэтага вырашаліся асабістыя пытанні. У пачатку 1950 г. нягледзячы на тое, што ў сваіх пропаведзях настаяцель мядзведзічскага касцёла Ляхавіцкага раёна В.Піянтоўскі расказваў вернікам «аб перавагах калгасаў перад адзіналічнымі гаспадаркамі»,ён быў арыштаваны па абвінавачванню ў тым, што ў мясцовы калгас не жадалі ўступаць сяляне-каталікі, якія быццам знаходзіліся пад уплывам ксяндза [2; с. 215].

У 1954 г. у БССР пачала складвацца новая сітуацыя, звязаная з вяртаннем асуджаных каталіцкіх служыцеляў культу. Да пачатку 1956 г. у рэспубліку прыбылі 60 ксяндзоў, з іх 32 – у Гродзенскую вобласць. Мясцовыя партыйныя і савецкія органы крайне неахвотна давалі дазвол на іх рэгістрацыю, матывуючы непажаданай актывізацыяй дзейнасці рэлігійных суполак. І сапраўды, там, дзе пачыналі працу ксяндзы, якія вярнуліся з лагераў, ажывала рэлігійнае жыццё: расла колькасць заяў з просьбай зарэгістраваць святароў, узмацняўся збор грашовых ахвяраванняў. Даючы дазвол на рамонт непрыгоднага для эксплуатацыі касцёла ў вёсцы Новыя Васілішкі Шчучынскага раёна, у сувязі з вялікімі фінансавымі затратамі мясцовыя ўлады не спадзяваліся на хуткае заканчэнне работ. Аднак на працягу месяца касцёл быў адрамантаваны і пачалася барацьба вернікаў за адкрыццё суполкі.

З вялікім непакоем адзначалі ўдзельнікі пленума Гродзенскага абкама партыі, абмеркаваўшага пытанне «Аб рабоце абласнога аддзялення таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў і задачах партыйных арганізацый вобласці», змену рэлігійнай сітуацыі з прыбыццём у вобласць вызваленых ксяндзоў. У выхадныя дні ў касцёлах, дзе святары прыступілі да службы, збіраліся ад 3 да 8 тыс. чалавек. Вернікі звярталіся са скаргамі ў найвышэйшыя інстанцыі аб нежаданні ўлад на месцах рэгістраваць рэлігійныя суполкі, прадстаўляць месца службы ксяндзам. Першы сакратар АК КПБ Ф.Баранаў звярнуўся да выступаўшага ў спрэчках упаўнаважанага па справах рэлігій М.Саласянкова з пытаннем: «Што можна супрацьпаставіць ксяндзам рэальнае?» «Адзінае збаўленне ад іх, – адказаў упаўнаважаны, – гэта не прапісваць на жыхарства ў вобласці» [5; спр. 10, арк. 79]. Таму на месцах усё рабілі для таго, каб пазбавіць прапіскі святароў і, такім чынам, не адкрываць касцёлы.

Між тым вернікі актывізавалі барацьбу за права на свабоду веравызнання, пасылаючы ў Мінск і Маскву лісты з патрабаваннем змяніць становішча. Актыўнасцю вызначалася насельніцтва тых мясцін, дзе на працягу дзесяцігоддзяў віравала рэлігійнае жыццё. Справа набыла такую вастрыню, што старшыня Савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў СССР І.Палянскі накіраваў у ЦК КПСС ліст з прапановай пашырэння колькасці касцёлаў на Беларусі. Ставілася пытанне аб мэтазгоднасці адкрыцця храмаў ва ўсходніх абласцях рэспублікі, стварэння ў Мінску каталіцкага цэнтра з епіскапам. Прапанову падтрымаў упаўнаважаны Савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў БССР К.Уласевіч.

Па традыцыі тых часоў гэты ліст быў накіраваны на разгляд у ЦК КПБ. Яго абмеркаванне адбылося ў лістападзе 1955 г. на бюро ЦК. Трэба адзначыць, што ідэалагічныя службы ЦК КПБ не адыйшлі ад панаваўшых стэрэатыпаў мыслення. Яны не бачылі парушэння правоў вернікаў. Больш таго, І.Палянскаму рабіліся папрокі ў няведанні рэчаіснасці. На думку беларускіх ідэолагаў, працуючы ў Маскве, ён нават сфальсіфікаваў некаторыя факты. Калі такія прэтэнзіі прад'яўляліся да высокага маскоўскага кіраўніка, то да мясцовага – знайшлі больш жорсткія. На бюро ЦК КПБ была зроблена заява аб тым, што К.Уласевіч палітычна адсталы чалавек, які стаіць на яўна памылковых пазіцыях. Па словах сакратара ЦК КПБ па ідэалогіі Ц.Гарбунова, «ён рабіў уціск на мясцовыя савецкія органы аб адкрыцці касцёлаў, не бачыў, што прайдзісветы, авантурысты фабрыкавалі дакументы аб адкрыцці касцёлаў, і не дапамагаў партыйным і савецкім органам правільна вырашаць гэта пытанне» [3; воп. 2, спр. 237, арк. 304]. З такімі абвінавачваннямі К.Уласевіч быў зняты з работы, а разам з ім зняты з абмеркавання прапановы аб пашырэнні каталіцкіх суполак ва ўсходніх рэгіёнах БССР. Такімі складанымі былі адносіны дзяржавы да РКЦ у пасляваенны перыяд. Яны не палепшыліся і ў наступныя гады.

Літаратура і крыніцы

1. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (далей – ДАРФ). Ф. 6991. Воп. 2. Спр. 1. Арк. 2.
2. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX ст.) – Мн., 1998. – С. 248.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). Ф. 4. Воп. 29. Спр. 544. Арк. 41.
4. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (далей – РДАСПГ). Ф. 17. Воп. 132. Спр. 285. Арк. 15.
5. Гродненскі абласны дзяржаўны архіў грамадскіх арганізацый. Ф. 1. Воп. 35. Спр. 15. Арк. 29.
6. Гарбінскі Ю. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. – Мінск–Мюнхен, 1999. – С. 184.
7. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 1479. Воп. 1. Спр. 11. Арк. 33.

Д.В. Карев, ГрГУ им. Я.Купалы, г. Гродно

СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКОЕ РАЗВИТИЕ ЗАПАДНОГО РЕГИОНА БЕЛАРУСИ В ИСТОРИКО-ЭКОНОМИЧЕСКОЙ МЫСЛИ XVI – XX вв.

В исторической и экономической литературе Советской Беларуси до 90-х годов XX в. региональным исследованиям придавалось второстепенное значение. Однако с началом периода суверенизации эта проблематика значительно актуализировалась. Большое развитие получили не только теории региональной экономики, но и теории регионоведения. Последнее обстоятельство было вызвано не только общенаучными, но и геополитическими, геоэкономическими реалиями конца XX ст. – глобализацией и возрастанием роли регионов в интеграционных процессах на пространстве ЕС. Этот интерес к региональной проблематике в современных гуманитарных исследованиях вполне закономерное явление сегодняшнего дня, если учесть современные социальные процессы и институциональные изменения в мире.

В странах с переходной экономикой, к которым относится и Беларусь, повышенный интерес к региональной проблематике вызван также обострением региональных проблем на этапе коренной социально-экономической, политической и социокультурной «составляющих» ее развития. К сожалению, осознание этих проблем на уровне необходимости введения их в круг не только исследовательского, но и вузовского учебного процесса явно отстает от «социального заказа» эпохи. К тому же на сегодняшний день не преодолен методологический разрыв в уровне понимания роли предшествующей исторической традиции в развитии региона между историками и экономистами. Исследование проблемы региона часто ведется представителями этих наук двумя непересекающимися,

«параллельными фронтами». Для понимания социальной сущности феномена регионального развития следует обратиться к его содержанию, во многом определяемому предшествующей исторической традицией. Это положение особенно актуально для выявления специфики крупных макрорегионов Беларуси, где роль и влияние предшествующего социально-политического и социокультурного контекста были определяющими. К последним с полным основанием относится и западнобелорусский регион. К сожалению, как нами отмечалось ранее, многие ракурсы его специфики, определяемые историей, до сегодняшнего дня не стали предметом детального историко-экономического анализа, а знание этой специфики крайне слабо включается в модель развития региона, в практику региональной экономической политики [1].

Одна из таких неизученных проблем, определяемых спецификой исторического развития региона, – проблема эволюции историко-экономической мысли Беларуси XVI – XX вв. отражающей специфику социально-экономического развития западнобелорусского региона в эпоху нового и новейшего времени. Изучение ее позволяет понять не только особенности протекания объективных социально-экономических процессов в жизни региона, но и роль субъективного фактора – значение управленческих и интеллектуальных элит в создании сегодняшнего «образа» региона.

Первый вопрос, который может возникнуть у читателя и слушателя – почему именно XVI – XX века выбраны в качестве исследовательской «площадки» для изучения данной проблемы? На наш взгляд, в рамках этих пяти столетий закладываются и формируются те две основных модели управления, которые главным образом определяют тенденции развития территории государств в Европе нового и новейшего времени (децентрализованная) и жесткая централизованная модель управления региона «из Центра», которая в основных своих элементах сохраняется и до сегодняшнего дня. Для XVI – XVIII веков в история региона (в период 1 Речи Посполитой) доминировала сословно-корпоративная, децентрализованная модель управления. В периоды Российской империи, II Речи Посполитой, СССР и суверенной Республики Беларусь можно выделить пять основных этапов в эволюции системы управления западно-белорусского региона:

1) первая половина Х1Х в.;
2) 60-е годы Х1Х в. – 1917 г.;
3) 1921 – 1939 гг.;
4) 1944 – 1991 гг;
5) 90-е годы XX – нач. XXI в.

Мы не включаем в эту схему периоды военных лихолетий и оккупаций края зарубежными государствами, которые оказали очень значительное, но кратковременное, «ситуативное» воздействие на состояние экономических и человеческих ресурсов региона (война 1812 г., война 1914–1918 гг. и гражданская война 1918 – 1921 гг.; вторая мировая война 1939 – 1945 гг.).

Все эти особенности социально-экономического развития региона и традиций его управления на протяжении пяти столетий с разной степенью интеллектуальной рефлексии осмыслялись в историко-экономической мысли элиты региона и Беларуси XVI – XX вв.

Изучая особенности социально-экономического развития Западной Беларуси XVI – XX вв., исследователи неоднократно отмечали, что в этом регионе в силу особенностей исторического развития быстрее, чем на Востоке Беларуси, формировались товарно-денежные отношения и рынок, закладывались основы перехода к более прогрессивной системе рыночных общественных отношений, как в аграрном, так и в промышленном секторах экономики (реформы: аграрная при Сигизмунде Августе в XVI в.; А.Тизенгауза в Гродно инвентарная реформа гр. П.Д.Киселева в западных губерниях; особый режим проведения реформы 1861 г. в Западной Беларуси и др.).

Эта специфика региона была закреплена в ходе социально-экономического развития Западной Беларуси в составе II Речи Посполитой в межвоенный период, где в целом в отличие от территорий, входящих в БССР, сохранились традиции развития экономической системы рыночного типа.

Поздняя и не столь катастрофичная, как на Востоке республики, советизация и «коллективизация» крестьянства региона (в конце 40-х – нач. 50-х гг. XX в.) позволила сохранить экономическую психологию и менталитет хозяина у значительной части населения края. Коренная институциональная перестройка экономической инфраструктуры региона и образа жизни населения (в направлении урбанизации и индустриализации) произошла только в 60-е – 90-е гг. XX в., что породило немало проблем после распада Советского Союза и поиска своего нового места под «экономическим солнцем» в системе новых геополитических и геоэкономических реалий. При всех сложностях перестройки переходного периода западная часть Беларуси (в особенности Гродненская область), как отмечают исследователи, тяготеет к западной модели экономических и социальных отношений. Восточная же часть Беларуси так же объективно и закономерно ориентируется на Россию. Начало XXI века, обозначив для жителей западнобелорусского региона новые вызовы, вместе с тем предоставляет и новые перспективы для позитивной реализации своего будущего в пространстве единой «европы регионов». Проблема европейской интеграции сегодня неразрывно связана со все возрастающими процессами регионализации. Одной из целей современного регионализма в Европе является этническое пробуждение, возвращение к корням, строительство «маленьких отчизн», но не для замыкания в своей региональной «скорлупе», а для более успешной продажи своей «эксклюзивности» в рамках системы мирового разделения труда и преодоления государственных границ через реанимацию органичных ландшафтно и цивилизационно близких еврорегионов [2].

Информация об особенностях развития западнобелорусского региона, наработанная поколениями исследователей XVI – XX вв., поможет

более пристально и конкретно выделить перспективные точки «развития будущего» во взаимоотношениях народов белорусско-польско–литовско-украинского пограничья.

Начало научной традиции изучения региона было заложено в начале XIX в. Включение западнобелорусских земель в состав Российской империи вследствие третьего раздела Речи Посполитой предопределило начало нового этапа в истории этого пограничного макрорегиона. Это историческое событие оказало мощное, но противоречивое влияние на его социально-экономическое, общественно-политическое и культурное развитие. Оно открыло новую полосу в существовании белорусской культуры и ее составной части – гуманитарных наук (история, экономика, право). Началась их постепенная переплавка в «тигле» российской государственности и культуры.

Громадное значение гуманитарных наук, особенно истории, как средства сохранения «социальной памяти» народа, воспитания молодого поколения отчетливо осознавалось в первой половине XIX в. По представлениям полонизированной шляхетской интеллигенции края, история, «отечествоведение» должны были служить борьбе за сохранение национальной культуры, ее традиций и своеобразия. Поэтому интеллигенция Западной Беларуси и Литвы (в лице различных ее социальных групп – магнатов, шляхты, части мещанства) оказалась очень восприимчивой к исторической проблематике в целом и историко-экономическим исследованиям края, в частности. На первый план выходила проблема интегративного описания и изучения источников по социально-экономической и культурной истории ВКЛ, исследования региона в историко-статистическом, топографическом и хозяйственно-бытовом отношении.

В частности, в этот период была заложена традиция историко-экономического изучения белорусского феодального города, белорусской шляхты и белорусского крестьянства. Она была заложена представителями и питомцами Виленского университета в I трети XIX в. В изучении истории своего края (и, в частности, города) ученые и воспитанники университета нередко выступали в роли первопроходцев. И.Лелевель, И.Онацевич, И.Ярошевич, И.Данилович, И.Лобойко в своих лекционных курсах и совместной со студентами исследовательской работе значительное внимание уделяли «местным», региональным сюжетам исторического прошлого Великого княжества Литовского. К изучению истории белорусского городского населения особенный интерес проявлял И.Н.Лобойко. Под его руководством студенты университета составили описание более 80 сел, местечек и городов Западной Белоруссии. Он был одним из ревностных поборников в организации археографических экспедиций на территории края, собиравших здесь письменные источники по истории населенных пунктов.

В 30-е – нач. 60-х гг. XIX в. наиболее значительный вклад в исследование исторического прошлого городского и сельского населения Западной Белоруссии внесли сотрудники губернских статистических комите-

тов западных губерний России (Т.Нарбут, А.Киркор, И.Крашевский, братья Е. и К.Тышкевичи, В Сырокомля и др.). Возникшие во второй половине 30-х гг. XIX в. губернские статистические комитеты одной из главных задач своей деятельности считали необходимость сбора информации о прошлом и настоящем хозяйства, населения и историко-бытовых особенностей отдельных местностей Белоруссии и Литвы. Сотрудники этих учреждений определяли программы издаваемых с 1838 г. при губернских правлениях «Губернских ведомостей», а с конца 40-х гг. XIX в. – «Памятных книжек губерний». В неофициальных их частях нередко публиковались историко-краеведческие заметки, очерки, исторические документы по истории белорусских сел и местечек. В формирование источниковой базы по истории белорусских населенных пунктов в 50-е – нач. 60-х гг. XIX в. немалый вклад внесли офицеры генерального штаба, создавшие ряд ценных описаний белорусских губерний (Виленской – А.Корева, Гродненской – П.О. Бобровский, Минской – И. Зеленский). Опыт офицеров-генштабистов в описании губерний Белоруссии опирался на вышедшую в 1855 г. работу генерал-майора М.О. Без-Корниловича «Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся».

И в 60-е – 90-е гг. XIX в. ведущим жанром в историко-экономических исследованиях города и деревни западнобелорусского региона оставался жанр историко-статистического и историко-бытового описания, популяризации и массовому распространению которого немало содействовали ведущие краеведы западных губерний России (А.Сементовский, А.Сапунов, Н.Е.Романов, А.Киркор, М.А.Дмитриев, Е.Ф.Орловский, К.Д.Плавский и др.). С активным участием этих исследователей, которые трудились чаще всего под эгидой губернских статистических комитетов или Северо-Западного отдела Русского Географического Общества (1867–1915), проводились описания территорий, входящих в состав волостей и уездов белорусских губерний, составлялись их топографические планы. Появление подобных работ, дававших историко-географическое, экономическое и историко-статистическое описание белорусских сельских и городских населенных пунктов, было делом для исторической науки чрезвычайно полезным во многих отношениях. Фиксировались объекты и явления, многие из которых быстро исчезали с лица земли и памяти поколений, собиралась порой уникальная историко-экономическая информация, создавалась источниковая база по исторической географии региона и истории его экономического развития.

Качественно новый период в изучении истории белорусских городов и деревень был связан с появлением в белорусской историографии эпохи капитализма работ М.О.Кояловича и М.В.Довнар-Запольского. В этих исследованиях проблема прошлого и настоящего белорусской деревни, белорусского города (в западнобелорусском регионе в частности – Д.К.), их места в истории края приобрела автономный «статус», стала рассматриваться с историко-теоретических позиций. В трактовке исто-

рии белорусского крестьянства и мещанства на первый план явно выходили конфессиональные и политические аспекты проблемы. Основа же их – эволюция социально- экономических отношений в белорусской феодальной деревне и городе не рассматривалась Кояловичем даже в постановочном плане.

М.В.Довнар-Запольский, крупнейший представитель демократического направления в белорусской историографии к XIX – нач.XX вв., в своем толковании исторического прошлого белорусской феодальной деревни и белорусского феодального города, которые он в значительной мере рассматривал на материалах западнобелорусского региона, испытывал явное влияние идей экономического материализма. Это позволило ему углубить изучение проблемы за счет анализа социально-экономических факторов в истории Белоруссии. Среди ключевых проблем ее исторического прошлого, в качестве самостоятельных предметов исследования он выделил: 1) белорусскую сельскую общину XVI – XIX вв.; 2) экономику белорусского города; 3) историю финансов и управления экономикой ВКЛ. Он показал их историческую эволюцию в процессе развития феодализма и генезиса капитализма на белорусских землях ВКЛ и Российской империи и их роль в истории белорусского этноса.

Под влиянием работ М.О.Кояловича, М.В.Довнар-Запольского и их учеников к началу XX в. значительно расширились горизонты исторического видения белорусской историографии, изменилось содержание объекта и предмета исследований. Историческая наука, интересовавшаяся в первой половине XIX в. преимущественно историей политической и конфессиональной, обратила свое внимание на историю народного хозяйства, социальных отношений, крестьянства города и отдельных регионов Беларуси. Нельзя не отметить того, что новое видение старых проблем белорусского «прошлого и настоящего» к началу XX в. основывалось на новых методологических основаниях – позитивизме и экономическом материализме. Развитие историко-экономического направления в краеведении западнобелорусского региона к началу XX в. находилось под влиянием этих новых методологических установок.

Изучение особенностей Западной Беларуси в составе II Речи Посполитой являлось одним из наиболее важных направлений исторической науки и экономической мысли Беларуси на протяжении 20 – 90-х гг. XX в. На разработку проблем социально-экономического, политического и культурного развития западнобелорусского региона значительный отпечаток накладывали изменения в общественно-политической ситуации в стране, внимание к этим проблемам советских и партийных органов, стремившихся направить их разработку в русло решаемых ими управленческих и идеологических задач. В 20-е – 30-е гг. XX в. в БССР были созданы специальные научно-исследовательские учреждения, которые изучали и анализировали ситуацию в западной части Беларуси (с 1926 г. – Комиссия по изучению Западной Белоруссии; с 1931 г. – Западный сектор Института истории партии при ЦК КП(б)Б. Эти учреждения проделали

значительную работу по изучению и освещению в печати вопросов истории революционного и национально-освободительного движения в Западной Беларуси, исследованию особенности социально-политической и экономической специфики региона. Аналогичная исследовательская работа проводилась на территории Западной Беларуси Виленским белорусским историко-этнографическим музеем им. И.Луцкевича, Белорусским научным товариществом при Виленском университете и Белорусским институтом хозяйства и культуры. Эта же проблематика продолжала разрабатываться в историко-экономической мысли Беларуси послевоенного периода (50-е – 90-е годы XX в: работы Глинской Т.Ю., Мацко А.Н., Палуяна В.А, Ладысева В.Ф., Бригадина П.И., Михнюка В.Н., Креня И.П, Ковкеля И.И. и др.). Нельзя не отметить, что работы, посвященные социально-экономическим вопросам развития западнобелорусского региона, занимают в общем массиве исторической информации, посвященной Западной Беларуси сравнительно небольшое место. К тому же большая часть историков, рассматривавших эти проблемы, как правило, не владела навыками профессионального экономического анализа. В работах белорусских экономистов второй половине XX в. историко-экономические ракурсы развития региона не получили достойного освещения. Экономический анализ ситуации в регионе практически начинался с «чистого листа», так, как будто предшествующая традиция в развитии региона не оказывала никакого влияния на его нынешнее состояние. Вывод, который вытекает из этой ненормальной ситуации, очевиден – необходимо при создании сегодняшней модели регионального развития синтезно совместить оба этих подхода (историко-генетический и методы экономического анализа). Их совмещение позволит выработать более адекватную и корректную модель сегодняшней ситуации в западнобелорусском регионе и наметить пути решения его проблем с помощью наиболее эффективных управленческих решений.

К тому же решение проблем, которые сегодня стоят перед Республикой Беларусь (формирование реального суверенитета, социально-рыночной экономики, эффективной государственной идеологии), невозможно без глубокого культурологического и экономического осмысления всех особенностей отечественного культурного наследия, специфики развития общественной мысли Беларуси в период нового времени. Мысль есть тот главный содержательный генератор, который не только осмысляет, анализирует прошлое и настоящее, но и проектирует социальное будущее.

Актуальность этой проблематики обусловлена возрастающей ролью гуманитарных знаний, как основного рычага, определяющего тип социальной конструкции настоящего и будущего.

В становлении идеологии белорусской нации и белорусской государственности историко-экономическая мысль играла и играет очень важную историческую роль – роль формирования базовых ценностей «интеллектуального инструментария» белорусского общества. Поэтому очень важно проследить и проанализировать те факторы белорусской культуры

и политической реальности, которые влияли на формирование специфики белорусской экономической мысли. При этом очень важно показать взаимосвязи и механизмы взаимодействия специфики исторического и экономического мышления белорусов с основными элементами социально-экономического, политического и социокультурного контекста развития белорусского общества. Для реализации этих целей необходимы системное обоснование существующего эмпирического материала и теоретическое его осмысление.

К сожалению, в истории белорусской и зарубежной общественной мысли на сегодняшний день не существует специальных исследований, посвященных системному анализу проблемы генезиса и развития историко-экономической мысли Беларуси периода нового и новейшего времени. И это несмотря на то, что в 60-е годы XX- нач. XXI в. белорусскими историографами, культурологами, экономистами издан ряд работ по истории экономической и исторической мысли Беларуси, которые большей частью затрагивали вопросы отдельных исторических периодов в развитии данного направления (работы Д.В.Карева, С.А.Подокшина, Г.Я.Голенченко, Э.К.Дорошевича, Т.И.Адамович, В.Н.Бусько, В.М.Конона, Н.Н.Улащика, В.В.Чепко, А.М.Лютого, И.И.Лущицкого, К.И.Шабуни, З.В.Шебеко, З.Б.Абезгауза, З.Ю.Копыского, Л.П.Липинского, М.О.Бича, Х.Ю.Бейлькина, Н.И.Мохнач, А.Н.Киштымова, Т.И.Адамович, А.Ф.Самусика, В.И.Голубовича и др.). Некоторые базовые аспекты данной проблемы и ее роли в становлении белорусской идеологии, культуры и науки рассматривались в публикациях автора данной статьи.

Целью предполагаемого исследования в данном направлении, на наш взгляд, должно быть комплексное системное изучение базовых ценностей историко-экономической мысли Беларуси в ее генезисе и функционировании в рамках социокультурного контекста развития Беларуси и Восточной Европы нового и новейшего времени.

Цель эта может быть конкретизирована и реализована через решение следующих задач:

1) анализ научной литературы (белорусской, польской, русской, украинской, англо-американской). Определить основные специфические акценты в развитии историко-экономической мысли Беларуси, данные отечественной и зарубежной историографией проблемы;

2) разработку методологических подходов исследования базовых ценностей историко-экономической мысли Беларуси, определение основных понятий и терминов;

3) определение состояния и характера источниковой базы проблемы на предмет ее полноты и репрезентативности;

4) исследование наиболее характерных, специфических черт, выделение основных этапов развития историко-экономической мысли Беларуси изучаемого периода (как в общебелорусском так и региональных контекстах);

5) анализ взаимодействия историко-экономической мысли Беларуси с экономической мыслью наиболее близких славянских народов в восточно-европейском социокультурном контексте;

6) определение специфики влияния историко-экономической мысли на процесс формирования идеологии белорусского общества и гуманитарных наук в Беларуси;

7) определение возможных прогнозов воздействия историко-экономической мысли Беларуси на процессы формирования и принятия управленческих решений властными структурами в новое и новейшее временя.

В качестве гипотезы мы руководствуемся положением о том, что для историко-экономической мысли Беларуси нового и новейшего времени были свойственны свои ценностные доминанты, которые отличают ее от развития экономической мысли национальных культур соседних народов. Эти особенности прежде всего определялись спецификой развития социокультурного контекста Беларуси XVI – XX вв. и «качеством» ее интеллектуальной и управленческой элиты (в том числе и региональной).

Исследование данной проблемы имеет не только теоретическое, но и важное прикладное, конкретно-практическое значение. Думается, что поставленные вопросы, представляют интерес: для проработки конкретной политики в сфере государственной идеологии Республики Беларусь, развития культуры гуманитарного мышления, народного образования и воспитания у молодого поколения чувств патриотизма и гордости за свое богатое культурное наследие. Непосредственное значение результаты исследования могут иметь для улучшения качества содержания учебного процесса в вузах Республики Беларусь, в период, когда необходимость модернизации учебных программ и курсов по истории отечественной культуры и науки становится особенно актуальной.

Не может не обращать на себя внимания тот факт, что, как правило, в XVI – XX вв. фокусирование основных проявлений историко-экономической мысли (как в сфере научного, так и в сфере практического, управленческого знания) было связано с крупнейшими реформами в сфере социально-экономической жизни ВКЛ и Беларуси (волочная помера в эпоху Сигизмунда Августа; реформы И.Хрептовича и А.Тизенгауза, реформы А.Д.Киселева и отмены крепостного права 1861 г.; реформы П.А.Столыпина и др.). Вероятно этот критерий может быть положен в основу периодизации развития историко-экономической мысли нового и новейшего времени. Влияние «зарубежного фактора» (школ западно-европейской экономической мысли: меркантилизма; физиократов; английской классической поллитэкономии; немецкой исторической школы; марксизма и др.) было существенным, но не главным обстоятельством в этом процессе.

Из этого положения напрашивается и вывод практического характера – современный жанр краеведческого исследования должен стремиться если не к максимальной интегративности изучения прошлого своей малой родины, то по крайней мере в обязательному включению (кроме исторической) трех обязательных «составляющих» этого прошлого: экономической, экологической и управленческой.

Литература и источники

1. Карев Д.В. Исторические традиции и формирование этнокультурных связей народов еврорегиона «Неман» (XXX вв.) // Еврорегион «Неман»: вопросы разития: Сборник информационных материалов. – Гродно, 1999. – С.37-41; Карев Д.В. Проблемы эффективности еврорегиона «Неман» в контексте расширения Европейского Союза // Расширение Европейского Союза и Беларусь: в поиске новой политики. – Мн.: Белфакс, 2003. – С. 24-26.; Карев Д.В. Особенности социально-экономического развития западно-белорусского региона в историко-экономической мысли Беларуси Х1Х – ХХ в. // Проблемы экономического развития региона: Материалы международной научно-практической конференции. Ч. 1. – Гродно: ГрГУ, 2004. – С.89-97.

2. Региональная экономика: проблемы и перспективы: Материалы международной межвузовской научной конференции. – Гродно, ГрГУ, 1998; Региональная экономическая политика: Материалы международной научно-практической конференции. 24-25 мая 2001 г. – Гродно: ГрГУ, 2001; Экономическое образование в университете: пути повышения качества: Материалы международной научно-методической конференции. 16-17 мая 2002 г. – Гродно: ГрГУ, 2002; Конкурентоспособность региона: состояние, проблемы, перспективы. Материалы международной научно-практической конференции 28-29 апреля 2005 г. – Гродно, 2005.

С.А. Габрусевіч, ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

ПРАФЕСАР ІГНАТ АНАЦЭВІЧ – ПАЧЫНАЛЬНІК АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

З якога часу пачынаецца сістэматычнае навуковае вывучэнне гісторыі Беларусі? У савецкія часы пачатак айчыннай гістарыяграфіі выводзілі з другой паловы XIX ст. Аднак ужо напачатку 90-х гадоў з'явіліся шэраг публікацый, аўтары якіх звязвалі зараджэнне айчыннай гістарыяграфіі з інтэлектуальнай дзейнасцю прафесароў Віленскага універсітэта М.Баброўскага, І.Даніловіча, І.Анацэвіча, І.Ярашэвіча, гісторыка і археолага Т.Нарбута. «Станаўленне нацыянальнай гістарыяграфічнай канцэпцыі звязана, – адзначаў М.Біч, – з зараджэннем і развіццём беларускай нацыянальнай ідэі і нацыянальнага руху. Да ліку першых прафесійных гісторыкаў, якія заклалі падмурак нацыянальнай канцэпцыі сваёй Радзімы, адносіліся прафесары Віленскага універсітэта М.Баброўскі, І.Даніловіч, І.Анацэвіч, І.Ярашэвіч, Т.Нарбут. На фарміраванне яе станоўча ўплывалі даследаванні па этнаграфіі Беларусі і фальклору беларусаў» [1, с.16].

Годам раней у артыкуле «Народзіны беларускай нацыянальнай ідэі» А.Латышонак менавіта з гэтымі імёнамі звязаў вытокі беларускай нацыянальнай свядомасці. Ён пісаў: «Працэс станаўлення сучаснай беларускай нацыі прынята называць «адраджэннем», а вытокі беларускай нацыяналь-

най думкі бачацца пры гэтым у творчасці Чачота, Баршчэўскага, Рыпінскага, Дуніна-Марцінкевіча. Але былі ў іх і папярэднікі» [2, с.9].

Хто былі гэтыя папярэднікі? «Яшчэ на пачатку XIX ст. знайшліся людзі, – гаворыць А.Латышонак, – якія здолелі нацыянальна вызначыць Беларусь. Былі гэта Міхайла Баброўскі, Ігнат Даніловіч ды іншыя прафесары Віленскага універсітэта...» [2, с.9].

Падсумоўваючы вынік даследавання, А.Латышонак сфармуляваў тры тэзы, якія для тагачаснага чытача не маглі быць бясспрэчнымі. І гэта зразумела, паколькі беларускі чытач у той час амаль нічога не ведаў ні пра жыццё, ні тым больш пра навуковую дзейнасць гэтых людзей. «Першае: дзве суседнія паловы XVIII і XIX стст. звязаны паміж сабою так непарыўна, што пра ніякае «адраджэнне» толькі ў XIX ст. гаварыць немагчыма. Калі нават не фальшывае самое паняцце «адраджэнне», дык фальшывая яго перыядызацыя і несапраўдныя яго героі. Другое: уласна беларускую нацыянальную ідэю стварылі не шляхецкія паэты і рэвалюцыянеры, а гістарычна адукаваныя спакойныя паповічы... Трэцяе: як Галіччына для Украіны, «Малая Літва» для Літвы, так і пруская Беласточчына для Беларусі адыграла выключную ролю ў станаўленні нацыянальнай свядомасці...» [2, с.14].

Да ліку гістарычна адукаваных спакойных паповічаў належыў прафесар Ігнат Анацэвіч. Ён нарадзіўся 25 жніўня 1780 года ў вёсцы Малая Бераставіца на Гродзеншчыне. Дата нараджэння І.Анацэвіча дакладна ўстанаўліваецца па аўтабіяграфіі, складзенай ім у 1828 годзе для савета Віленскага універсітэта.

Ігнат паходзіў з сям'і уніяцкага святара. Бацька Сымон быў настаяцелем Малабераставіцкай царквы. Гэта быў чалавек суровы, але ў найвышэйшай ступені справядлівы, спартанскай маралі. Звестак аб маці Ігната няма. У сям'і было трое сыноў: Міхаіл, Антон і Ігнат – і традыцыя пастарскага служэння. Прадбачачы, што царкоўная унія будзе знішчана, прыходскае уніяцкае духавенства пасля 1772 г. стала хрысціць сваіх дзяцей па лацінскаму абраду, пакідаючы аднаго толькі сына, звычайна старэйшага, у грэчаскім абрадзе. Ігнат Анацэвіч быў ахрышчаны па лацінскаму абраду.

Сацыяльнае паходжанне І.Анацэвіча, без сумневу, паўплывала на ягонае стаўленне да вучобы і працы. «Бедныя святарскія сыны, клеймаваныя мянушкай «паповічаў», – піша А.Латышонак, – добра разумелі, што толькі поспехам у навуцы змогуць дабіцца прызнання з боку панічоў і настаўнікаў» [1, с.11].

Аналізуючы дзейнасць выпускнікоў Віленскага універсітэта, якія выявілі сябе ў грамадстве, знаўца яго гісторыі прафесар Людвік Іваноўскі прыйшоў да наступнай высновы. Землеўладальніцкая шляхта, чыіх сыноў шмат вучылася ва універсітэце, дала Вільні мала вучоных, гэтак жа, як і саслоўе мяшчан і сялян. Затое былі яшчэ два саслоўі, якія пастаўлялі універсітэту знакамітых прафесараў. Былі гэта дробная шляхта і уніяцкае духавенства. Як сведчаць рапарты візітатараў школ, менавіта «паповічы»

былі ў іх самымі здольнымі і працавітымі вучнямі. Не могучы разлічваць на чыюсьці падтрымку, яны імкнуліся выбіцца на больш высокія прыступкі сацыяльнай лесвіцы толькі з дапамогай навукі. Балазе эпоха Асветніцтва ім такую магчымасць давала. «Паповічы» вылучаліся ў сярэдніх школах, выбіваліся на высокія пасады ў Віленскім універсітэце, а што самае галоўнае, – гаворыць Л.Іваноўскі, – прафесарскае прызванне лічылі сваім. Такімі былі прафесары Міхаіл Баброўскі, Ігнат Даніловіч, Платон Сасноўскі, Міхаіл Гамаліцкі, Ігнат Анацэвіч, а таксама Антон Марціноўскі.

Першыя веды малаберастaвіцкі «паповіч» набываў дома. У 9-гадовым узросце яго аддалі ў Ваўкавыскае вучылішча. Там ён паспяхова навучаўся сем гадоў (1789–1796). Па выніках 1792/93 навучальнага года атрымаў узнагароду. Прозвішча Ігната Анацэвіча лічыцца ў спісе вучняў гэтай навучальнай установы за 1796 г., аднак што яна сабой уяўляла, сёння мы звестак не маем.

Наступным крокам у навуку была акруговая школа ў Гродне – тады павятовым цэнтры Слонімскай губерні. У гэтай установе прагны да навук Ігнат навучаўся ў 1796–1797 навучальным годзе. Указам Паўла I Гродзенская акруговая школа была зачынена, і на яе базе 29 верасня 1797 г. адкрылі павятовае вучылішча, якім апекаваліся дамініканцы. Вось чаму ў літаратуры памылкова ўказваецца, што Ігнат Анацэвіч вучыўся ў Гродзенскім павятовым вучылішчы.

Далейшыя жыццёвыя шляхі павялі Ігната на Беласточчыну, якая незадоўга да таго стала Нова-Усходняй Прусіяй. Новую правінцыю сваёй дзяржавы з такой назвай стварыла Прусія на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, якая па трэцяму падзелу увайшла ў яе склад. На чале правінцыі быў пастаўлены міністр – маёр кавалерыі Фрыдэрык Леапольд барон фон Шротэр. Ён выконваў тут функцыі намесніка прускага караля Фрыдрыха II.

Для падрыхтоўкі новых педагагічных кадраў, якія бачыліся галоўным рухавіком рэформы адукацыі, міністр заснаваў пры мясцовай гімназіі ў Элку настаўніцкую семінарыю. Ігнат Анацэвіч стаў на два гады (1801–1802 г.) семінарыстам у навучальнай установе, якая рыхтавала педагогаў для Усходняй Прусіі, Беластоцкай і Плоцкай абласцей.

Методыка навучання ў Элку была эфектыўнай і энергічнай. Ахвочыя да навук семінарысты ўжо праз год гаварылі і пісалі па-нямецку, разумелі лекцыі на нямецкай мове. Настаўніцкая семінарыя таксама дала Ігнату грунтоўныя веды па лацінскай мове. Але галоўнымі прадметамі былі педагогіка і дыдактыка. Тут шліфаваліся яго педагагічныя здольнасці. Тут жа ён далучаўся да таямніц гісторыі.

Сусед Ігната па пакоі і сябар М.Стоц, успамінаючы пра яго, пісаў, што гэты высокага росту, плячысты, надзвычайнай сілы семінарыст, які гаварыў хутка і, здавалася, нібы шапялявіў, найбольш прыкладаўся да гісторыі. Пабеленыя сцены і дзверы іх пакою ён спісаў гістарычнымі фактамі і храналагічнымі табліцамі. «Гледзячы на яго, – адзначае М.Стоц, – і ў мяне з'явілася ахвота цалкам аддацца гісторыі» [3, с.114].

Праз год вучобы абодва сябры атрымалі ўзнагароду, якую прыслаў ім з Берліна міністр Шротэр. Дарэчы, дзякуючы Шротэру І.Анацэвіч атрымаў каралеўскую стыпендыю на двухгадовае навучанне ў Кёнігсбергскім універсітэце.

Сёння дакладна вядома, што ў Кёнігсберг І.Анацэвіч прыехаў у ліпені 1802 г. (хоць у літаратуры звычайна называецца 1803 г.). Здольнасці і руплівасць І.Анацэвіча былі высока ацэнены кёнігсбергскай прафесурай, што дазволіла прадоўжыць каралеўскую стыпендыю яшчэ на два гады.

Такім чынам, у 1802–1806 гадах І.Анацэвіч вывучаў педагогіку, права, фінансы, палітычную эканомію, дыпламатыю, фізіку, хімію ў Кёнігсбергскім універсітэце. Асабліва зацікавіўся, выйшаўшы на крыніцы, якіх тут знаходзілася шмат, гісторыяй Прусіі і Літвы. Па заканчэнні універсітэта ён атрымаў пасаду выкладчыка польскай мовы, пачаткаў рускай мовы, а пазней – яшчэ і пасаду афіцыйнага перакладчыка прускага караля. Аднак у 1809 годзе І.Анацэвіч пакінуў Кёнігсберг.

Сёння невядома прычына, што заставіла перспектыўнага выкладчыка і вучонага І.Анацэвіча пасля сямігадовага прабывання ў Кёнігсбергу, які адкрыў дзверы ў навуковы свет і «высокія» кабінеты, пакінуць горад назаўсёды. Можна толькі меркаваць, што гэтая прычына была грунтоўнай, бо і сам Кёнігсберг, і яго універсітэт шмат што значылі для нядаўняга «паповіча».

Каля года (1809–1810 г.) І.Анацэвіч жыў ў маёнтку М.П.Румянцава ў Гомелі, які прыняў яго гасцінна, а галоўнае, адкрыў свае багатыя зборы для навуковых пошукаў. Сам госць сваю працу ў знакамітай бібліятэцы акрэсліў наступным чанам: «Шукаў гістарычныя звесткі пра розныя правінцыі, якія належаць Расійскай дзяржаве, важныя звесткі, што датычаць літоўскай гісторыі, зрабіў значныя поспехі ў расійскай мове» [4, а.78].

1 верасня 1810 г. прагны да ведаў педагог і даследчык быў залічаны на «маральнае аддзяленне» (юрыдычны факультэт) Віленскага універсітэта. Тады яму было 30 гадоў. Слухаў курсы гісторыі, права, палітычнай эканоміі, а таксама астраноміі, фізікі, хіміі. Праз год вучобы, 24 верасня 1811 г., пасля здачы спецыяльнага экзамену атрымаў у выніку тайнага галасавання сямнаццацю галасамі «за» пры адным «супраць» званне магістра філасофіі. Было таксама аднадушна прызнана, што ён мае вялікія веды па ўсеагульнай гісторыі і асабліва па гісторыі народаў і ў гэтай сферы можа працаваць.

Улічыўшы грунтоўную падрыхтоўку новага магістра, савет Віленскага універсітэта даручыў яму выкладанне на публічных курсах для дзяржаўных служачых усеагульную гісторыю, права і палітэканомію. Першыя ж выступленні выявілі ў І.Анацэвічы здольнага і красамоўнага лектара. Гэта быў добры пачатак потым так трагічна завершанай яго працы ва універсітэце.

У 1813 г. магістр І.Анацэвіч атрымаў запрашэнне на пасаду настаўніка Беластоцкай гімназіі. У гімназіі Ігнат Анацэвіч выкладаў старажытныя мовы і літаратуру, потым французскую мову. У 1816 г. атрымаў і сваю

любімую ўсеагульную гісторыю, а таксама права і нямецкую мову, а праз год – прызначэнне на пасаду памочніка дырэктара гімназіі.

Беласток пачатку XIX ст. быў глухой правінцыяй. Адрэзаны ад навуковых асяродкаў, вучоны адчуваў сябе адзінока і сумаваў: не было патрэбнай навуковай літаратуры, захопленых навукай людзей, не хапала нават падручнікаў. Праўда, і сам ён, заняты настаўніцкай, а потым яшчэ і адміністрацыйнай працай, не мог нават і марыць пра навуковыя даследаванні – не было вольнага часу.

Але аднойчы яму вельмі пашанцавала. Падчас паездкі ў Вільню, хутчэй за ўсё па службовых справах, пазнаёміўся з незвычайным чалавекам, вучоным, намеснікам прафесара кафедры ўсеагульнай гісторыі Іаяхімам Лялевелем. Паміж імі завязалася перапіска, якая доўжылася 15 гадоў, аж да выезду І.Лялевеля ў эміграцыю. Сёння яна з'яўляецца цікавай гістарычнай крыніцай не толькі для вывучэння іх біяграфій, але і інтэлектуальнага руху эпохі, станаўлення гістарычнай навукі.

У рукапісным аддзеле бібліятэкі Вільнюскага універсітэта захоўваецца ліст І.Лялевеля, пісаны 13 чэрвеня 1816 г. да Ігната Анацэвіча ў Беласток – ці не адзін з першых у іх ліставанні. Ліст прасякнуты пачуццём павагі да беластоцкага калегі, добразычлівасці да яго, шчырага сяброўства. Не падлягае ніякаму сумненню: Лялевель бачыў у І.Анацэвічы гісторыка-прафесіянала, раўнага сабе, і імкнуўся да супрацоўніцтва з ім.

Восенню 1818 года Савет Віленскага універсітэта прызначае Ігната Анацэвіча на пасаду намесніка прафесара. Праца ў найстаражытнейшым з усходнееўрапейскіх універсітэтаў адкрывала перад гісторыкам шырокія гарызонты для навуковай і педагагічнай дзейнасці. Гэтыя магчымасці ён паспяхова выкарыстоўваў.

«Сапраўднай красой аддзялення палітычных навук быў тады Жэгота Анацэвіч, адзін з найбольш сімпатычных і заслужаных віленскіх прафесараў», – пісаў яго біёграф і даследчык гісторыі Віленскага універсітэта Людвік Яноўскі. Прыбыўшы ў Вільню (1818 г.), стаў адным са слупоў гуманітарных навук, якія стаялі нязменна ніжэй за дакладныя [навукі], і толькі спробамі і талентам плеяды, якая складалася з Даніловіча, Алдакоўскага, Галухоўскага, Анацэвіча, з Лялевелем на чале, учынілі раўнамерны стан навуковасці ў Вільні» [5, с.99]. На працягу трох гадоў, ад 20 верасня 1818 г. па 1821 г., І.Анацэвіч чытаў ва універсітэце курс усеагульнай гісторыі.

Першага сакавіка 1821 года ў выніку конкурсу І.Анацэвіч страціў кафедру і курс усеагульнай гісторыі. Савет універсітэта даручыў яму чытанне курсаў расійскай статыстыкі і дыпламатыі.

28 чэрвеня 1827 г. савет універсітэта сакрэтным галасаваннем 14-цю галасамі з 15-ці абраў І.Анацэвіча экстраардынарным прафесарам. Двума тыднямі раней І.Анацэвіч за выслугу гадоў атрымаў чын калежскага асэсара, ды якога быў прадстаўлены яшчэ ў 1819 г.

Аднак праз кароткі час І.Анацэвіча спасцігла катастрофа. Восенню 1827 года ва універсітэце была выкрыта тайная студэнцкая арганізацыя

«Патрыёты Айчыны». На допытах студэнты паказалі, што да стварэння арганізацыі іх падштурхнулі лекцыі І.Анацэвіча.

17 лютага прафесара арыштавалі ва ўласнай хаце, канфіскавалі ўсе паперы. Сярод канфіскаваных папер былі гістарычныя працы даследчыка, «абуральныя вершы і іншыя паперы заганнага зместу», перапіска, у тым ліку з канцлерам М.П.Румянцавым, і інш.

2 красавіка 1828 года адбылося пасяджэнне Савета універсітэта. Пратакол захоўваецца ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве ў Вільнюсе. Звычайны запіс у кнізе пасяджэнняў універсітэцкага савета. Незвычайны выракам: «Такога чалавека нельга цярпець ва універсітэцкім саслоўі. Каб яго ўчынак як прыклад не зрабіў спакусы ў вучнёўскай моладзі і не расстройваў парадку, з такімі цяжкасцямі і намаганнямі заведзенага...». Да атрымання санкцыі куратара і правіцеля заходніх губерняў вялікага князя Канстанціна лічыць, што І.Анацэвіч знаходзіцца пад судом [6, а.12].

14 мая паліцыя ўварвалася да яго ў хату і, не даўшы часу ўпакаваць самыя патрэбныя рэчы, а тым больш уладкаваць незавершаныя справы, схапіла і пад канвоем вывезла з Вільні. 16 мая яго даставілі ў Гродна. Гродзенскі губернатар рапартаваў тады ў Вільню аб прыняцці выгнанніка ў сваё ведамства: «Магістр філасофіі Віленскага універсітэта Анацэвіч для ўсялення на радзіме дастаўлены» [7, а.12].

17 мая ссыльнага прывезлі ў Малую Бераставіцу – цэнтр уніяцкага прыхода, у якім настаяцелем быў родны брат Ігната Міхаіл, і здалі «пад строгі паліцэйскі нагляд крынскага ключвойта». Адлучацца з месца пасялення было забаронена. Услед прыслалі з універсітэта жалаванне – 42 рублі 31 капейку серабром [7, а.4-6].

Судовы працэс над прафесарам І.Анацэвічам закончыўся 21 лютага 1836 г. Ігнат Анацэвіч ужо другі год жыў у Пецярбургу.

Атрымаўшы вырак Сената, які вызваліў яго ад суда і следства, на радзіму ён ужо не вярнуўся. Разлічваць на атрыманне там працы не прыходзілася. Найлепшае, чаго мог чакаць, – гэта жыццё на міласэрным, але чужым хлебе беднага святара Міхаіла ў Малой Бераставіцы. Вяртацца ў Вільню, пазбаўленую універсітэта, не мела сэнсу. Пецярбург жа прываблівaў сталічнымі архівамі і бібліятэкамі – добрым месцам для навуковай працы. Спадзяваўся таксама з дапамогай сваіх сувязяў у навуковым свеце атрымаць тут якуюсьці пасаду.

Дзякуючы пратэкцыі пецярбургскіх сяброў, пазбаўлены сродкаў існавання прафесар атрымаў пасаду ў толькі што створанай Археаграфічнай камісіі з акладам 1500 рублёў асігнацыямі (400 сярэбраных рублёў у год). Сярод членаў гэтай камісіі І.Анацэвіч вылучаўся як найбольш актыўны і падрыхтаваны навуковец.

З 1834 г. Ігнат Анацэвіч, паралельна з працай у Археаграфічнай камісіі, выконваў абавязкі памочніка бібліятэкара Румянцаўскага музея. Пасля смерці колішняга Ігнатавага апекуна Мікалая Пятровіча Румянцава (1754 –1826 г.) яго унікальная калекцыя: кнігі, рукапісы, творы мас-

тацтва, нумізматычныя калекцыі, археалагічныя і этнаграфічныя матэрыялы – была перавезена з Гомеля ў Пецярбург і на яе аснове ў 1831 г. заснаваны Румянцаўскі музей.

18 лютага 1845 г. у 10 гадзін раніцы Ігната Анацэвіча не стала. Да апошняга моманту ён захоўваў свядомасць. Сціплае пахаванне яго адбылося на Смаленскіх могілках 20 лютага.

Аб'ектыўна ацаніць прафесара Ігната Анацэвіча як гісторыка і яго ўклад у беларускую гістарычную навуку, на наш погляд, немагчыма без адказу на два пытанні. Па-першае, наколькі грунтоўна ён даследаваў гісторыю сваёй Айчыны? Па-другое, што зроблена ім у гэтым накірунку?

Даследчыкі спадчыны вучонага галоўнай яго заслугай лічаць шматгадовую працу над гісторыяй Літвы. У чытача, незнаёмага з яго працамі, можа скласціся ўражанне, што ён даследаваў гісторыю Літвы ў сучасным разуменні. І тады залічэнне Ігната Анацэвіча да першых прафесійных айчынных гісторыкаў, як гэта робіць Міхась Біч, можа здацца грубай нацяжкай. Але нацяжкі тут няма.

Працуючы над гісторыяй Літвы, прафесар І.Анацэвіч меў на ўвазе Літву ў гістарычным разуменні, а менавіта Вялікае княства Літоўскае, эканамічным, культурным і ў значнай ступені палітычным ядром якога былі беларускія землі. За доказам гэтага няма патрэбы хадзіць далёка. Адным з першых раздзелаў яго працы «Погляд на гісторыю Вялікага княства Літоўскага» з'яўляецца невялікі, але вельмі красамоўны раздзел «Межы краю». У ім гаворыцца: «Сёння да ліку літоўскіх губерняў адносяцца толькі Віленская і Гродзенская. Літва ж гістарычная мела межы ад Дзвіны, Дона, Волгі і Днястра аж да Балтыйскага мора» [8, с.8]. Вось над гісторыяй гэтай Літвы, адной з самых значных у XIII – XV ст. дзяржаў Еўропы, якая ляжала на памежжы усходне- і заходнееўрапейскай цывілізацый, і працаваў амаль усё жыццё Ігнат Анацэвіч.

Ідэя стварыць капітальную працу па гісторыі Вялікага княства Літоўскага, а гэта значыць, па гісторыі беларускага і літоўскага народаў, хутчэй за ўсё ўзнікла ў І.Анацэвіча ў 1818 – 1921 гадах, калі ён быў прафесарам кафедры ўсеагульнай гісторыі. «Пакуль не будзе дакладнай і грунтоўна распрацаванай гісторыі паасобных народаў, – заяўляў І.Анацэвіч, – думаць пра дасканалую ўсеагульную гісторыю немагчыма» [9, с.270]. Кожны народ, на яго думку, павінен разумець адметнасць гістарычнага шляху сваіх продкаў і сваю адметнасць «у лабірынце іншых народаў».

Менавіта ў гэтыя гады прафесар І.Анацэвіч увёў у навучальную праграму курса ўсеагульнай гісторыі важную навацыю. Гісторыя Вялікага княства Літоўскага разглядалася да яго ў курсе ўсеагульнай гісторыі, які чытаўся 4 гадзіны ў тыдзень, і гублялася ў моры інфармацыі. Па ўласнай ініцыятыве і бескарысліва Ігнат Анацэвіч распрацаваў асобны курс айчыннай гісторыі і чытаў яго па паўтары гадзіны ў тыдзень. Гэта быў першы спецыяльны універсітэцкі курс, прысвечаны мінуламу беларускага і літоўскага народаў. Варта адзначыць, што І.Лялевель насцярожана ставіўся да такога роду лекцый. Такое ж стаўленне да курса гісторыі беларускага

народа характэрныя і для кіраўніцтва Віленскага універсітэта гэтых гадоў. У архіве захаваліся звесткі, якія сведчаць, што адміністрацыя універсітэта часта не давала для чытання гэтага курса аўдыторый, і прафесару І.Анацэвічу прыходзілася чытаць яго студэнтам на карыдоры. Такім чынам, прафесар І.Анацэвіч быў у поўным сэнсе гэтага слова піянерам у распрацоўцы курса гісторыі беларускага і літоўскага народаў.

І.Анацэвіч распрацаваў сваю класіфікацыю крыніц па гісторыі ВКЛ ад старажытнасці да 1569 г., выдзеліўшы наступныя іх групы: міжнародныя трактаты, Метрыка ВКЛ і Кароны, судовыя акты і акты капітул, «Хроніка...» Мацея Стрыйкоўскага, «Гісторыя Літвы» Войцеха Каяловіча, трактат Міхалона Літвіна «Аб норавах татар, ліцвінаў і маскавітаў», Галіцка-валынскі летапіс 2-й паловы XIII ст., тайны архіў крыжакоў. Важнымі гісторык лічыў таксама «нямыя помнікі», да якіх адносіў руіны замкаў, пахаванні, рэшткі адзення і зброі, урочышчы (напрыклад, гара Міндоўга пад Навагрудкам), народныя песні. Вучоны даў характарыстыку гэтых груп крыніц.

І.Анацэвіч даў перыядызацыю гісторыі Літвы ад першага ўпамінання гэтай назвы ў 1009 г. да 1569 г. Ён падзяліў яе на наступныя пяць перыядаў:

1009 – 1183 гады – міфічная гісторыя, якая пачынаецца ад першага летапіснага ўпамінання Літвы.

1183 – 1240 гады – няпэўная гісторыя: ад нападаў Літвы на рускія краіны, а менавіта Пскоў і Ноўгарад, да панавання Міндоўга.

1240 – 1386 гады – больш пэўная гісторыя. Змест першай паловы гэтай эпохі складаюць «вялікія клопаты ад крыжакоў». У другой палове, ад панавання Гедыміна, Літва набірае моц і сілу. Гэта эпоха доўжыцца да часоў увядзення Ягайлам хрысціянскай веры.

1386 – 1447 гады – Літва, пераадолеўшы раздробленасць, знаходзіцца на вяршыні магутнасці.

1447 – 1569 гады – пераход пад уладу Польшчы. Пасля Люблінскага сейма «асобная гісторыя Літвы завяршаецца», і яна «ўліваецца ў гісторыю Польшчы» [10, с.7-8].

У сваіх працах прафесар І.Анацэвіч стварыў цэласную арыгінальную навуковую карціну гісторыі ВКЛ ад старажытнасці да канца XVI ст. Некаторыя элементы распрацаванай ім канцэпцыі пазнейшая беларуская і літоўская гістарыяграфія паклала ў аснову ўласнага бачання далюблінскай гісторыі сваёй краіны і народа. Працай ва універсітэце і навуковымі публікацыямі вучоны рабіў беларускую і літоўскую гісторыю набыткам многіх людзей. Ён быў першым, хто ўздымаў іх гістарычную культуру. Уведзены ім у навуковае абарачэнне фактычны матэрыял стаў хрэстаматыйным і сёння ўваходзіць у падручнікі гісторыі. «Найвялікшы ў нас знаўца літоўскай гісторыі, які ў яе разуменні мог узняцца над голымі фактамі, ахапіць яе цалкам у сувязі з дзейнасцю іншых народаў і падвергнуць суровай крытыцы яе сумнення нормы», – канстатаваў выдаўца пецярбургскага «Rocznika Literackiego» [10, старонка без нумарацыі].

Французскі гісторык Агюстэн Ц'еры сцвярджаў у 1822 годзе, што менавіта гісторыя накладзе свой адбітак на XIX стагоддзе і дасць яму сваё імя, як філасофія дала сваё імя стагоддзю XVIII. Прафесар І.Анацэвіч быў адным з першых беларусаў, якія XIX стагоддзе рабілі стагоддзем гістарычнай навукі ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе.

Напярэдадні важнага і адказнага этапу свайго этнагенезу – этапу складвання ў нацыі – беларусы і літоўцы дзякуючы руплівай працы прафесара І.Анацэвіча былі недалёкія ад таго, каб займець уласную раннюю нацыянальную гісторыю, убачыць сваё месца на еўрапейскай сцэне. Абставіны не далі яму магчымасці завяршыць сваю працу. Час быў упушчаны, змянялася грамадска-палітычная сітуацыя. Беларуская гістарыяграфія, якая толькі пачала падаваць свой голас, была зацiснутая паміж больш моцнай расійскай і польскай гістарыяграфіяй. Гэта паспеў адчуць і сам гісторык, які 30 студзеня 1839 г. пісаў з Пецярбурга Адаму Йохеру пра «вельмі неспрыяльныя часы», калі набірае сілу тэндэнцыя забараніць друкаванне твораў, «якія дазваляюць пазнаць веліч працы і здольнасць нашых продкаў».

Літаратура і крыніцы

1. Біч М. Аб нацыянальнай канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. // Беларускі гістарычны часопіс. – Мінск. – 1993. – №1.

2. Латышонак А. Народзіна беларускай нацыянальнай ідэі // Спадчына. – 1999. – №1.

3. Stoc M. Kilka slyw o szkolach Polskich za Pruss poludniowych // Orkdownik naukowy. – 1845. – № 13.

4. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Пецярбургу. Ф. 1151. Воп. 2. – 1835 г. Спр. 52. Арк.58.

5. Janowski L. W promeniach Wilno i Krzemenca. – Wilno, 1923.

6. Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф.721. Воп. 1. Спр. 1195. Арк. 11 адв. – 12

7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне. Ф.1. Воп. 3. Спр. 186. Арк. 2.

8. Onacewicz Ï. Rzut oka dzieje Wielkiego Ksikstwa Litewskiego // Pamiktnik Naukowo-Literacki (Wilno). – 1849. – T. 1.

9. Onacewicz Ï. Uwagi nad historia powszechna // Magazyn Powszechny. – 1840. – № 12.

10. Onacewicz Ï. Rzut oka na pierwotne dzieje Litwy // Rocznik Literacki. – 1846. – T.3.

В. Кушнер, галоўны рэдактар «Беларускага гістарычнага часопіса», г. Мінск

БЕЛАРУСКАЯ ГІСТАРЫЧНАЯ НАВУКА: ДАСЯГНЕННІ І НОВЫЯ МІФЫ

У гэтых нататках аўтар не мае на мэце зрабіць якісьці ўсеабдымны аналіз развіцця беларускай гістарычнай навукі пасля абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь, бо зрабіць такі аналіз надзвычай складана, ды і будзе ён вельмі суб'ектыўным. Таму выкажу некаторыя меркаванні, падставай для якіх з'яўляецца знаёмства з найбольш значнымі навуковымі і навукова-метадычнымі працамі беларускіх гісторыкаў і краязнаўцаў, а таксама падручнікамі і дапаможнікамі па гісторыі для вучняў агульнаадукацыйных навучальных устаноў і ВНУ.

Развал СССР і стварэнне незалежных дзяржаў спрыяла таму, што гістарычная навука перастала быць монацэнтрычнай, калі кірункі навуковых даследаванняў, тэматыка акадэмічных і універсітэцкіх даследаванняў, доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый зацвярджалася ў Маскве. Новыя палітычныя, ідэалагічныя і адукацыйныя задачы, якія паўсталі ў сувязі з распадам адзінай дзяржавы і адмаўленнем ад адзінай метадалогіі – марксізма-ленінізма, знікненнем ідэалагічнага ціску з боку кіраўніцтва КПСС–КПБ прывялі да пэўнай разгубленасці сярод выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін ВНУ і настаўнікаў і разам з тым вымусілі кіраўнікоў Акадэміі навук, Міністэрства адукацыі і навукі звярнуцца да навукоўцаў і выкладчыкаў ВНУ з прапановай аб стварэнні «Нацыянальнай канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь». Творчы калектыў узначаліў таленавіты вучоны і змагар за беларускае Адраджэнне, доктар гістарычных навук, намеснік дырэктара Інстытута гісторыі АН Беларусі па навуковай рабоце Міхась Восіпавіч Біч (1937 – 1999). Былі вызначаны найважнейшыя прынцыпы нацыянальнай канцэпцыі:

· дэпартызацыя і дэідэалагізацыя гістарыяграфіі як галоўная перадумова яе навуковасці;

· гістарычныя, агульначалавечыя і нацыянальна-дзяржаўныя каштоўнасці як крытэрый ісціны і ацэнкі гістарычных падзей, фактаў, дзеячаў;

· плюралістычная метадалогія, якая грунтуецца на творчым засваенні розных тэорый сусветна-гістарычнага працэсу, найперш – на спалучэнні цывілізацыйнага і інфармацыйнага падыходаў;

· разуменне айчыннай гісторыі як арганічнай часткі еўрапейскай і сусветнай гісторыі;

· параўнальны гістарычны падыход з выяўленнем спецыфічнага і агульнага ў сусветнай, рэгіянальнай і айчыннай гісторыі;

· адлюстраванне ў навуковых даследаваннях і, па магчымасці, у навучальных дапаможніках дыскусійных праблем, асноўных канцэпцый і інш.

У выніку шматлікіх і вострых дыскусій, якія вяліся на навуковых канферэнцыях з удзелам расійскіх, украінскіх, польскіх, літоўскіх гісторыкаў, на старонках такіх беларускіх грамадска-палітычных і літаратурных выданняў як часопісы «Спадчына», «Маладосць», «Полымя», а з 1993 г. новастварэных «Беларускага гістарычнага часопіса» і «Беларускай мінуўшчыны», былі вызначаны галоўныя праблемы і тэмы айчыннай гісторыі, якія ў савецкай гістарыяграфіі асвятляліся часта тэндэнцыйна, таму неабходна было прынцыпова перагледзець іх на аснове новых метадалагічных падыходаў і фактаў, выяўленых у раней засакрэчаных фондах партыйных і дзяржаўных архіваў.

Адной з такіх праблем, якая і сёння мае вялікую навуковую і палітычную значнасць, з'яўляецца праблема паходжання беларускага этнасу. Пры вывучэнні яе доўгія гады бясспрэчным з'яўляўся дагматычны тэзіс аб утварэнні ў IX–XII стагоддзях адзінай старажытнарускай народнасці, якая з'яўляецца «калыскай трох братніх народаў – рускага, украінскага і беларускага». Пры гэтым яшчэ з дарэвалюцыйных часоў рускаму народу адводзілася роля старэйшага брата. Падчас навуковых дыскусій было прызнана неабходным з новых метадалагічных падыходаў разглядаць гісторыю Полацкага, Тураўскага, Менскага і іншых самастойных княстваў IX – XIII ст. на тэрыторыі Беларусі, якія паклалі пачатак гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

Утварэнне Вялікага княства Літоўскага, на думку многіх беларускіх навукоўцаў – гэта працэс складвання беларуска-літоўскай (літоўска-беларускай) дзяржавы, вызначальная роля ў якой належала менавіта насельнікам беларускіх зямель. Гэта была поліэтнічная і поліэлігійная дзяржава, якая на аснове добраахвотнасці (пры першаступенным імкненні шляхты ВКЛ) аб'ядналася ў 1569 годзе з Каралеўствам Польскім у канфедэратыўную дзяржаву Рэч Паспалітую. Расійскія, польскія, літоўскія даследчыкі маюць свае пункты гледжання па гэтай праблеме, аднак амаль усіх іх аб'ядноўвае намаганне прынізіць ролю беларусаў у гісторыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай. На аснове як ранейшых, так і новых міфаў яны імкнуцца даказаць, што Беларусь у сваёй палітыцы павінна арыентавацца менавіта на іх краіны.

Беларускімі даследчыкамі былі прааналізаваны вынікі і вызначаны новыя кірункі даследаванняў па гісторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі і гісторыі Беларусі савецкага перыяду. Менавіта з новых метадалагічных падыходаў у 1993 г. пачалося выданне першай нацыянальнай «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (т.1–6, Мн., 1993–2003), а ў 1996 г. выйшаў першы том «Беларускай энцыклапедыі» (т.1–18, Мн., 1996–2004). Сёння ўжо пабачыў свет і першы том «Энцыклапедыі ВКЛ».

Былі ўнесены істотныя змены ў шматтомнае серыйнае выданне энцыклапедычнага характару гісторыка-дакументальных хронік раёнаў і гарадоў Беларусі «Памяць». Выданне хронік пачалося ў 1985 г. выдавецтвам «Беларуская энцыклапедыя імя П.Броўкі», завершана ў 2005 г., вый-

шла 146 кніг. Такой унікальнай серыі, як «Памяць», не мае ніводная дзяржава былога СССР.

Можна пагадзіцца з многімі крытычнымі заўвагамі ў адрас гэтых энцыклапедычных выданняў, але галоўная іх каштоўнасць у тым, што упершыню створаны унікальныя, менавіта беларускія нацыянальныя энцыклапедычныя выданні, у нашу гісторыю вернуты тысячы забытых імёнаў, ушанавана памяць дзесяткаў тысяч беларусаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, разглядаемай у кантэксце другой сусветнай вайны, іншых войнах і ўзброеных канфліктах. Надзвычай важным з'яўляецца і тое, што да вывучэння і напісання гісторыі роднай зямлі, свайго народа прычыніліся многія тысячы людзей з усіх куткоў нашай Радзімы, а таксама навукоўцы іншых краін і беларусы, якія воляй лёсу апынуліся за межамі сваёй Бацькаўшчыны.

У выніку палітычных змен, якія адбыліся пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі, сталі больш даступнымі навуковыя даследаванні прадстаўнікоў беларускай эміграцыі, якія жывуць у ЗША, Канадзе, Вялікабрытаніі і беларускай дыяспары ў краінах былога СССР. Важную ролю ў пашырэнні навуковых і грамадскіх кантактаў адыгралі грамадскія аб'яднанні «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына», заснаванае 6 сакавіка 1990 г. у Мінску і Міжнародная асацыяцыя беларусістаў (створана 25 мая 1991 г.). На жаль, у апошнія гады дзейнасць гэтых аб'яднанняў значна звузілася па многіх прычынах. У 1991 і 1994 гг. выйшлі з друку тры выпускі артыкулаў, дакументаў і ўспамінаў пад назвай «З гісторыяй на «Вы», у 1991 і 1993 гг. два выпускі зборніка «Скарыніч». У 1993 г. для даследавання і папулярызацыі гісторыі беларусаў у Беластоку (Польшча) было створана Беларускае гістарычнае таварыства, якое выдае «Bielaruskie zeszyty historyczne» («Беларускія гістарычныя сшыткі»). На старонках гэтага выдання выступаюць навукоўцы і краязнаўцы Рэспублікі Беларусь.

У 1993–1994 гг. у Беларусі выйшлі з друку працы польскага даследчыка Ю.Туронка «Беларусь пад нямецкай акупацыяй» (Мн., 1993), Я.Найдзюка і І.Касяка «Беларусь учора і сёння» (Мн., 1993), А.Калубовіча «Крокі гісторыі» (Мн., 1993) і «На крыжовай дарозе» (Мн., 1994), В.Кіпеля «Беларусы ў ЗША» (Мн., 1993), успаміны і дыялогі «На суд гісторыі» (Мн., 1994) і інш. Сведчаннем збліжэння з беларускай эміграцыяй стала абранне М.Кандрацюка віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, А.Цеханавецкага – яе ганаровым членам, М.Белямука, стваральніка і выдаўца часопіса «Полацак» у Кліўлендзе (ЗША) у 1990-я гады – ганаровым членам Інстытута гісторыі НАН Беларусі, В.Кіпеля, дырэктара Беларускага Інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Йорку – ганаровым доктарам Гродзенскага універсітэта імя Янкі Купалы, а вядомага гісторыка і палітычнага дзеяча Я.Запрудніка – ганаровым доктарам БДУ.

Значную цікавасць выклікалі працы беларускіх даследчыкаў Б.Сачанкі «Беларуская эміграцыя» (2 выд., Мн., 1991), Л.Прančака «Беларуская Амерыка» (Мн., 1994), артыкулы А.Мальдзіса, А.Ліса, Г.Сяргеевай, В.Кушнера і іншых даследчыкаў, змешчаныя ў часопісах «Спадчына»,

«Беларускі гістарычны часопіс», «Беларуская мінуўшчына», «Беларускі гістарычны агляд», «Кантакты і дыялогі» і іншых выданнях, у цэнтральных і рэгіянальных газетах.

На жаль, у гэты час на старонках спачатку перыядычнага друку, а потым і ў афіцыйных дакументах укараніўся міфалагічны падзел на краіны «блізкага» і «далёкага» замежжа. У аснову яго быў узяты палітычны прынцып: так, беларусы, якія жывуць у ФРГ, ці Францыі, – гэта беларусы далёкага замежжа, а ў Казахстане, ці Сібіры, – гэта ўжо беларусы блізкага замежжа. Зусім неясна, да якога замежжа трэба аднесці Польшчу, Літву, Латвію.

Рэзкая змена палітычных і навуковых арыенціраў у пачатку 1990-х гадоў наклала свой адбітак і на абагульняльныя працы. Першай такой працай у беларускай, ужо нацыянальнай, гістарыяграфіі навейшага часу можна назваць «Нарысы гісторыі Беларусі» ў дзвюх частках (Мн., 1994–1995). Яны былі падрыхтаваны калектывам навукоўцаў Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі пад кіраўніцтвам дырэктара Інстытута гісторыі М.Касцюка і выйшлі пад яго рэдакцыяй. У нарысах на аснове выкарыстання новых археалагічных і архіўных матэрыялаў, статыстычных і іншых крыніц, манаграфічных прац беларускіх і замежных даследчыкаў падаецца гісторыя Беларусі ад старажытных часоў да прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у 1994 годзе.

Аўтары нарысаў імкнуліся пераасэнсаваць праблемы этнагенезу, станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці, міжнацыянальных і міжканфесійных адносін, узаемадачыненняў з суседнімі краінамі і народамі, ранейшыя погляды на праблемы нацыянальна-вызваленчай і класавай барацьбы, кіруючай ролі Камуністычнай партыі і камуністычнай ідэалогіі ў развіцці беларускага грамадства. Аналізуюцца маладаследаваныя ў той час праблемы таталітарнай сістэмы, стварэння, ліквідацыі і аднаўлення шматпартыйнай палітычнай сістэмы, праблемы беларускай дыяспары. Называюцца многія новыя імёны беларускіх дзеячаў мінулых эпох і савецкага перыяду, раней безпадстаўна забытыя ў нашай гісторыі.

Нарысы выклікалі вострую крытыку навукоўцаў і палітыкаў, якія засталіся на ранейшых метадалагічных пазіцыях, або мелі іншыя падставы быць незадаволенымі выхадам гэтай працы. Нарысы па гісторыі Беларусі сталі першым вучэбным дапаможнікам, рэкамендаваным Міністэрствам адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь для студэнтаў ВНУ.

У 1998 г. таксама ў якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў ВНУ была выдадзена «Гісторыя Беларусі» ў дзвюх частках пад рэдакцыяй Я.Новіка і Г.Марцуля. Дапаможнік меў іншую ад «Нарысаў» структуру падачы матэрыялаў, значна больш увагі надавалася аналізу розных падыходаў і канцэпцый у асвятленні гісторыі Беларусі, пытанням знешняй палітыкі, культуры, міжнацыянальных і міжканфесійных адносін. Больш глыбока асвятляюцца праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ва ўмовах правядзення рыначных рэформ, крызіс аднапартыйнай савецкай сістэмы, узнікненне і дзейнасць палітычных партый і палітычнай апазіцыі ў

Рэспубліцы Беларусь. У кожнай главе ёсць грунтоўныя вывады і спіс рэкамендаванай літаратуры.

У 1998 г. выйшла з друку і праца навукоўцаў і выкладчыкаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта І.Коўкеля і Э.Ярмусіка «История Беларуси с древнейших времен до нашего времени». У 1998 – 2005 гг. выйшлі 8 выданняў гэтай працы, яна атрымала высокую ацэнку выкладчыкаў не толькі ВНУ рэспублікі, але і вядомасць у Расійскай Федэрацыі і Польшчы.

Да сказанага патрэбна дадаць, што ў 2001 годзе гродзенскімі гісторыкамі падрыхтаваны і выдадзены з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь вучэбны дапаможнік «Гісторыя Беларусі: з 1795 г. да вясны 1917» для студэнтаў гістарычных факультэтаў ВНУ рэспублікі. Акрамя названых вышэй аўтараў, у яго падрыхтоўцы прынялі ўдзел В.Белазаровіч, І.Крэнь, Н.Паўлючэнка і іншыя. Вучэбны дапаможнік выйшаў у свет пад рэдакцыяй прафесараў І.П.Крэня і І.І.Коўкеля. Зараз рыхтуецца яго другое выданне.

Новым словам у выкладанні айчыннай гісторыі ў ВНУ рэспублікі з'явілася падрыхтоўка і выданне гродзенскімі і мінскімі гісторыкамі курса лекцый па гісторыі Беларусі ў двух частках. Частка першая ахоплівае перыяд са старажытных часоў да канца XVIII ст. (кіраўнік аўтарскага калектыва прафесар І.П.Крэнь, а частка другая – XIX – XX ст. (кіраўнік аўтарскага калектыва прафесар П.І.Брыгадзін).

Пасля абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь у асабліва цяжкім становішчы апынуліся вучні і настаўнікі агульнаадукацыйных навучальных устаноў. У 1991 г. творчым калектывам пад кіраўніцтвам М.Біча была распрацавана і 30 лістапада гэтага года апублікавана ў «Настаўніцкай газеце» «Канцэпцыя гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе». Ставілася задача стварэння нацыянальнай школы і нацыянальнага зместу адукацыі, як асновы нацыянальна-культурнага адраджэння беларускага этнасу. На аснове рэкамендацый навукоўцаў Вярхоўны савет прыняў новую дзяржаўную сімволіку – бела–чырвона–белы сцяг і герб «Пагоня».

Міністэрства адукацыі і навукі пад кіраўніцтвам М.Дзямчука, а затым В.Гайсёнка прыкладала вялікія намаганні па стварэнні новых базавых праграм і вучэбных дапаможнікаў па айчыннай гісторыі. Аўтару гэтых радкоў у той час давялося працаваць начальнікам аддзела грамадскіх навук Міністэрства, удзельнічаць у рэфармаванні гістарычнай адукацыі, і можна з адказнасцю сказаць, што толькі дзякуючы самаадданасці і патрыятызму беларускіх навукоўцаў, многія з якіх самі працавалі ў агульнаадукацыйнай школе, удалося вырашыць гэтую надзвычай складаную задачу. Ужо ў 1993 г. былі выдадзены вучэбныя дапаможнікі Г.Штыхава і У.Пляшэвіча для 5–6-га класаў, П.Лойкі для 7-га класа, М.Біча для 8-га, У.Сідарцова і В.Фаміна для 9-га класа. Гэта быў першы, а таму і самы цяжкі крок у стварэнні беларускіх нацыянальных падручнікаў. З сённяшняга пункту гледжання іх нельга назваць бездакорнымі, але, думаецца мне, сваю станоўчую ролю яны адыгралі.

Даволі плённымі для беларускай гістарычнай навукі і гістарычнай адукацыі былі першыя пяць гадоў XXI стагоддзя. Навукоўцы Інстытута гісторыі НАН Беларусі і некаторых ВНУ завяршылі працу «Археалогія Беларусі» (т.1–4. Мн., 1997–2001), прадаўжаецца выданне «Гісторыі Беларусі» ў 6-ці тамах. Даследчыкі ваеннай гісторыі ў 2004–2005 гг., калі адзначалася 60-годдзе вызвалення Беларусі і 60-годдзе заканчэння Вялікай Айчыннай і другой сусветнай войнаў, выдалі такія працы, як «Беларусь в годы Великой Отечественной войны: уроки истории и современность. Материалы международной конференции, посвященной 60-й годовщине освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков. Минск, 29–30 июня 2004 г.» (Мн., 2004); «Беларусь в годы Великой Отечественной войны» (Мн., 2005); «Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны», «Вялікай Перамозе ў Вялікай вайне – 60» (Гродна, 2005). Вынікам шматгадовай карпатлівай і настойлівай працы беларускага навукоўца Б.Далгатовіча стала даследаванне «Военачальники земли белорусской. Энциклопедический справочник» (Мн., 2005). Заслугоўваюць увагі, але разам з тым патрабуюць крытычнага асэнсавання такія працы, як «Армия Победы против вермахта» (М. – Мн., 2005); Бешанов В.В. «Танковый погром 1941 года (Куда исчезли 28 тысяч советских танков)» (Мн., 2005); яго ж «Десять сталинских ударов» (М. – Мн., 2005); Шуньков В.Н. «Вермахт» (Мн., 2004) і інш.

Важнае адукацыйнае і выхаваўчае значэнне мае вывучэнне гісторыі Другой сусветнай вайны ва ўсіх тыпах навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь. Шматгадовы вопыт выкладання айчыннай гісторыі ў ВНУ, сустрэчы з настаўнікамі, метадыстамі, прыём экзаменаў і залікаў у студэнтаў дазваляе аўтару гэтага артыкула зрабіць вывад, што вельмі многія студэнты і вучні слаба ведаюць асноўныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны, не могуць назваць даты вызвалення сваіх гарадоў, абласных і раённых цэнтраў ад акупантаў, расказаць пра тых Герояў Савецкага Саюза, военачальнікаў, удзельнікаў партызанскага руху, чые імёны носяць вуліцы, дзе яны жывуць, нават аб такіх як Г.Жукаў, К.Ракасоўскі, М.Гастэла, П.Машэраў, П.Панамарэнка, В.Казлоў і інш.

Таму ўвядзенне курса па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ва ўсіх тыпах навучальных устаноў у 2003/2004 навучальным годзе з'яўляецца неабходным, мае вялікае выхаваўчае значэнне. Створаны вучэбныя дапаможнікі: «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа у кантэксце Другой сусветнай вайны» (пад рэд. А.Кавалені, М.Сташкевіча) (Мн., 2004); «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» (пад рэд. Ю.Бохана, В.Кушнера) (Мн., 2005); Мяснікоў А. «Вялікая Айчынная вайна» (Мн., 2005) і інш. У 2006 годзе пабачыць свет і слоўнік-даведнік «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)», падрыхтаваны аўтарамі-складальнікамі А. Каваленяй, М. Красновай, У. Лемяшонкам.

Таму вельмі важна не пераўтварыць вывучэнне гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў чарговую «юбілейную кампанію». Зняцце гэтага кур-

са з вучэбнай праграмы будзе вялікай ідэалагічнай памылкай. У той жа час неабходна адмовіцца ад старых і не ствараць новыя міфы ў асвятленні гісторыі Вялікай Айчыннай і другой сусветнай войнаў. Даследчыкі павінны акцэнтаваць увагу не толькі на рашаючых бітвах, іх выніках і значэнні для Перамогі, на гераізме народа ў вайне – безумоўна, гэты кірунак будзе заставацца галоўным – але і на вялікіх цяжкасцях, у пераадоленні якіх набывала моц Чырвоная Армія, здабывалася перамога ў тых ці іншых бітвах, развіваўся шырокі партызанскі і антыфашысцкі рух. Трэба разумець, што многія ранейшыя формы патрыятычнага выхавання (сустрэчы з ветэранамі, паходы па месцах былых баёў і інш.) цяпер даюць вельмі невялікі вынік, асабліва ў старшых класах і сярод студэнцкай моладзі. Найбольш актуальнымі для моладзі з'яўляюцца вострыя пытанні: Чаму і па якіх рэальных, а не міфалагічных, прычынах СССР фактычна паказаўся непадрыхтаваным да вайны? Чаму цана Перамогі была такой вялізарнай? Як ваявалі савецкія палкаводцы – колькасцю ці ўменнем? Чаму подзвігі абаронцаў Брэсцкай крэпасці замоўчваліся на працягу 20 гадоў? На ўсе гэтыя і іншыя пытанні неабходна даваць праўдзівыя адказы.

Адной з асаблівасцей развіцця беларускай гістарычнай навукі пасля абвяшчэння незалежнасці з'яўляецца павышэнне ролі рэгіянальных навуковых школ. Калі раней бясспрэчнымі лідэрамі з'яўляліся Інстытут гісторыі НАН Беларусі, гістарычныя факультэты Беларускага дзяржаўнага універсітэта і Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка, то цяпер можна гаварыць пра значныя поспехі, якія маюць даследчыкі гісторыі Віцебскага, Гродзенскага, Гомельскага, Магілёўскага універсітэтаў, краязнаўцы гэтых рэгіёнаў.

Вельмі значнымі, на наш погляд, з'яўляюцца дасягненні гродзенскай гістарычнай школы, ядро якой складаюць выкладчыкі кафедры гісторыі Беларусі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта. Заснавальнікам яе па праву можна лічыць прафесараў Якава Навумавіча Мараша і Барыса Маркавіча Фіха. Першы з верасня 1946 г. працаваў у Гродзенскім педагагічным інстытуце (з 1978 г. Гродзенскі універсітэт). Яму выпаў складаны асабісты і навуковы лёс, але менавіта грунтоўная праца Я.Мараша «Из истории борьбы народных масс Белоруссии против экспансии католической церкви», яго доктарская дысертацыя па гэтай праблеме (абаронена ў 1973 г.), манаграфічныя работы «Ватикан и католическая церковь в Белоруссии (1569–1795)» (Мн., 1971); «Очерки истории экспансии католической церкви в Белорусии XVIII в.» (Мн., 1974); «Политика Ватикана и католической церкви в Западной Белоруссии (1918–1939)» (Мн., 1983) заклалі аснову самай моцнай у СССР навуковай школы па вывучэнню гісторыі і палітыкі каталіцызму на землях Усходняй Еўропы і, у прыватнасці, беларускіх землях. У цесным кантакце з прафесарамі Б.М.Фіхам і Я.Марашам працаваў і адзін з іх вучняў, выпускнік Гродзенскага педагагічнага інстытута Іван Платонавіч Крэнь, які ў 1959 – 1967 гг. быў дырэктарам шэрагу школ у Радунскім і Воранаўскім раёнах, затым старшым выклад-

чыкам, дацэнтам, з 1990 г. загадчыкам кафедры гісторыі. З 1995 г. прафесар І.Крэнь стаў дэканам факультэта гісторыі і культуры універсітэта. Дзякуючы яго намаганням як загадчыка кафедры, а затым дэкана значна ўмацаваліся сувязі з Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі рэлігіі, Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеям, архіўнымі ўстановамі, дзяржаўнымі органамі і грамадскімі арганізацыямі. Рэгулярнымі сталі сувязі з навуковымі ўстановамі Польшчы, перш за усё Беластока. Значна пашырылася тэматыка навуковых даследаванняў. Вялікім поспехам гродзенскіх навукоўцаў стала правядзенне шэрагу міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных навуковых канферэнцый і выданне іх матэрыялаў, гісторыка-культурнай серыі «Наш радавод» (кн. 1–7, Гродна, 1990–1996), рэдактарам-складальнікам якой з'яўляецца прафесар Дз.Караў. Паспяхова абаранілі доктарскія дысертацыі А.Краўцэвіч, С.Куль-Сяльверстава, С.Марозава, В.Швед.

З 2001 г. гістарычны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта ўзначальвае доктар гістарычных навук, прафесар А.Нечухрын. На факультэце працуюць 8 дактароў і прафесараў, 38 кандыдатаў навук, дацэнтаў. Асноўнымі кірункамі навуковых даследаванняў з'яўляюцца гісторыя Заходняй Беларусі і, у прыватнасці гісторыя каталіцкага касцёла і ўніяцкай царквы, дзейнасць Арміі Краёвай, гісторыя Гродзеншчыны, метадалогія гісторыі, крыніцазнаўства. Супрацоўнікі факультэта, перш за ўсё кафедры гісторыі Беларусі, прымалі актыўны ўдзел у стварэнні гісторыка-дакументальных кніг «Памяць» Гродзенскай вобласці. Цяпер археолагі універсітэта інтэнсіўна даследуюць зону рэканструкцыі Аўгустоўскага канала. Вядзецца вялікая праца па стварэнню вучэбных дапаможнікаў для ВНУ і навучальных устаноў, якія даюць агульную і спецыяльную сярэднюю адукацыю. Гродзенская гістарычная школа мае грунтоўныя напрацоўкі, вялікі вопыт, высокакваліфікаваныя кадры і добрыя перспектывы далейшай работы.

Хацелася б акцэнтаваць увагу на такой актуальнай праблеме, як пераемнасць і стабільнасць. Цяпер вельмі важна не ламаць праграмы курсаў па гісторыі Беларусі і ўсеагульнай гісторыі ў ВНУ і сярэдніх навучальных установах, а ўдасканальваць іх змест і выдаваць новыя вучэбныя дапаможнікі з улікам ужо назапашанага вопыту. Вывучэнне гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай і, перш за ўсё, еўрапейскай цывілізацыі ў цеснай сувязі з гісторыяй бліжэйшых суседзяў спрыяе глыбокаму ўсведамленню агульнасці лёсу ўсіх народаў, якія стагоддзямі пражываюць на беларускіх землях, усебаковаму асэнсаванню інтэрнацыянальнай сутнасці беларускай культуры, вытокаў талерантнасці і калектывізму як рыс беларускага нацыянальнага характару.

Варта звярнуць увагу і на вывучэнне праблем, якія сёння з'яўляюцца надзвычай актуальнымі і трактаванне якіх ужо набывае міфалагічны характар. Адна з такіх праблем – фактычна двуадзіная праблема нацыянальнай дзяржаўнасці і дзяржаўнай ідэалогіі. Навукоўцы і палітыкі многіх

краін звяртаюць увагу на тое, што у працэсе эканамічнай глабалізацыі, нягледзячы на тое, што дзяржаўныя межы становяцца ўсё больш празрыстымі, ствараюцца розныя эканамічныя і палітычныя аб'яднанні, наднацыянальныя органы, адбываецца значнае ўзмацненне нацыяналізму. На гэтай глебе абвастраюцца міжэтнічныя і міжканфесійныя канфлікты, прыкладаў чаму вельмі шмат. Так, пасля тэрарыстычных актаў 11 верасня 2001 г. прэзідэнт ЗША Дж.Буш узвёў прынцып «Амерыка перш за ўсё» ў ранг новай дзяржаўнай ідэалогіі. У КНР адбыліся бурныя маніфестацыі пратэсту з нагоды выхаду ў Японіі новых школьных падручнікаў, у якіх абяляюцца злачынствы японскіх мілітарыстаў у Кітаі падчас другой сусветнай вайны.

Варта звярнуць увагу і на тое, што сёння ў значнай ступені міфалагізуецца і тэзіс пра «брацкае славянскае адзінства». Разам з тым відавочна, што ўсё выразней абазначаюцца контуры рускай нацыянальнай ідэі – захаванне і ўмацаванне Расіі як вялікай, федэратыўнай, магутнай эканамічнай, палітычнай і ваеннай дзяржавы, аднаго з важнейшых цэнтраў сусветнай цывілізацыі. Таму невыпадкова, што адной з праблем, якая выклікае цікавасць з боку студэнтаў і вучняў і адначасова цяжкасці для выкладчыкаў у яе тлумачэнні – гэта праблема стварэння саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі і перспектыў беларускай дзяржаўнасці.

На сустрэчах кіраўнікоў Беларусі і Расіі самага высокага рангу пастаянна сцвярджаецца, што працэс будаўніцтва саюзнай дзяржавы «ўвайшоў у сваю рашаючую фазу». Створаны Пастаянны камітэт саюзнай дзяржавы, зацвярджаецца бюджэт, ёсць шэраг камісій у рамках Парламенцкага сходу Саюза, сярод якіх і камісія па падрыхтоўцы канстытуцыйнага акта. Неаднаразова ў Беларусі і Расіі праводзіліся навуковыя, навукова-практычныя канферэнцыі, круглыя сталы і тэлемасты з удзелам вядомых палітыкаў, вучоных, юрыстаў Беларусі, Расіі і іншых краін, напісаны манаграфічныя даследаванні, абараняюцца доктарскія і кандыдацкія дысертацыі, выходзяць саюзныя перыядычныя выданні. Заяўляецца, што за 10 гадоў пройдзены вялікі шлях ад супольнасці Беларусі і Расіі да дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, аднак пакуль дакладна не вызначаны асноўныя прынцыпы будаўніцтва і формы гэтай саюзнай дзяржавы.

На думку кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі, у аснову яе стварэння павінны быць пакладзены прынцып Еўрапейскага саюза: увядзенне адзінай грашовай сістэмы, свабоднае перамяшчэнне грамадзян і іх працаўладкаванне, узгадненне заканадаўчых актаў, каардынацыя знешняй і абарончай палітыкі і інш.

У якасці «пробнага шара» ў некаторых расійскіх СМІ і нават выступленні дэпутатаў Дзяржаўнай Думы закідваецца ідэя ўключэння Беларусі ў склад Расійскай Федэрацыі са статусам яшчэ адной федэральнай акругі, на чале якой будзе беларус, або некалькіх губерняў. Кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь адстойвае прынцып дзяржаўнай незалежнасці, права нашай краіны самастойна вызначаць сваю эканамічную, фінансавую, знешнюю палітыку.

Сёння ўжо відавочна, што Садружнасць Незалежных Дзяржаў (СНД) фактычна перажывае глыбокі крызіс, усё большае значэнне набывае Еўрапейска-азіяцкая эканамічная супольнасць. Таму многія праблемы саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, якія яшчэ пяць, ці, нават, тры гады таму разглядаліся і прапагандаваліся як хутка вырашальныя, цяпер набываюць больш складаны характар. Студэнты і настаўнікі ставяць канкрэтныя пытанні: якім будзе будучы саюз Беларусі і Расіі: саюзам дзвюх раўнапраўных дзяржаў, федэрацыяй, або канфедэрацыяй? Ад адказу на гэтае пытанне залежыць і адказ на пытанне пра дзяржаўную ідэалогію і яе асновы – ці гэта будуць нацыянальныя інтарэсы, ці прынцыпы славянскага адзінства, альбо прынцыпы інтэрнацыяналізму.

Калі беларускія навукоўцы і палітыкі не будуць даваць праўдзівыя адказы на гэтыя і многія іншыя вострыя і супярэчлівыя пытанні, то зноў паўтарыцца сітуацыя, калі наша гісторыя пісалася ў іншых краінах і з пазіцый іх інтарэсаў.

Таму вельмі важнае значэнне мае стварэнне беларускай нацыянальнай гістарычнай школы і рэгіянальных навуковых школ, распрацоўка нацыянальнай канцэпцыі гістарычнай навукі і гістарычнай адукацыі. Неабходна ісці па шляху аб'ектыўнага вывучэння і прапаганды гісторыі, а не міфалагізаваць яе пад уплывам тых ці іншых палітычных падзей.

А.М. Літвін, Інстытут гісторыі НАНБ, г. Мінск

ЗАХОДНІ РЭГІЁН Ў АДЛЮСТРАВАННІ ДАКУМЕНТАЎ БЕЛАРУСКАЙ АКРУГІ УНУТРАНЫХ ВОЙСКАЎ НКУС СССР (красавік 1944 – чэрвень 1946 гг.)

1. Мэтай дадзенага выступлення з'яўляецца прыцягнене ўвагі даследчыкаў да дакументальных крыніц часцей і злучэнняў Инсвойскаў НКУС СССР, якія дыслакаваліся і выконвалі баявыя задачы на тэрыторыі Беларусі ў 1944 – 1946 гг. Да апошняга часу гэтыя матэрыялы былі на сакрэтным захоўванні і з'яўляліся фактычна незапатрабаванымі даследчыкамі ваеннага і пасляваеннага часу. Масіў гэтых дакументаў знаходзіцца на захаванні ў Расійскім дзяржаўным ваенным архіве (РДВА – РГВА), былы Расійскі дзяржаўны архіў Савецкай Арміі (РДАСА – РГАСА) ў г.Маскве, вуліца адмірала Макарава, 29.

2. Гісторыя войскаў НКУС СССР – гэта асобная старонка гісторыі нашай былой дзяржавы. Аб дзейнасці гэтых дзяржаўных структур, якія прызваны выконваць спецыфічныя функцыі па ахове бяспекі і правапарадку, у літаратуры і грамадскай свядомасці маюцца розныя ацэнкі, пры-

чым часам рэзка палярныя. Нагадаем, што напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў склад войск НКУС СССР уваходзілі: Унутраныя войскі НКУС СССР (злучэнні і часці аператыўнага прызначэння), Канвойныя войскі НКУС СССР, Пагранічныя войскі НКУС СССР, Чыгуначныя войскі НКУС СССР, Войскі НКУС па ахове асабліва важных аб'ектаў, войскі Урадавай (ВЧ) сувязі. Усяго ў войсках НКУС СССР налічвалася 173,9 тыс. чалавек, у тым ліку аператыўныя войскі – 41,9 тыс., па ахове чыгуначных дарог – 63,7 тыс., па ахове асабліва важных прадпрыемстваў прамысловасці – 29,3 тыс., канвойныя войскі – 38,2 тыс. чалавек [1]. Падчас вайны адбываліся пэўныя змены ў структуры, колькасным складзе і падпарадкаванасці войскаў НКУС, таму, улічваючы абмежаваныя памеры артыкула, гаворка ў ім будзе ісці толькі аб дакументах і матэрыялах Унутраных войскаў НКУС СССР.

Афіцыйная назва ўнутраныя войскі з'явілася 4 студзеня 1942 г., калі загадам НКУС СССР № 0053 войскі аператыўнага прызначэння былі пераіменаваны ва ўнутраныя войскі, а Упраўленне аператыўных войскаў НКУС СССР было пераіменавана ва Упраўленне УВ НКУС СССР. У мэтах узмацнення кіраўніцтва аховай тылу Дзеючай Чырвонай Арміі ў красавіку 1942 г. Упраўленне УВ НКУС СССР было перафарміравана ў Галоўнае упраўленне Унутраных войскаў па ахове тыла Дзеючай Чырвонай Арміі.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны УВ НКУС СССР складаліся з дывізій, асобных стралковых брыгад і асобных палкоў (мотастралковых, стралковых і кавалерыйскіх) Да пачатку 1942 г. Унутраныя войскі НКУС СССР налічвалі: 7 мотастралковых і 5 стралковых дывізій, 1 артылерыйскую брыгаду, 3 мотастралковых і 3 стралковых палкі, 1 асобны стралковы батальон, 1 асобную стралковую роту, 8 вайсковых вучылішчаў і школ. Штатная колькасць войскаў складала 151779 чалавек [2].

3. Храналагічныя рамкі дадзенага артыкула ахопліваюць перыяд з вясны 1944 г., калі Чырвоная Армія на поўдні Беларусі вызваліла першыя раёны Заходняй Украіны і частку тэрыторыі Заходняй Беларусі. Для барацьбы з бандытызмам у заходніх абласцях УССР, БССР, а таксама ў Прыбалтыйскіх рэспубліках былі створаны ўпраўленні Украінскай, Беларускай і Прыбалтыйскай акругаў унутраных войскаў. У пачатку красавіка 1944 г. была ўтворана Беларуская акруга ўнутраных войскаў НКУС СССР.

Упраўленне УВ НКУС СССР Беларускай акругі было сфарміравана 30 красавіка 1944 года ў Гомелі, у адпаведнасці з загадам НКУС СССР № 00390 ад 5 красавіка 1944 г. На ўпраўленне акругі ускладаліся каардынацыя і аб'яднанне кіраўніцтва баявой і службова-аператыўнай дзейнасці войскаў акругі. Галоўнай задачай унутранных войскаў і упраўлення акругі былі ліквідацыя бандытызму і агентуры нямецкай разведкі ў Беларусі, забеспячэнне парадку тыла часцей Чырвонай Арміі. Начальнікамі упраўлення войскамі акругі былі: генерал-маёр Кісялеў Васіль Іванавіч (5.04.1944 – 12.07.1945 г.) і генерал-лейтэнант Марчэнкаў (12.07.1945 –

06.1946 г.), а начальнікамі штаба палкоўнікі – Клокаў Прохар Васільевіч (12.04.1944 – 19.12.1944 г.) і Лявіцкі Васіль Мітрафанавіч (14.02.1945 – 06.1946 г). Першапачаткова ў склад акругі ўвайшлі: упраўленне акругі, 6-я стралковая дывізія УВ НКУС СССР (камандзір дывізіі палкоўнік Малікаў Мікалай Цімафеевіч), 7-я мотастралковая дывізія УВ НКУС СССР (камандзір – палкоўнік Серыкаў Дзмітрый Емельянавіч) і 287-ы стралковы полк УВ НКУС СССР (камандзір – падпалкоўнік Кузняцоў Андрэй Іванавіч.) [1]. У канцы ліпеня 1944 г. у склад акругі ўвайшла таксама 10-я стралковая дывізія УВ НКУС СССР (камандзір – палкоўнік Шыраеў Рыгор Міхайлавіч)

6-я стралковая дывізія УВ НКУС СССР была сфарміравана ў студзені 1942 г. у г. Калініне ў адпаведнасці з загадам НКУС СССР № 0021 ад 5.01.1942 г. Дывізія выконвала задачы па нясенню гарнізоннай службы ў вызваленых ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў гарадах, барацьбе з варожымі дэсантамі, бандыцкімі і дыверсійнымі групамі і аднаўленні «рэвалюцыйнага» парадку на вызваленай тэрыторыі. Да красавіка 1944 г. знаходзілася пад непасрэдным кіраўніцтвам Галоўнага упраўлення УВ НКУС СССР, а з 5.04.1944 г. (загад № 00390 ад 5.04.1944 г.) увайшла ў падпарадкаванне Начальніка упраўлення унутраных войскаў Беларускай акругі. У ліпені 1944 г. Упраўленне і часці дывізіі былі перадыслакаваны на тэрыторыю Беларусі, дзе прымалі актыўны ўдзел у ліквідацыі бандытызму на тэрыторыі Магілёўскай, суседняй Смаленскай, Мінскай і Вілейскай абласцей. У кастрычніку 1944 г. у яе склад уваходзілі: упраўленне дывізіі, 135 (падпалкоўнік Харчанка), 136 (падпалкоўнік Чувакоў), 139 і 262 стралковыя палкі. На тэрыторыі Беларусі часці дывізіі дыслакаваліся да яе расфарміравання ў кастрычніку 1945 г. (Загад НКУС СССР № 001164 ад 4.10.1945 г.)

7-я мотастралковая дывізія войск НКУС СССР была сфарміравана ў студзені 1942 г. у г. Туле. Як і 6-я стралковая дывізія да красавіка 1944 г. непасрэдна падпарадкоўвалася ГУ УВ НКУС, а затым Начальніку Упраўлення ўнутраных войскаў Беларускай акругі. З 15 лютага 1942 г. па 15 лістапада 1944 г. дывізія ўваходзіла ў склад Дзеючай Чырвонай арміі і з 15.02.1942 г. па 22.04.1944 г. несла службу па ахове тыла Заходняга, а з 23.04.1944 г. па 15.11.44 г. і 2-га Беларускага фронта. Выконваючы ўскладзеныя на яе абавязкі, дывізія прайшла шлях ад Тулы да Пінска.

З пачатку 1944 года часці дывізіі дыслакаваліся на тэрыторыі Беларусі і выконвалі задачы па ахове важных аб'ектаў і ліквідацыі бандфарміраванняў на тэрыторыі Гомельскай, Палескай, Пінскай, часткі Мінскай, Брэсцкай і Баранавіцкай абласцей. Аб тым, як выкарыстоўваліся часці 7-й мсд і 287 сп напярэдадні аперацыі «Баграціён», бачна з наступнага дакумента штаба Беларускай акругі ўнутраных войскаў НКУС ад 16 чэрвеня 1944 г.:

УТВЕРЖДАЮ

НАРКОМ ВНУТРЕННИХ ДЕЛ БССР КОМИССАР ГОС. БЕЗОПАСНОСТИ
/БЕЛЬЧЕНКО/
16 июня 1944 года.

НАЧАЛЬНИК ВНУТРЕННИХ ВОЙСК НКВД БЕЛОРУССКОГО ОКРУГА ГЕНЕРАЛ-МАЙОР
/КИСЕЛЕВ/
16 июня 1944 года.

ПРЕДЛОЖЕНИЯ
О ПЕРЕДИСЛОКАЦИИ ЧАСТЕЙ 7 МОТО-СТРЕЛКОВОЙ ДИВИЗИИ И 287 СП ВНУТРЕННИХ ВОЙСК БЕЛОРУССКОГО ОКРУГА.

В целях повышения результативности борьбы и последующего изъятия враждебных элементов в ряде районов БССР, наведения жесткого революционного порядка, предупреждения и пресечения возможной диверсионной и террористической деятельности со стороны ставленников и пособников немецкой разведки в районах действия тылов фронта, приближения частей 7 МСД и 287 СП к районам предстоящего продвижения частей КА и наведения на территории этих районов после освобождения их от немецких оккупантов – соответствующего порядка в духе требований приказа НКВД СССР № 0021 от 5.01.1942 г. и инструкции Начальникам гарнизонов ВВ НКВД, считать необходимым и своевременным произвести следующую передислокацию частей 7 МСД и подразделений 287 СП:

264 СП

Один стрелковый батальон – ЧЕЧЕРСК (6050)

Один стрелковый батальон – БУДА-КОШЕЛЕВСКАЯ (4030)

Штаб полка, спецподразделения и один стрелковый батальон – временно ГОМЕЛЬ (1060).

287 СП

Один стрелковый батальон – РОСЛАВЛЬ (8090)

Штаб полка, спецподразделения и два стрелковых батальона – ГОМЕЛЬ (1060)

12 СП

Штаб полка, спецподразделения и один стрелковый батальон – МОЗЫРЬ (7050)

Один стрелковый батальон – КАЛИНКОВИЧИ (5080)

Один стрелковый батальон – ЕЛЬСК и Ельский район (4040)

ПРИМЕЧАНИЕ: – При штабе полка иметь в полной готовности 6 автомашин, рассчитанных для выброски по оперативным соображениям и обстановки в районы боевой оперативно-служебной деятельности подразделений полка подвижного резерва в количестве 100 человек.

265 СП

Штаб полка, спецподразделения и один стрелковый батальон – ХОЙНИКИ (5000)

Один стрелковый батальон – БРАГИН (4010)

Один стрелковый батальон – МУХОЕДЫ (1060), ДЕРНОВИЧИ (2080), ДОВЛЯДЫ (1090), штаб батальона в ДОВЛЯДЫ.

32 МСП

Штаб полка, спецподразделения и один стрелковый батальон – КЛИНЦЫ (4040)

Два стрелковых батальона, один из них выводится из района действий по ликвидации бандгрупп «УПА» – РЕЧИЦА (0020)

НАЧАЛЬНИК ШТАБА ВВ НКВД ВО
ПОЛКОВНИК /КЛОКОВ/
НАЧАЛЬНИК 1-го ОТДЕЛА ШТАБА ВВ НКВД ВО
МАЙОР /РЕБРОВ/ [2]

У кастрычніку 1944 г. у склад дывізіі ўваходзілі: упраўленне дывізіі (штаб размяшчаўся ў г.Пінске, камандзір палкоўнік Серыкаў); 12 сп (г.Пінск, падпалкоўнік Бардзін. Батальёны палка: 1-ы (Іванава, капітан Барышнікаў), 2-і (Целеханы, ст.лейтэнант Курачка), 3-і (Драгічын, капітан Ланухін); 264 сп (Лунінец, маёр Капасоўскі. Батальёны: 1-ы (Давыд-Гарадок, капітан Палуян), 2-і (Столін, капітан Папугаеў), 3-і (Ганцавічы, капітан Круць); 265 сп (Брэст, маёр Курдзюкоў. Батальёны: 1-ы (Маларыта, капітан Ганчароў, 2-і Дывін, капітан Цітаранка); 284 сп (Баранавічы, маёр Крынкін. Батальёны: 1-ы (Навагрудак, маёр Беляеў, 2-і (Стоўбцы, капітан Лагер), 3-і (Ляхавічы, ст.лейтэнант Сумцоў), 6 стралковая рота (Івянец, лейтэнант Шалатонаў) [3]. У кастрычніку 1945 года 7 мсд была перафарміравана ў 7 стралковую дывізію ў складзе 12, 265 і 284 стралковых палкоў [3]. З 25 чэрвеня 1946 г. упраўленне дывізіі знаходзілася ў Мінску.

У якасці прыклада інфармацыі, якая маецца ў матэрыялах фондаў дывізіі, прывядзем звесткі з аператыўнай зводкі №23 штаба 7-й стралковай дывізіі начальніку УВ Беларускай акругі за перыяд з 25 верасня 1944 па 10 кастрычніка 1944 г.:

Начальнику ВВ Белорусского округа
Оперсводка № 23
за период с 25.09 по 10.10.1944 г. штадив 7 г. Новогрудок
Карта 200.000-42

Обстановка

а) Обстановка на участках гарнизонов частей и подразделений дивизии за отчетные 15 дней характеризовалась нижеследующими данными:

По гарнизонам 12 сп /Пинская область/

...По данным Столинского РО НКВД в районе Ситиц /6070/, 30 км восточнее Пинск, скрывается группа дезертиров КА до 10 человек и одиночки бандиты.

2.10.1944 г. для поиска и задержания дезертиров и одиночек бандитов в район Ситиц от 3 /батальона/ 12 сп была выслана 7 ср численнос-

тью 60 человек под командой командира роты лейтенанта Садильникова. В результате 3-х дневной работы задержано 3 бандита одиночки и 9 дезертиров КА.

По данным местных жителей в районе Отвержичей (6090), 5 км северо-восточнее Столин, скрывается группа дезертиров до 20 человек.

3.10.44 г.для поиска и задержания дезертиров вышеуказанный район от 3/12 сп была выслана 9 ср численностью 30 человек под руководством командира роты лейтенанта Толоконникова. В результате проведенной работы задержано 10 дезертиров КА.

По данным Давид-Городокского РО НКВД в районе х.Колбики (5020), Храпунь (3030) оперирует вооруженная банда «УПА» численностью до 300 человек.

5.10.44 г.для уточнения данных в вышеуказанный район была выслана разведка в составе 9 ср численностью 100 человек под руководством адъютанта батальона мл.лейтенанта Витько, который 6.10.44 г.из района Мочула /6020/ донес, что данные подтведились – банда численностью до 1000 человек.

6.10.44 г. для ликвидации банды в указанный район было выброшено 3 сб и две стрелковые роты 12 сп во главе с командиром полка подполковником Бардиным и начальником УНКВД Пинской области подполковником г/б Одинцовым. Агентурно-войсковой разведкой пребывание банды на территории Давид-Городокского района подтверждалось. По непроверенным данным, эта банда из указанного района ушла на территорию Украины. В связи с неясностью обстановки, агентурная и войсковая разведка продолжается. Для уточнения данных обстановки в район действия подразделений 264 сп и 12 сп направлен начальник штаба дивизии подполковник Евдокимов.(ф.38675.оп.1.д.14.л.384)

По гарнизонам 264 сп /Гомельская,Полесская, Могилевская области/

По гарнизонам 264 сп: Гомель, Могилев, Бобруйск, Жлобин – за истекшие 15 дней бандпроявлений и бандформирований, а также террористических актов со стороны бандгрупп и прочего преступного элемента незафиксировано.

По поступившим данным в Полесское УНКВД, на территории Туровского и Лельчицкого районов Полесской области, отмечены мелкие бандгруппы из числа местных жителей, уклоняющиеся от службы в КА и бывших ставленников врага. Главари банд, вооружение и численность не установлены.

Для выявления состава формирующихся мелких банд групп, главарей, вооружения и мест их укрытия, Полесским УНКВД проводится агентурная разработка.

С целью очищения Туровского и Лельчицкого районов Полесской области от скрывающихся дезертиров КА,уклоняющихся от призыва и воинского учета, одиночек бандитов, ликвидации мелких бандгрупп и прочего преступного элемента, 8.10.44 г. в указанные районы от 1/264

сп выслана опергруппа в составе 130 человек, усиленная 2-мя расчетами 50 мм минометов и станковых пульвзводом под командованием капитана Соколова. Оперативное руководство возглавляет зам.нач.Полесского УНКВД подполковник г\б Лисовский. В район операции 8.10.44 г. выехал командир 264 сп полковник Ижик. Операция намечена на 12.10.44 г. Результат доложу дополнительно.

По гарнизонам 32 мсп и 265 сп \Барановичская область\.Для очищения Ивьевского, Юратишского, Новогрудского и Любчанского районов Барановичской области от белопольских банд, одиночек бандитов, дезертиров Красной Армии, уклоняющихся от призыва и воинского учета, в период с 25-го сентября по 10 октября 1944 г. подразделения 32 мсп, 265 сп, 1/12 сп и роты автоматчиков 264 сп в количестве 1671 человек участвовали в массовой войсковой операции. Результаты операции приводятся в разделе 11 и 111 настоящей оперсводки. В связи с проведением ряда оперативно-войсковых мероприятий в северных районах Барановичской области, отмечены случаи добровольной сдачи и явки с повинной участников белопольских банд.\Так например: 9.10.44.г.в Юратишское РО НКВД и РВК добровольно явилось 50 человек участников белопольских банд.

Значительно сократилось число уклоняющихся от призыва в КА, являвшихся базой пополнения белопольских банд.

По состоянию на 8.9.44 г., т.е. к началу операции скрывалось от воинского учета и призыва в КА – 8781 чел., по состоянию на 8.10.44 г. указанного элемента скрывается – 1282 челов. Состояние призыва на 10.10.44 г. удовлетворительное. Кроме того, по всем районам первый план госпоставок выполняется удовлетворительно.

К концу отчетного периода на учета ОББ НКВД БССР состоят белопольские бандгруппы, указанные в оперсводке № 22. По линии органов НКВД продолжается агентурная разработка банд на предмет уточнения места нахождения и ликвидации их.

б/ Авиация противника в районах дислокации гарнизонов активности не проявляла.

За период с 25.09.44 г. по 10 октября 1944 г. в результате оперативных чекистско-войсковых мероприятий:

Ликвидировано: 20 бандгрупп, общей численностью 202 человека.

В том числе: убито – 16 чел.

Ранено – 3 чел.

Пленено – 65 чел.

Добровольно сдалось – 118 человек.

Ликвидировано бандодиночек- 15 чел.

В том числе: убито – 3 чел.

Ранено – 2 чел.

Пленено – 10 чел [4].

Несумненную цікавасць прадстаўляюць матэрыялы фонда камандавання Беларускай акругі ўнутраных войскаў. Сярод іх у першую чаргу

неабходна выдзеліць розныя дырэктыўныя ўстаноўкі аб службовых задачах, арыенціроўкі аб сітуацыі на тэрыторыі заходніх абласцей, справаздачныя матэрыялы, апісанні вайсковых аперацый і г.д. Па звестках НКУС, на тэрыторыі БССР дзейнічала каля 300 банд, шмат агентаў праціўніка і яго пасобнікаў. Толькі ў 1944 г. на тэрыторыі Беларусі былі зарэгістраваны 574 бандыцкія праяўленні, 222 тэрарыстычныя акты, 11 дыверсій і 75 іншых цяжкіх злачынстваў. Галоўная небяспека зыходзіла ад дзейнасці польскага і ўкраінскага нацыяналістычнага падполля. Іх дзейнасць была пад пільнай увагай органаў НКУС і камандавання Беларускай акругі ўнутраных войскаў.

У якасці прыклада прывядзем арыенціроўку ад 9 верасня 1944 года ўпраўлення Беларускай акругі камандзірам часцей і злучэнняў аб антысавецкіх фарміраваннях, якія дзейнічалі на тэрыторыі БССР:

г. Лида 9 сентября 1944 г.

На территории западных областей Белорусской ССР оперируют националистические повстанческие белопольские бандформирования «ПОВ», представляющие собой войсковые формирования – батальоны (легионы) и бандгруппы, формируемые из местного польского населения.

Польские националистические бандповстанческие формирования, именующие себя «Польская подпольная армия», как видно из документов разгромленных штабов и показаний арестованных, созданы в 1939 году преимущественно из кадрового состава бывшей польской армии и контрреволюционных антисоветских элементов, активно ведущих борьбу против Советской власти.

«ПОВ» действует по директивам «Эмигрантского польского правительства в Лондоне».

В период немецкой оккупации, как установлено следствием, польские к/р националистические бандформирования по заданию командования и разведорганов немецкой армии вели активную борьбу против партизан и участвовали в карательных экспедициях.

С начала июньского (1944г.) наступления войск КА белопольские легионы по заданию своего командования сосредоточились в районе Вильнюса, имея целью воспрепятствовать освобождению города Вильнюс частями Красной Армии.

После освобождения частями КА гор. Вильнюс и успешного продвижения вперёд командованию белопольских легионов командованием КА было предложено объединиться с польской армией, возглавляемой генералом Берлингом, для совместных действий в борьбе с немецко-фашистскими захватчиками по освобождению Польши.

Ввиду отказа от совместных действий белопольские легионы были разоружены, однако часть из них успела скрыться и сосредоточиться в лесах Гродненской, Русской, Налибокской пущ, Барановичской области и Литовской ССР.

Часть участников легионов по заданию своего командования была отпущена по домам с задачей организовать бандитско-повстанческие

группы из числа местного польского населения для активных действий против Советской власти.

Основные задачи белопольских к/р-повстанческих и бандитских формирований:

а) Активная борьба против Советской власти.

б) Призыв к противодействию и неповиновению всего польского населения мероприятиям Советской власти в западных областях Белорусской ССР.

в) Распространение гнусной клеветы по адресу Советского правительства и Красной Армии, проведение антисоветской пропаганды среди польского населения.

г) Организация террористических актов против представителей партии и Советской власти, органов НКВД, НКГБ и военнослужащих КА.

д) Срыв мобилизации мужского населения западных областей БССР в КА и поставки конского поголовья для нужд Красной Армии.

е) Совершение диверсионных актов на железнодорожных путях, автогужмагистралях и организация нападений на проходящие транспорты КА.

Структура белопольских бандформирований:

а) Отряд от 50 до 100 человек во главе с офицером, иногда именуется батальоном. Отряды объединены и имеют своё командование, именующее себя «соединение батальонов», которое в свою очередь подчинено комендатуре Виленского округа «Краевой армии обороны» или «Польской подпольной армии», возглавляемой якобы генералом под кличкой «БОР».

Отряды делятся на дружины (отделения) во главе с «дружиновым».

б) каждому участнику банд- повстанческих отрядов после принятия им присяги-подписки, в том числе и руководящему составу, присваивается кличка.

в) Форма одежды- установленная для польской армии, значительная часть- в гражданской одежде.

Капральский и унтер-офицерский состав знаков отличия не носит, а именуется по званию и кличке.

Сказанное относится и к возведению жилья строителями области в ходе реализации идеи М.С.Горбачёва: каждой семье отдельную квартиру – к 2000 году, которая официально являлась общегосударственной Программой обеспечения нуждающихся жильём. Участвуя в её решении, коллективы Брестского коврового, Коссовского мебельного производственных объединений, Брестского электромеханического, Кобринского инструментального заводов, дорожно-строительного треста №4 разработали свои программы решения жилищной проблемы к 1995 году. А руководители и трудовые коллективы Брестского машиностроительного объединения, Пинского производственного объединения по выпуску кузнечно-прессовых и литейных автоматических линий, Пружанского радиозавода, завода «Брестсельмаш» и некоторых других планировали обеспечить своих работников жилой площадью за счёт государственных капиталовложений. Правда, на брестском заводе «Цветотрон» желающим строить индивидуальное жильё было предоставлено 128 земельных участков, денежная ссуда в размере до трёх тысяч рублей, оказана помощь в изготовлении проектно-сметной документации, строительными материалами, транспортом, техникой и т.д. Однако кооперативное и индивидуальное строительство развивалось недостаточно эффективно из-за сложных отношений с государственными службами, которые квартиры ни для себя, ни для строителей не получали. Очереди оставались большими. Например, в 1987 году в области получили квартиры 10487 семей, а встало на учёт в этот же период 12355 семей [19].

Выполнение заданий XII пятилетки в индустриальном секторе экономики на Брестчине характеризуется следующими тенденциями и показателями:

• опережающими темпами развивалось машиностроение и металлообработка, являющиеся материальной базой ускорения научно-технического прогресса и технической реконструкции всех отраслей народного хозяйства области, впрочем, как и станкостроение, приборостроение инструментальной и электронной промышленности;

• внедрены три гибкие производственные системы, 13 систем автоматизированного проектирования, 37 автоматических линий, комплексно автоматизировано 25 участков, цехов и производств, установлено 10,7 тысячи новых станков. Эти и другие мероприятия позволили снизить долю ручного труда до 20,5 %;

· разработана областная программа развития производства товаров народного потребления и сферы услуг;

· в промышленности в 1990 году за счёт внедрения достижений науки и техники получено более 70 % прироста производительности труда. Брестский завод «Цветотрон» освоил производство электронных блоков для зерноуборочных комбайнов «Дон», сигнализирующих комбайнёру о потерях зерна и технических неисправностях комбайна, не допускают перегрузок двигателя, поддерживают почти бесшумный ход и оптимальный микроклимат в кабине.

Славно потрудились строители. На Брестчине нашла поддержку инициатива коллектива отделения Белорусской железной дороги по строительству жилья хозяйственным способом. Отделение за год выполнило задание по строительству жилья [20].

Транспортники основной объём перевозок обеспечили преимущественно по железной дороге и водным путём. Автомобильным же транспортом доставка грузов осуществлялась в специальных пакетах и контейнерах. Сам город Брест – крупнейший транспортный узел по перевозке и людей всеми видами транспорта – железнодорожным, автобусным, воздушным.

Улучшилось обслуживание населения и народного хозяйства всеми видами связи, в том числе максимально полному обеспечению квартирными телефонами. К 1990 году предприятия связи получили необходимые средства механизации и автоматизации для сортировки писем, бандеролей и посылок. Более своевременно стала доставляться гражданам области периодическая печать, почта, телеграммы.

90-е годы XX столетия явились новым и плодотворным этапом в развитии индустриального облика Брестской области. В 1991 – 2000 годах производственный потенциал области включал в себя около 3 тысяч промышленных производств и предприятий, в том числе 331 на самостоятельном балансе. Наибольшее количество их приходится на традиционные машиностроение и металлообработку, деревообработку, производство строительных материалов, а также лёгкую и пищевую промышлен-

ность. Значительный удельный вес занимают отрасли, которые обеспечивают современный технический прогресс – предприятия радиоэлектроники по производству искусственных материалов, вычислительных средств, точных приборов.

Развивается и негосударственный сектор в промышленности, строительстве, на транспорте и в связи. Например, только в промышленности в 2001 году работало около 100 негосударственных предприятий и на их долю приходилось 59,8 % произведённой продукции области [21].

Таким образом, мы видим, что Брестчина вступила в XXI век с солидным индустриальным потенциалом и хорошими перспективами для его дальнейшего развития. Успешное выполнение заданий в промышленности, строительстве, транспорте и связи в 2001 – 2005 годах тому убедительное подтверждение.

Что же касается западного региона Беларуси в целом, то его вклад в индустриальный облик белорусского государства в рассматриваемые годы существенно возрос, а промышленная продукция из Гродненской и Брестской областей экспортируется в настоящее время уже в 85 стран мира. Заметно вырос индустриальный потенциал Брестской области [22], хотя в специализации западных областей Республики Беларусь кардинальных изменений не произошло.

Литература и источники

1. Гродненская правда. – 1985 – 21 декабря.

2. Там же. – 22 декабря.

3. Промышленность Гродненской области. – Гродно, 1986. – С. 12, 16, 33, 37; 50 лет Гродненской области. Статистический сборник. – Гродно, 1994. – С. 12 – 15, 21 – 27.

4. Гродно: Историко-экономический очерк / Крень И.П., Мараш Я.Н.. Ковкель И.И. и др.: Полымя, 1988. – С. 232 – 235; Іванчук Б.М. Гродзеншчына ў 1986 – 1995 г. (сацыяльна-эканамічныя пазіцыі) // 60-летие образования Гродненской области: материалы междунар. науч. конф., 3 – 4 марта 2004 г., Гродно / Отв. ред. В.А.Белозорович. – Гродно: ГрГУ, 2004. – С. 182.

5. Там же. – С. 183.

6. Там же. – С. 185.

7. Там же.

8. Там же.

9. История Беларуси в контексте европейской цивилизации: Пособие: 2 изд., испр. и расшир. / В.А. Сосна и др.; Под ред. Л.В. Лойки. – Мн.: РИВШ, 2005. – С. 292.

10. Омелько В.П. Социально-экономическое развитие Гродненской области на современном этапе. – В кн.: 60-летие образования Гродненской области: материалы междунар. науч. конф., 3-4 марта 2004 г., Гродно / Отв. ред. В.А. Белозорович. – Гродно: ГрГУ, 2004. – С. 11.

11. Там же. – С. 9.

12. Там же. – С. 12, 13.

13. Дубко А.З надзеяй на будучыню // Назаўсёды разам: Да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. – Мінск, «Беларуская энцыклапедыя», 1999. –

С. 166; Очерки истории профсоюзов Гродненщины (1905 – 2005) / Под ред. И.И. Гайдукевича, И.П. Креня. – Гродно, ГОУПП, 2005. Гродзенская праўда. – 2006 – 17 студзеня.

14. Очерки истории профсоюзов Брестчины. – Брест, УО «БГТУ», 2005. – С. 60 – 61.

15. Белорусская ССР: Брестская область. – 3-е изд., перераб. и доп. – Мн.: Беларусь, 1987. – С. 200 – 2003.

16. Там же. – С. 62.

17. Там же. – С. 63.

18. Там же. – С. 64.

19. Там же. – С. 68 – 69.

20. Заламай У. Брэстчына на парозе 21 стагоддзя // Назаўсёды разам: Да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. – Мінск, Беларуская энцыклапедыя, 199. – С. 161.

21. См. Абрамаў І.М. Тэндэнцыі развіцця эканомікі // Беларусь на мяжы тысячыгоддзяў. – Мн.: БелЭН, 2000. – С. 252 – 261.

І.І. Коўкель, ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ І АРГАНІЗАЦЫЙ ПА СТВАРЭННЮ БЕЛАРУСКАЙ АРМІІ (1917 – 1920 гг.)

Адной з асноўных мэтаў усіх нацыянальных рухаў, праз якія прайшлі амаль усе народы свету, здабыўшыя сваю дзяржаўнасць, было стварэнне сваіх нацыянальных узброеных сіл, якія з'яўляліся апорай і гарантам іх станаўлення, а пасля абароны незалежнасці і суверэнітэту. Не быў выключэннем у гэтым плане і беларускі нацыянальны рух, які значна актывізаваўся пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі. Хаця на першапачатковым этапе беларускія палітычныя партыі і арганізацыі, якія спачатку групаваліся вакол Беларускага нацыянальнага камітэта (БНК), а пасля – Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый (ЦРБА), дамагаліся толькі аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўнай рэспублікі, але іх кіраўнікі разумелі, што рэалізаваць нават гэтую ўрэзаную праграму яны не змогуць без апоры на свае ўласныя ўзброеныя сілы. Таму яшчэ летам 1917 г. яны пачалі дамагацца ад Часовага ўрада дазволу на фарміраванне беларускіх нацыянальных часцей у складзе расійскай арміі. Надзею на гэта ім давала тое, што Часовы ўрад дазволіў ужо фарміраванне польскіх, украінскіх і латышскіх часцей. Але, як пазней пісаў у сваёй брашуры «Беларускі рух ад 1917 да 1920 г. Кароткі агляд» адзін з тагачасных лідэраў беларускага нацыянальнага руху Я.Варонка, Керэнскі не даў згоды «нават на арганізацыю беларусаў ваенных у зямляцтвы» [3, с. 5].

Аднак сітуацыя хутка змянілася. У кастрычніку 1917 г. Часовы ўрад і Вярхоўнае камандаванне расійскай арміі змянілі стаўленне да фарміра-

вання нацыянальных часцей. 16 кастрычніка 1917 г. выконваючы абавязкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага генерал-лейтэнант М.Духонін, каб спыніць разлажэнне войск, прапанаваў Часоваму ўраду прыступіць у лістападзе да перафарміравання арміі на нацыянальна-тэрытарыяльнай аснове. Часовы ўрад прыняў гэтую прапанову, і Духонін даў згоду на правядзенне з'езда беларусаў-вайскоўцаў Заходняга фронта [6, с. 50].

Да гэтага часу ў расійскай арміі, у тым ліку на Заходнім фронце, ужо існавала шырокая сетка беларускіх зямляцтваў, гурткоў і таварыстваў, якія настойліва вялі працу па пашырэнню нацыянальнай самасвядомасці сярод воінаў-беларусаў [6, с. 45 – 48]. Гэта дазволіла хутка і аператыўна склікаць з'езд. Задачу аблегчыла тое, што разам з ім праходзілі III з'езд БСГ і другая сесія ЦРБА [8, с. 139]. Іх дэлегаты-вайскоўцы і склалі асноўнае ядро ўдзельнікаў з'езда. На ім прысутнічалі таксама прадстаўнікі Балтыйскага флота, Паўночнага і Румынскага франтоў, якія ўваходзілі ў кіруючыя органы БСГ і ЦРБА [6, с. 50].

З'езд, абмеркаваўшы палітычную сітуацыю ў Беларусі, заклікаў гуртаваць сілы, «каб беларускі народ змог заняць месца ў Расійскай федэратыўнай (саюзнай) дэмакратычнай рэспубліцы як роўны з роўнымі», запатрабаваў абавязковага ўдзелу баларускіх прадстаўнікоў у міжнароднай мірнай канферэнцыі [8, с. 140]. Улічваючы пагрозу цэласнасці Беларусі з боку Германіі, Польшчы, Літвы і Латвіі, а таксама магчымыя сумныя наступствы дэмабілізацыі расійскай арміі, ён прызнаў утварэнне беларускага войска «крайне неабходным і безадкладным» [8, с. 140].

Для кіраўніцтва справай арганізацыі беларускага войска 24 кастрычніка 1917 г. з'езд стварыў часовую Цэнтральную Беларускую Вайсковую Раду (ЦБВР), абраў яе выканаўчы камітэт. Старшынёй камітэта стаў прапаршчык С.Рак-Міхайлоўскі, яго намеснікамі – паручнік К.Езавітаў і малодшы ўнтэр-афіцэр Я.Мамонька [6, с. 51].

Пакольк Цэнтральная Рада беларускіх арганізацый была рэарганізавана ў Вялікую Беларускую Раду (ВБР), то ЦБВР стала яе аўтаномнай арганізацыяй, а яе выканаўчы камітэт увайшоў у склад выканаўчага камітэта ВБР. Яго ўзначаліў таксама, беларускі вайсковец – капітан В.Адамовіч (бацька) [6, с. 51].

Пазней, калі адбыліся з'езды воінаў-беларусаў іншых франтоў: Паўночнага (у другой палове лістапада 1917 г.), Паўднёва-Заходняга і Румынскага (снежань 1917 г.), іх выканкамы таксама ўвайшлі ў склад выканкамаў ЦБВР і ВБР. У выніку, яны сталі шматлікімі і ўплывовымі арганізацыямі беларускага нацыянальнага руху [8, с. 140].

З першых дзён свайго існавання Цэнтральная Беларуская Вайсковая Рада актыўна ўключылася ў працу па стварэнню беларускай арміі. У яе складзе было створана 6 аддзелаў: вайсковых фарміраванняў, агітацыі, палітычны, культурна-асветны, фінансавы і гаспадарчы. Галоўнае месца сярод іх займаў аддзел вайсковых фарміраванняў. Яго ўзначаліў генерал-лейтэнант К.Кандратовіч [6, с. 52].

У канцы кастрычніка 1917 г. дэлегацыя выканкама ЦБВР у складзе С.Рак-Міхайлоўскага, К.Кандратовіча, М.Ярушэвіча і І.Шчэрбы наведала стаўку Вярхоўнага галоўнакамандвання, дзе вяла перагаворы з генералам М.Духоніным аб стварэнні беларускага войска. Духонін спачатку не даў адказу на прапановы і патрабаванні ЦБВР, але праз некалькі дзён выслаў тэлеграму, у якой выказаў згоду на фарміраванне беларускіх часцей [6, с. 52].

Па дамоўленасці з Духоніным спачатку меркавалася сфарміраваць беларускі полк у Мінску, а пазней – асобны Беларускі корпус, па ўзору польскага. Кіруючыся дасягнутымі дамоўленасцямі генерал Кандратовіч распрацаваў арганізацыйныя мерапрыемствы па рэалізацыі намечаных планаў [6, с. 52].

Фарміраванне Беларускага корпуса планавалася на аснове рэарганізацыі вайсковых дружын, якія фарміраваліся па тэрытарыяльнаму прынцыпу і ў якіх знаходзілася многа беларусаў. Так, напрыклад, у 401 Мінскай дружыне, якая складалася з 800 чалавек, 650 былі беларусамі. Аналагічным было становішча ў Віленскай, Віцебскай і інш. беларускіх дружынах. Іх і планавалася ператварыць у беларускія батальёны і палкі, якія склалі б аснову Беларускага корпуса. Пазней меркавалася папоўніць яго боездольнымі беларускімі франтавымі часцямі [6, с. 55 – 56].

Аднак пасля кастрычніцкіх падзей у Петраградзе гэтыя планы былі парушаны. 9 лістапада 1917 г. распараджэннем Савета Народных Камісараў РСФСР генерал Духонін быў вызвалены ад абавязкаў Вярхоўнага галоўнакамандуючага і на яго месца прызначаны прапаршчык – бальшавік М.Крыленка. Прадстаўнікам ЦБВР і ад яго ўдалося атрымаць дазвол на фарміраванне беларускіх часцей. Але гэта выклікала актыўнае супрацьдзеянне камандуючага Заходняга фронта А.Мяснікова, абранага на гэтую пасаду Франтавым з'ездам Саветаў, і Аблвыканкамзаха – краёвага органа Савецкай улады, утворанага ў другой палове лістапада 1917 г. на аснове з'ездаў Саветаў Заходняй вобласці і фронта. Яны настойліва патрабавалі ад Крыленкі адмяніць дазвол на фарміраванне нацыянальных войск. Свае дамаганні яны матывавалі перашкодамі, якія чынілі легіянеры польскага корпуса Доўбар-Мусніцкага ў ажыццяўленні першых рэвалюцыйных пераўтварэнняў, асабліва ў рэалізацыі Дэкрэта аб зямлі [8, с. 140 – 150]. Мясцовыя памешчыкі, у пераважнай большасці палякі, карыстаючыся размяшчэннем у сваіх мясцовасцях польскіх войск, запрашалі ў свае памесці легіянераў, якія бралі іх пад сваю ахову і жорстка распраўляліся з камбедамі, калі тыя спрабавалі канфіскаваць памешчыцкія землі і падзяліць іх паміж беззямельнымі і малазямельнымі сялянамі.

2 снежня 1917 г. пытанне аб фарміраванні нацыянальных войск разглядалася на сесіі Аблвыканкамзаха. Выступаючы на ёй прадстаўнік ЦБВР, балтыйскі матрос В.Муха настойліва патрабаваў дазволіць фарміраванне беларускіх вайсковых часцей. Сутыкнуўшыся, аднак, з адмоўнай рэакцыяй большасці ўдзельнікаў сесіі, ён прапанаваў не даваць тады дазволу нікому, у тым ліку палякам. Аблвыканкамзах падтрымаў яго прапанову і

прыняў рашэнне распусціць польскі корпус і забараніць фарміраванне беларускіх часцей [6, с. 57 – 58].

Прымаючы такое рашэнне, члены Аблвыканкамзаха добра ведалі, для чаго беларускія дзеячы фарсіруюць фарміраванне беларускіх часцей, асабліва беларускага палка ў Мінску, з якой мэтай склікаецца Усебеларускі з'езд і якую ролю ў яго арганізацыі адыгрвае Цэнтральная Беларуская Вайсковая Рада. Ім удалося пераканаць Крыленку, які адмяніў сваё рашэнне аб фарміраванні нацыянальных войск і выдаў загад, забараняючы правядзенне ў прыфрантавой паласе з'ездаў і іншых палітычных мерапрыемстваў [6, с. 57]. 5 снежня 1917 г. Савет Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронта, абмеркаваўшы даклад К.Ландара прыняў рашэнне распусціць ЦБВР, а яе кіраўкікоў аддаць пад суд Рэвалюцыйнага Трыбунала [6, с. 57].

Але ажыццявіць роспуск ЦБВР Аблвыканкамзаху не ўдалося. СНК РСФСР даў згоду на правядзенне Усебеларускага з'езда, і ён распачаў сваю работу 5 снежня 1917 г. у Мінску. Цэнтральная Беларуская Вайсковая Рада да гэтага часу спяшалася закончыць фарміраванне беларускага палка. У пачатку снежня 1917 г. у Мінску ўжо знаходзілася 350 салдат і афіцэраў, гатовых уступіць у беларускае войска. Але яны былі прыпісаны да розных часцей, дзе атрымоўвалі паёк і забеспячэнне. 150 з іх былі размешчаны ў казармах 2-й запасной пяхотнай брыгады, 200 – у 101-м тылавым этапе [6, с. 64]. Кіраўнікі ЦБВР імкнуліся сабраць іх у адно месца і падпарадкаваць свайму камандаванню. Быў ужо назначаны і камандзір 1-га беларускага палка – палкоўнік Манцывода [6, с. 60].

Камандуючы Заходняга фронта А.Мяснікоў усімі мерамі супрацьдзейнічаў фарміраванню беларускага палка, але ЦБВР не здавалася. Тады Мяснікоў прапанаваў уключыць усіх беларускіх салдат і афіцэраў у 289 запасны полк, які адыграў значную ролю ва ўстанаўленні Савецкай улады ў Мінску. Кіраўнікі ЦБВР згадзіліся на гэтую прапанову, разлічваючы распрапагандаваць полк і падпарадкаваць яго свайму камандаванню [6, с. 64].

Але пераламаць сітуацыю ў сваю карысць дзеячам беларускага нацыянальнага руху не ўдалося. У гэты час пачалася самадэмабілізацыя расійскай арміі і салдаты і афіцэры масамі сталі пакідаць свае часці. Самадэмабілізацыя ахапіла і ўсе беларускія дружыны, якія планавалася ператварыць у беларускія батальёны і палкі. Гэта выклікала разлад у кіраўніцтве ЦБВР, якую таксама ахапіла самадэмабілізацыя.

Віну за дэзарганізацыю працы па фарміраванню беларускіх войск усклалі на генерала Кандратовіча. Яго абвінавацілі ў бяздзеянні і знялі з пасады кіраўніка аддзела вайсковых фарміраванняў. На яго месца быў прызначаны К.Езавітаў. Замест Я.Мамонькі намеснікам старшыні ЦБВР на другой сесіі Рады, якая праходзіла 4-5 снежня 1917 г. быў выбраны Т.Грыб [6, с. 60].

Аднак кадравыя перастаноўкі не змянілі ходу падзей. Фарміраванне беларускага войска падыходзіла да сваёй развязкі. Гэта прымусіла вайсковую секцыю І Усебеларускага з'езда, якая налічвала 716 асоб, прыняць

рашэнне абвясціць сябе трэцяй сесіяй ЦБВР і выбраць новае кіраўніцтва Рады. 11 снежня 1917 г. старшынёй ЦБВР быў выбраны П.Аляксюк, яго намеснікамі – К.Езавітаў і Т.Грыб [6, с 61]. Сесія прыняла рэзалюцыю рашуча патрабуючую адмены забароны на фарміраванне беларускіх часцей, катэгарычнага падцвярджэння права беларускага народа на стварэнне сваёй нацыянальнай арміі, аднаўлення працы па фарміраванню беларускага палка ў Мінску, ураўнення ў правах беларускіх вайсковых камітэтаў з агульнарасійскімі [6, с. 61].

Але катэгарычнасць рэзалюцый ЦБВР не змяніла сітуацыю. Бальшавікі поўнасцю нейтралізавалі яе дзейнасць і яна не змагла выканаць сваёй асноўнай задачы – стварыць узброеную апору будучай беларускай улады, якую дзеячы беларускага нацыянальнага руху планавалі стварыць на І Усебеларускім з'ездзе. Калі ж І Усебеларускі з'езд у ноч з 17 на 18 снежня пачаў галасаваць рэзалюцыю аб стварэнні органа дзяржаўнай улады на тэрыторыі Беларусі ў супрацьвагу Аблвыканкамзаху, то СНК Заходняй вобласці і фронту распусціў з'езд і падверг рэпрэсіям ВБР і ЦБВР. Яны былі выселены з дому губернатара, які яны занялі ў дні работы з'езда [6, с. 62 – 63].

Тым не менш ВБР і ЦБВР не спынілі сваёй дзейнасці. Пасяліўшыся ў новым будынку па вуліцы Паліцыйнай, дзе асеў і Выканаўчы Камітэт Усебеларускага з'езда, выбраны 18 снежня на падпольным паседжанні часткі дэлегатаў з'езда ў дэпо Лібава-Роменскай чыгункі, яны ўвайшлі ў кантакт з Вярхоўным галоўнакамандуючым Крыленка і прапанавалі свае паслугі ў фарміраванні беларускіх часцей ужо ў складзе Чырвонай Арміі і да стварэння якой прыступілі органы Савецкай улады. У выніку перагавораў К.Езавітава і І.Серады з М.Крыленка, як аб гэтым паведамляе К.Езавітаў, была дасягнута дамоўленасць аб стварэнні Беларускай Народнай Чырвонай Гвардыі [6, с. 63]. Але Мяснікоў і Аблвыканкамзах не хацелі аддаваць справу фарміравання арміі ў рукі тых, хто варожа сустрэў перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі. Яны ізноў запатрабавалі ад Крыленкі адмовіцца ад дамоўленасці з ЦБВР. Улічваючы аўтарытэт Мяснікова і Аблвыканкамзаха Крыленка перадаў справу фарміравання арміі змешанай камісіі, працу якой актыўна сабатаваў Мяснікоў [6, с. 63 – 64]. Убачыўшы такія адносіны да справы, старшыня ЦБВР звярнуўся за дапамогай у Народны камісарыят вайсковых спраў у Петраградзе, але і там не знайшоў падтрымкі [6, с. 64].

Застаўшыся ў ізаляцыі, кіраўнікі ЦБВР і ВБР прыступілі да канспіратыўнай дзейнасці. Карыстаючыся тым, што ў 289 запасным палку і Мінскай ахоўнай камандзе ў выніку самадэмабілізацыі значна ўзрасла ўдзельная вага беларусаў, яны разгарнулі сярод салдат і афіцэраў актыўную працу, пачалі ствараць беларускія гурткі і камітэты, прыбіраючы кіраўніцтва імі ў свае рукі. Адначасова вялося назапашванне зброі ад дэмабілізуючыхся вайсковых часцей [6, с. 64]. Але гэтая праца працягвалася нядоўга. 289 запасны полк па распараджэнню Мяснікова быў высланы з Мінска для аховы чыгуначных шляхоў па лініі Мінск – Віцебск – Сма-

ленск – Арол. У хуткім часе ён таксама самадэмабілізаваўся і перастаў існаваць. Тое ж самае здарылася і з тымі часцямі, дзе яшчэ вялася «беларусізацыя» [6, с. 64].

У гэты час актыўна вялася праца па «беларусізацыі» толькі ў часцях Румынскага фронта. Намеснік камандуючага фронта генерал Д.Шчарбачоў падтрымліваў ідэю фарміравання нацыянальных часцей у надзеі стрымаць у такі спосаб разлажэнне арміі і яе бальшавізацыю. 9 студзеня 1918 г. пры яго падтрымцы была створана Беларуская вайсковая камісія, старшынёй якой стаў генерал Пажарскі. 14 студзеня Шчарбачоў выдаў загад аб «беларусізацыі» 6-га Таўрогенскага пагранічнага коннага палка, які быў пераіменаваны ў 1-ы гусарскі беларускі народны полк. 21 студзеня ўжо з'явіўся загад аб «беларусізацыі» IV армейскага корпуса і 43-й дывізіі пяхоты. У гэты корпус пераводзіліся ўсе афіцэры і салдаты беларусы з 4-й і 6-й армій, а ў 43-ю пяхотную дывізію – з 8-й і 9-й армій. Праз два тыдні быў выдадзены загад аб «беларусізацыі» 357 Віцебскай і 401 Мінскай дружынаў. У лютым пачалося фарміраванне першай беларускай дывізіі [6, с. 65]. У лютым – сакавіку 1918 г. пад кантролем Беларускай вайсковай камісіі ўжо знаходзілася каля 100 тысяч войск, палова маёмасці фронта, 2000 коней і каля 800 самаходаў [6, с. 77 – 78].

Але і на Румынскім фронце пачалася самадэмабілізацыя. Яго колькасны склад катастрафічна змяншаўся. Да таго ж у справы фарміравання беларускага войска ўмяшаўся ўрад так званай Незалежнай Малдаўскай Рэспублікі, утворанай у Бесарабіі пры падтрымцы Румыніі. Ён дазволіў фарміраванне беларускіх войск, але без узбраення і амуніцыі. У красавіку 1918 г., пасля падпісання нямецка-румынскага мірнага дагавора, румынскія войскі акружылі ў Ясах астаткі беларускіх войск і запатрабавалі іх разбраення. Камандванне падпарадкавалася патрабаванню і здало зброю і маёмасць спецыяльнай камісіі, складзенай з прадстаўнікоў Румыніі і Антанты [6, с. 78]. Салдаты і афіцэры атрымалі магчымасць вярнуцца на радзіму, але вяртацца не было куды, бо тэрыторыя Беларусі ўжо была акупавана Германіяй пасля зрыву мірных перагавораў у Брэсце.

Калі Мінск 21 лютага 1918 г. апынуўся ў руках нямецкіх акупантаў, беларускія дзеячы прадпрынялі яшчэ адну спробу стварыць беларускую армію. Яны вялі перамовы з нямецкім камандаваннем аб перадыслакацыі беларускіх часцей з Румыніі і аднаўлення фарміравання беларускіх войск непасрэдна на тэрыторыі Беларусі. Але немцы і слухаць аб гэтым не жадалі. Яны раззброілі нават тыя нешматлікія беларускія атрады, якія ўдалося стварыць у Мінску пасля адыходу бальшавікоў [6, с. 78]. Не прынеслі поспеху і шматлікія звароты Рады і ўрада БНР да кайзера Вільгельма, нямецкага ўраду, іншых дзяржаўных і грамадскіх структур аб прызнанні дзяржаўнасці Беларусі і дазволу на фарміраванне нацыянальных войск [6, с. 78 – 79].

Калі ж Германія апынулася на парозе рэвалюцыі, урад БНР прыняў рашэнне аб фарміраванні беларускай арміі. Гэтае пытанне было вынесена на абмеркаванне сесіі Рады БНР, дзе генерал Кандратовіч прапанаваў

праект стварэння 20-тысячнай беларускай арміі. Ён заявіў, што віленскія банкіры і мясцовыя памешчыкі гатовы выдзеліць на гэтыя мэты неабходныя фінансавыя сродкі. Патрэбна толькі згода нямецкага камандвання [6, с. 80].

Кіраўнікі Рады і ўрада БНР распачалі перагаворы па гэтаму пытанню з нямецкімі вайсковымі ўладамі. Але камандуючы 10-й нямецкай арміі генерал Фанкельгейм заявіў на перагаворах, што «калі ў полі зроку нямецкіх войск з'явіцца хоць якія-небудзь узброеныя сілы, то супраць іх будуць выкарыстаны нашы кулямёты» [6, с. 80]. Адмовіўся падтрымаць ідэю стварэння беларускай арміі і Савет салдацкіх дэпутатаў 10-й нямецкай арміі [6, с. 80].

Не ўдалося дзеячам БНР дамовіцца аб стварэнні сумесных узброеных сіл і з краёвымі польскімі памешчыкамі, якія прыступілі да стварэння сваіх вайсковых фарміраванняў са згоды нямецкага Обер-Осту для барацьбы супраць Чырвонай Арміі, распачаўшай вызваленне Беларусі пасля анулявання Брэсцкага мірнага дагавора [6, с. 80].

Вымушаныя эвакуявацца з Мінска ў Вільню, дзеячы Рады і ўрада БНР знайшлі спагаду і падтрымку толькі ва ўрадавых колах Літвы. Літоўскі ўрад, імкнучыся анексіраваць тую частку беларускіх зямель, якую аддалі немцы Літве па ўмовах Брэсцкага мірнага дагавора, уступілі ў перагаворы з Віленскай Беларускай Радай, заключылі з ёй дагавор, па якому прадаставілі ёй 6 месц у Літоўскай Тарыбе і далі згоду на стварэнне Міністэрства беларускіх спраў пры ўрадзе Літвы. Міністрам беларускіх спраў пры літоўскім урадзе стаў былы старшыня Народнага Сакратарыята БНР Я.Варонка [6, с. 86].

У снежні 1918 г. літоўскаму ўраду ўдалося дабіцца ад немцаў згоды на фарміраванне літоўска-беларускай арміі. Генерал Кандратовіч стаў віцэ-міністрам абароны Літвы. З гэтага часу пачалося фарміраванне ў складзе літоўскай арміі «беларускіх» часцей. Яны фарміраваліся ў Гродна, куды пераехалі ўрад БНР і Міністэрства беларускіх спраў Літвы.

Дазвол на фарміраванне першага беларускага палка ў Гродна немцы далі 1 лютага 1919 г. Але міністр беларускіх спраў Літвы Я.Варонка абвясціў мабілізацыю ў беларускае войска за тры дні да афіцыйнага дазволу (29 студзеня). У выніку першых мабілізацыйных мерапрыемстваў у сярэдзіне лютага ў Гродна ўжо знаходзілася 80 афіцэраў і 63 салдаты [5, с. 275]. Аднак паводзілі яны сябе непрыстойна, бо ў казармах працвітала п'янства і на гэтай глебе ўзнікалі разборкі. Нямецкай жандармерыі прыходзілася сілай наводзіць парадак [5, с. 275].

З цягам часу становішча палепшылася. Намаганнямі каменданта г.Гродна капітана М.Дзямідава ў многіх гарадах і мястэчках Заходняй Беларусі, якая яшчэ знаходзілася пад кантролем немцаў, былі адкрыты вярбовачныя бюро і прыток дабраахвотнікаў значна павялічыўся. Гэта дало магчымасць закончыць фарміраванне першага беларускага палка і пачаць фарміраванне другога.

У красавіку 1919 г. першы беларускі полк ужо налічваў 800 чалавек. Ім камандваў спачатку палкоўнік Лаўрэнц'еў, пасля – палкоўнік Езавітаў.

Фарміраванне другога беларускага палка не было завершана. На яго базе пазней быў сфарміраваны спецыяльны беларускі батальён, які падпарадкоўваўся каменданту горада М.Дзямідаву. Батальён налічваў каля 350 чалавек. У падпарадкаванні Дзямідава знаходзілася яшчэ група грэнадзёраў пад камандваннем паручніка Бандарчука, узвод гусараў пад камандваннем ротмістра М.Глінскага і вайсковы аркестр [5, с. 275].

Аднак гэтыя фарміраванні праіснавалі нядоўга. 27 красавіка 1919 г. Гродна занялі польскія войскі. Усе беларускія падраздзяленні, якія засталіся ў горадзе, праз некаторы час былі раззброены палякамі [5, с. 277].

У пачатку 1919 г. дзеячы Рады і ўрада БНР спрабавалі сфарміраваць беларускую армію на поўдні Расіі, дзе ў гэты час інтэнсіўна вялася праца па фарміраванню расійскай Дабраахвотніцкай арміі пры падтрымцы краін Антанты. Консул БНР у г.Адэсе С.Некрашэвіч разам з палкоўнікам П.Вентам устанавілі цесны кантакт з галоўнакамандуючым войск Антанты на Усходзе французскім генералам Бартэлё і дамагліся ад яго згоды на фарміраванне беларускіх войск. Аднак супраць гэтага выступіла камандванне расійскай Дабраахвотніцкай арміі. Галоўны інспектар расійскай белай арміі генерал Шварц выдаў загад, забараняючы фарміраванне беларускіх войск. Загад нават быў апублікаваны ў газеце [1, т. 1, кн. 1, с. 552].

Аднак французы па настаянню беларусаў паўторна далі згоду на фарміраванне беларускіх войск. Замест Шварца галоўным інспектарам па фарміраванню Дабраахвотніцкай арміі быў назначаны ўкраінскі генерал Сакіро-Яхантаў, які знаходзіўся ў прыязных адносінах з П.Вентам. Урад Украінскай Народнай Рэспублікі выдзеліў сродкі на фарміравнне беларускіх часцей. З гэтага часу ў Адэсе пачалося фарміраванне беларускай дывізіі. Яе камандзірам быў прызначаны П.Вент, якому ў хуткім часе прысвоілі чын генерала [1, т. 1, кн. 1, с. 552].

У сярэдзіне сакавіка ў беларускай дывізіі ужо налічвалася каля 1000 чалавек. Але ў канцы сакавіка – пачатку красавіка 1919 г. французы і дабраахвотнікі пачалі эвакуацыю з Адэсы. Павінна была эвакуавацца і беларуская дывізія. Аднак камандзір дывізіі П.Вент застаўся ў Адэсе і перайшоў на бок бальшавікоў. З прыходам бальшавікоў на базе дывізіі і пачалося фарміраванне беларускай савецкай брыгады, якая ў хуткім часе ўжо налічвала 10000 чалавек. Камандаваў брыгадай генерал Вент.

Нацыяналістычна настоеныя афіцэры, як сведчыць С.Некрашэвіч, хацелі перадыслакаваць брыгаду ў Мінск, «каб выгнаць адтуль бальшавікоў». З гэтай мэтай А.Баліцкі ездзіў у Мінск. Але Крывашэйн не даў згоды на перавод брыгады ў Беларусь. А ў Адэсе ў хуткім часе пачалося паўстанне М.Грыгор'ева, да якога прымкнуў П.Вент. Паўстанне аднак было падаўлена і Венту прыйшлося ўцякаць. Брыгада ў хуткім часе была адпраўлена на фронт [1, т. 1, кн. 1, с. 553].

Такім чынам, і на поўдні Расіі дзеячам Рады і ўрада БНР стварыць беларускую армію не ўдалося. Але яны не траціліі надзеі і настойліва шукалі шляхі да рэалізацыі пастаўленай мэты.

Вясной – летам 1919 г. прэм'ер-міністр БНР А.Луцкевіч спрабаваў стварыць беларускую армію з ваеннапалонных беларусаў у Германіі, якіх там налічвалася, па дадзеных ураду БНР, каля 75 тысяч. З гэтай мэтай актыўна вяліся перагаворы з Літвой, аб прадастаўленні апошняй сваёй тэрыторыі для дыслакацыі беларускай арміі. У Берліне са згоды нямецкіх уладаў было створана Беларускае вайсковае бюро на чале з генерал-маёрам Л.Давыдавым. Аднак Літва адмовілася прадаставіць сваю тэрыторыю для размяшчэння беларускіх войск, ды і дабраахвотнікаў сярод беларускіх ваеннапалонных не знайшлося. Ад ідэі прышлося адмовіцца [1, т. 1, кн. 1, с. 375 – 384; 2, с. 145].

Не спраўдзіліся надзеі лідэраў БНР на дапамогу і падтрымку з боку Польшчы. Ажыццяўляючы анексію беларускіх зямель, Ю.Пілсудскі больш карміў іх прыгожымі абяцаннямі, чым аказваў практычную дапамогу. Калі ж у канцы кастрычніка 1919 г. ён і выдаў загад аб утварэнні Беларускай вайсковай камісіі і даў згоду на фарміраванне двух беларускіх батальёнаў, гэта справы не змяніла. Ды і сфарміраваць беларускія батальёны дзеячы БНР не змаглі [4, с. 20 – 62].

Так на сённяшні дзень у святле гістарычных крыніц прадастаўляецца справа дзейнасці беларускіх палітычных партый і арганізацый у 1917 – 1920 гг. па фарміраванню беларускай арміі і такімі былі яе вынікі.

Літаратура і крыніцы

1. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі: У 2-х кн. / Склад. С.Шупа. – Вільня – Нью-Ёрк – Менск – Прага: Беларускі інстытут навукі і мастацтва. Таварыства беларускага пісьменства, 1998. – 1721 с.

2. Апостол национального возрождения. Собственноручные показания А.И.Луцкевича 30 октября 1939 г. / Подг. к публ. В.Н.Михнюк, Н.М.Климович, А.Н.Гесь // Неман. – № 1. – 1995 – С. 127 – 162.

3. Варонка Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 году: Кароткі агляд. – Коўна: Выд-ва Міністэрства беларускіх спраў, 1920. – 29 с.

4. Ковкель И., Сташкевич Н. Почему не состоялась БНР? (Из истории политического банкротства националистической контрреволюции в Белоруссии. 1918 – 1925 гг.). – Мн.: Биб-ка газ. «Голас Радзімы», 1980. – 125 с.

5. Коўкель І.І., Чарнякевіч А.М. Рэвалюцыйны і грамадска-палітычны рух у 1917 – 1920 гг. // Памяць: Гіст. – дакум. хроніка горада Гродна / Рэд. кал.: Г.П.Пашкоў, Я.М.Жабрун, І.П.Крэнь і інш. – Мн.: БелЭН, 1999. – С. 271 – 277.

6. Latyszonek O. Bialoruskie formacje wojskowe. 1917 – 1923. – Bialystok: Bialoruskie Towarzystwo Historyczne, 1995. – 273 s.

7. Мигун Д.А. Германия и Беларусь: уроки истории (1914 – 1922 годы). – Мн.: РИВШ БГУ, 2001. – 63 с.

8. Рудовіч С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе. – Мн.: Тэхналогія, 2001. – 201 с.

А.М. Чарнякевіч, ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

ГІСТАРЫЯГРАФІЯ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА РУХУ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XX СТАГОДДЗЯ

У адрозненне ад Вільні, дзе прасочваецца пэўная пераймальнасць паміж рознымі этапамі беларускага нацыянальнага руху, у Гродне традыцыя беларускага адраджэння мела яскрава цыклічны – «квантавы» характар і развівалася хвалямі, адшукваючы з кожным разам усё большую колькасць прыхільнікаў, з тым, каб пазней зноў знікнуць, амаль не пакідаючы слядоў. У выніку грамадская актыўнасць на беларускай глебе прыходзілася, галоўным чынам, на шэраг «пікаў», даўжынёю ад пару месяцаў, да аднаго-двух гадоў.

Гэтая асаблівасць у развіцці мясцовага беларускага асяродка знайшла свой адбітак і ў пытанні гістарыяграфіі беларускага нацыянальнага руху на Гродзеншчыне. Большая частка публікацый прысвечаных гэтай праблематыцы не выходзяць за вузкахраналагічныя рамкі і канцэнтруецца на разглядзе канкрэтна-гістарычных падзеяў у межах толькі аднаго з перыядаў. Амаль суцельная адсутнасць, за адзінкавым выключэннем, спробаў абагульняльнага аналізу з шырынёй ракурсу ў некалькі дзесяцігоддзяў, а не двух-трох месяцаў ці ў лепшым выпадку – аднаго-двух гадоў, паспрыяла замацаванню ўстойлівага стэрэатыпа аб існаванні пэўнай фінальнай даты, якая б адпавядала «канцу» беларускага руху ў Гродне. Гэтай памылкі не пазбег і аўтар дадзенага артыкула, калі апісваючы падзеі 1918 – 1921 гадоў, напрыканцы зазначыў: «А яшчэ праз нейкі час згас і беларускі агенчык Гародні» [82]. Пазнейшая спроба удакладніць гэтую высновy больш канкрэтным сцвярджэннем таго, што «польскай уладзе спатрэбілась яшчэ дзесяць год, перш чым згас беларускі агенчык Гродна», тым самым адсоўваючы канцовую дату з 1921 да 1931 год, ізноў аказалася неадпаведнай рэчаіснасці, бо гэткім чынам, напрыклад, не ўлічваўся беларускі кааператыўны рух, які актывізаваўся ў наваколле Гродна як раз на мяжы 1931-1932 года. Аднак і гэтая дата не можа разглядацца ў якасці апошняй у гісторыі беларускага руху на Гродзеншчыне, таму што адсутнасць арганізацыйных формаў не пазбавіла саму ідэю нацыянальнага адраджэння беларусаў унутранага зместу.

Уласна пачаткі беларуска руху ў Гродне назвычай звязваюць з дзейнасцью на месцовай глебе беларускага зямляцтва пад апекай ксяндза Францішака Грынкевіча, больш вядомага пад назваю Гродзенскі гурток беларускай моладзі «Хатка», праз які прайшло агулам да сарака чалавек. Гэты першы перыяд ахоплівае 1909–1914 гады і даволі шырока прадстаўлены ў гістарыяграфіі [6, 13, 17, 27, 29, 32, 41, 56, 57, 61, 67, 84, 88, 91, 92, 99]. Асаблівая роля ў захаванні спадчыны па гуртку належыць Зоське

Верас – Людвіке Сівіцкай-Войцік, якая актыўна прычынілася, як да дзейнасці «Хаткі», так і да «папулярызацыі» пазней яе імя [23, 24].

У адрозненні ад гуртка, беларускія арганізацыя, што дзейнічалі ў Гродне ў перыяд 1918–1921 годоў (яго магчыма умоўна звязаць з існаваннем Гродзенскага Беларускага нацянальнага камітэта), у савецкай гістарыяграфіі наогул не прадстаўлены. Затое менавіта гэты час станавіў найбольшую цікавасць для даследчыкаў гісторыі БНР, прычым першыя працы, прысвечаныя дадзенай праблематыцы былі напісаны амаль разам з самімі падзеямі [1, 8, 14, 25, 28, 30, 31, 34, 39, 40, 42, 44, 46, 47, 48, 51, 52, 53, 54, 64, 66, 73, 75-94, 96, 97]. Некаторыя з іх у сваю чаргу, як, напрыклад, «Успаміны аб польскай акупацыі Гарадзеншчыны ў 1919-1921 гг. «Малюнкі гвалту і здзекаў фацэтных польскіх паноў на Беларусі (Мае перажыванні)» Янкі Антонава выклікалі палеміку яшчэ напярэдадні свайго з'яўлення. У сваім лісце да В.Ластоўскага ад 6 чэрвеня 1921 года К.Езавітаў пісаў: «Вучыцель Антонаў, што працуе ў Сямашкі, выпускае кнігу сваіх успамінаў, у якой ёсць вялікія і вельмі некарысныя... памылкі з боку беларускай Дзяржаўнасці і ў асвятленні спраў на Гродзеншчыне. Я напісаў свае думкі Антонаву, але не пэўна што ён зробіць папраўкі. Звярніце на кнігу ўвагу!» [18; 19, т.2, ст. 1240, 1329].

У сваю чаргу ў межах дадзенага перыяду вылучаюцца адразу некалькі «самастойных» тэмаў: урад БНР у Гродне (адсюль даволі распаўсюджанае паняцце: «Гродна як другая сталіца БНР»); Першы Гродзенскі беларускі полк і інш. (да апошніх адносіцца, напрыклад, тэма – беларускі тэатр у Гродне, найшырэй прадстаўлены ў літаратурнай спадчыне П.Мядзёлкі [52, 53]). Гісторыя фармавання беларускіх вайсковых частак у Гродна на мяжы 1918-1919 года была настолькі важным, хаця, можа, і абмежаваным па сваіх рэальных наступствах, эпізодам, што трапіла на старонкі адразу некалькіх паважных навуковых працаў [4, 5, 7, 9].

Сярэдзіна 1922 – першая палова 1923 годоў, аб'яднанныя гэткімі падзеямі, як выбары ў Сейм II Рэчы Паспалітай і беларуская партызанка, на мясцовым грунце з'вязаны перш за ўсё з асобамі паслоў – С.Барана і С.Якавюка і партызанскіх атаманаў – Хмары і Скамароха. Гістарыяграфія гэтага перыяду, за выключэннем працы, прысвечаннай асобе Разумовіча-Хмары [14], амаль поўнасцью паўстала пасля 1991 года, што тлумачыцца як недаступнасцью праз доўгі час навуковых архіваваў па дадзенай праблематыцы, так і палітычнай кан'юнктурай [3, 22, 37, 80]. Асаблівай ўвагі ў гэтым кантэксце заслугоўваюць працы С.Токця, які ўдала, на нашую думку, спалучае метады рэгіяналістыкі з даследаваннем агульных, нацыятворчых працэсаў [69-72].

Застаўшыяся амаль пятнадцаць год існавання Гродна ў складзе II Рэчы Паспалітай былі не менш насычаныя падзеямі для мясцовых беларусаў: вясна – восень 1924 года – гэта няўдалая спроба адраджэння антыпольскага падполля ўжо з выразна камуністычным ухілам, якая скончылася сецэссіяй, чарговымі рэпрэсіямі з боку польскіх уладаў і актывізацыяй паланафільскага крыла сярод мясцовых беларусаў; 1925–1927 гады –

«эпоха Грамады», прычым з іх толькі апошнія сем месяцаў існавання гэтай арганізацыі для горада і павету сталіся сапраўднаю падзеяй; 1928 – 1931 гады – час «Змагання». Нарэшце, 30-е гады, якія для беларускага руху ў Гродна прайшлі «пад ценью» мураў гродзенскай турмы – гэта найменш даследаванная частка з гісторыі дадзенай праблематыкі. На жаль, гэты пярыяд у беларускай гістарыяграфіі асветлены меньш за ўсе іншыя і галоўным чынам прадстаўлены на старонках польскіх навуковых прац, прысвечанных грамадска-палітычным рухам на тэрыторыі паўночна-усходніх ваяводстваў II Рэчы Паспалітай, што паўсталі на працягу 1970-х – 1990-х гадоў у Беластоцкім навуковым асяродку [10, 11, 12, 15, 16].

Аналізуючы даследаванасць беларускага нацыянальнага руху Гродзеншчыны можна прыйсці да высновы, што ўзгаданая тэма ў дадзеным канкрэтным рэгіянальным кантэксце прадстаўлена куды шырэй, чым нават агульны ўзровень яе даследаванасці. Некаторыя пытання, разгледжаныя даследчыкамі на прыкладзе Гродна і яго наваколля, наогул не знайшлі свайго працягу ў дачыненні да іншых беларускіх асяродкаў, пры тым, што сам Гродна з'яўляўся толькі адным з шэрагаў цэнтраў нацыянальнага руху. Не менш важным падаецца і тое, што гістарыяграфія беларускага руху на Гродзеншчыне ахоплівае амаль усе яго асноўныя этапы развіцця, хаця яны і прадстаўлены не аднолькава шырока.

Літаратура і крыніцы

1. Czerniakiewicz A. Przejmowanie wladzy przez Polakow w Grodnie (koniec 1918 – kwiecien 1919) // Poczatki niepodleglosci. – Lomza – Bialystok – Grodno – Suwalki. 1918 –1919. – Bialystok, 1998. – S. 41-50.

2. Engelhardt E. Weiss-Ruthenien. – Berlin-Amsterdam-Praga-Wiena, 1943.

3. Giogowska H. Los biaioruskiego posia Sergiusza Baranowa // Biaioruskie Zeszyty Historyczne, 1995. – № 2 (4). – St.146-159.

4. Karpus Z. Bialoruskie formacje wojskowe w Polsce w latach 1919-1921 // Pomorze-Polska-Europa. Studia i materialy z dziejow XIX i XX wieku. – Toruc, 1995. – S. 223-231.

5. Karpus Z. Wschodni sojusznicy Polski w wojnie 1920 roku. Oddzily wojskowe ukrainskie, kozackie i bialoruskie w Polsce w latach 1919-1920. – Toruc, 1999.

6. Koziowska-Giogowska H. Koias naљaj nivy // Czasopis. – 2003. – Nr 7-8.

7. Latyszonek O. Bialoruskie formacje wojskowe 1917-1923. – Biaiystok, 1995.

8. Jatyszonek O. Biaioruski oњrodek narodowy w Grodnie wobec niepodlegiego pacstwa polskiego // Biaiostocczyzna. – 1994. – Nr 1. – S. 68-73.

9. Lesжius V. Lietuvos kariuomene 1918-1920. – Vilnius, 1998.

10. Majecki H. Dziaialnoњж Biaioruskiego Wioњciacsko-Robotniczego Klubu Poselskiego na Biaiostocczyџnie w latach 1928-1930 // Studia polsko-litewsko-biaioruskie. Praca zbiorowa pod red. J. Tomaszewskiego, E. Smuikowej i H. Majeckiego. – Warszawa, 1988. – S. 219-229.

11. Majecki H. Dziaialnoњж towarzystwa szkoiy biaioruskiej na Biaiostocczyïnie // Studia polsko-litewsko-biaioruskie. Praca zbiorowa pod redakcj№ J.Tomaszewskiego, E.Smuikowej i H.Majeckiego. – War., 1988. – S. 201-218.

12. Naikowska Z. Dzienniki (1918-1929). – T. III. – War., 1980.

13. Stankieviж A. Bieiaruski chruњsijanski ruch (histaryжny narys). – Vilnia, 1939.

14. Starïa A. Ataman Chmara Razumowicz. Sylwetka biaioruskiego irredentysty. – War., 1937.

15. Tomczonek Z. Ruch ludowy na kresach pyinocno-wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej. – Biaiystok, 1996..

16. Wysocki R. Spyidzielczoњж bialoruska na terenie wojewydztwa biaiostockiego w latach 1919-1939 // Biaiostocczyzna. – 1996. – № 41 /1/. – S. 39-47.

17. Ад Гуртка да Грамады... Старонкі беларускай гісторыі Гродна першай паловы XX стагоддзя (матэрыялы да круглага стала 23 кастрычніка 2004 года) / Гродзенскае абласное аб'яднанне маладых навукоўцаў «ВІТ». – Гродна, 2004.

18. Антонаў І. Успаміны аб польскай акупацыі Горадзеншчыны у 1919-1921 г.: Малюнкі гвалту і зьдзеку фацетных польскіх паноў на Беларусі (Мае перажываньні). – Б.м., 1921.

19. Архівы Беларускай народнай рэспублікі. Кніга 1, том 1-2 – Вільня – Нью-Ёрк – Менск – Прага: Беларускі інстытут навукі й мастацтва, таварыства беларускага пісьменства Наша ніва, 1998.

20. Вашкевіч А. Архіў, які не знік // Гродзенская праўда – 2005. – 9 ліпеня.

21. Вашкевіч А. Вацлаў Пануцэвіч у Беларусі амаль невядомы // Куфэрак Віленшчыны. – №2(7). – 2002. – Ст. 14-22.

22. Вашкевіч А., Нарэль Д. Сымон Якавюк: адраджэнец, спекулянт, манархіст і савецкі дыверсант // Arche. – № 5. – 2005. – Ст. 176-232.

23. Верас З. Гродзенскі гурток беларускай моладзі // Бібліятэка Акадэміі Навук Беларусі, аддзел рэдкай кнігі. Ф. 23. Воп. 1. Спр. 624.

24. Верас З. Старое Гродна // Краю мой – Нёман. – Мн., 1986. – С. 188-194.

25. Воронко И. Я. Белорусский вопрос к моменту Версальской мирной конференции: Историко-политический очерк. – Ковна, 1919.

26. Гарбінскі Ю. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. – Мн. – Мюнхен, 1999.

27. Глагоўская Е. Вяртанне да сваіх Станіслава Грынкевіча // Ніва, 7 мая 2000. – № 19.

28. Глагоўская Е. Жыццё і дзейнасць Л.Дзекуць-Малея // Слонімскі край. – № 2. – 2000.

29. Грабінскі Б.Сакольшчына-Горадня-Вільня // ARCHE. – 2000. – № 5. – С. 179-208.

30. Данілюк Т. Мае ўспаміны аб службе ў беларускіх вайсковых фармацыях і ўдзеле ў беларускім збройным змаганьні. 1917 – 1921 // Спадчына. – №5. – 1995.

31. Езовитов К. Белорусы и поляки: Документы и факты из истории оккупации Белоруссии поляками в 1918 и 1919 гг. – Ковна: Изд. Ф. Скарыны, 1919.

32. Жук І. Уладыслаў Чаржынскі – беларускі навуковы і культурны дзеяч з Сакольшчыны // Bialoruskie zeszyty historyczne. – 1998. – № 10. – S. 109-110.

33. Западная Беларусь на скамье подсудимых: процесс Белорусскай крестьянско-рабочей Грамады. – Мн., 1929.

34. Засецкі М. Міністэрства беларускіх спраў за 10 месяцаў існавання. Кароткі нарыс // Casopis. – № 1. – 1919.

35. Игнатович Ф. Страдал за идею... // Биржа информации. – 27 июня 2002. – № 26.

36. Карповіч М. Пра беларускі тэатр у Горадні // Наш край. – 1929. – №3(42).

37. Карповіч С., Крапівін С. След атамана Скомороха // Советская Белоруссия. – № 203-204. – 19.8.2000.

38. Коўкель І., Чарнякевіч А. Партызанскі рух на Гродзеншчыне 1921–1925 // Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў: матэр'ялы рэгіянальнай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 750-годзю г. Слоніма і 70-годзю заснавання Слонімскага раённага краязнаўчага музея імя І.І. Стаброўскага / Пад рэд. І.П. Крэня. Слонім: ГАУПП «Слонімская друкарня», 2002. – С. 254-259.

39. Коўкель І., Чарнякевіч А. Рэвалюцыйны і грамадска-палітычны рух у 1917–1920 гг. // Памяць: Гіст. – дакум. хроніка горада Гродна / Рэд. кал.: Г.П. Пашкоў, Я.М. Жабрун, І.П. Крэнь і інш. – Мн.: БелЭН, 1999. – С. 271 – 277.

40. Курбскі-Кузняцоў У. Успаміны аб беларускам руху ў Гродна // Новая дарога, 27.9.1942. – № 27.

41. Л.С. – Ш. Успаміны аб Горадзенскім гуртку Беларускай Моладзі // Студэнская думка. – 1925. – № 3,4.

42. Лаўрэш Л., Круцікаў У., Сліўкін В. Генерал Кіпрыян Кандратовіч // Спадчына. – 2002. – №1.

43. Луцкевіч А. Дзённік // Полымя. – 1991. – № 4. – С. 205-224; № 5. – 1991. – С. 168-191.

44. Луцкевіч А. Польская акупацыя на Беларусі. – Вільня, 1920.

45. Ляхоўскі У. Беларуская справа падчас польскай акупацыі 1919 – 1920 гг. // Спадчына. – 1994. – № 6. – С. 50 – 87.

46. Ляхоўскі У. Беларуская школьная справа на Гродзеншчыне 1915–1919 гг. // Культура Гродзенскага рэгіёну: праблема развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа. – Гродна, 2003. – С. 125-128.

47. Ляхоўскі У. Рупіўся дзеля Бога і людзей. Жыццёвы шлях Лявона Вітан-Дубейкаўскага // Наша Вера. – 1997. – №4. – С. 32 –51.

48. Ляхоўскі У. Сумесная чыннасьць хрысьціянскіх сьвятароў і рэлігійных дзеячоў на ніве беларускай культуры ды дабрачыннасьці ў гады першае сусьветнае вайны (1914 – 1921). // Роля асобы ў жыцці і дзейнасці хрысьціянскіх цэркваў Беларусі ў XX стагоддзі. – Мінск, 2000. – С. 73 – 83.

49. Ляхоўскі У., Чарнякевіч А. Першы беларускі полк // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 6. Кн. 2. – Мн.: БелЭн, 2003. – С. 423.

50. Малецкі Я. Пад знакам пагоні // Спадчына. – 1994. – № 3. – С. 129-130.

51. Мікула Я. Аркадзь Смоліч на Гродзеншчыне // Гарадзенскія запісы, вып. 1. – Гродна, 1993. – С. 99-101.

52. Мядзёлка П. Сцежкамі жыцця // Полымя. – 1993. – № 5.

53. Мядзёлка П. Сцежкамі жыцця. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1974. – 232 с.

54. Пануцэвіч В. Гарадзеншчына ў нацыянальным руху ў 1918-1919 гадах // Бацькаўшчына. – 1964. – № 5-6.

55. Працэс 72 // Беларуская доля. – 1925. – № 26, 31, 32.

56. Пяткевіч А. Гродзенскі гурток беларускай моладзі // ЭГБ, т. 3. – С. 133-134.

57. Пяткевіч А. Гродзенскі гурток беларускай моладзі і Сакольшчына // Biaioruskie Zeszyty Historyczne. – 1998. – № 9 – С. 136-141.

58. Пяткевіч А.М. Беларускі шлях // ЭГБ, т.1. – С.459.

59. Пяткевіч А.М. Выстрал // БГЭ., т.2. – С.375.

60. Пяткевіч А.М. Беларусь / Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.3. – С.486.

61. Пяткевіч А.М. Гродзенскі гурток беларускай моладзі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.3. – Мн.: БелЭн, 1996. – С.133-134.

62. Пяткевіч А.М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік. – Гродна, 2000.

63. Рудовіч С. Аляксюк Павел Паўлавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.1. – Мн.: БелЭн, 1993. – С.113.

64. Сідарэвіч А. Старонкі з гісторыі БНР // Адраджэнне. Гістарычны альманах. – Мн.,1995. – С. 243-244.

65. Скорабагатаў В. Кампазітар Ян Тарасевіч: Ён абышоўся без славы, слава не абыдзецца без яго // ARCHE. – 2000. – № 5. – С. 261.

66. Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакумэнтах і ўспамінах. – Мн., 2001.

67. Смалянчук А. Гарадзенскі гурток беларуская моладзі // Музей і развіццё гістарычнага краязнаўства. – Гродна, 1990. – С. 34-36.

68. Содаль У. Харал «А хто там ідзе?» // Наша Ніва, – 12.06.2000. – № 24.

69. Токць С. Барацьба за беларускую дзяржаўнасць на абшарах Гарадзенскай (Берштаўскай) пушчы ў 1920-х гадах // Biaioruskie Zeszyty Historyczne. – 2001. – № 15.

70. Токць С. Беларуская вёска на мяжы эпох: Змены этнічнай самасвядомасці сялянства ва ўмовах распаду традыцыйнага аграрнага грамадства (па матэрялах Гарадзеншчыны 19 – першай паловы 20 ст.). – Гродна: ГрДУ, 2003.

71. Токць С. Беларускі нацыянальны рух 1920-х гадоў вачыма польскай паліцыі // Гістарычны альманах. – Т. 3.

72. Токць С. Выбары ў парламент на Гарадзеншчыне ў 1920-х гадах // Пагоня. – 12.10.2000. – № 38; 19.10.2000. – № 39.

73. Успенскі А. 1-шы беларускі полк у Гародні і як палякі яго раззброілі // Раніца. – 1942. – № 44-49.

74. Цыхун А. Маем «Заходнія Ўкраіны?» // Літаратура і мастацтва. – 1991. – 5 апр.

75. Чаркасава Д.Пагасла яснае сонейка // Голас Радзімы. – 30.1.1986. – № 5.

76. Чарнякевіч А. Абое памерлі ад сухотаў // Наша Ніва. – 3.12.2001. – № 49.

77. Чарнякевіч А. Ад імя народу: Гродзенскі Беларускі нацыянальны камітэт // Биржа информации. – 9.10.2003. – №40.

78. Чарнякевіч А. Ад Маркевіча да Маркевіча, або з гісторыі беларускага перыядычнага друку ў Гродна // Биржа информации. – 13.11.2003. – №34.

79. Чарнякевіч А. Беларускі супраціў // Биржа информации. – 2003. – 16 окт.

80. Чарнякевіч А. Беларускія паслы са спісу № 16 // Биржа информации. – 2003. – 30 окт.

81. Чарнякевіч А. Бялецкі К.Я. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 6. Кн. 2. – Мн.: БелЭн, 2003. – С. 349.

82. Чарнякевіч А. Гарадзенскія апосталы. Беларускі нацыянальны рух у Гродна ў 1918-1920 г. / Грамадскае аб'яднанне «Ратуша». – Гродна, 1999.

83. Чарнякевіч А. Другая сталіца БНР // Биржа информации. – 2003. – 27 нояб.

84. Чарнякевіч А. Касцёл бернардзінцаў: Францішак Грынкевіч і беларускі каталіцкі рух // Пагоня. – 2001. – 9 нояб.

85. Чарнякевіч А. Мары аб Еўропе // Биржа информации. – 2003. – 20 нояб.

86. Чарнякевіч А. Першы гродзенскі беларускі полк // Биржа информации. – 2004. – 9 янв.

87. Чарнякевіч А. Першы Гродзенскі губернскі беларускі з'езд // Биржа информации. – 2003.

88. Чарнякевіч А. Першы колас беларускай нівы // Биржа информации. – 2003. – 4 сент.

89. Чарнякевіч А. Постаці беларускага нацыянальнага руху ў Гродна 1909-1939 гг.: біяграфічны даведнік. – Мінск: Грамадскае аб'яднанне «ВІТ», 2003.

90. Чарнякевіч А. Прытулак для беларускіх дзетак // Биржа информации. – 2003. – 23 окт.

91. Чарнякевіч А. Францішак Грынкевіч і беларускі каталіцкі рух // Биржа информации. – 2003. – 28 авг.

92. Чарнякевіч А. Францішак Грынкевіч і беларускі нацыянальны рух // Этносоциальные и конфессиональные процессы в трансформирующемся обществе: Материалы международной научной конференции, в 2-х частях. Часть 2. – Гродно, 2001. – С. 229-232.

93. Чарнякевіч А. Цэнтральная беларуская рада Гродзеншчыны // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 6. Кн. 2. – Мн.: БелЭн, 2003. – С. 118.

94. Чарнякевіч А. Шпацар па беларускай Гародні // Пагоня. – 2001. – 1 нояб.

95. Черепица В.Н. Гродненские национально-общественные комитеты в годы немецкой оккупации (1941-1944 г.) // 55 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: погляд праз гады, новыя канцэпцыі і падыходы: Матэрыялы навукова-тэарэтычнай канферэнцыі 4-5 мая 2000 года. Частка ІІ. – Мінск, 2004. – С. 29-33.

96. Чернякевич А. Акция Гродненской польской организации войсковой (ПОВ) по освобождению К.Цвирко-Годыцкого // Этнасацыяльныя і культурныя працэсы ў заходнім рэгіёне Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі / пад рэд. І.П.Крэня. – Гродна: ГрДУ, 1998. – С. 148-150.

97. Чернякевич А. Национальные процессы в Гродно в период советско-польской войны 1919-1920 г.г. // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця заходняга рэгіёна Беларусі: Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі: У 2 частках / Брэсцкі дзярж. ун-т. – Брэст, 1998. – Ч. ІІ. – С.119-130.

98. Школа Беларуская // Інфармацыйны бюлетэнь Гродзенскага гарадскога аддзялення рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Таварыства Беларуская школа». – Гродна, 2004.

99. Ян з-пад Ласосны. Горадзенскі беларускі гурток 1913 г.. Успаміны // Kryvic. – 1924. – № 1(7).

А.У. Паўшок, ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

ДЗЕЙНАСЦЬ ПОЛЬСКІХ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ У БЕЛАРУСІ НА ПАЧАТКОВЫМ ЭТАПЕ ПЕРШАЙ РАСІЙСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ (студзень – снежань 1905 г.)

Гаворачы пра дзейнасць польскіх палітычных партый на Беларусі ў рэвалюцыі 1905–1907 гг., трэба зазначыць, што яна працякала ў розных накірунках: сацыял-дэмакратычных і ліберальна-буржуазных.

Да сацыял-дэмакратычнай плыні можна аднесці Польскую сацыялістычную партыю (ППС). Кіраўніцтва ППС лічыла, што польская дзяржава павінна адрадзіцца ў межах, якія існавалі да падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г.

З пачатку першай расійскай рэвалюцыі ў студзені 1905 г. ППС на Літве разам з іншымі партыямі стала на чале рэвалюцыйнага руху на Беларусі. Асабліва важную ролю яна адыграла ў 1905 г. у г.Гродне, дзе пэпэсаўцы і бундаўцы з·явіліся адзіным арганізацыйным цэнтрам рабочага руху. Гродзенскі Рабочы Камітэт ППС на Літве выдаваў уласную газету «Вястун вольнасці» [7, с.18]. У яго склад уваходзілі: Ганна Каменецкая, Майсей Лейбаў, Чышка Капульская, Іосель Нелекіс, Янкель Ляцкі, Браніслаў Шушкевіч, Данііэль Габаў, Хайма Ліпскі, Шала Трылінг, Абрам Айзенберг, Рахпі Фрахтаўнін, Сіма Гольдберг, Юдэль Бурдэ, Шенона Капульска, Пейсах Ліпец, Шепшэль Каплан, Эстэр Гурвін, Янкель Любіс, браты Станіслаў і Казімір Трускоўскія, Абрам Ліпнік, Эстэр Крапу, Ева Хвілевіцкая, Ісер Длугач, Рыўка Кантор, Габрыэль Шатаўскі, Арона Руда, Барэль і Зуселя Куленернскія [1, с.4].

Потым Камітэт прыняў рашэнне стварыць з лепшых працоўных групу, якая б уваходзіла ў кантакт з масамі працоўных, сялян і салдат. Група атрымала названне «Цэнтралка». У яе склад уваходзілі Грабоўскі, Б. Рутковўскі, Бальцэр, Кавальчук, Станіслаўчык, Панкевіч, Ган. Кіраўніком яе да кастрычніка быў Шушкевіч, а затым Шумаў [8, с.32].

Прыблізна ў сакавіку 1905 г. пачала сваю дзейнасць баявая арганізацыя пры Гродзенскім Рабочым Камітэце ППС на Літве. У яе склад уваходзілі М.Панкевіч (кіраўнік), Ф.Маслоўскі, З.Калгановіч, М.Станіслаўчык, Ю.Шапіра, З.Калгановіч і інш. – усяго 16 чалавек. На ўзбраенні ў членаў «баёўкі» знаходзіліся звыш 20 браўнінгаў і рэвальвераў, самаробныя бомбы [8, с.26].

Акрамя гэтага, у складзе гродзенскага Рабочага Камітэта ППС на Літве дзейнічаў «Яўрэйскі камітэт ППС». У ім працавалі выключна прадстаўнікі яўрэйскай нацыі. На сваіх лістоўках яны ставілі ініцыялы на рускай мове «Е.К.» [2, с.89].

Члены Гродзенскага Рабочага Камітэта ППС на Літве арганізоўвалі сярод іншых палітычныя дэманстрацыі 7 сакавіка ў прыгарадзе Гродна і 1 мая ў Гродне [8, с.31].

Напярэдадні 1 мая паліцыяй былі арыштаваны лідэры ГрРК, сярод іх Хвіліцкую, Шушкевіча, Лапіна, Капульскую. Жандармы ў ходзе арыштаў таксама наткнуліся на кансператы̆ную кватэру Франца Ігнатовіча, дзе як раз друкавалі на гектографе Трускоўскія, Ліпнік, Кранс. Цудам паспеў схавацца дэлегат ЦРК ППС «Юліан» (Станіслаў Капецкі), які прыехаў з г.Варшавы ў г.Гродна з інструкцыямі па каардынацыі правядзення мерапрыемства [8, с.24].

Негледзячы на ўсе гэта, 1 мая па вуліцы Дамініканскай пачалося шэсце рабочых. Сігнал да пачатку акцыі далі Дыяканаў і Глінскі. Імі былі раскіданы адозвы, падняты над галавамі сцяг ППС. Аднак дэманстрацыя была разагнана паліцыяй [8, с.24].

Акрамя гэтага, члены ГрРК наладзілі сувязі з рэвалюцыянерамі з горада Лодзі і праводзілі сумесныя акцыі па збору грошаў па рэвалюцыйныя патрэбы. Аб гэтым сведчыць сакрэтны цыркуляр паліцыі ад 21 ліпеня 1905 г. У ім даваўся загад аб арышце ў выпадку паяўлення дэлегатаў з г.Лодзі. У г.Гродне членамі ГрРК былі праведзены забастоўкі і сходы пратэсту супраць расстрэлу рабочых у Лодзі ў чэрвені 1905 г. [5, с.19].

У пачатку 1905 г. арганізацыя пачала работу ў арміі. Гродзенскі гарнізон у той час складаўся з чатырох палкоў пяхоты (101-ы Пермскі, 102-і Вяцкі, 103-і Петразаводскі, 171-ы Кобрынскі), крэпаснога батальёна, 4-га сапернага, 26-й артылерыйскай брыгады, двух соцень казакоў – усяго каля 20 тыс. салдат і афіцэраў [8, с.31].

Гэтую работу праводзілі Г.Петрашкевіч, А.Дзьяканаў, У.Матушэўскі. Найбольш значны водгук ідэі ППС артымалі ў салдат 4-га сапернага батальёна, 26-й артылерыйскай брыгады і 102-га пяхотнага палка. Актыўнымі членамі ППС, напрыклад, сталі сапёры М.Судакоў і П.Аляксееў [8, с.32].

Члены ГрРК выдавалі спецыяльныя пракламацыі для салдат: на рускай і польскай мовах «Подымитесь солдаты», «Солдатская памятка», «Ко всем солдатам Гродненского гарнизона» [4, с.211].

Восенню 1905 г. быў заснаваны Вайсковы рэвалюцыйны камітэт пры Гродзенскім рабочым Камітэце ППС на Літве [8, с.32].

Найбольш спрыяльную працу ў арміі праводзіў Уладзіслаў Матушэўскі, які ў лістападзе 1905 г. пачаў служыць у 4-ым сапёрным батальёне. Дзякуючы яму, восенню 1905 г. пачаліся хваляванні сярод салдат 4-га сапернага батальёна, затым – у 26-й артылерыйскай брыгадзе па прычыне дрэннага харчавання. Пазней да іх далучыліся салдаты 102-га пяхотнага палка [8, с.32].

Акрамя гэтага члены ГрРК імкнуліся распаўсюдзіць рэвалюцыйную агітацыю сярод сялян. Для іх друкаваліся і распаўсюджваліся камітэтам наступныя брашуры на польскай і рускай мовах: «Крестьяне, к вам наше слово», а таксама на беларускай мове: «Настаў час», «Братцы мужыкі!», «Царская гаспадарка», «Гутарка аб тым, куды мужыцкія грошы ідуць». Для правядзення агітацыі члены ГрРК накіроўваліся ў розныя паветы

Гродзенскай губерніі. Вядомы факт аб распаўсюджанні ідэй ППС сярод сялян Пружанскага павета. Там паліцыя часта сустракала адозву пад назвай «Ко всем крестьянам Пружанского уезда» і адозвы на польскай мове ад імені ЦК ППС у мястэчку Шэрашова [3, с.236].

У гэты час дзейнасць ГрРК распаўсюдвалася толькі на Гродне і яго бліжэйшае наваколле. У другіх гарадах, такіх як Брэст, Слонім, Ваўкавыск, Крынкі, яно было вельмі слабым. З мэтай пашырэння уплываў ППС на масы Шумаў стварыў «школу агітатараў», якой сам кіраваў.

Заняткі ў школе ахоплівалі пытанні тэорыі марксізма і гісторыі сацыялістычнага руху. У школу былі запрошаны: Петрашкевіч, Ярашэвіч, Ган, Сянкевіч, Кавальчук, Руткоўскі, Грыбоўскі, Юхневіч, а з яўрэяў – Капульскі, Ганна Гурвіч і інш. Школа знаходзілася на кватэры рыбака Бяляўскага [8, с.36].

Члены ГрРК актыўна праводзілі работу і сярод моладзі. Так, у лістападзе 1905 г. пад кіраўніцтвам ГрРК была праведзена маніфестацыя ў гродзенскіх гімназіях пад лозунгам «Гродна – горад польскі». Па выніках маніфестацыі была складзена адозва да гродзенскага губернатара Ізоргіна, у якой гаварылася пра права выкладання польскай мовы ў гродзенскіх гімназіях. Вынікам адозвы было прыняцце губенатарам Ізоргіным рашэння аб увядзенні ў гімназіях выкладання польскай мовы (але толькі для палякаў і па жаданню) [8, с.36].

У ходзе рэвалюцыі 1905–1907 гг. ППС на Літве ўвесь час супрацоўнічала з Бундам (яўрэйская партыя, утворанная Мартавым у 1897 г). Разам яны правялі ў г.Гродна агульнагарадскія палітычныя забастоўкі 19 кастрычніка (супраць Маніфеста 17 кастрычніка), 9 снежня 1905 г. забастоўку салідарнасці працоўных Гродна з пралетарыятам Польшчы з пратэстам супраць увядзення цэнтральным кіраўніцтвам вайсковага палажэння ў Каралеўстве Польскім і 25–29 снежня (у падтрымку снежаньскага ўзброенага паўстання рабочых у Маскве), якая ў адпаведнасці з заклікам ЦК ППС павінна была прывесці да захопу ўлады ў Гродне. Але на гэта Гродзенскі рабочы камітэт ППС на Літве не пайшоў, як дарэчы, і камітэт Бунда. Справа скончылася забастоўкай [7, с.21].

Акрамя горада Гродна, камітэт ППС на Літве дзейнічаў таксама ў г.Брэсце. Ён быў заснаваны ў 1905 г. Але гэты камітэт не карыстаўся падтрымкай рабочых. Членамі арганізацыі і камітэта ППС тут былі амаль выключна яўрэйскія рабочыя. Большасць рабочых Брэста падтрымлівала Бунд [7, с.21].

Інакш паводзілі сябе падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг. на тэрыторыі Беларусі польскія ліберальна-буржуазныя партыі.

Палітызацыя грамадскасці, узнікненне легальных палітычных партый спрыялі паглыбленню палітычнай дыферэнцыяцыі польскіх ліберальна-буржуазных партый у Беларусі на дзве дамінуючыя плыні: краёўцы і нацыянальныя дэмакраты. Можна зазначыць, што ў студзені-верасні 1905 г. прыхільнікі гэтых палітычных плыняў шлі разам. Асаблівай актыўнасці яны не праяўлялі. Мяжой падзела стаў Маніфест Мікалая II ад 17 кастрычніка 1905 г. [6, с.64].

Краёвая плынь на тэрыторыі Беларусі была прадстаўлена наступнымі партыямі: Краёвая партыя белай Русі і Літвы (лістапад 1905 г., кіраўнік Раман Скірмунт), Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі (люты 1906 г., Эдвард Роп). Палітычным цэнтрам краёвай ідэалогіі з·яўляўся часопіс «Кур·ер літэўскі» [6, с.31].

Нацыянальна-дэмакратычная плынь была прадстаўлена Польскай дэмакратычна-нацыянальнай партыяй Літвы (люты 1906 г., Юры Гласка) [6, с.135].

Асаблівасцю дзейнасці гэтых дзвух плыняў на тэрыторыі Беларусі было тое, што яны не мелі дастатковай сацыяльнай базы, таму што іх праграмы насілі нацыяналістычны характар, яны арыентаваліся на інтарэсы буйных землеўладальікаў, якім гарантавалася недатыкальнасць прыватнай уласнасці і недапушчэння адчужэння памешчыцкай зямлі, а інтарэсы другіх колаў грамадства іх не цікавілі. Дзейнасць была накіравана на здабычу месц у першай Дзяржаўнай думе, а потым і другой. Дзеля гэтага члены гэтых партый пачалі ствараць свае выбарчыя камітэты. Іншымі справамі яны не займаліся [6, с.128].

Так вялі сябе асноўныя польскія палітычныя партыі на Беларусі на пачатковым этапе першай расійскай рэвалюцыі.

Літаратура і крыніцы

1. НДГА ў Гродне. Ф.34, 1, Д. 89.
2. НДГА ў Гродне. Ф.366, 1, Д. 89.
3. НДГА ў Гродне. Ф.366, 1, Д. 93.
4. НДГА ў Гродне. Ф.366, 1, Д. 96.
5. НДГА ў Гродне. Ф.399, 1, Д. 23.
6. Смалянчук А. Палякі Беларусі і Літвы ў рэвалюцыі 1905-1907 гг. – Гродна, 2001. – С.332.
7. Яцкевіч І. ППС на Беларусі // Беларуская мінуўшчына. – № 4. – 1997. – С.18-22.
8. Szuszkiewicz B. Organizacia Grodzienska PPS. – Warszawa, 1937. – S.61.

Д.В. Сківіцкі, ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

ПАЛІТЫКА БЕЛАРУСКАЙ ПАРТЫІ САЦЫЯЛІСТАЎ-РЭВАЛЮЦЫЯНЕРАЎ ВА ЎМОВАХ САВЕЦКА-ПОЛЬСКАЙ ВАЙНЫ І АКУПАЦЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Партыя беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р) пачала фарміравацца ў красавіку 1918 года. Ініцыятарам яе стварэння з’яўлялася народніцкая група БСГ на чале з Т.Грыбам і П.Бадуновай, выступіўшая супраць ЦК БСГ, якая падтрымлівала германскую арыентацыю Рады БНР.

У маі 1918 года гэтая група абвесціла аб стварэнні партыі беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў, у дэкларацыі ініцыятыўнай групы заяўлялася, што партыя будзе выступаць ад імя ўсяго працоўнага беларускага народа. У ёй падвыргалася рэзкай крытыцы палітычная лінія ЦК БСГ і яе правага крыла, якая працягвала супрацоўнічаць з «Мінскім беларускім народным урадам» – кааліцыяй палітычных груповак ліберальна-буржуазнага накірунку. Дэкларацыя тлумачыла прычыну краху БСГ. Левая яе частка з рэвалюцыйным светапоглядам адкалолася ад партыі, санкцыянаваўшай пасылку тэлеграмы кайзеру Германіі Вільгельму II, і, адклікаўшы сваіх сяброў з народнага сакратарыята, стварыла самастойную рэвалюцыйна-народніцкую сацыялістычную партыю – БПС-Р [4, с. 176].

Белэсэры прапаноўвалі ўласную канцэпцыю нацыянальнага адраджэння Беларусі. У яе аснову была пакладзена ідэя ўласна беларускага дзяржаўнага жыцця, з якой беларускія эсэры звязвалі перспектывы палітычнага, эканамічнага і духоўнага росквіту сваёй Бацькаўшчыны.

БПС-Р з самага пачатку свайго існавання ўзяло курс на неадкладнае здзяйсненне дзяржаўна-самавызначальнага ідэалу – да незалежнасці і міжнароднага прызнання БНР.

Як і большасць беларускіх нацыянальных партый, белэсэры не прызналі стварэння ССРБ, як нешта незаконнае, штучнае, прынесенае звонку.

Адначасова БПС-Р выступіла і супраць праводзімай камуністамі палітыкі ў адносінах да Беларусі, стварэння ЛітБелССР і адарванне Віцебскай, Смаленскай і Магілёўскай губерняў.

Хоць адначасова дзеячы беларускага нацыянальнага вызвалення, у тым ліку і белэсэры, рабілі пэўныя практычныя захады адносна беларуска-літоўскага збліжэння. У лістападзе 1918 года шэсць членаў Віленскай Беларускай Рады, сярод якіх быў і сябра БПС-Р Вацлаў Ластоўскі, увайшлі ў склад літоўскай Тарыбы. Згодна дасягнутаму пагадненню беларусам было прадстаўлена 25 працэнтаў у агульнай колькасці месцаў у літоўскім парламенце і адно – у Кабінеце Міністраў Літвы. Беларуская тэрыторыя ў складзе Літвы набывала статус аўтаномнай адзінкі з беларускай мовай у якасці дзяржаўнай. 1 снежня 1918 года ў літоўскім урадзе было створана Міністэрства беларускіх спраў на чале з сацыялістам-федэралістам Язэпам Варанкам, пад кантроль якога перайшлі Берасцейскі, Бельскі, Слонімскі, Ваўкавыскі, Сакольскі, Пружанскі, Белавежскі, Кобрынскі, Лідскі, Беластоцкі, Гродзенскі, Віленскі, Ашмянскі, Дзятлаўскі і Навагрудскі паветы [1, с. 243].

На заходняй мяжы Беларусі ў гэты час усё большая пагроза насоўвалася з боку адраджаючайся II Рэчы Паспалітай. Польскі Нацыянальны Камітэт (ПНК – KNP) які дзейнічаў з 1917 года ў Францыі на чале з лідарам буржуазна-памешчыцкай Народнай Дэмакратыі – Раманам Дмоўскім, рэпрэзэнтаваў адроджаную Польшчу і яе інтарэсы перад дзяржавамі Антанты, і імі жа ПНК быў прызнаны за легітымны ўрад маладой дзяржавы. 29 студзеня 1918 года выступаючы перад «вялікай чацвёркай» (ЗША, Францыяй, Вялікабрытаніяй, Італіяй) Р.Дмоўскі выказаў прэтэнзіі палякаў да

дзяржаўных межаў 1772 года і спадзяваўся на актыўную дыпламатычную і фінансавую падтрымку ў ажыццяўленні гэтых планаў [5, с. 189].

У ходзе Лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі з вязніцы горада Магдэбурга быў вызвалены Ю.Пілсудскі, які быў засуджаны да смяротнага пакарання і каб яго базбегчы выдаваў сабе за вар'ята. Але неўзабаве Ю.Пілсудскі прыбывае ў Варшаву дзе ўжо 22 лістапада атрымлівае пасаду Тымчасовага Начальніка Дзяржавы і склікае левасацыялістычны ўрад А.Марачэўскага, які да гэтага часу стаяў на чале Сацыял-дэмакратычнай партыі Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ). Новы ўрад, каб пазбегнуць магчымай сацыялістычнай рэвалюцыі ў краі, абвяшчае правядзенне карэнных сацыяльных рэформ на карысць працоўных [2, с. 622]. Але ўлада Пілсудскага не прызнавалася «вялікімі» дзяржавамі толькі да таго, як з Парыжа прыбыў прадстаўнік ПНК – І.Падарэўскі і стаў на чале ўрада Польшчы. ПНК перадаў свае паўнамоцтвы Ю.Пілсудскаму, ўлада Начальніка была прызнана Антантай, якая адразу паспрабавала выкарыстаць новаўтворануюдзяржаву ў сваіх уласных эканамічных і палітычных мэтах, галоўнай з якіх было знішчэнне Савецкай рэспублікі і ўлады бальшавікоў у Расіі, а таксама рэстаўрацыі былога рэжыму.

Дзяржавы Антанты актыўна дапамагалі ствараць польскія ўзброеныя сілы для будучага мілітарнага канфлікту, які распачаўся вясной 1919 года.

У красавіку польскія войскі Літоска-Беларускага фронту пад камандаваннем генерала Шаптыцкага захапілі Заходнюю Беларусь і частку Літвы з Вільняй. 22 красавіка 1919 года Ю.Пілсудскі выдаў «Адозву да насельнікаў былога Вялікага княства Літоўскага». У адозве кіраўнік польскай дзяржавы сцвярджаў, што польскія войскі нясуць свабоду і вызваленне ад бальшавіцкай навалы і інфармаваў аб загадзе па стварэнні на занятых тэрыторыях цывільнага кіравання на чале з буйным памешчыкам – Ежы Асмалоўскім [3, с. 216].

Пасля таго, як у ліпені 1919 года Літоўска-Беларуская ССР была цалкам акупавана польскімі войскамі, ЦК БПС-Р, устанавіў кантакт з кіраўніцтвам партыі польскіх сацыялістаў (І.Дашынскім), намагаючыся дабіцца перадачы «грамадзянскай улады» на Беларусі Радзе БНР [4, с.176]. Аднак польскія кіруючыя колы на словах пракламуючы ідэю федэрацыі Беларусі з Польшчай, на самой справе імкнуліся ператварыць беларускія землі ў неад'емную частку сваёй дзяржавы. Гэта прывяло да таго, што беларускія эсэры заявілі аб сваёй апазіцыі да польскай акупацыйнай улады. Сваю пазіцыю яны адкрыта прадэманстравалі на беларускім з'ездзе «Віленшчыны і Гродзеншчыны», скліканым па ініцыятыве паланафільскага крыла беларускага палітычнага руху. З'езд праходзіў з 9 па 12 чэрвеня 1919 года ў г.Вільні. Польскі ўрад на чале з І.Падарэўскім разлічваў, што яго удзельнікі падтрымаюць ідэю «уніі Беларусі з Польшчай». Аднак пад уплывам дэлегатаў эсэраў з'езд выказаўся за адраджэнне літоўска-беларускай дзяржавы ў межах былога ВКЛ. Аб'явіўшы, што будзе абараняць «нацыянальныя інтарэсы беларускага народа», БПС-Р рашуча адме-

жавалася ад прапольскай арыентацыі. Яе прадстаўнікі на гэтым з'ездзе нагадалі дэлегатам аб рашэннях Усебеларускага з'езда, які ў снежні 1917 года выказаўся за адстойванне рэспубліканскага ладу на Беларусі [4, с. 176].

Разгарнуўшаяся рэвалюцыйна-вызваленчая барацьба працоўных Беларусі супраць польскіх інтэрвентаў паскорыла палітычную эвалюцыю партыі беларускіх эсэраў. Ужо ў верасні 1919 года кіраўніцтва партыі заявіла, што ідэю незалежнасці рэспублікі можна рэалізаваць толькі Працоўны кангрэс, абраны на аснове усеагульнага выбарчага права ўсімі працоўнымі слаямі беларускага народа. Згодна з эсэраўскімі ўстаноўкамі, у яго склад не павінны быць дапушчаны прадстаўнікі кіруючых класаў – буржуазіі, памешчыкаў і духавенства. Гэтымі захадамі белэсэры ішлі насустрач бальшавікам [1, с. 245].

11 ліпеня 1919 года ў газеце «Беларуская думка» ЦК БПС-Р апублікаваў дэкларацыю, у якой заявіла, што бліжэйшай мэтай партыі з'яўляецца зацвярджэнне незалежнасці і сапраўднага суверэнітэту БНР. Пры гэтым важна было дасягнуць згоды паміж рознымі палітычнымі партыямі. Таму ЦК БПС-Р выдзвінула задачу стварэння агульнага фронту барацьбы за вызваленне Беларусі. Гэтая прапанова была адрасавана ў першую чаргу бальшавікам.

Апынуўшыся ў апазіцыі да польскіх акупацыйных улад, беларускія эсэры ў лістападзе 1919 года на сваёй канферэнцыі, якая праходзіла ў Мінску, заявілі аб разрыве з тымі палітычнымі партыямі, якія арыентаваліся на Польшчу. І на гэтай жа канферэнцыі яны абвясцілі сабе «трэцяй сілай», змагаючайся за нацыянальную незалежнасць на два франты: і супраць польскіх інтэрвентаў, і супраць «імперыялістычна-маскоўска-дзяржкінскай сілы», якая ідзе з Усходу. Зараз, змяніўшы тактыку, партыя беларускіх эсэраў заявіла аб адмове барацьбы з Савецкай уладай, пацвердзіла непрыняцце кааліцыі з буржуазна-нацыяналістычнымі партыямі. Гэтым самым крокам яна адкрывала перспектыву для заключэння кампрамісу з бальшавікамі ў сферы нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва.

Змена палітычнага курсу беларускіх эсэраў наблізіла іх з камуністамі. Хаця паміж імі па-ранейшаму заставаліся вострыя супярэчнасці. У снежні 1919 года па ініцыятыве ЦК КП(б)ЛіБ у г.Смаленску адбылася нарада з прадстаўнікамі БПС-Р. На ім было выпрацавана пагадненне аб сумеснай барацьбе за ўстанаўленне і аднаўленне беларускай дзяржаўнасці. У дамове, падпісанай прадстаўнікамі КП(б)ЛіБ і БПС-Р, падкрэслівалася, што абедзве партыі бяруць на сабе абавязкі абараняць сацыяльныя інтарэсы беларускага працоўнага народа. З боку беларускіх эсэраў гэтае пагадненне падпісалі члены ЦК: П.Бадунова, І.Мамонька, М.Асвяцімскі, Ф.Шантыр [4, с. 180].

Кампраміс паміж бальшавікамі і эсэрамі паклаў пачатак новаму этапу барацьбы за адраджэнне Беларусі. У красавіку 1920 года ЦК КП(б)ЛіБ у адпаведнасці з указаннямі ЦК РКП(б) увёў сваіх прадстаўнікоў у беларускі паўстанцкі камітэт, арганізаваны беларускімі эсэрамі ў г.Мінску. Ён

выконваў функцыі каардынацыйнага цэнтра па арганізацыі супраціву польскім інтэрвентам [4, с. 180].

У ліпені 1920 года пасля вызвалення Мінска ад польскіх акупантаў белэсэры выказалі жаданне ўключыцца ў гаспадарчае і нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва на Беларусі. Аднак гэтае супрацоўніцтва працягвалася нядоўга. ЦК БПС-Р адмовілася падпісаць «Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ» (прынята 31 ліпеня 1920 года). Такое становішча спраў прывяло да разрыву ўзаемаадносін бальшавікоў з белэсэрамі і пераход апошніх у апазіцыю.

Такім чынам, БПС-Р прыйшлося змагацца ў Заходняй Беларусі падчас савецка-польскай вайны як супраць буржуазна-памешчыцкай Польшчай, так і супраць бальшавікоў, пазнаючы жорсткасць рэпрэсій за свае палітычныя погляды з абодвух бакоў.

Літаратура і крыніцы

1. Глушакова Н.А. Была такая партыя // Маладосць. – 1998. – С. 243.
2. Dzieje Polskie pod redakcj№ J.Topolskiego. – Warszawa, 1976. – S. 622.
3. Garlicki A. Jyzef Piisudski 1867 – 1935. – Warszawa, 1988. – S. 216.
4. Сташкевич Н.С. Партия Белорусских социалистов-революционеров // Минск. – Згода. – 1994. – №2. – С. 176
5. Skardzicski B. Polskie lata 1919 – 1920. – T. 1. – Warszawa, 1993. – S. 189.

С.А. Фядзечка, ПФ БДЭУ, г. Мінск

БЕЛАРУСЫ ЯК НАЦЫЯНАЛЬНАЯ МЕНШАСЦЬ У КАНТЭКСЦЕ ВЕРСАЛЬСКАЙ СІСТЭМЫ

Ва ўмовах стварэння новай польскай дзяржаўнасці асноўнай крыніцай рэгулявання становішча нацыянальных меншасцей на яе тэрыторыі было міжнароднае права. Па заканчэнні першай сусветнай вайны ў Еўропе ствараецца сістэма бяспекі, заснаваная на Версальскіх мірных пагадненнях. Галоўнай геапалітычнай прычынай падпісання шэрагу дагавораў стаў не толькі факт сканчэння вайны, але і факт узнікнення новых дзяржаў на палітычнай карце Еўропы. Неўпэўненасць краін-пераможцаў у этнічнай сітуацыі ў новых межах паміж такімі дзяржавамі, як Чэхаславакія, Румынія, Венгрыя, Польшча, Германія, Аўстрыя і інш., прывяла да ўзнікнення сістэмы міжнароднага права па забеспячэнню правоў нацыянальных меншасцяў.

Адносна нацыянальнай палітыкі яшчэ перад адраджэннем Польшчы вылучыліся дзве канцэпцыі. Першая, найлепей сфармуляваная нацыянальна-дэмакратычным рухам, была развіццём формулы, якая агалошвала перавагу нацыянальных інтарэсаў у адносінах да дзяржавы і грамадства, а таксама прызнавала натуральнасць нацыянальных канфліктаў [1, с. 62].

Адпаведна гэтай канцэпцыі ролю гаранта стабільнасці і незалежнасці польскай дзяржавы павінен быў выконваць польскі народ, бо валодаў значнай перавагай у гаспадарчым жыцці і культурным развіцці перад астатнімі. Іншыя народнасці павінны былі падпарадкавацца гэтай палітычнай, эканамічнай і культурнай перавазе палякаў. Такая праграма адмаўляла нябольскім жыхарам дзяржавы права на свабоднае нацыянальнае жыццё, робячы з іх грамадзян ніжэйшай катэгорыі. Канкрэтна гэта прыводзіла да паланізацыі беларусаў і ўкраінцаў [1, с. 303], ізаляцыі яўрэяў ад грамадскага жыцця і аслаблення гаспадарчай і палітычнай пазіцыі немцаў, а ў перспектыве павінна была адбыцца паланізацыя занятых імі тэрыторый. Выразам гэтай дактрыны была тэрытарыяльная праграма Народнай Дэмакратыі, вядомая пад назвай «інкарпарацыйнай» [1, с. 320].

У апазіцыі да нацыяналістычнай думкі заставаліся прапагандуючыя вырашэнне нацыянальнага пытання праз талерантнасць і суіснаванне. Яны зыходзілі з таго, што механізмы стварэння І Рэчы Паспалітай змогуць дапамагчы стварыць новую, другую, Рэч Паспалітую ўжо ў федэратыўнай форме [2, с. 23]. Пры гэтым уступленне ў федэрацыю павінна быць дабраахвотным, а сам федэратыўны тып дзяржавы павінен прывясці да дэмакратызацыі ўнутраных стасункаў і гарантаванага прызнання праў усіх народнасцяў. Адну з перашкод поглядаў федэралістаў, на погляд аўтара, складала думка, што этнічныя межы ва Ўсходняй Еўропе немагчыма вызначыць, а права на самавызначэнне належыць таксама палякам, якія пражываюць на Ўсход ад Сана і Буга; у гэтым выпадку праграма была прадстаўлена як прыклад рэалізацыі права на самавызначэнне народаў [3, с. 488]. Частка польскіх палітыкаў, а перш за ўсё Ю.Пілсудскі, выкарыстаўвала федэрацыйную канцэпцыю пераважна для вырашэння нейкіх тактычных пытанняў.

Тыповай праявай такога становішча былі спрэчкі ў польскай дэлегацыі перад парыжскім кангрэсам. Польскія нацыянал-дэмакраты начале з Р.Дмоўскім выступалі за стварэнне моцнай дзяржавы паміж Германіяй і Расіяй. З гэтай нагоды Р.Дмоўскі лічыў, што «федэрацыя – гэта слабасць, а не сіла, таму што ўласна няма з кім ствараць федэрацыю. Якое ж панства створыць та Літва? У межах гістарычных, то хто там будзе кіраваць, з кім ствараць федэрацыю? Не магчыма ўявіць у Еўропе краіну, у якой бы панавала такая каша з адногот боку элементу літоўскага, з другога боку элементу беларускага, з трэццяга боку напалову бальшавіцкай напалову антыпольскай яўрэйскай анархіі, і ўрэшце, чацьвёртага боку – польскага насельніцтва, апіраючагася на буйную зямельную ўласнасць, якая там хутка знікае».

У рамках дыскуссіі па гэтай праблеме Антоні Суйкоўскі прапанаваў адваротнае: аставіць этнічную Літву па-за межамі Польшчы; прадухіліць канчатковы падзел беларускай народнасці ў выніку інкарпарацыі і русіфікацыі ўсходняй часткі; у створанай федэрацыі павінен існаваць відавочны падзел паўнамоцтваў паміж суб'ектамі (Польшча, Літва (!!!) і Украіна) і цэнтрам. Такім чынам, унутраная сітуацыя ў Польшчы спрыяла доў-

гаму абмеркаванню і калегіяльнаму вырашэнню праблемы нацыянальных меншасцяў. У выпадку гвалтоўнага вырашэння гэтага пытання на карысць прыхільнікаў інкарпарацыі новая польская дзяржава атрымоўвала значныя ўнутраныя праблемы ў міжнацыянальных адносінах.

Трактаты аб правах нацыянальных меншасцяў былі падпісаныя ў аднабаковым парадку прадстаўнікамі малых дзяржаў. Другі бок – вялікія еўрапейскія дзяржавы ў адносінах да сябе ніякіх абавязкаў не прымалі. У выніку заключэння Версальскіх пагадненняў узнікшыя дзяржавы вымушаны былі падпісваць не толькі агульныя дакументы, але таксама, пад ціскам вялікіх дзяржаў, і дамоўленасці аб правах нацыянальных меншасцяў. Дагавор з Польшчай быў падпісаны першым 28 чэрвеня 1919 года ў Версалі і ўступіў у сілу разам з Версальскім дагаворам 10 снежня 1920 года. Падобная сітуацыя растлумачвалася проста – дзяржаў-пераможцаў найбольш хвалявала вырашэнне праблемы Горнага Шлёнска і іншых тэрыторый былой кайзераўскай Германіі, якія адыходзілі да Польшчы. Горны Шлёнск значны час належыў Германіі, і плебісцыт аб уключэнні яе ў склад Польшчы месцамі выліваўся ў узброеныя сутыкненні немцаў і палякаў. Далейшае развіццё сітуацыі падмацоўвае нашу канцэпцыю: 15 мая 1922 г. Польшча на перамовах з Германіяй у Жэневе прыняла далёка ідучыя абавязкі ў адносінах да нямецкай меншасці, у Лізе Нацый адразу (16 мая 1922 года) ствараўся механізм назірання за правамі нямецкай меншасці на працягу 15 гадоў [4, с. 12]. Гэтыя дамоўленасці прадугледжвалі правы па набыцці грамадзянства, агульнавядомыя грамадзянскія правы (роўнасць, ахова жыцця, свабоды і г.д.), а таксама пэўныя правы нацыянальнай меншасці. Адной з галоўных падстаў для рэалізацыі гэтых правоў былі вынікі перапісаў насельніцтва [4, с. 53], ствараючы з перапісу падзею, значна ўплываўшую на нацыянальную палітыку польскай дзяржавы. Нягледзячы на універсальнасць юрыдычных норм па абароне праў нацыянальных меншасцяў II Рэчы Паспалітай, фактычна галоўныя бакі версальскіх дамоўленасцяў былі накіраваны толькі на развязанне праблемы Горнага Шлёнска.

Аб поглядах краін Антанты на праблему славянскіх меншасцяў Польшчы можна дагадвацца па прапанове лорда Керзона (т.зв. «Лініі Керзона»). Падобная прапанова сведчыць аб тым, што вырашэнне гэтай праблемы Антанта бачыла ў пабудове рэгіянальнай сістэмы міжнароднага права, у якой павінны былі ўдзельнічаць і краіны са складу былой Расійскай Імперыі. Ва ўсялякім разе, краіны Антанты не лічылі мэтазгодным уключэнне беларускіх, украінскіх і літоўскіх земляў у склад Польшчы. Агульнавядомая недасканаласць версальскай сістэмы адбілася і на становішчы беларускай нацыянальнай меньшасці ў II Рэчы Паспалітай. Нягледзячы на распрацаваную сістэму абароны правоў, яна павінна была ўдакладняцца праз заключэнне рэгіянальных дагавароў і праз стварэнне нацыянальных інстытутаў абароны нацыянальных меншасцяў.

1. Wapicski R., Z dziejyw tendencji nacjonalistycznych. O stanowisku Narodowej Demokracji wobec kwestii narodowej w latach 1893-1939 // Kwartalnik Historyczny. – 1973. – № 4.

2. Tymieniecka A., Polityka Polskiej Partii Socjalistycznej w latach 1924 – 1928. – Warszawa, 1969.

3. Grunberg K., Polskie koncepcje federalistyczne 1864–1918. – Warszawa, 1971.

4. Kutrzeba St. Mniejszosci narodowe w najnowszem prawe. – Lwow. 1925

Ю.В. Черняк, БарГУ, г. Барановичи

УКРАИНСКИЕ НАЦИОНАЛИСТИЧЕСКИЕ ОРГАНИЗАЦИИ НА ТЕРРИТОРИИ ЗАПАДНОЙ БЕЛОРУССИИ НАКАНУНЕ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

Среди проблем, опосредованно влияющих на белорусско-украинские отношения, важное место занимает проблема, связанная с деятельностью антисоветского украинского движения на территории Беларуси. Проблема является сложной, противоречивой, привлекающей внимание политиков, вызывающей интерес у учёных-историков и эмоции у населения. Объясняется это в равной степени как трагичностью судьбы этого движения, так и неоднозначностью сведений о нём.

Длительное время в крайне редких публикациях по этому вопросу наблюдалось либо произвольное, либо заданное непонимание специфики деятельности украинцев в южных районах республики. Дело в том, что там была благоприятная почва для антисоветского украинского движения, так как на белорусском Полесье в первой половине XX века проживало определенное количество украинскоязычного населения. Это доказывают этнические и лингвистические карты, из которых видно, что северная граница распространения украинского языка в Брестской области проходит по линии Пружаны – Пинск [1, с. 54]. Во время фашистской оккупации Брестчина вошла в состав рейхскомиссариата Украина, поэтому украинцы действовали здесь на «законных» основаниях.

Ведущее место в деятельности антисоветского украинского движения в предвоенный период на территории Западной Белоруссии имело большое влияние петлюровское движение. Петлюровцы пропагандировали идею консолидации всех творческих сил на базе республиканской концепции Украинской Народной Республики как законного Государственного Центра Украины. Они воспитывали молодых людей в духе всенародного милитаризма. Их культ Народной Республики постепенно превращался в петлюровское движение.

В тридцатые годы на Полесье начинает развиваться молодёжное петлюровское движение. На Полесье этим движением среди молодёжи руководил Василий Раевский под командованием полковника Ивана Литвиненко. Националистическое движение полковника Коновольца под идеологическим влиянием Дмитрия Донцова в 30-х годах встало на путь тотального противоречия с государственной концепцией Украины 1917–1921 годов. На её место это движение выдвинуло совершенно новую концепцию – концепцию так называемой националократичной державы. Эта концепция начала проникать на Полесье из эмиграции. Это была уже вторая (после монархической) антикоммунистическая идея националистического лагеря, которая боролась за влияние.

По причине низкого уровня национального самосознания полесского населения при помощи сотника Раевского и полковника Литвиненко националисты начали свою деятельность среди молодёжи. Зимой 1932-1933 года на Полесье была основана небольшая подпольная организация под названием «Украинское национальное возрождение» [2; с. 385], главой которой был избран Тарас Боровец-Бульба. Деятельность указанной организации была направлена на распространение украинской националистической прессы и литературы.

Законы Польши были настолько гибкими, что то, что пропускала цензура в г.Варшаве, не могло появиться в г.Львове, а то, что пропускалось в г.Львове, не могло выйти в г.Луцке, а то, что легально выходило в г.Ровно или г.Луцке, было запрещено в соседнем Полесье. Каждый воевода действовал на правах абсолютного феодала. Об издании украинской газеты на Полесье не могло быть и речи. При таких условиях всякая украинская литература привозилась на Полесье неофициально из городов Львова и Луцка. Эта литература, несмотря на государственные ограничения, имела большое значение. На протяжении неполных двух десятков лет, без школ и государственных субсидий, Полесье практически превратилось в украинскую провинцию.

Начав свою деятельность на территории Полесья, УНВ решила:

• не выступать как политическая партия;

• в строгом подполье переформироваться в военно-революционную организацию;

• для расширения влияния среди населения использовать всякие другие официальные организации, вплоть до евангельских сект (они имели полную свободу действий и сборов);

• членство в организации должно было быть очень доверительным, а не массовым;

• сознательно не включаться ни в одну партию, стоять на государственной платформе политического и военного движения Семёна Петлюры и действовать под государственным флагом Украинской Народной Республики;

• всё оружие в своей борьбе направить против коммунистической партии, российской империи и польской реакции [3, с. 38-39].

Полковник Иван Литвиненко находился в г.Ровно. По приказу правительства Украинской Народной Республики он руководил украинской разведкой на польско-советской границе. Тарас Боровец-Бульба сразу стал его курьером. Члены УНВ доставляли на советскую территорию директивы правительства Украинской Народной Республики и националистическую литературу, а обратно – различные материалы, советскую прессу и книги.

Эта деятельность была особенно активной во время великого голода на Украине 1932-1933 годов. Члены УНВ приносили с советской стороны целую массу образцов «хлеба», выпеченного из коры деревьев, листьев, свеклы.

Постепенно Украинское национальное возрождение укрепилось, направило свою деятельность на воспитание молодёжи в духе военно-революционных традиций. Встал вопрос о том, что, кроме политических организаций, необходимо создать организацию военного типа.

В результате военных событий 1939 года высшее руководство Украинского национального возрождения было отрезано от самой организации. В связи с этим в ноябре 1939 года в г.Холме состоялось совещание неполной высшей управы УНВ, на которой присутствовали полковник Литвиненко, сотник Раевский и Тарас Боровец-Бульба. На совещании было решено, что Тарас Боровец-Бульба должен вернуться на Полесье и провести реорганизацию УНВ.

Уже в мае 1940 года план этих действий был готов. На совещании, которое Тарас Боровец-Бульба провёл 20 июня 1940 года среди своих помощников на Полесье, был принят приказ следующего содержания:

1) готовить УНВ и все революционные силы к военным действиям, базируясь на кадрах УНВ;

2) заложить свою главную Базу на Полесье и сформировать штаб из имеющихся кадров;

3) проверить состояние активного подполья УНР по всей Украине;

4) стараться восстановить старые или создать новые тайные точки революционной организации по всех областях;

5) с началом войны сразу поставить под оружие территориальную партизанскую армию, подписывать все документы как Командующий атаман украинских повстанческих войск;

6) большие оперативные военные объединения держать главным образом на Полесье;

7) пока не будет политических предпосылок для организации регулярной армии и своей Суверенной Украинской Державы, не поднимать массового восстания, а быть только очагом постоянной борьбы;

8) пока не будет дальнейших приказов и директив правительства, не признавать оккупантов Украины, а широко пропагандировать идею Суверенной Державы, маневрируя между всеми чужими силами на своей территории;

9) на случай отсутствия связи с правительством, действовать по ситуации [3, с.75-76].

Петлюровское движение к тому времени организационно было почти парализовано. Были порваны нити связи. Осталось мало населённых пунктов, где действовал старый пароль петлюровского подполья. Постепенно восстанавливались старые и налаживались новые связи.

К концу 1940 года петлюровцы отработали более-менее точную схему своей новой организации, которая окончательно оформилась в 1941 году. Она имела следующую структуру:

1. Главная Команда.

2. Две или максимум четыре области составляли Окружную Сечь с территориальным названием (Полесская сечь).

3. Область – областная бригада с названием области.

4. Район – районный полк с названием района формирования.

5. От двух до пяти сёл составляли курень (батальон) с названием района и порядкового числа.

6. Село – сельская сотня с названием села.

7. Неполная сотня – отдел с названием населённого пункта [4, с.7-8].

Согласно приказу правительства Украинской Народной Республики, новая организация получила название Украинская повстанческая армия. Все организационные подразделения имели по возможности полностью сформированный костяк и находились до приказа в подполье.

На территории Полесья в предвоенный период была проведена колоссальная работа по украинизации местного «тутэйшага» населения. Это деятельность проводилась при помощи украинских культурно-просветительских организаций (например, «Просвита») и украинских политических партий. Это стало действенным подспорьем в формировании и деятельности на территории Беларуси антисоветского украинского движения и привело к возникновению зимою 1932-1933 года на Полесье подпольной организации под названием «Украинское национальное возрождение».

Литература и источники

1. Ширяев Е.Е. Беларусь: Русь Белая, Русь Чёрная и Литва в картах. – Мн., 1991.

2. Гуленка У. Палеская сеч Украінскай паўстанцкай арміі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 тамах. Т. 5. – Мн., 1999.

3. Боровец-Бульба Т. Армія без держави. Слава і трагедія українського повстанського руху. – Київ, Торонто, Нью-Йорк, 1996.

4. Откуда есть пошла Ненька-Украіна // Альфа. – №7. – 2000.

А.А. Новік, БДПУ імя М.Танка, г. Мінск

ВЫТОКІ АРМІІ КРАЁВАЙ

Я.Сямашка сцвярджае, што польскі рух Супраціўлення на беларускіх землях зараджаецца «адразу пасля прыходу савецкіх войскаў. Многія польскія ваеннаслужачыя, у першую чаргу афіцэры, якім удалося пазбегнуць палону і рэпрэсій, перайшлі на падпольнае становішча» [18, с. 9-10].

Загад аб стварэнні польскага падполля быў выдадзены 17 верасня 1939 г. галоўнакамандуючым польскай арміі маршалам Э.Рыдз-Сміглы [2, с. 79]. А 25(27) верасня 1939 г., напярэдадні акупацыі Варшавы войскамі вермахта, паводле рашэння вышэйшых афіцэраў «Войска Польскага», была створана «Служба за Перамогу Польшчы» (СПП), мэтай якой была далейшая барацьба з нямецкімі захопнікамі. 28 верасня 1939 г. Польшча капітулявала. Адначасова ў Францыі ў горадзе Анжэры быў створаны польскі эмігранцкі ўрад, які ўзначаліў генерал У.Сікорскі. Новае кіраўніцтва Польшчы адмовілася ад палітыкі «санацыі» і сродкаў яе рэалізацыі і ставіла сваёй мэтай падняць народ на ўсеагульнае паўстанне, аднавіць польскую дзяржаву і вярнуць ёй тэрыторыі ў межах да 1 верасня 1939 г., у тым ліку і тэрыторыі Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Літвы (Віленскага краю) [17, с.152; 3, с. 113]. Не прызнаючы законнасці дагавораў паміж Германіяй і СССР адносна Польшчы, а таксама ўключэння пералічаных вышэй тэрыторый у склад СССР, урад Сікорскага знаходзіўся ў стане вайны як з Германіяй, так і з СССР (так званая «тэорыя двух ворагаў»).

Зразумела, што, каб падняць народ на ўсеагульнае паўстанне, неабходна было стварыць падпольную ваенную арганізацыю, дзейнасць якой распаўсюджвалася б на ўсю тэрыторыю былой Польшчы. Таму ў лістападзе 1939 г., калі ўсталявалася сувязь фарміраванняў СПП з Парыжам, Сікорскі даручыў генералу К.Сасноўскаму – кіраўніку Камітэта міністраў па справах у краі – стварыць на базе СПП «усяпольскую ваенную арганізацыю» – «Саюз узброенай барацьбы» (СУБ) [2, с. 84].

Дзейнасць арганізацый і груп, якія падпарадкоўваліся эмігрыйнаму ўраду, распаўсюджвалася на ўсе тэрыторыі былой польскай дзяржавы. Таму ачагі супраціўлення савецкай уладзе пачалі ўзнікаць і на тэрыторыі «крэсаў усходніх» – у Гродне, Брэсце, Беластоку, Лідзе, Баранавічах, а таксама ў многіх невялікіх гарадах і мястэчках, вёсках. Найбольшая канцэнтрацыя ўзброенных груп, якія засталіся ад разбітага Войска Польскага, была ў Гродзенскай, Рудніцкай, Белавежскай, Налібоцкай і Ліпічанскай пушчах, у Аўгустоўскіх лясах [9, с. 256].

У 1939–1941гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічала некалькі даволі буйных польскіх падпольных арганізацый: СУБ, «Саюз барацьбы за незалежнасць Польшчы», «Стральцы», «Вызваленцы», «Сокал». У сваіх радах яны аб'ядноўвалі ўсе «антысавецкія контррэвалюцыйныя элемен-

ты пераважна польскай нацыянальнасці», якія расцэньвалі дзеянні СССР, а таксама Германіі як несправядлівыя і агрэсіўныя [7, с. 136].

Першыя польскія падпольныя арганізацыі ў Заходняй Беларусі ўзнікалі стыхійна, без узаемадзеяння і сувязі паміж сабой, без агульнай стратэгіі і тактыкі. Значная іх частка, у тым ліку «Стральцы», «Вызваленцы», «Саюз польскіх парыётаў», не жадалі падпарадкоўвацца камандаванню СУБ. Менавіта таму СУБ на Беларусі ў 1939–1941гг. «нельга разглядаць як агульнапольскі падпольны рух» [4, с. 129].

На думку даследчыка В.Барабаша, дзейнасць польскага руху Супрацыўлення ў Беларусі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ускладнялася таксама і «недостаточно гибкой концепцией эмиграционных властей о «двух врагах», которая не находила поддержки у части национально дифференцированного общества. Много белорусов, поляков и особенно евреев Западной Беларуси солидаризировалось с Советской властью после ее воссоединения с БССР» [2, с. 81].

Неабходна таксама адзначыць, што ўсе пракамуністычныя і дэмакратычныя арганізацыі Польшчы, і перш за ўсё найбольш буйныя польскія рабочыя партыі, поўнасцю прызнавалі правамернасць уваходжання заходніх вобласцей Беларусі і Украіны ў склад БССР і УССР і займалі пазіцыю неўмяшання ва ўнутраныя справы СССР [11, с. 3]. А амаль усе польскія буржуазныя партыі, лічылі гэта аб'яднанне чарговым падзелам Рэчы Паспалітай паміж СССР і Германіяй і працягвалі весці на заходнебеларускіх тэрыторыях актыўную палітычную і арганізацыйную дзейнасць, падпарадкаваную польскаму эміграцыйнаму ўраду [12, с. 16-17].

Магутным ударам па сацыяльна-палітычнай базе ўсяго польскага падполля, у тым ліку і СУБ, сталі шматлікія рэпрэсіі і дэпартацыі, а таксама аперацыі органаў дзяржаўнай бяспекі і ўнутраных спраў БССР, накіраваныя на ліквідацыю польскіх нелегальных арганізацый і праведзеныя напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Толькі яе пачатак здолеў выратаваць польскія падпольныя арганізацыі, у тым ліку і СУБ, ад поўнай ліквідацыі органамі НКДБ на тэрыторыі Заходняй Беларусі [5, с. 132].

У ліпені 1941 г. у Лондане пачаліся перамовы паміж паслом СССР у Вялікабрытаніі І. Майскім і генералам У.Сікорскім. Польскі бок узняў праблему ўсходніх граніц Польшчы, аднаўлення яе ў межах да верасня 1939 г. Савецкі бок прапанаваў адкласці гэта пытанне надалей [8, с. 115]. Нарэшце 30 ліпеня 1941 г. быў падпісаны давор аб аднаўленні савецка-польскіх дыпламатычных адносін і супрацоўніцтве ў вайне. У першым пункце пагаднення адзначалася: «Савецкі Саюз прызнае, што савецка-нямецкая дамоўленасць 1939 г. адносна тэрытарыяльных змен у Польшчы страціла сілу» [6; с. 115]. Такая формулёўка, аднак, давала магчымасць рознай яе інтэрпрэтацыі. Разам з тым, дагавор Сікорскага-Майскага прадстаўляў «амністыю» ўсім палякам, якія падвергліся рэпрэсіям і дэпартацыям пасля кастрычніка 1939 г. 14 жніўня 1941 г. у Маскве было падпісана савецка-польскае ваеннае пагадненне аб стварэнні на тэрыторыі СССР польскай арміі, якая павінна была стаць часткай узброенных сіл Польскай

Рэчы Паспалітай і «бороться против немецких грабителей плечом к плечу с советскими войсками» [10, с. 138].

Аднак дагавор Сікорскага-Майскага ад 30 ліпеня 1941 г. у сувязі з тым, што пытанне аб усходніх граніцах было адкладзена на пазнейшы тэрмін, пакінула ўсіх пры былых інтарэсах: палякі працягвалі лічыць гэту тэрыторыю сваёй, савецкае падполле – сваёй. На думку многіх гісторыкаў, у такіх абставінах на змену варожасці палякаў у дачыненні да СССР прыйшоў «недавер да ўсходняга саюзніка» [15; с. 116]. Таму мы можам сцвярджаць, што ўрэгуляванне савецка-польскіх адносін было толькі знешнім. На самой справе з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны дзейнасць польскага нацыяналістычнага падполля значна актывізавалася [3; с. 270].

14 лютага 1942 г. на аснове СУБ загадам У. Сікорскага было створана падпольнае ваеннае фарміраванне – Армія Краёва (АК), у якое ўвайшлі створаныя раней нелегальныя арганізацыі, што падтрымлівалі Лонданскі эміграцыйны ўрад. Згодна з дырэктывамі апошняга, кіраўніцтва АК на пачатковым этапе дзейнасці арганізацыі павінна было часова падтрымліваць з савецкімі партызанамі «саюзніцкія» адносіны, прытрымлівацца тактыкі «пасіўнай барацьбы», або «трымаць зброю ля нагі», і, разам з тым, кіравацца ў сваёй дзейнасці тэорыяй «двух ворагаў».

Аднак тут мы не павінны забывацца на тое, што акаўцы, згодна з савецка-польскімі дамоўленасцямі, атрымалі магчымасць змагацца супраць германскіх акупантаў, і змагацца «актыўна». Адначасова яны былі зацікаўлены і ў паслабленні СССР, з мэтай вырашэння пытання аб межах у сваіх інтарэсах. Таму саюзніцкія адносіны з савецкімі партызанамі, якія ўсталяваліся на пачатку дзейнасці АК, уяўлялі сабой «часовы нейтралітэт», які дазволіў польскім падпольшчыкам забяспечыць надзейны тыл і пачаць барацьбу, накіраваную на дасягненне сапраўдных мэт польскага руху Супраціўлення [1; с. 52].

Адначасова, паміж радавымі АК і яе «вярхушкай» часта «не было адзінства мэты ў барацьбе» [16; с. 47]. У доказ гэтаму можна прывесці выпіску з пратакола допыту палоннага польскага партызана Грабоўскага Ч.І. ад 21 лістапада 1943 г.: «Сярод радавога саставу вядуцца размовы, што кіраўніцтва настройвае нас на барацьбу супраць партызан, украінцаў, літоўцаў і г.д., замест таго, каб сумесна з імі змагацца з немцамі... Я разумею, што страляючы ў партызан, мы тым самым страляем у свабоду польскага народа. Я асабіста нічога зрабіць супраць загаду не змог... Толькі кіраўніцтва імкнецца да барацьбы з партызанамі, а большасць салдат гатовы кожную хвіліну пайсці з партызанамі супраць сапраўднага ворага – немцаў» [14; л. 94].

На маю думку, усе пералічаныя вышэй факты і абумовілі разгортванне структурамі АК актыўнай антыфашысцкай дзейнасці на пачатковым этапе свайго існавання. Такім чынам, польскі рух Супраціўлення зарадзіўся на тэрыторыі этнічнай Польшчы адразу з пачаткам германа-польскай вайны 1 верасня 1939г. Узнікненне яго на тэрыторыі Заходняй

Беларусі многія гісторыкі звязваюць з уз'яднаннем «крэсаў усходніх» з БССР і УССР 17 верасня 1939 г.

У выніку гэтых падзей, створаны ў 1939 г. у Францыі польскі эміграцыйны ўрад узяў на ўзбраенне так званую тэорыю «двух ворагаў» – Германіі і СССР. Менавіта гэтай тэорыяй кіраваўся ў сваёй дзейнасці СУБ – «усяпольская ваенная арганізацыя», узнікшая на базе СПП ў 1939 г.

Абмежаванасць і вузкасць сацыяльна-палітычнай базы польскага руху Супраціўлення, выкліканыя, па-першае, шэрагам рэпрэсій, дэпартацый, іншых тэрарыстычных дзеянняў савецкіх улад, як у дачыненні да польскага насельніцтва Заходняй Беларусі, так і ў адносінах да польскіх падпольных арганізацый у 1939-1941 гг., па-другое, пазіцыямі пракамуністычных і дэмакратычных арганізацый Польшчы – абумовілі нізкую эфектыўнасць дзейнасці СУБ на тэрыторыі заходніх вабласцей Беларусі ў адзначаны перыяд.

Разам з пачаткам германа-савецкай вайны ў 1941 г. польскі эміграцыйны ўрад быў вымушаны пайсці на аднаўленне дыпламатычных адносін з СССР і на заключэнне з савецкім урадам шэрагу пагадненняў, у т.л. і аб супрацоўніцтве ў справе змагання з агульным ворагам – Германіяй. Пытанне аб межах, між іншым, засталося нявырашаным.

Гэта ў пэўнай ступені актывізавала дзейнасць польскіх нацыяналістычных структур, што знайшло сваё ўвасабленне ў стварэнні на аснове СУБ ў лютым 1942 г. Арміі Краёвай.

Літаратура і крыніцы

1. Армія Краёва на тэрыторыі Заходняй Беларусі // Матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі беларускіх і польскіх гісторыкаў. – Гродна, 1994.

2. Барабаш В.В. Поляки в антифашистской борьбе на территории Беларуси (1941–1944гг.). – Гродно, 1998.

3. Гісторыя Беларусі. У 2-х частках. Частка 2. XIX-XX стст.: курс лекцый. / Пад рэд. П.І.Брыгадзіна, У.Ф.Ладысева. – Мн., 2002.

4. Гісторыя Беларусі. У 2-х частках. Частка 2. Люты 1917–1997 гг. / Пад рэд. Я.К.Новіка, Г.С.Марцуля. – Мн., 1998.

5. Гуленка У. «Акаўцы», «бульбаўцы», «аўнаўцы»... Ці былі ў Беларусі антыфашысцкія і адначасова партызанскія фарміраванні або арганізацыі // Звязда. – 1991. – 20 лютага.

6. Документы и материалы по истории советско-польских отношений. – М., 1973. – Том 7.

7. Ермаловіч В. Стварэнне і дзейнасць Саюза ўзброеннай барацьбы ў Заходняй Беларусі (1939–1941 гг.) // Весці БДПУ. – 2001. – № 2.

8. Ермолович В.И., Жумарь С.В. Огнем и мечом. Хроника польского националистического подполья в Белоруссии (1939–1953 гг.). – Мн., 1994.

9. Каваленя А.А. Беларусь у выпрабаваннях вайны (1939–1945гг.). – Мн., 2001.

10. Літвін А.М. Акупацыя Беларусі (1941-1944): пытанні супраціву і калабарацыі. – Мн., 2000.

11. Літвін А.М. Армія Краёва // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Том 1. – Мн., 1993.
12. Літвін А.М., Паўлаў Я.С. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны // Нарысы гісторыі Беларусі. У 2-х тамах. Том 2. – Мн., 1995.
13. Міхнюк У. Саюз узброенай барацьбы // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Том 6. –
Мн., 2001.
14. Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь. Ф.3500. Воп.2. Спр.50.
15. Падзеі верасня-кастрычніка 1939г. у лёсе беларускага народа // Матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі, 17-18 верасня 1999 г. – Мн., 1999.
Доношу, что 7-го января сего года, в 12 часов дня, в местечке Холмеч, Речицкого уезда, Речицкий мещанин Александр Волоткович и крестьянин села Тульгович Степан Окуненко принадлежащие к польской партии социалистов убили урядника местечка Холмеч Алексея Черняка, убийство произошло при следующих обстоятельствах: урядник с женою шел из церкви и увидев собравшуюся толпу крестьян предложил разойтись. Из толпы вышел мещанин Володкович и Окунев, которые начали укорять урядника за то, что он совместно с Приставом произвел обыск у первого. По окончании угроз Володкович выстрелил в урядника; раненный урядник начал кричать о помощи, а затем видя, что помощи никто не подает скрылся в доме Помощника акцизного Надзирателя Перепечи. Вскоре к дому Перепечи под предводительством выше названных лиц явилась вооруженная толпа человек в 60 и начали ломать двери и окна. Урядник вырвал раму и выскочил в сад. Толпа догнала его и расстреляла из револьверов и ружей. Затем вооруженная шайка направилась к квартире урядника, разгромила последнюю, уничтожив все вещи и одежу и забрала около 150 рублей казенных и собственных урядника денег. Володкович и Окунев скрылись. Задержано 9 человек, производится полицейское и негласное дознание.

Ротмистр Нартов [13].

ДОНЕСЕНИЕ МИНСКОГО ГУБЕРНАТОРА П.Г. КУРЛОВА В ДЕПАРТАМЕНТ ПОЛИЦИИ О ДОЗНАНИИ ПО ДЕЛУ ОБ УБИЙСТВЕ УРЯДНИКА А. ЧЕРНЯКА

16 февраля 1906 г.

Секретно

По делу об убийстве в мест. Хойниках урядника Черняка полицейским дознанием установлено, что убийцы последнего крестьяне Александр Волоткович, Степан Окуленко... имели постоянное местопребывание в с. Тульговичах, расположенном в районе 2-го стана Речицкого уезда и являющемся гнездом революционеров. Произведенным в названном селе обыском найдено и отобрано от крестьян 38 ружей и в квартире Окуленко найдено одно охотничье ружье и три револьвера, один из которых принадлежал покойному Черняку; там же найдены разные нелегальные брошюры, прокламации и вообще переписка, указывающая на принадлежность Окуленко и всех его товарищей к преступному сообществу, деятельное участие в котором принимали также мать Окуленко – Ульяна Окуленко, его брат Михаил и еврей Арон Янкелев Фридман... все поименованные лица задержаны и заключены под стражу, а произведенное о них дознание полицией передано жандармской власти...

И. д. Губернатора Курлов

Исп. об. Правителя Канцелярии Данилов *[14]*.

6 апреля 1907 г. А.Волоткович, А.Гапоненко и В.Стасенок осуждены к смертной казни, «причем Суд постановил ходатайствовать о помиловании их», остальные обвиняемые были оправданы (11, д. 8, ч. 32, т. 3, л. 28).

Исследователям удалось установить численность боевиков в период революции 1905–1907 гг. Самой большой была Боевая организация ППС – в ней насчитывалось 7631 человек. В боевых организациях, подчиненных НДП, и прежде всего в НРС, состояло свыше 1000 боевиков. В СДКПиЛ их численность колебалась в пределах 1000–1500 человек. Гораздо малочисленнее была Боевая организация ППС-"Пролетариата» [5, с 38].

Царские правоохранительные органы боролись против боевых организаций, пользуясь услугами своей агентуры. Документы департамента полиции изобилуют материалами об арестах боевиков. К арестованным после уголовного расследования и судебного разбирательства применялись суровые наказания – длительное тюремное заключение, каторга, смертная казнь. Таким образом в 1907 г. усилиями полиции практически были ликвидированы Боевые организации СДКПиЛ и ППС-"Пролетариата».

Оставшиеся на свободе боевики НРС совершали террористические акты практически только против социалистов. Активно продолжала действовать лишь Боевая организация ППС, хотя и ее ряды понесли серьезные потери: из 7631 боевика, которые действовали в период революции 1905–1907 гг., полиция арестовала 5489 – то есть, 62,6 % [7, с. 83].

Теперь обратимся к статистике. Всего за время революции 1905–1907 гг. на территории Королевства Польского было совершено 3166 боевых акций (в 1905 г. – 1441, в 1906 г. – 1090, в 1907 г. – 635). Террористические акты и вооруженные нападения были совершены в 1108 населенных пунктах. Число убитых в результате террористических актов и умерших от ран воинских чинов, жандармов, полицейских за 1905 г. и за четыре первых месяца 1906 г. составило 127 человек, раненых – 207 человек. Боевиками партий действовавших на территории Королевства Польского было совершено 443 экспроприации и разбойных нападения на государственные и частные учреждения (захвачено – 600 143 рубля). Полиция изъяла 34 бомбы, 413 винтовок, 1244 пистолета, более 26 000 патронов [5, с 40].

Что же касается территории Беларуси, то здесь ситуация была в целом такой же. Вот что об этом говорит документ:

СТАТИСТИЧЕСКИЕ ДАННЫЕ О ЛИЦАХ, ПОСТРАДАВШИХ ПРИ ТЕРРОРИСТИЧЕСКИХ АКТАХ С ФЕВРАЛЯ 1905 г. ПО МАЙ 1906 г.
ноябрь 1906 г.

Вследствие резолюции Вашего Высокопревосходительства относительно проверки помещенных в «Практическом Враче» числовых данных об убитых и раненых при террористических покушениях с февраля 1905 г. по май 1906 г., имею честь доложить, что, на основании отзывов местных властей, числовые данные по сему предмету представляются в следующем виде:

Генерал-губернаторов, губернаторов и градоначальников – 8
Вице-губернаторов и советников губернских правлений – 5
Полициймейстеров, уездных начальников и исправников – 21
Жандармских офицеров – 8
Генералов (строевых) – 4
Офицеров (строевых) – 7
Приставов и их помощников – 79
Околоточных надзирателей – 125
Городовых – 346
Урядников – 57
Стражников – 257
Жандармских нижних чинов – 55
Агентов охраны – 18
Гражданских чинов – 85
Духовных лиц – 12
Сельских властей – 52
Землевладельцев – 51
Фабрикантов и старших служащих на фабриках – 54
Банкиров и крупных торговцев – 29
Всего: 1273 [15].

В среде русской администрации воцарилась атмосфера страха. В заключение хотелось бы сказать, что террор этот нравственно калечил не только самих исполнителей террористических актов – боевиков, но опосредованно и польское общество, снимая моральные ограничения и смещая нравственные оценки в самом польском обществе. Убийство террористами человека (представителя русской администрации) в большинстве своем одобрительно встречалось в польском обществе, так как в убийстве чиновника, офицера, полицейского поляки подсознательно видели уничтожение врага, что придавало им некоторую уверенность в противостоянии государственной машине подавления. Этот мотив в свое время отмечал Энгельс в письме к Марксу: «Террор – это главным образом ненужные жестокости, совершаемые испуганными людьми ради собственного успокоения».

Актуальность проблемы террора видна и сейчас. Террор изменил свои мотивы, инструменты, способы. Его сущность осталась той же.

Следует обратить внимание на период деятельности польских боевых организаций: это примерно 1901-1906 гг. Почему это время? Почему такие организации не появились в конце XIX века? Некоторые скажут: из-за незрелости политических партий и отсутствия непосредственных поводов к социальному взрыву. Но это далеко не так. К концу XIX века уже произошло чёткое разделение политических сил по идеологическим лагерям. Так что незрелыми политические партии не назовёшь. Что же касается взрывоопасной ситуации – то и в начале XX века таковой (в классическом значении понятия) в польском обществе не наблюдается. В чём же тогда причина?

Хотелось бы вспомнить, что период 1900–1904 гг. – это период нарастания революционных настроений в самой России. Такие настроения имели различный подтекст: экономический политический и т.д. Но непосредственной предпосылкой таких настроений стало проникновение в среду российского общественного мнения новых, революционных взглядов. Нечто похожее происходило и в польском обществе. Правда, имело другие корни – национальные. Кроме того, полякам хорошо запомнился опыт двух последних восстаний. Они прекрасно понимали, что столкновение лоб в лоб с российской военной машиной неминуемо приведёт к поражению любого восстания, если, конечно, это восстание не будет иметь общенародного характера. Но на такое восстание нельзя было рассчитывать: слишком много было противоборствующих движений в политической жизни Польши. Поэтому был избран иной вариант ведения войны – террор. Но чем же на самом деле являлся польский террор? После нескольких лет исследований можно сказать с определённой долей уверенности – революцией! Ведь если вспомнить определение революции, то она представляется как насильственная смена власти. Так было и в этом

случае. Власть российского правительства сменялась властью страха. И всё это в атмосфере полнейшей безнаказанности террористов.

Данная тактика имела успех. Вскоре практически на всей территории, где действовали боевые организации, прервалась нормальная работа российской администрации. Правительство было в растерянности: полиция явно не справлялась, а армию использовать было бесполезно (армия не может воевать с невидимым противником). Казалось, Польша близка к обретению независимости. Но любая власть, даже власть террора, является лакомым куском для всякого рода авантюристов. С начала революции в состав польских боевых организаций начинают проникать всяческие уголовные элементы. В конечном счёте, их становится так много, что деятельность этих организаций меняет своё русло: из революционного в явно разбойное. А полиции с бандитами явно легче было справиться, чем с городскими партизанами. И к концу 1906 года практически все крупные боевые организации были разгромлены.

Литература и источники

1. Общественное движение на польских землях. Основные идейные течения и политические партии в 1864-1914 гг. – М., 1988. – С.112-116.

2. Gazeta Wilenska. – 1906.

3. Kraj. – 1882-1907.

4. Погодин А.Л. Главные течения польской политической мысли, 1863–1907 гг. – СПб., 1999. – С.63.

5. Pajak J. Organizacje bojowe partii politycznych w Krolewstwe Polskim, 1904–1911. – Warszawa, 1985. – S.37-44.

6. Kozicki S. Historia Ligi Narodowej (okres 1887–1907). – Londyn, 1964/ – S.51-55.

7. Wereszycki H. Historia polityczna Polski: (1846–1918). – Wrociaw – Warszawa – Krakyw, 1990.

8. Robotniczy. – 1905.

9. Смалянчук А. Польскі нацыянальны рух і беларускае Адраджэнне пачатку XX ст. – Гродна, 1995.

10. Смалянчук А. Беларускае пытанне ў польскім клерыкальным друку // Весці АН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 1994. – №4.

11. Государственный архив Российской Федерации (далее – ГАРФ). Ф. 102. Д-7. 1906 г. Д. 8. Ч. 32. Т. 5. Л. 9.

12. ГАРФ. Ф. 102. Д-7. 1906 г. Д. 8. Ч. 32. Т. 5. Лл. 14-14 (об.)

13. ГАРФ. Ф. 102. Д-7. 1906 г. Д. 8. Ч. 32. Т. 3. Лл. 5-5(об.).

14. ГАРФ. Ф. 102. Д-7. 1906 г. Д. 8. Ч. 32. Т. 3. Лл. 10-10(об.).

15. ГАРФ. Ф. 102. Ос. Отд. 1905 г. Д. 2554. Лл. 32-32 (об.)

16. Курлов П.Г. Гибель императорской России. – М., 1992.

17. Герасимов А.В. На лезвии с террористами. – М., 1991.

І.Р. Кулевіч, ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

СУТНАСЦЬ УСХОДНЯЙ ПАЛІТЫКІ ЎРАДА II РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

Прадстаўнікі польскай інтэлігенцыі разумелі, што адроджаная Рэч Паспалітая сутыкнецца з такой праблемай, як нацыянальнае пытанне. Асабліва калі ўлічваць, што артыкул №109 польскай Канстытуцыі 1921 г., які абвяшчаў роўнасць нацыянальных меншасцей, іх права на ўтварэнне органаў самакіравання, якія б займаліся захоўваннем сваіх культурных спадчын так і не быў ратыфікаваны польскім сеймам. Польская рэчаіснасць аказалася іншай. У большасці гэта тычылася палітыкі ў адносінах да нацыянальных меншасцей, у прыватнасці, беларусаў, якія пражывалі на «крэсах усходніх» і ў адносінах да якіх яшчэ ў канцы XIX ст. была вызначана будучыня.

Варожае стаўленне беларусаў да польскіх уладаў абумовіла той факт, што першапачаткова найбольшую актыўнасць у вывучэнні праблем беларускага руху ў даваеннай Польшчы праяўлялі службы бяспекі. У 1928 г. з падачы вайскоўцаў з'явілася праца «Krytki zarys zagadnienia biaioruskiego» [1], якая ўтрымлівала звесткі аб дзейнасці ўсіх беларускіх палітычных партый і арганізацый, існаваўшых на тэрыторыі Беларусі з 1902 па 1925 г. Яна была напісана на падставе дакументальных крыніц і накіравана ўсім прадстаўнікам польскай адміністрацыі ў якасці сакрэтнай інфармацыі.

Вялікі ўклад у вывучэнне беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі ўнеслі супрацоўнікі Instytuta badac spraw narodowoњciowych, створанага ў Варшаве ў 1921 г. У хуткім часе ў інстытуце былі створаны тры секцыі: міжнародная, якая займалася даследаваннем праблем нацыянальных меншасцей у свеце наогул, секцыя нацыянальных меншасцей у Польшчы і секцыя нацыянальных меншасцей у суседніх з Польшчай дзяржавах.

З 1927 інстытут пачаў выдаваць двухмесячнік «Sprawy narodowoњciowe», які праіснаваў да верасня 1939 г. Рэдакцыя часопіса ўзяла на сябе абавязак даваць чытачам аб'ектыўную інфармацыю па нацыянальнай палітыцы польскіх уладаў.

Першай працай, якую выдаў інстытут, была кніга К.Сракоўскага «Sprawa narodowoњciowa na kresach wschodnich» [2]. Асобны раздзел у ёй быў прысвечаны беларускай справе, у прыватнасці, этнічнай тэрыторыі ў складзе II Рэчы Паспалітай, сацыяльнаму, прафесійнаму, нацыянальнаму і канфесійнаму складу насельніцтва Заходняй Беларусі, даваўся кароткі агляд беларускага нацыянальнага руху. Як і Л.Васілеўскі, аўтар лічыў, што беларусы мелі нізкі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці. Гэтаму садзейнічала адсутнасць інтэлігенцыі і дыскрымінацыйная палітыка польскіх уладаў у галіне адукацыі на беларускай мове. Ён скептычна ставіўся да беларускай дзяржаўнасці, лічыў, што каб не Кастрычніцкая рэвалюцыя,

то ў бліжэйшыя два дзесяцігоддзі нічога аб незалежнасці Беларусі не было б чуць. Не суджана ажыццявіцца і ідэі федэрацыі Беларусі з Літвой. У працы К.Сракоўскага разглядаецца таксама дзейнасць ураду БНР на чале з В.Ластоўскім.

Другой працай, апублікаванай супрацоўнікамі Інстытута, быў артыкул Я.Ахоты «Z historii pacstwowotwyrczych poczynac biaiorusinyw» [3]. Ён уяўляе сабой перапрацоўку прац беларускіх нацыянальных дзеячоў.

У артыкуле П.Трайдэнскага «Biaioruskie stronnictwa polityczne w Polsce i ich ideologia» даецца класіфікацыя беларускіх палітычных партый і арганізацый, якія дзейнічалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі [4]. Аўтар згрупаваў іх наступным чынам: памяркоўныя з паланафільскім ухілам, незалежніцкія, якія знаходзіліся ў апазіцыі да польскай улады, і лева-радыкальныя камуністычнай арыентацыі.

Манаграфія С.Віслоўха «Rola Komunistycznej Partyi Zachodniej Biaiorusi w ruchu narodowoњciowym» [5] з'яўляецца паказчыкам усведамлення польскіх уладаў краху нацыянальнай палітыцы ў адносінах да беларусаў. Аўтар, які належаў да санацыйнага лагеру, тым не менш даволі аб'ектыўна падыйшоў да разгляду гэтага пытання. Ён даказаў на канкрэтных прыкладах цяжкае эканамічнае становішча заходнебеларускіх зямель у складзе Польшчы, сацыяльны і нацыянальны прыгнёт, паліцэйскі свавол і абумоўленую ўсім гэтым папулярнасць пракамуністычных ідэй сярод заходнебеларускага насельніцтва. У гэтым, на думку аўтара, вінавата супрацьлеглая палітыка польскага ўрада.

Па-іншаму напісана праца С.Ельскага «Sprawa biaioruska. Zarys historyczno-polityczny» [6]. Аўтар зыходзіў з пазіцый, што беларускі нацыянальны рух – гэта хімера, выкліканая правакацыямі з усходу. Яго не магло быць па сваёй сутнасці, бо беларусы не мелі ўласнай інтэлігенцыі і ўвогуле носьбітаў беларускай нацыянальнай ідэі.

У кнізе З.Урбаньскага «Mniejszoњci narodowe w Polsce» характарыстыка беларускай меншасці адбываецца ў спалучэнні з характарыстыкай і ў параўнні з іншымі нацыянальнымі меншасцямі II Рэчы Паспалітай – немцамі, украінцамі, літоўцамі, яўрэямі, чэхамі і рускімі [7]. Але гэтыя звесткі агульныя, чаго не скажаш пра раздзел, прысвечаны міжнароднай абароне правоў нацыянальных меншасцей.

Такім чынам, аналізуючы польскую гістарыяграфію міжваеннага перыяда, ахопліваючага 1921 – 1941 гг., можна зрабіць выснову, што яна мела на сабе адбіткі палітычнай сітуацыі. Распачаўшаяся з дэмаграфічных падлікаў польскага насельніцтва ў Паўночна-Заходнім краі Расійскай імперыі, паступова перайшла на шлях зацікаўленасці спачатку беларускім фальклорам і літаратурай, потым – гісторыяй беларускага нацыянальнага руху. Агульнае, што аб'ядноўвала польскіх даследчыкаў – гэта фанатычнае жаданне аднавіць Рэч Паспалітую менавіта ў межах 1772 г. Па меры ўзрастання рэалізацыі гэтай магчымасці перад польскай публіцыстыкай ставіліся новыя задачы. Галоўная з іх – даказаць спрадвечнае «гістарычнае права» Польшчы на Беларусь і супрацьстаяць нацыянальна-вызваленчаму руху ў Заходняй Беларусі. Гэтая мэта дасягалася рознымі сród-

камі. Найбольш распаўсюджаным быў спосаб перабольшвання колькаснай лічбы польскага насельніцтва на так званых «крэсах усходніх», прычым неважна, ці за кошт веравызнаўчага фактару, ці за кошт ужывання польскай мовы. Яшчэ адзін спосаб, які выкарыстоўвалі польскія публіцысты – гэта скептычнае стаўленне да перспектыў беларускай дзяржаўнасці. Адсюль зыходзіла характэрная для польскай гістарыяграфіі думка аб цывілізацыйнай і культурнай місіі Польшчы на Усходзе. Лічылася, што толькі Польшча можа стаць дзяржаўнатворчым элементам. У польскай гістарычнай думцы ІІ Рэчы Паспалітай амаль нічога не змянілася. За выключэннем толькі таго факта, што да беларусаў пачалі ставіцца як да нацыянальнай меншасці шматнацыянальнай Рэчы Паспалітай. Паказ беларускай гісторыі, стаўленне да беларускага нацыянальнага руху залежылі ад сімпатый ці антыпатый польскіх гісторыкаў да беларусаў.

Літаратура і крыніцы

1. Krytki zarys zagadnienia biaioruskiego. Sztab Generalny. Oddziai II (mnps.). – W., 1928. – 600 s.

2. Srokowski K. Sprawa narodowoњciowa na kresach wschodnich. – Krakyw: Yebethner i Wylff, 1924. – 56 s.

3. Ochota I. Z historji pacstwowotwyrczych poczynac biaioruskich // Sprawy narodowoњciowe. – № 1. – 1928. – S.11-21.

4. Trejdecski P. Biaioruskie stronnictwa polityczne w Polsce i ich ideologia // Sprawy Narodowoњciowe. – № 5-6. – 1930. – S.513-543.

5. Wysiouch S. Rola komunistycznej Partii Zachodniej Biaiorusi w ruchu narodowym Biaiorusinyw w Polsce. – Wilno: Instytut Naukowo-Badawczy Europy Wschodnej w Wilno, 1933. – 71 s.

6. Elski S. Sprawa biaioruska. Zarys historyczno-polityczny. – W., 1931. – 105 s.

7. Urbacski Z. Mniejszoњci narodowe w Polsce. – W.: Mniejszoњci narodowe, 1932. – 380 s.

А.І. Борка, ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

ДЗЕЙНАСЦЬ ГАРАДСКІХ РАДАЎ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 20–30 ГГ. XX ст.

Пасля заняцця тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1919 г. польскімі войскамі і падпарадкаванню іх Цывільнаму ўпраўленню ўсходніх зямель пачалі ствараццa органы гарадскога самакіравання. 25 чэрвеня 1919 г. было абвешчана распараджэнне Генеральнага камісара ўсходніх зямель аб выбарах у часовыя гарадскія рады [1].

Па меры далейшай акупацыі гарадоў у апошніх праводзіліся выбары ў гарадскія рады. Так, згодна з распараджэннем Генеральнага камісара ўсходніх зямель ад 25 чэрвеня 1919 г. былі праведзеныя выбары ў га-

радскія рады Брэста, Валкавыска, Гродна, Кобрына, Ліды, Навагрудка, Новай Вілейкі, Ашмян, Пінска, Пружан, Слоніма, Свянцян [2, с. 17].

Польскія ўлады ў гарадах Заходняй Беларусі ўстанавілі сістэму мясцовага самакіравання, падобную ў значнай ступені да сістэмы самакіравання гарадоў Польскага Каралеўства. Вызначалася яна распараджэннем Генеральнага камісара ўсходніх зямель ад 14 жніўня 1919 г. Аднак самакіраванне першапачаткова існавала толькі ў 19 гарадах (Брэст-Літоўск, Друскенікі, Гродна, Кобрын, Ковель, Ліда, Луцк, Лунінец, Навагрудак, Нова-Вілейка, Ашмяны, Пінск, Пружаны, Свянцяны, Слонім, Трокі, Вільня, Владзімір-Валынскі, Валкавыск) [3, с. 46]. Пазней 20 лютага 1920 г. быў выдадзены закон, які дазваляў міністру ўнутраных спраў распаўсюджваць на гарады былой расійскай акупацыі дэкрэт ад 4 лютага 1919 г. аб гарадскім самакіраванні [4, с. 318]. У сувязі з гэтым колькасць гарадоў з самакіраваннем была павялічана да 68 [3, с. 126-136].

Гарадская рада з'яўлялася распарадчым і кантралюючым органам гарадской гміны, выступала ад яе імя ў справах, якія належылі да галіны дзеянняў гміны. Да яе кампетэнцыі належылі наступныя справы: рада вызначала прынцыпы і спосаб выкарыстання гміннай маёмасці [3, с. 20]; набывала і прадавала нерухомую маёмасць, займалася справамі пазык і размяшчэння капіталаў; прымала гарадскі бюджэт і вызначала надзвычайныя выдаткі, а таксама ўносіла розныя змяненні ў гарадскі бюджэт; устанаўлівала памер падаткаў і выплат на карысць гміны; вызначала натуральныя павіннасці і замяняла іх грашовымі; прадстаўляла ўраду прапановы па пытаннях ўстанаўлення на карысць горада прамысловай манаполіі і ўвазных аплат; анулявала гмінныя запазычанасці, спагнанне якіх было немагчыма; устанаўлівала колькасць гарадскіх службовых пасад, ліквідавала іх, а таксама зацвярджала адпаведныя службовыя штаты; зацвярджала штат членаў магістрата; устанаўлівала тарыфы для брычак, трамваяў, а таксама іншых гарадскіх сродкаў камунікацыі; вызначала цэны на сродкі першай неабходнасці; займалася наданнем ганаровага грамадзянства; давала рэкамендацыі ў справах змянення межаў гміны; зацвярджала планы будаўніцтва; вызначала колькасць лаўнікаў; зацвярджала палажэнні ўласнай дзейнасці, камісій, магістрата; кантралявала дзейнасць гарадскога ўпраўленння і правярала яго справаводства, выбірала членаў магістрата [3, с. 21].

Згодна з распараджэннем ад 14 жніўня 1919 г. Генеральны камісар меў права распусціць гарадскую раду ці пазбавіць яе члена мандата [3, с. 44].

Планавалася, што першыя гарадскія рады, выбраныя па закону аб самакіраванні 1919 г., калі не будзе заканадаўчых змяненняў, будуць працаваць да 1 ліпеня 1922 г. [5]. Аднак гарадскія органы самакіравання, якія паспяхова ствараліся ў 1919-1920-х гг., у пераважнай большасці дзейнічалі аж да 1927 г. [6, с. 22].

Арганізацыя органаў гарадскога самакіравання знаходзілася пад пільным наглядам адміністрацыйных уладаў. Так, напрыклад, у пачатку 1921 г. палескі ваявода выдаў цыркуляр адрасаваны да павятовых старас-

таў у справе гмінных і гарадскіх рад, згодна якога падначаленыя яму старасты павінны былі прадастаўляць звесткі аб існуючых абраных і прызначаных гарадскіх радах. Згодна з другім цыркулярам, старасты павінны былі прадастаўляць ваявадзе штомесячныя справаздачы аб дзейнасці органаў гарадскога самакіравання [7, с. 7]. 21 лютага 1929 г. было выдадзена распараджэнне міністра ўнутраных спраў, адрасаванае ваяводам, згодна якога ваяводы павінны былі ажыццяўляць нагляд і зацвярджаць усе здзелкі з нерухомасцю гарадскіх рад [8].

Не заўсёды дзейнасць органаў гарадскога самакіравання адпавядала існуючай нарматыўнай базе. Так, міністэрства ўнутраных спраў у 1929 г. выдала цыркуляр, які павінен быў прадухіліць тэндэнцыю зацвярджэння гарадскімі радамі рашэнняў, насуперак існуючым нарматыўным актам, выплаты грашовай дапамогі членам магістрата ў сувязі са сканчэннем тэрміна паўнамоцтваў [9].

Польскія ўлады вельмі часта карысталіся правам роспуску гарадскіх рад, а пасля 1926 г. увогуле імкнуліся не дапусціць выбар такіх гарадскіх радаў, у якіх перавагу мела б апазіцыя. Скасоўваліся выбарчыя лісты, адмяняліся выбары, распускаліся гарадскія рады [10, с. 46]. Так, напрыклад, першая гарадская рада горада Брэста, якая існавала 6 гадоў і 9 месяцаў была распушчана 25 красавіка 1926 г. рэскрыптам міністра ўнутраных спраў з матывіроўкай няздольнасці прыняцця рашэнняў кваліфікаванай большасцю, другая – 26 красавіка 1928 г., як нездольная да плённай працы на карысць горада [11]. Пінская гарадская рада, якая своечасова не абрала главу магістрата, была распушчана ў сувязі з устанаўленнем дрэнных адносін з прызначанай на гэтую пасаду асобай. Як вынік – былі прызначаныя новыя выбары [12].

23 сакавіка 1933 г. быў выдадзены закон «Аб змяненні арганізацыі органаў тэрытарыяльнага самакіравання», які павялічыў тэрмін паўнамоцтваў гарадскіх органаў з 3 да 5 гадоў [3, с. 53]. Згодна з гэтым нарматыўнаму акту, кожны грамадзянін Польшчы, які дасягнуў 24-гадовага ўзросту, не менш за 1 год пражываў на тэрыторыі таго саюза самакіравання, дзе адбываліся выбары, а таксама валодаў выбарчым правам ў Сейм, меў права выбіраць гарадскія органы кіравання [3, с. 55]. Абранай магла быць асоба, якая на момант выбараў дасягнула 30 гадовага ўзросту. У склад гарадской рады, а таксама на пасаду лаўніка мог быць выбраны толькі грамадзянін Польшчы, які, акрамя валодання выбарчым правам у вышэйшыя органы, валодаў польскай мовай [3, с. 56]. Распараджэнне міністра ўнутраных спраў ад 17 кастрычніка 1933 г., якое на 5 гадоў адтэрміноўвала валоданне польскай мовай кандыдатамі на пасады ў органы самакіравання ва ўсходніх ваяводствах, не распаўсюджвалася на органы гарадскога самакіравання [13, с. 64]

Закон вызначаў наступную колькасць радных у гарадах: да 5 тысяч жыхароў –12 радных, ад 5 да 10 тысяч – 16 [3, с. 65], ад 10 да 25 – 24, ад 25 да 40 – 32, ад 40 да 60 – 40, ад 60 да 120 – 48, ад 120 да 180 – 56, ад 180 да 250 – 64, звыш 250 – 72 [3, с. 66].

Новым адносна ўсходніх ваяводстваў было тое, што гарадская рада магла пазбавіць свайго члена, калі ён не ўваходзіў у склад гарадскога ўпраўлення, мандата [3, с. 67].

Увогуле трэба адзначыць, што закон ад 23 сакавіка 1933 г. узмацніў нагляд дзяржавы над органамі самакіравання, у большай ступені падпарадкаваў іх адміністрацыйным уладам [10, с. 43].

У перыяд міжваеннага дваццацігоддзя гарадскія рады ў большасці гарадоў выбіраліся 4 разы: у 1919, 1927, 1934 і 1939 гадах [6, с. 21]. 16 жніўня 1938 года быў выдадзены апошні закон «Аб выбарах гарадскіх радных», які ўжо не рабіў ніякіх выключэнняў гарадам усходніх ваяводстваў. Згодна, з гэтым заканадаўчым актам, выбары ў гарадах, не выдзеленых з павятовага саюза самакіравання, прызначаў павятовы староста, у выдзеленых гарадах – ваявода. Узмацнілася роля адміністрацыйных уладаў у ажыццяўленні нагляду за правядзеннем выбараў [14, с. 1115]. Гэты закон таксама рэгуляваў працэдуру выбараў без галасавання [14, с. 1121].

Выбары ў гарадскія рады часам адбываліся ва ўмовах вострай палітычнай барацьбы, у якой часам дамінавала саперніцтва польскіх груповак (альбо шырэй – хрысціянскіх) і яўрэйскіх. Даходзіла нават і да супрацоўніцтва, якое адбывалася, нягледзячы на нацыянальны падзел, але гэта былі рэдкія выпадкі і сустракаліся яны толькі з боку левых сіл [6, с. 21]. Так, у выбарах у гарадскія і сельскія органы самакіравання, якія праходзілі ў 1926-1929 гг., рэвалюцыйныя арганізацыі рабочых выступалі адзіным блокам пад назвай «Рабочае адзінства». У яго уваходзілі прафсаюзы, ППС-левіца, «Сельроб», а таксама камуністы [15, с. 36].

У канцы 1930-х гадоў шырока распаўсюдзілася новая практыка – складанне адзінага кампраміснага спіса. У такім выпадку выбранне гарадской рады адбывалася без галасавання. Асабліва гэта было характэрна для Палескага ваяводства. Калі ў перыяд 1927-1928 гг. з 17 гарадоў толькі ў Косаве быў складзены кампрамісны спіс, то ў 1939 г. па такому прынцыпу былі абраныя рады ўжо ў 8 гарадах з 12 у гэтым ваяводстве. У Брэсце і Пінску выбары праводзіліся толькі часткова (у некалькіх акругах). Поўныя выбары адбыліся пры досыць высокай актыўнасці ў Ружанах (96 %) і Высока-Літоўску (83 %). У Ружанах адмовіліся ад саюзаў, створаных раней, бо, напрыклад, у агульным «хрысціянскім спісе» апынуліся 4 каталікі і 6 праваслаўных. Вялікая [6, с. 22] колькасць выпадкаў складання адзінага кампраміснага спіса не была чымсьці натуральным у палітычным і грамадскім жыцці. Гэта быў у асноўным вынік ціску адміністрацыйнай улады, а таксама аслаблення польскіх апазіцыйных партый, асабліва Польскай партыі сацыялістычнай, перад санацыяй.

Кааліцыі, якія ствараліся перад выбарамі ў гарадскія рады, часам былі дзіўныя. На мяжы 1925-1926-х гг. у Навагрудку ўзнік польска-беларуска-магаметанскі выбарчы камітэт на чале з прапольскім беларускім дзеячом Паўлам Алексюком, які потым садзейнічаў узаемапаразуменню з яўрэйскім камітэтам, аддаючы яму 13 з 24 мандатных месцаў у кампрамісным спісе. У сваю чаргу ў Смаргоні (Віленскае ваяводства) у 1927 г. на пасаду бурмістра быў абраны прадстаўнік нацыянальна-дэмакратыч-

най партыі, якая пракламавала антысеміцкія лозунгі. Яўрэйская фракцыя, якая падтрымала яго, узамен атрымала пасаду намесніка бурмістра і лаўніка. Аднак стараста не зацвердзіў абраную кандыдатуру, і бурмістр быў зацверджаны на пасаду шляхам прызначэння. Ім стаў прыхільнік кіруючага рэжыму. Да стварэння рознага роду выбарчых блокаў і саюзаў падчас выбараў органаў самакіравання падыход быў практычны і, у прынцыпе, не было складанасцей з узаемапаразуменнем паміж іх удзельнікамі.

Нягледзячы на ціск дзяржаўнай улады (пасля 1926 года востра ставілася пытанне запаўнення вакантных месцаў у органах самакіравання прыхільнікамі праўрадавай арыентацыі), у гарадскія рады ўсё-такі выбіраліся прадстаўнікі розных палітычных партый і нацыянальных груп. Аднак колькасць радных ад апазіцыйных груповак змяншалася больш, чым ад нацыянальных меншасцей [6, с. 23]. Так, напрыклад, падчас выбарчай кампаніі 1927 г. міністр унутраных спраў спецыяльна выдаў сакрэтны цыркуляр, у якім паліцыі і адміністрацыйным уладам прадпісвалася рабіць усялякія перашкоды пры выстаўленні кандыдатаў ад левых сіл [16, с. 159] Удзел прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей быў адносна прапарцыянальны нацыянальнаму складу гарадоў. Адхіленні ад гэтай заканамернасці праяўляліся хіба толькі ў павялічэнні перавагі палякаў у гарадскіх упраўленнях і большым удзеле яўрэяў у радах у 20-я гады і меншым прадстаўніцтве беларусаў на працягу ўсяго перыяду. У многіх выпадках гэта было вынікам невялікай колькасці беларускай інтэлегенцыі і слабога эканамічнага становішча гэтай часткі гарадскога насельніцтва.

Склад гарадскіх рад істотна ўплываў на шэраг рашэнняў, якія прымаліся органамі самакіравання і былі вельмі важнымі для асобных нацыянальных груп, напрыклад, па праблемах фінансавання прыватных школ, дабрачынных і культурна-асветніцкіх арганізацый, рабочай мовы на пасяджэннях, нядзельнага гандлю, пры прыёме служачых на працу ў магістрат і г.д. Гэта было важным таксама для фарміраваня адносін да дзяржавы на ніжэйшым узроўні ўладных структур [6, с. 23].

Увогуле трэба адзначыць, што агульны напрамак адносін польскай улады не спрыяў павялічэнню зацікаўленасці гараджан у выбарах, працы органаў гарадскога самакіравання. Асабліва гэта праяўлялася на прыкладзе невялікіх гарадоў. Так, пружанскі стараста ў сваёй справаздачы ў 1939 г. канстатаваў, што ў насельніцтва адсутнічае інтарэс да органаў самакіравання [17].

Літаратура і крыніцы

1.Regulamin wyborczy do tymczasowych Rad Miejskich. – Druk. Literacka, Brzeњж,1919. – 16 s.

2. Справочник учреждений і организаций, действовавших на территории Западной Белоруссии в 1919-1939 гг.. – Брест: Государственный архив Брестской области,1972. – 88 с.

3. Ustroj samorz№dy miejskiego w wojewydztwach wschodnich (oras w pow. grodziecskim i woikawyskim w woj. bieiostockiem). – Warszawa, 1933. – 134 s.

4. Dziennik Ustaw Rzeczypospoliteij Polskiej. – Warszawa, 1920. – №115. – Poz.91. – 514 s.

5. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей ДАБВ).Ф.2005. Воп.1. Спр.24. Арк.17.

6. Ян Ежы Мілеўскі. Нацыянальная структура гарадскіх рад у перыяд з 1919 па 1939 год у Віленскім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах // Беларускі гістарычны часопіс. – 2000. – №1. – С.21-23.

7. Dziennik Urzkdowy Wojewydztwa Poleskiego. – 1921r. – №1. – 16 s.

8. Dziennik Ustaw Rzeczypospoliteij Polskiej. – Warszawa. – 1929. – №24. – Poz.252. – 780 s.

9. ДАБВ. Ф.1. Воп.1. Спр.6. Л.150.

10. Jan Jerzy Milewski. Z dziejyw wojewydztwa biaiostockiego w okresie mikdzywojennym. – Biaiystok 1999. – 135 s.

11. ДАБВ. Ф.1. Воп.1. Спр.1022. Арк.2.

12. ДАБВ Ф.1. Воп.1. Спр.1054. Арк.13.

13. Jak wybieraж radnych gromadzkich, soitysyw i podsoitysyw. Opracowall Stanisiaw Podwicski, Jerzy Chylewski. – Warszawa, 1933. – 64 s.

14. Dziennik Ustaw Rzeczypospoliteij Polskiej. – Warszawa, 1938. – №63. – Poz.480. – 1592 s.

15. Ладысев В.Ф. В борьбе за демократические права і свободы: (Из ист. Опыта КПЗБ, 1926-1938 гг.) – Мн.: Беларусь,1988. – 191 с.

16. Глинская Т.Ю. КПЗБ – руководитель освободительной борьбы трудящихся Западной Белоруссии, 1924 – 1928 гг. – Мн: Беларусь,1965. – 200 с.

17. ДАБВ. Ф.4. Воп.2. Спр.37. Арк.2.

А.І. Борка, ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

МЯСЦОВЫЯ ОРГАНЫ ЎЛАДЫ І САМАКІРАВАННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

Паводле Рыжскага мірнага дагавору тэрыторыя Заходняй Беларусі ўвайшла у склад ІІ Рэчы Паспалітай. На тэрыторыю, далучаную да Польшчы, было распаўсюджана польскае заканадаўства, адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел.

Артыкулы 108 і 109 Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 1921 года забяспечвалі нацыянальным меншасцям правы сходаў, стварэння таварыстваў і арганізацый, «права захавання сваей нацыянальнасці і аховы сваёй мовы і нацыянальных асаблівасцей» [1, с. 21]. Сакавіцкая канстытуцыя 65 артыкулам таксама замацоўвала развіццё тэрытарыяльнага самакіравання адміністрацыйным адзінкам [2, с. 97], на якія і былі падзелены заходнебеларускія землі ў складзе Польшчы. Яны падраздзяляліся на ваяводствы, якія складаліся з паветаў, паветы – з гмін, гміны – з грамад. Згодна з гэтым падзелам былі ўтвораны мясцовыя органы ўлады і самакіравання [3, с. 203].

Тэрыторыя Заходняй Беларусі падчас польскай акупацыі была падзелена на чатыры ваяводствы: Віленскае, Навагрудскае, Беластоцкае і Палескае. Мясцовымі органамі дзяржаўнай адміністрацыі ў ваяводстве былі ваявода і ваяводскае ўпраўленне. Ваявода прызначаўся прэзідэнтам па прапанове міністра ўнутраных спраў, зацверджанай Саветам Міністраў [4, с. 218]. Ваявода быў прадстаўніком урада. Ён каардынаваў дзейнасць усіх дзяржаўных устаноў на тэрыторыі ваяводства і мог ажыццяўляць кантрольныя паўнамоцтвы над усімі дзяржаўнымі ўстановамі, якія непасрэдна яму не падпарадкоўваліся. Ваявода наглядаў, каб іх дзейнасць адпавядала агульнай палітыцы дзяржавы.

Свае функцыі ваявода выконваў праз ваяводскае ўпраўленне, якое складалася з аддзелаў: агульнага, бяспекі, самакіравання, адміністрацыйнага, аховы здароўя, вайсковага, зямляробства, прамысловасці, працы і інш. Галоўная ўвага ваявод у заходнебеларускіх ваяводствах накіроўвалася на апалячванне краю, на недапушчэнне нацыянальна-вызваленчай барацьбы беларускага народа, устанаўленне жорсткага кантролю за прэсай, грамадскімі і палітычнымі рухамі, партыямі і арганізацыямі. Ваяводы ажыццяўлялі нагляд за працай падпарадкаваных ім павятовых органаў улады [3, с. 205].

Органамі ваяводскага самакіравання з'яўляліся ваяводская рада і ваяводскі аддзел. Ваяводская рада была дарадчым органам пры ваяводзе. У яе склад уваходзілі старшыня, якім з'яўляўся ваявода, яго намеснік, які адначасова з'яўляўся віцэваяводай, і члены выбраныя павятовымі аддзеламі і гарадскімі радамі гарадоў, выдзеленымі са складу паветаў. Пасяджэнні ваяводскай рады павінны былі праводзіцца не менш аднаго разу ў год, на якіх ваявода абавязаны быў выступіць са справаздачай аб агульным становішчы ваяводства, дзейнасці дзяржаўнай адміністрацыі на падлеглай яму тэрыторыі, абвясціць планы на будучае. Права роспуску ваяводскай рады належыла міністру ўнутраных спраў. Ваяводскі аддзел з'яўляўся наглядальным і дарадчым органам пры ваяводзе. У яго склад уваходзілі ваявода, два прызначаныя чыноўнікі: адзін – міністрам унутраных спраў, другі – старшынёй Савета міністраў, а таксама трох членаў, выбраных ваяводской радай. Ваяводскі аддзел валодаў дарадчым правам голасу па пытаннях, прадстаўленых яму ваяводам, а таксама зацвярджаў пастановы органаў павятовага самакіравання і гарадскога, гарадоў выдзеленых са складу паветаў [5, с. 51].

На чале павятовай адміністрацыі стаяў староста, які прызначаўся міністрам унутраных спраў і падпарадкоўваўся ваяводзе. Яму было падпарадкавана павятовае ўпраўленне – староства. Паўнамоцтвы старасты ў многім былі падобнымі да паўнамоцтваў ваяводы [3, с. 205]. У павятовым упраўленні, у адрозненні ад ваяводства, была меншая колькасць аддзелаў і называліся яны рэфератамі.

Да 1933 г. у паветах існавалі павятовыя сеймікі як органы мясцовага самакіравання, дэлегаты на якія выбіраліся гміннымі радамі [3, с. 206]. Пасля выдання закона «Аб частковым змяненні арганізацыі тэрытарыяль-

нага самакіравання» ад 23 сакавіка 1933 г. павятовыя сеймікі былі перайменаваныя ў павятовыя рады, якія выбіраліся гміннымі радамі [6, с. 693], а іх выканаўчымі органамі сталі павятовыя аддзелы з шасці чалавек на чале са старастам. Але гэтыя органы самакіравання былі ў значнай меры толькі дэкларатыўнымі, бо самі яны без старасты нічога вырашаць не маглі [3, с. 206]. «Павятовы староста, дзяржаўны служачы, выконваў адначасова і абавязкі старшыні павятовага сейміка, якому павет адлічваў палову даходаў. Падаткі, якія збіраліся органамі самакіравання з збяднелага насельніцтва, у асноўным выкарыстоўваліся на ўтрыманне і прадстаўніцтва павятовых старостваў. Калі павятовы сеймік спрабаваў хоць неяк праявіць самастойнасць, або даказаць свае законныя правы, то дзяржаўная адміністрацыя іх распускала», – пісаў у сваім дакладзе на кангрэс 1937 г. у Лондане ксёндз Адам Станкевіч [7, с. 112].

Вялікія гарады, з колькасцю жыхароў за 75 тыс. чалавек, выдзяляліся ў самастойныя гарадскія паветы і ўзначальваліся гарадскімі старастамі. Малыя гарады ўтваралі гарадскія гміны [3, с. 206]. Органамі гарадскога самакіравання ў гарадах, не выдзеленых з паветаў, з'яўляліся гарадская рада і магістрат [5, с.48]. Згодна закону ад 23 сакавіка 1933 г. магістрат быў перайменаваны ў гарадское ўпраўленне [6, с. 693]. Магістрат з'яўляўся выканаўчым органам гарадскога самакіравання [5, с. 48]. У склад магістрата ўваходзілі бурмістр, які ўзначальваў магістрат, яго намеснік, 2-3 лаўнікі. У кампетэнцыю магістрата ўваходзілі: кіраўніцтва гарадской маёмасцю, распрацоўка бюджэта, вызначэнне памеру падаткаў, утрыманне гарадскіх дарог, мастоў, вуліц, плошчаў, сродкаў камунікацыі і інш. Падпарадкоўваліся магістраты павятовым аддзелам. Распарадчым і кантралюючым органам у горадзе з'яўлялася гарадская рада [8, с. 18]. Да яе кампетэнцыі належылі наступныя справы: устанаўленне прынцыпаў і спосабу выкарыстання гміннай маёмасці [9, с. 20]; набыццё і продаж нерухомай маёмасці, справы пазыкі і размяшчэння капіталаў; прыняцце гарадскога бюджэту і надзвычайных выдаткаў, а таксама розныя змяненні ў бюджэце; устанаўленне памеру падаткаў і выплат на карысць гміны; устанаўленне натуральных павіннасцей і замена іх грашовымі; прадстаўленне ўраду прапаноў у справе ўстанаўлення на карысць горада прамысловай манаполіі і ўвазных аплат;ануляванне гмінных запазычанасцей, спагнанне якіх было немагчыма; устанаўленне гарадскіх службовых пасад, іх ліквідацыя, а таксама зацвярджэнне адпаведных штатаў; зацвярджэнне штата членаў магістрата; устанаўленне тарыфаў для брычак, трамваяў, а таксама іншых гарадскіх сродкаў камунікацыі; зацвярджэнне цэн на сродкі першай неабходнасці; наданне ганаровага грамадзянства; выпрацоўка рэкамендацый па зменах межаў гмін; зацвярджэнне планаў будаўніцтва ў гмінах; вызначэнне колькасці лаўнікаў; зацвярджэнне палажэнняў аб ўласнай дзейнасці, камісій, магістрата; кантроль за дзейнасцю гарадскога ўпраўленння і праверка яго справаводства, выбары членаў магістрата [9, с. 21]. У перыяд міжваеннага двадцацігоддзя гарадскія рады ў большасці гарадоў выбіраліся 4 разы: у 1919, 1927, 1934 і 1939 гадах [10, с. 21].

Кожны сельскі павет падраздзяляўся на гміны. Гмінную адміністрацыю складалі войт і гміннае праўленне, якое складалася з намесніка войта і двух або трох засядацеляў. Засядацелі выбіраліся гміннаю радаю ў склад якой уваходзіла 10 – 15 радцаў. Гмінную раду выбіралі дэлегаты гміннага сходу, які складаўся са 100 – 150 прадстаўнікоў мясцовых паселішчаў – грамад.

Гміны складаліся з грамад, якія маглі аб'ядноўваць некалькі хутароў або невялікіх вёсак, аднак магло быць, што адна вёска ўтварала грамаду [3, с. 207]. Органамі грамады з'яўляліся солтыс, грамадская рада [11, с. 3] ці грамадскі сход [12, с. 225].

На чале грамады стаяў солтыс, які з'яўляўся выканаўчым яе органам. Згодна з законам ён выбіраўся на грамадскім сходзе або грамадскай радай [12, с. 216]. Грамадская рада, а там, дзе яна не была ўтворана, грамадскі сход з'яўляліся пастанаўляючым органам грамады (органам грамадскага самакіравання). Грамадская рада выбіралася ў грамадах з насельніцтвам звыш 200 жыхароў, а таксама магла быць склікана па прапанове грамадскага сходу, гміннай рады, павятовага аддзела са згоды ваяводы і ваяводскага аддзела у грамадах з меншай колькасцю насельніцтва [6, с. 697].

На ўсе дзяржаўныя пасады ў ваяводствах, паветах і гмінах Заходняй Беларусі прызначаліся толькі палякі і, як правіла, ураджэнцы самой Польшчы, выхадцы з багатых слаёў насельніцтва. Каб не дапусціць простых людзей на працу ў дзяржаўным апараце, у 1933 годзе быў прыняты закон, згодна з якім нават на пасады ў гміннае праўленне маглі «выбірацца» толькі асобы, якія мелі сярэднюю адукацыю і павінны былі вытрымаць экзамены ў спецыяльнай павятовай камісіі. Уся сістэма мясцовых органаў дзяржаўнай улады грунтавалася на прынцыпе бюракратычнага цэнтралізму, на поўным падпарадкаванні месц цэнтру, без уліку мясцовых інтарэсаў, на падаўленні ўсяго беларускага [3, с. 207].

Нацыянальная палітыка польскіх уладаў характарызавалася антыдэмакратызмам, імкненнем паланізаваць беларусаў, украінцаў, літоўцаў, ліквідаваць нацыянальныя школы, культурна-асветніцкія ўстановы і арганізацыі, закрыць выдаваемыя на нацыянальных мовах газеты і часопісы. З прыходам да ўлады рэжыма Пілсудскага курс на дыскрымінацыю правоў нацыянальных меншасцяў, пропаведзь нацыянальнай адметнасці палякаў, вялікадзяржаўны шавінізм дасягнулі свайго апагея. «Няхай палякі, якія так доўга і пакорліва давалі сябе «біць па твары» кожнаму расійскаму гарадавому, – казаў Ю.Пілсудскі ў размове з адным вядомым дзеячом санацыйнага рэжыму В.Бараноўскім, – і былі шчаслівыя, калі маглі пераканацца, упэўніцца, што ў выпадку чаго можа «біць па твары» і польская ўлада. І будзе горш, калі да гэтага прынцыпу не прывучыць палякаў» [13, с. 146]. Таксама пра змест польскай палітыкі на тэрыторыі Заходняй Беларусі яскрава сведчыць дакладная запіска беластоцкага ваяводы Генрыха Асташэўскага ў Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы ад 23 чэрвеня 1939 года «Мы жадаем аднаго і настойліва патрабуем, – заявіў ваявода, – каб гэтая нацыянальная меншасць (меў на ўвазе беларусаў) думала па-польску – нічога ўзамен не даваць і нічога не рабіць у іншым напрамку» [14, с. 4].

1. Konstytucja 17 marca 1921 r. Wydanie czwarte. – Warszawa, 1925.

2. Konstytucje Polski. Studje monograficzne z dziejyw polskiego konstytucjonalizmu. Praca zbiorowa pod redakcj№ Mariana Kallasa. – Warszawa, 1990. Pacstwowe Wydawnictwo Naukowe. – 342 s.

3. Круталевіч В. А., Юхо І. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917–1945гг.). – Мн.: Беларуская навука, 1998. – 238 с.

4. Вішнеўскі А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. – Мн., 2000. – 313 с.

5. Prawo panstwowe, organizacja wiadz i urzedow i samorzady. – Warszawa, 1928. – 440 s.

6. Dziennik Ustaw Rzeczypospoliteij Polskiej. – Warszawa, 1933. – №35. – Poz.294. – 864 s.

7. Станкевіч А. Беларусы як нацыянальная меншасць у Польшчы.//Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – №2.

8. Справочник учреждений і организаций, действовавших на территории Западной Белоруссии в 1919-1939 гг.. – Брест: Государственный архив Брестской области,1972. – 88 с.

9. Ustroj samorz№dy miejskiego w wojewydztwach wschodnich (oras w pow. grodziecskim i woikawyskim w woj. bieiostockiem). – Warszawa, 1933. – 134 s.

10. Ян Ежы Мілеўскі. Нацыянальная структура гарадскіх рад у перыяд з 1919 па 1939 год у Віленскім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах // Беларускі гістарычны часопіс. – 2000. – №1. – С.21-23.

11. Najda S.. Gramada: jej ustryj, zakres dziaiania i przepisy wyborcze. – Warszawa,1938. – 18 s.

12. Podrкcznik dla urzkdyw i dziaiaczy gminnych. Zebrai i opracowai Bronisiaw Wesoiowski. – Warszawa,1923. – 298 s.

13. Ладысев В.Ф. В борьбе за демократические права свободы: (Из ист. опыта КПЗБ,1926-1938гг.) – Мн.: Беларусь,1988. – 191 с.

14. Уладзімер Ладысеў. Аб'яднанне беларускай нацыі (да 65-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР) // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 9.

В.Е. Егорычев, ГрГУ им. Я.Купалы, г. Гродно

ЗВОНКАЯ ПЕСНЯ ГРОМАДЫ

В то время как рабочие и крестьяне Советской Белоруссии строили новое, социалистическое общество, трудящиеся западной части Белоруссии, отторгнутой от советской страны буржуазно-помещичьей Польшей по Рижскому мирному договору, находились под тяжелым социальным и национальным угнетением. Но не прекращали борьбы за свободу от гнета эксплуататоров, за воссоединение.

Стремления к объединению с БССР особенно сильно проявились с деятельности массовых организаций национально-освободительного движения, таких, как Белорусская крестьянско-рабочая громада (БКРГ), Белорусский крестьянско-рабочий посольский клуб «Змаганне», Товарище-

ство белорусской школы (ТБШ). Громада, созданная в 1925 году под руководством Коммунистической партии Западной Белоруссии, возглавлялась левыми белорусскими послами польского Сейма и их лидером – одним из самых популярных в то время в Западной Белоруссии политическим деятелем, ученым-филологом, талантливым публицистом и организатором Брониславом Тарашкевичем.

В программе Громады подчеркивалось, что освобождение всего трудового народа из-под ярма капитала и национального гнета возможно только в тесном союзе рабочих и крестьян.

Все передовое, сознательное, уважавшее свое национальное достоинство шло в Громаду. Вскоре она стала грозной силой. К началу 1927 года Громада насчитывала в своих рядах более 100 тысяч членов, объединенных почти в двух тысячах кружков, и являлась самой массовой революционной крестьянской организацией не только в Польше, но и в Европе. Почти в каждой деревне был создан «гурток» Громады. Местные организации открывали клубы, библиотеки, читальни, создавали коллективы художественной самодеятельности.

В Гродненском повете председателем комитета Громады был И.Балицкий, секретарем – член КПЗБ Поддубный, число членов здесь достигло 10 тысяч.

Вопреки запрету и полицейскому террору часто в деревнях юноши и девушки распевали революционные песни. Комсомольские организации устраивали вечеринки молодежи, на которых тайно разучивали советские песни, читали революционные стихи, ставили спектакли по пьесам белорусских авторов.

Пьесы и сатиру на злободневные темы сочиняли и сами комсомольцы. Наиболее удачные сочинения переписывались и передавались из деревни в деревню, особенно из сатирического журнала «Маланка».

Известный белорусский поэт скидельчанин Михась Василек (Костевич) писал в своей автобиографии: «...целыми неделями не бывал дома, ходил по деревням, организовывал кружки Громады и ТБШ (Товарищество Белорусской школы), организовывал с товарищами вечера, ставил спектакли, пели белорусские и русские песни».

Большой популярностью у трудящихся пользовались газеты Громады «Беларуская справа», «Народная справа». Их тираж доходил до 9 тысяч экземпляров. Газеты призывали к рабоче-крестьянской солидарности, звали к борьбе за свободу, популяризовали достижения Белорусской ССР и всего Советского Союза.

Кружки БКРГ на Гродненщине проводили митинги и демонстрации за освобождение политических заключенных и прекращение белого террора, собирали средства в помощь политическим узникам, бастовавшим рабочим Гродно, Белостока и других городов, распространяли листовки.

Такие массовые акции с участием представителей Громады прошли в 1925 году в Гродно, Скиделе, Индуре и других местах.

Натиск революционно-демократических сил, руководимых КПЗБ и Громадой, встречал ожесточенные репрессии со стороны властей. Только за полгода – с 1 июля 1926 года по 1 января 1927 года – в Виленском воеводстве было 100 случаев применения административных мер к громадовцам, в Новогрудском – 220. Около тысячи членов Громады были преданы суду. Учащались случаи кровопролитных столкновений, когда полиция и войска разгоняли митинги.

В этой сложной обстановке слышались призывы брать в руки оружие, давать вооруженный отпор провокаторам. КПЗБ разъясняла массам, что разрозненные вооруженные действия будут жестоко подавлены, что власти используют их как предлог для разгрома всей Громады.

Призыв КПЗБ был правильно понят трудящимися. Они создавали дружины народной милиции, которые защищали интересы трудящихся, охраняли рабочие колонны на демонстрациях.

После злобной пропагандистской кампании лжи и клеветы, рассчитанной на обман общественного мнения, власти приняли решение разгромить Громаду. В ночь 14 на 15 января 1927 года в Западной Белоруссии начались массовые обыски и аресты. Репрессии обрушились на КПЗБ, БКРГ, ТБШ и другие прогрессивные организации.

Вскоре вместо разгромленной Громады ее традиции продолжил Белорусский крестьянско-рабочий посольский клуб «Змаганне», а в конце 1930 года польское реакционное правительство запретило деятельность и этой организации. Ее руководителей постигла та же участь, что и руководителей Громады, – они были арестованы и присуждены к многолетнему тюремному заключению.

Единственной легальной организацией трудящихся в то время оставалось Товарищество белорусской школы (образовалось в 1921 году). Оно вело культурно-просветительскую работу: боролось за белорусскую школу, создавало драматические, хоровые и музыкальные кружки, ставило спектакли, продолжало национально-освободительные традиции Громады и «Змагання». ТБШ насчитывало около 20 тысяч членов, объединенных в 500 кружках. Руководителями этой организации в разные годы, кроме послов БКРГ и «Змагання», были М.И.Петкевич, М.И.Кепель, Г.Р.Ширма, Н.М.Мартинчик, Е.К.Лебецкая и другие.

КПЗБ прилагала все усилия, чтобы активизировать работу ТБШ. Организации ТБШ создавали избы-читальни, организовывали чтения русской и белорусской литературы, проводили дискуссии... Так, в Гродно было открыто отделение Белорусского посольского клуба, белорусский книжный магазин. Председателем окружного правления ТБШ здесь был скидельчанин Петр Севрук.

Произведения народных поэтов Белоруссии Янки Купалы и Якуба Коласа, сатирические басни Кондрата Крапивы, журналы «СССР на стройке» и «Красная новь» и многие другие советские издания – книги, газеты, журналы, попадая в район, обходили все кружки ТБШ. Их читали широкие массы народа, соблюдая при этом строгую конспирацию.

Деятельность ТБШ наталкивалась на большие препятствия со стороны польских властей и белорусских буржуазных националистов. Будучи не в состоянии подчинить ТБШ своему влиянию, власти запретили и его. Но мужественная борьба трудящихся завершилась воссоединением. Наступил сентябрь 1939 года.

А.В. Пашкевіч, Інстытут гісторыі НАНБ, г. Мінск

КПЗБ І БЕЛАРУСКІ СЯЛЯНСКА-РАБОТНІЦКІ ПАСОЛЬСКІ КЛУБ «ЗМАГАННЕ» Ў 1928 – 1930 гг.: НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА

У выніку парламенцкіх выбараў, якія адбыліся на тэрыторыі Польшчы ў сакавіку 1928 года, у склад польскага сейма ўвайшлі некалькі леварадыкальных беларускіх паслоў, якія ўтварылі Беларускі сялянска-работніцкі пасольскі клуб (БСРПК) «Змаганне». Першапачаткова ў склад клуба ўваходзілі Язэп Гаўрылік, Ігнат Дварчанін і Аляксандр Стагановіч, выбраныя ў Навагрудскай акрузе з выбарчага спісу Беларускага сялянска-рабочага выбарчага камітэта «Змаганне за інтарэсы работнікаў і сялян». Хутка да іх далучыліся таксама Іван Грэцкі, які прайшоў у сейм у Брэсцкай акрузе са спісу ўкраінскай левай партыі «Сельроб-лявіца», і Флегонт Валынец, абраны ў Лідскай акрузе са спісу «Выбарчага камітэта беларускіх сялян і работнікаў» (ВКБСР). Дзейнасць паслоў БСРПК «Змаганне» заўсёды выклікала дастаткова пільную ўвагу даследчыкаў, асабліва ў ранейшыя часы. Гэта было перш за ўсё звязана з цеснымі сувязямі дэпутатаў гэтай парламенцкай фракцыі з камуністамі. Аднак у адносінах «змаганцаў» з КПЗБ да гэтай пары застаецца шмат не да канца зразумелых момантаў.

Выступаючы 31 траўня 1928 г. з праграмнай дэкларацыяй, прадстаўнік «Змагання» І.Дварчанін заявіў, што «Беларускі сялянска-рабочы пасольскі клуб заклікае працоўныя масы Заходняй Беларусі, каб яны сталі ў супольных шэрагах з працоўнымі масамі ўсіх нацыянальнасцяў Польшчы і змагаліся ў абарону сваіх інтарэсаў супраць уціску і эксплуатацыі капіталістаў і памешчыкаў без розніцы нацыянальнасцяў» [1, l. XIII/34]. З прыведзенай цытаты вынікае, што сябры клуба збіраліся арыентавацца ў сваёй дзейнасці ў першую чаргу на абарону не нацыянальных правоў беларускага насельніцтва, а класавых правоў «працоўных масаў» Заходняй Беларусі.

Падобная пазіцыя паслоў «Змагання» тлумачылася ў першую чаргу тым, што яны прайшлі ў сейм пры актыўнай усебаковай дапамозе Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, кіраўніцтва якой чакала ад іх зусім акрэсленых дзеянняў. Яшчэ падчас выбарчай кампаніі ў камуністычнай

прэсе падкрэслівалася, што «Кампартыя ідзе на выбары для таго, каб правесці ў Сейм такіх паслоў, якія з сеймавай трыбуны будуць выяўляць фашысцкія злачынствы гэтак сама, як гэта рабілі камуністычныя паслы ў папярэдніх сеймах» [2, s. 6]. Аказваючы і надалей паслам «Змагання» рознага кшталту падтрымку, перш за ўсё матэрыяльную, кіраўніцтва кампартыі вымагала ад іх безумоўнага падпарадкавання ўсім рэзалюцыям, ухваленым яе кіраўнічымі органамі.

У КПЗБ якраз у той час значна пашырыла свой уплыў лявацкая плынь, прыхільнікі якой не дапускалі практычна ніякага супрацоўніцтва з іншымі палітычнымі сіламі. У той жа самы час большасць паслоў клуба «Змаганне» не былі ідэйнымі камуністамі, а хутчэй прадстаўлялі левае крыло заходнебеларускага нацыянальнага руху. Таму некаторыя з іх схіляліся да захавання нацыянальнай салідарнасці з іншымі беларускімі арганізацыямі. Так, І.Дварчанін, паводле інфармацыі польскай выведкі, 4 лістапада 1928 г. заключыў пагадненне з Беларускім сялянскім саюзам і Беларускай хрысціянскай дэмакратыяй, згодна з якім прадугледжвалася ўтрыманне адзінага нацыянальнага фронту на выключна культурніцкім грунце. Саюз быў заключаны на «свабоднай» аснове, г.зн. кожная партыя магла праводзіць сваю далейшую працу згодна з уласнымі праграмнымі і тактычнымі ўстаноўкамі, але пры гэтым прадугледжвалася ўстрыманне ад узаемных нападак у прэсе [3, с. 194].

Аднак на паседжанні клуба «Змаганне» 7 снежня 1928 г. прымірэнчыя дзеянні І.Дварчаніна былі востра скрытыкаваны іншымі сябрамі клуба, у першую чаргу Я.Гаўрылікам і Ф.Валынцом. Было падкрэслена, што «аздараўленне адносінаў паміж групамі і партыямі не змяшчаецца ў тым, каб заключаць з імі якія-небудзь пагадненні, але трэба аддзяліць дробнамяшчанскі элемент ад рабочай ідэалогіі і адкрыта, пры кожнай магчымасці выступаць супраць згодніцкіх напрамкаў, як шкодных для беларускіх народных масаў». Дзеянні Дварчаніна былі прызнаны ганебным фактам, недастойным прадстаўніка сялянска-работніцкага клуба [3, с. 195]. Характэрна, аднак, што дагэтуль на працягу цэлага месяца сябры клуба не выказвалі ніякага незадавальнення заключаным пагадненнем. Таму нельга выключаць тут непасрэднага ўплыву на іх пазіцыю кіраўніцтва камуністычнай партыі.

Несумненна, што менавіта з прычыны гэтага ўплыву за два з паловай гады дзейнасці польскага парламента II склікання зафіксавана зусім мала праяваў супрацоўніцтва паслоў БСРПК з іншымі беларускімі дэпутатамі. Калі такія выпадкі і здараліся, то яны з'яўляліся прыватнай ініцыятывай паслоў і звычайна асуджаліся КПЗБ. У якасці падобных выступленняў можна прыгадаць адмову ўсіх беларускіх дэпутатаў удзельнічаць у арганізаваных з нагоды 10-годдзя аднаўлення польскай дзяржаўнасці ўрачыстасцях [4, с. 42], сумеснае выступленне ўсіх беларускіх прадстаўнікоў супраць ліквідацыі беларускай гімназіі ў Радашковічах у 1929 г. [5, s. 67], а таксама спробы БСРПК ў верасні 1929 г. склікаць сумесную нараду з БПК у сувязі з парламенцкім крызісам з меркаванай наступнай пада-

чай некалькіх інтэрпеляцый аб незаконных дзеяннях адміністрацыйных органаў улады [4, с. 43].

Акрамя таго, камуністы таксама імкнуліся стрымліваць самыя дробныя памкненні паслоў БСРПК да завязвання кантактаў з прадстаўнікамі польскіх радыкальных, але не камуністычных арганізацый. Так, вельмі негатыўна быў ацэнены факт правядзення Ф.Валынцом 23 чэрвеня 1929 г. сумеснага справаздачнага мітынга ў мястэчку Ячна Сакольскага павета з сеймавым паслом Я.Савіцкім з фракцыі Странніцтва Хлопскага. Гэта падзея была ацэнена як «грубая палітычная памылка, хутчэй нават палітычная непісьменнасць». Асаблівае абурэнне выклікала ў камуністаў тое, што Валынец «даў магчымасць гэтаму сацыял-фашысту выступіць перад масамі ў ролі свайго пратэктара, даючы яму прадставіць сябе масам і беручы, можна сказаць, з яго рук слова» [6, арх. 105].

У цэлым уся парламенцкая і пазапарламенцкая тактыка БСРПК накіроўвалася камуністычнай партыяй, а на пасяджэннях клуба звычайна прысутнічаў прадстаўнік КПЗБ [7, с. 97]. Знешне здавалася, што гэты пасольскі клуб знаходзіцца пад поўным кантролем камуністаў. Аднак паміж апошнімі і дэпутатамі БСРПК рэгулярна ўзнікалі непаразуменні і супярэчнасці. Яшчэ на І з'ездзе КПЗБ, які адбыўся летам 1928 г., некаторыя дэлегаты лічылі памылкай выстаўленне на выбарчым спісе «Змаганя» І.Дварчаніна [8, арх. 4, 181]. Добра характарызуе сітуацыю таксама даклад дарадцы палпрэдства СССР у Польшчы Ю.М.Кацюбінскага, які датычыў гутаркі, праведзенай апошнім з Я.Гаўрылікам у верасні 1928 г. Кацюбінскі сведчыў, што Гаўрылік «увесь час падкрэсліваў, што ён не камуніст і з «Вашымі», як ён пастаянна кажа, ён нічога агульнага не мае, не адказвае за іх дурасць, але ў душы ён большы рэвалюцыянер, чым «Вашы»... Палітычна ён чалавек мала развіты і вельмі сыры. Ён лічыць, што ім трэба завязаць непасрэдную сувязь з Савецкай Беларуссю, так як сувязь з польскай Кампартыяй вельмі дыскрэдытуе. Наогул яны вельмі незадаволены гэтай сувяззю... Памылкай яны лічаць наданне Таварыству беларускай школы палітычнага характару» [9, с. 34].

Партыйны функцыянер А.Канчэўскі (Уладак), які пэўны час адказваў у партыі за сувязь з БСРПК (фактычна за кіраванне ім) адзначаў у лютым 1929 г., што «кампанія па барацьбе з голадам сустракаецца з поўным незразуменьнем яе значэньня як у партыі, так і пасярод нацыянальна вызваленчых колаў, а ў першую чаргу ў Б.С.Р. Клюбе... У пас[ольскім] Клюбе ізноў некаторыя адзінкі хварэюць на баязьнь перад масамі» [10, арх. 41]. Тады ж ён адзначаў, што «Г[аўрылік], на якога безумоўна найбольш пасрэдна і беспасрэдна (часта міма яго волі) мае ўплыў белсанацыя, вельмі часта робіць глупствы... Прымаючы пастанову аб уваходзе Г[аўрыліка] ў тройку, мы не учлі, што канцэнтруючы ў яго руках старшын[ства] і скарбн[ікоўства], не толькі стаўляем яго ў курс усіх справаў, але робім яго фактычным кіраўніком клюбу» [10, арх. 45].

КПЗБ імкнулася выкарыстаць усе свае наяўныя механізмы для поўнага забеспячэння падпарадкавання паслоў БСРПК сваім дырэктывам і

немагчымасці іх выхаду з-пад кантролю. Польскае міністэрства ўнутраных спраў мела звесткі, што пасол А.Стагановіч перад пастаўленнем сваёй кандыдатуры на выбарчы спіс «Змагання» даў пісьмовае абяцанне адмовіцца ад мандата па першым патрабаванні КПЗБ [11, с. 52]. Можна меркаваць, што падобныя абяцанні былі ўзяты і ў астатніх сяброў клуба. Праўдзівасць інфармацыі МУС пацвярджаецца аператыўнасцю вырашэння камуністамі пытання аб складанні Стагановічам пасольскіх паўнамоцтваў пасля адмовы апошняга выконваць патрабаванні кампартыі. Адпаведная пастанова была прынята на паседжанні Краёвага бюро ЦК КПЗБ 25 лютага 1929 г., а адмова Стагановіча ад мандата адбылася ўжо 1 сакавіка 1929 г. [12, арх. 38-39].

На месца Стагановіча ў БСРПК увайшоў селянін са Слонімшчыны, сябра КПЗБ П.Крынчык, са з'яўленнем якога і без таго няпростыя адносіны ў клубе яшчэ больш абвастрыліся. Крынчык трымаўся больш левых поглядаў, чым астатнія сябры клуба, і на яго камуністы зрабілі галоўную стаўку пры рэалізацыі сваёй палітыкі поўнага кіравання клубам. Таму Крынчык у сваёй дзейнасці часта дазваляў сабе ігнараваць думку кіраўніцтва клуба, пра што сам згадваў у сваіх пазнейшых успамінах [13, с. 75]. Такія яго паводзіны выклікалі ўсё больш актыўнае непрыманне і нават абурэнне астатніх сяброў клуба. Урэшце рэшт гэта вылілася ў вострую канфліктную сітуацыю паміж П.Крынчыкам і І.Грэцкім. Канфлікт знешне насіў чыста асабісты характар, аднак у той жа час выразна засведчыў расстаноўку сілаў унутры клуба і глыбокія супярэчнасці паміж яго сябрамі ў палітычных пытаннях [14, арх. 106].

У выніку да вырашэння канфлікту мусіў падключыцца ЦК КПЗБ, тым больш, што з асабістымі адносінамі ў клубе была непасрэдна звязана адмова яго сяброў узяць удзел у дэманстрацыйным выступленні камуністычнай фракцыі ў сейме 5 снежня 1929 г. падчас разгляду прапановы левых сеймавых фракцый аб недаверы ўраду. Сябры БСРПК проста не з'явіліся на паседжанне сейма, і адзін з адказных камуністычных функцыянераў, ацэньваючы гэты факт, пісаў у сваім лісце ў ЦК КПЗБ, што «яны, зразумела, атрымалі ад нас вялікую нахлабучку... Бюро... пастанаўляе прапанаваць ім выдаць спецыяльны камунікат, дзе яны павінны растлумачыць перад масамі ў парадку самакрытыкі прычыны сваёй адсутнасці ў гэты дзень у сейме і выказаць сваю салідарнасць з кам. фракцыяй. Больш блізкім сябрам* (П.Крынчыку і Я.Грэцкаму – **А.П.**) аб'яўлена строгая вымова з папярэджаннем» [10, арх. 111-113]. Тэкст заявы быў уласнаручна напісаны камуністычным куратарам клуба А.Канчэўскім [15, арх. 62-64]. Некаторыя даследчыкі дзейнасці БСРПК, ацэньваючы гэту заяву, адзначаюць, што «сумленнае прызнанне парламентарыямі перад выбаршчыкамі сваёй памылкі было і застаецца выключна рэдкім крокам, які

---

* Для азначэння паслоў БСРПК камуністычныя дзеячы ў сваёй карэспандэнцыі даволі часта карысталіся тэрмінам «сябры».

садзейнічаў ўзмацненню ўзаемадавераў паміж імі» [16, с. 37; 4, с. 44]. Аднак адзначаная несамастойнасць паслоў пры выданні заявы выклікае сумненне ў правамернасці падобнай ацэнкі.

Ва ўсялякім выпадку, пасля апісаных падзей камуністычнымі функцыянерамі адзначалася, што „перад сябрамі пастаўлена рабром праблема кіраўніцтва ў нацыянальна-вызваленчым руху. Раскрытыкаваны памылкі, ідучыя па лініі недаацэнкі небяспекі нацыянал-фашысцкага лагеру... Яшчэ і сёння яны не бачаць „на практыцы» класавага расслаення вёскі... Легалізм, які мяжуе з супрацоўніцтвам з фашысцкай дыктатурай... Недастатковаць і бяспланавасць масавай працы, асабліва па лініі горада» [10, с.111-112]. У каментарыі ЦК КПЗБ да заявы паслоў БСРПК адзначалася, што «памылка беларускіх сялянска-работніцкіх паслоў адлюстроўвае тыя ваганні, якія перажываюць інтэлігенцкія колы вярхушкі нацыянальна-вызваленчага руху... Усе гэтыя... з'явы ў нацыянальна-вызваленчым руху ставяць перад партыяй з усёй вастрынёй пытанні ўмацавання палітычнага і арганізацыйнага кіравання ў нацыянальна-вызваленчым руху» [6, арх. 13-14].

Аднак і пасля гэтага паслы «Змаганння» не спынілі спробаў абыйсці ў сваёй практычнай дзейнасці лявацкія ўстаноўкі камуністычнага кіраўніцтва. У чарговы раз інструкцыі КПЗБ яны часткова парушылі ўжо ў пачатку 1930 г. Падчас разгляду ў сейме пастаўленага беларускімі сеймавымі пасламі цэнтрысцкай арыентацыі пытання аб выдзяленні польскім урадам субсідый на беларускую асвету «змаганцы» галасавалі супраць асігнавання сродкаў на будынак беларускае гімназіі і бурсы ў Наваградку, але падалі свае галасы за крэдыты на настаўніцкія курсы і семінарыю. Праўда, праз некаторы час яны былі прымушаны выступіць з публічным пакаяннем за «зробленую памылку» ў сваім афіцыйным друкаваным органе [17, с. 3].

Гэта сітуацыя стала ў пэўнай ступені пераломнай для беларускіх радыкальных паслоў. Да пачатку 1930 г. лідэры БСРПК стаміліся ад правядзення палітыкі, не зусім, на іх думку, адпаведнай задачам сеймавага клуба – прадстаўніка нацыянальнай меншасці. Расчараваліся яны і ў магчымасці прыйсці да паразумення з кіраўніцтвам КПЗБ. Левыя тэндэнцыі ў кампартыі пашырыліся да гэтага часу настолькі, што многія патрабаванні камуністычных функцыянераў былі непрымальныя нават для найбольш радыкальнага з паслоў П.Крынчыка. Так, апошні не прыняў выкладзеную яму прапанову адмовіцца ад практыкі падачы ўладам дэкларацый на адкрыццё беларускіх школ і падаваць замест іх дэкларацыі на адкрыццё «працоўных» (фактычна камуністычных – А.П.) школ [18, арх. 57-58].

У лютым-сакавіку 1930 г. Я.Гаўрылік і І.Дварчанін склалі спецыяльны мемарандум, які быў высланы ў Камінтэрн. У гэтым мемарандуме беларускія паслы выказвалі думку, што БСРПК павінен часцей вылучаць не толькі сацыяльна-класавыя, але і нацыянальныя патрабаванні – у справах школ на роднай мове, рэвіндыкацыі праваслаўных цэркваў і г. д. [4, с.

44-45]. Аднак лявацкія тэндэнцыі ў КПЗБ былі адлюстраваннем аналагічных працэсаў у Камінтэрне, таму паслы так і не дачакаліся адказу на свой мемарыял.

Чакаючы гэтага адказу, «змаганцы» бралі актыўны ўдзел у паўторных выбарах у сейм у Лідскай і Свянцянскай акругах, якія адбываліся ў траўні і ліпені 1930 г. адпаведна. Пры правядзенні выбарчай кампаніі, як і звычайна, не заўсёды дакладна выконваліся інструкцыі ЦК КПЗБ.

Сакратар Віленскага акруговага камітэта КПЗБ пісаў у ЦК партыі: «Падрыхтоўка да выбараў... працякае нармальна, але маем цяжкасці ў кантактах працы з нашымі сябрамі. Дзе б мы што-небудзь ні рыхтавалі – яны не прыязджаюць; яны самі пазначылі сабе план работы, але нас не інфармуюць. Нашым планам яны не падпарадкоўваюцца, так што атрымоўваецца паралельнасць... Яны наогул не адчуваюць цяпер кіраўніцтва, нас не слухаюць» [18, арх. 387]. Супраціўленне паслоў інструкцыям партыі праявілася сярод іншага ў складанні выбарчых спісаў, на якіх аказаліся змешчаны толькі прозвішчы кандыдатаў-беларусаў, нягледзячы на пастулат, што КПЗБ ідзе на выбары «на аснове рэвалюцыйнага саюза пралетарыяту з працоўным сялянствам усіх нацыянальнасцяў». Практычна ігнараваліся патрабаванні камуністаў «папулярызаваць пяцігадовы план у СССР, калектывізацыю і г.д., асабліва апошнюю», «указваць на абвастрэнне небяспекі ўзброенага нападу на СССР... паказваючы на праявы нападу: акцыя манархістаў супраць «забойства Куцепава ГПУ»..., разрыў Мексікі з СССР..., пробная мабілізацыя Д.О.К.III» [19, арх. 97]. Беларускія паслы насуперак гэтым інструкцыям асноўны акцэнт у сваіх перадвыбарчых матэрыялах зрабілі на больш блізкіх для заходнебеларускага насельніцтва праблемах: зямельнай палітыцы польскага ўрада, узмацненні рэпрэсіяў і г.д. [20, с. 82-84].

Пасля выбараў у Лідскай акрузе ЦК КПЗБ выдаў спецыяльную рэзалюцыю, у якой падкрэслівалася, што «ў выбарчай агітацыі недастаткова... нададзена ўвагі пытаньням сялянскай палітыкі СССР і БССР, у асаблівасьці справе калектывізацыі, дэмаскаваньня дзікага патоку брахні, з дапамогай якой увесь фашысцкі лягер старанна атуманьвае сялянскія масы і падрывае давер і сімпатыі да СССР і палітыкі Камуністычнай партыі. Як на вялікую памылку з боку кіраўнікоў кампаніі належыць адзначыць адсутнасьць на сьпісу Рабоча-сялянскага блёку кандыдатаў жыдоўскага пралетарыяту, польскага і літоўскага, што не магло не адбіцца на нашым доступе да жыдоўскіх, польскіх і літоўскіх працоўных мас» [19, арх. 87]. Не зусім задаволеныя засталіся камуністы і перадвыбарчай кампаніяй у Свянцянскай акрузе, адзначаючы сярод іншых недахопаў слабую работу сярод небеларускага насельніцтва і «заціранне камуністычнага твару» [22, арх. 22]. Але на прыняцце мераў і поўнае падпарадкаванне сваёй волі непаслухмяных паслоў ужо практычна не заставалася часу: 30 жніўня 1930 г. парламент быў датэрмінова распушчаны дэкрэтам прэзідэнта Польшчы І.Масціцкага, а многія апазіцыйныя да ўрада дэпутаты арыштаваныя.

Такім чынам, падчас існавання БСРПК «Змаганьне» ў польскім сейме II склікання лідэры КПЗБ пастаянна імкнуліся схіліць яго сяброў да вядзення палітычнай дзейнасці ў строгай адпаведнасці са сваімі інструкцыямі. Насуперак гэтаму частка паслоў, у першую чаргу І.Дварчанін і Я.Гаўрылік, стараліся праводзіць больш гнуткую палітыку і вылучаць не толькі сацыяльна-класавыя, але і нацыянальныя патрабаванні. Гэтыя супярэчнасці часам выліваліся ў даволі вострыя канфлікты паміж пасламі і іх камуністычнымі куратарамі, аднак да адкрытага разрыву адносінаў справа так і не дайшла.

Літаратура і крыніцы

1. Sejm RP. Okres II. Sprawozdanie stenograficzne z 13 posiedzenia z dn. 31 maja 1928 r.

2. B. W. R. K. P. jako agentura Kominternu. – Warszawa,1930.

3. Centralne Archiwum Wojskowe (CAW) w Rembertowie. Oddziai II Sztabu Generalnego. Sygn. I.303.4.2706.

4. Даніловіч В. В. Дзейнасць пасольскага клуба «Змаганне» ў польскім сейме // Назаўсёды разам: Да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. – Мінск, 1999.

5. Gomyika K. Biaiorusini w II Rzeczypospolitej. – Gdacsk, 1992.

6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НА РБ). Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 156.

7. Ковальский Ю. С послами клуба «Змаганне» // Годы испытаний и мужества (сост. Орехво Н.С., Сташкевич Н. С.). – Минск, 1973.

8. НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 179.

9. Знешняя палітыка Беларусі: Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т.3 (1928 г. – чэрвень 1941 г.) / Склад. У.М.Міхнюк, У.К.Ракашэвіч, Я.С.Фалей, А.В.Шарапа. – Мінск, 2001.

10. НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 217.

11. Archiwum Akt Nowych (AAN) w Warszawie. Ministerstwo Spraw Wewnktrznych (MSW) 1918-1939. Sygn. 1032-dopiywy.

12. НАРБ. Ф. 4. Воп. 21. Спр. 169.

13. Кринчик П.С. «Неприкосновенность» послов // Годы испытаний и мужества / сост. Орехво Н.С., Сташкевич Н. С. – Минск, 1973.

14. НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 106.

15. НАРБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 409.

16. Місарэвіч Я.А., Каралёў М.Д. Ігнат Дварчанін. Гісторыка-біяграфічны нарыс. – Гродна, 1995.

17. Хроніка. Прызнаньні Сялянска-Работніцкага Клюбу // Наперад. – 1930. – 2 красавіка. – № 13.

18. НА РБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 278.

19. НА РБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 367.

20. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Т. 2 (1929-1939). – Минск, 1972.

21. AAN. MSW 1918-1939. Sygn. 1031-dopiywy.

22. НА РБ. Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 96.

А.П. Дзмітрук, ДУА «РІВШ», г. Мінск

АСАБЛІВАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ ПОЛЬСКАГА ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАГА РУХУ Ў НАВАГРУДСКІМ ВАЯВОДСТВЕ Ў 20 – 30-я гг.

У першыя гады пасля савецка-польскай вайны грамадска-палітычнае жыццё ў Навагрудскім ваяводстве амаль не існавала. Першыя саюзы, якія пачалі арганізоўвацца ў Навагрудку мелі ў большасці характар гаспадарчых і прафесійных арганізацый: сельскагаспадарчыя кола, саюз купцоў, рамеснікаў, настаўнікаў. Такія арганізацыі фармальна пачалі з'яўляцца ў канцы 1922 – сярэдзіне 1923 гг., але былі нялічныя, дзейнасці амаль не праяўлялі.

Адной з першых грамадскіх арганізацый быў Саюз сельскагаспадарчых колаў Навагрудскай зямлі, падпарадкаваны Цэнтральнаму сельскагаспадарчаму таварыству ў Варшаве. І толькі ў 1925 г. і 1926 г. была створана Навагрудская акруговая ваяводская рада сельскагаспадарчых таварыстваў і Навагрудскае ваяводскае сельскагаспадарчае таварыства.

У канцы 1923 г. з'яўляюцца першыя аддзяленні Саюза Стральцоў (пяць у Лідскім павеце, па аднаму ў астатніх), фарміруюцца пажарная ахова, саюз ваенных інвалідаў, кола Мацежы школьнай.

У канцы 1925 г. пры Саюзе сельскагаспадарчых колаў Навагрудскай зямлі ў аддзяленнях пазашкольнай асветы арганізуецца маладзёжны рух у выглядзе некалькіх колаў Саюза сялянскай моладзі (далей ССМ). Акцыяй кіраваў інструктар пазашкольнай асветы пры Школьным інспектараце ў Нясвіжы, а развіццё арганізацый адбывалася дзякуючы грамадзянскаму ўдзелу настаўнікаў. У кастрычніку 1926 г. адбыўся першы з'езд дэлегатаў ад сялянскай моладзі, створанага ССМ Навагрудскага ваяводства. Але нават улады ацэньвалі дзейнасць самога Саюза як слабую. Вось што адзначаецца ў справаздачы ССМ Наваградскай зямлі за 1928 г.: «Надзвычайных эфектаў яшчэ няма....Канешне, гэтыя некалькі высыпак сярод вялікай колькасці вёсак... яшчэ мала змяняюць аблічча вёскі...» [2, с. 11].

Па ацэнцы адміністрацыйных ўлад, да 1928 г. як самі грамадскія арганізацыі, так і іх дзейнасць, былі вельмі слабыя, не атрымалі шырокага развіцця, былі замкнуты. Толькі пачынаючы з 1928 г. пачынае фарміравацца больш жывы рух у грамадскім жыцці [1, с. 71-72]. Гэта супадае ў асноўным з фарміраваннем санацыйнага лагера.

У мае 1926 г. Ю.Пілсудскі ажыццяўляе дзяржаўны пераварот пад лозунгам барацьбы з партыйнай сістэмай і свой палітычны рух абапірае ў першую чаргу на грамадскія арганізацыі. Таму іх развіццё ўкладваецца ў ідэалагічныя рамкі ўрадавага лагера, і ўсялякімі сродкамі падтрымліваецца і развіваецца. Менавіта яны становяцца асновай пры фарміраванні Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з ўрадам, палітычнага аб'яднання санацыйнага лагера. Цікава, што стварэнне структур урадавага блока, як і

саміх грамадскіх арганізацый, якія яго складалі, у Навагрудскім ваяводстве амаль супадаюць па часе.

На роздум наводзіць той факт, што ССМ у Навагрудскім ваяводстве з'яўляўся самастойнай арганізацыяй, незалежнай ад сваёй аднаіменнай цэнтральнай арганізацыі [2, с. 1-3]. Але з іншага боку, ўсё грамадска-палітычнае жыццё ў ваяводстве знаходзілася пад жорсткім кантролем з боку ваяводы. Значыць праз гэтую «самастойнасць» мясцовыя ўлады атрымалі магчымасць улічваць асаблівасці ваяводства.

У 1928 г. ССМ Навагрудскага ваяводства звярнуўся за фінансавай дапамогай да Міністэрства вайсковых спраў. Чаму яна выклікала інтарэс з боку міністэрства? Гэта арганізацыя ўпершыню, у адрозненні ад Саюза Стральцоў, акрамя палякаў, аб'ядноўвала мясцовую моладзь. Сваёй мэтай яна ставіла аб'яднанне ўсіх таварыстваў вясковай моладзі да агульнай працы для выхавання іх як добрых грамадзян Рэчы Паспалітай, у тым ліку задачу дастойна арганізаваць фізвыхаванне і ваенную падрыхтоўку ў вёсках Навагрудскага ваяводства. Магчыма, спачатку ССМ зацікавіла Міністэрства з пункту гледжання дзяржаўнай бяспекі і фарміравання лаяльных стасункаў да польскай дзяржавы з боку мясцовага насельніцтва. Міністэрства вайсковых спраў пагаджалася выдзеліць арганізацыі грошы пры ўмове, што ДОК IX (скар. Камандаванне акруговага корпуса, які знаходзіўся ў Брэсце) будзе ажыццяўляць кантроль над ёю [2, с. 9]. Такім чынам, дзейнасць ССМ прасочвалі яшчэ і вайсковыя ўлады. Хутчэй за ўсё з цягам часу гэты вопыт быў улічаны пры фармуляванні ў 30-я гг. паланізацыйнай палітыкі на гэтых землях, што можна прасачыць пры аналізе распрацаванага ў ДОК IX плана ўзмацнення польскага элемента на тэрыторыі корпуса [3, с. 8] і па працы А.Гертыха «Аб праграме крэсавай палітыкі», выдадзенай у 1932 г. [4]. Па гэтых праграмах, на першы план яны вылучаюць задачу прыцягнення да супрацоўніцтва мясцовага насельніцтва (рускага «тубыльчага» насельніцтва) на карысць польскай дзяржаве і яго паланізацыю, у тым ліку і праз грамадскія арганізацыі [3, с. 9 – 29].

Асноўны напор рабіўся на тыя грамадскія арганізацыі, якія, дзякуючы сваёй дзейнасці, карысталіся добрымі адносінамі да сябе з боку мясцовага насельніцтва і не вылучалі, не падкрэслівалі афіцыйна палітычных мэтаў [3, с. 9–29]. Напрыклад, такімі арганізацыямі былі Стража пажарная (пажарная ахова), сельскагаспадарчыя колы, ССМ. На іх была зроблена асноўная стаўка ў паланізацыйнай палітыцы. На першым этапе яны павінны былі стаць тым месцам, дзе праходзіла б супрацоўніцтва польскага і няпольскага насельніцтва пад кіраўніцтвам польскага элемента. Потым вылучаліся розныя дапаможныя крокі на гэтым шляху – арганізацыйныя, гаспадарчыя, вельмі вялікая ўвага надавалася пазашкольнай і школьнай акцыям, якія непасрэдна павінны былі фарміраваць свядомасць мясцовага насельніцтва [3, с. 1-3, 9].

Па праграме А. Гертыха прадугледжвалася стварэнне змешаных арганізацый, якія б, акрамя вылучаных «чыста польскіх», уключалі б і так

званыя «рускія». Ён зыходзіў з таго, што ў грамадскіх арганізацыях з мясцовым насельніцтвам польскі дух некаторы час будзе яшчэ не зусім грунтоўны. «Але каб у гэты доўгі пераходны перыяд утрымаць і арганізацыйнае сплачэнне і... каштоўнасць польскага люду – трэба каля гэтай шырокай арганізацыі ахапіць і рускія арганізацыі, але ўтрымаць і ўзмацніць таксама і асобную арганізацыю, якая складалася з людзей, якія з'яўляюцца палякамі па паходжанню і мове» [4, с. 84]. Па падобнай схеме будавалася Федэрацыя Польскіх Саюзаў Абаронцаў Айчыны, якая аб'ядноўвала былых вайскоўцаў. Сярод вайсковых арганізацый раней за ўсё з'явіліся Саюз ваенных інвалідаў і Саюз ваенных асаднікаў, а таксама арганізацыі незалежніцкага руху. Усе яны былі малалічныя, ніякага ўздзеяння на мясцовае насельніцтва не аказвалі і ў асноўным займаліся абаронай сваіх эканамічных інтарэсаў. У 1928-1929 гг. фарміруюцца Саюз афіцэраў рэзерву і Саюз рэзервістаў, Саюз падафіцэраў рэзерву. Найбольш інтэнсіўна арганізацыйная праца ідзе з 1932 г. да 1934 г. – як раз падчас з'яўлення праграм паланізацыі. Накірункамі іх працы стала грамадзянскае выхаванне, праца ў святліцах, культурна-асветніцкая дзейнасць, удзел у святах [2, с. 71, 81].

Найбольшая ўвага надавалася Саюзу рэзервістаў, бо менавіта ён складаўся з мясцовага элемента (які прайшоў службу ў польскім войску) і прыдаваў масавы характар польскім ваенным арганізацыям, бо ў 1939 г., па падліках ваяводы, налічваў да 5000 членаў [2, с. 81]. У той час, як астатнія – Саюз афіцэраў рэзерву і Саюз падафіцэраў рэзерву ўключалі выключна польскі элемент і былі малалікімі (мелі 600 і 250 чалавек) [2, с. 81].

Пазней за ўсё пачалося стварэнне жаночых арганізацый, як іх акрэслівае А.Гертых, арганізацый для жанчын, якія, акрамя навучання гаспадарчым навыкам, павінны былі распачаць і культурна-асветніцкую дзейнасць. Кола вясковых гаспадынь, хаця і было створана ў 1925 г., але дзейнасці амаль не праявіла. Сітуацыя трохі палепшылася ў 1930 г. Першыя колы Саюза грамадзянскай працы жанчын з'яўляюцца ў 1929 г. Яго аддзяленні ствараюцца спачатку ў гарадах, мястэчках, аднак дзякуючы накірункам дзейнасці – апека над маці і дзіцём, дакормліванне дзяцей – уплыў Саюза пранік у вёску [2, с. 86-87].

Важнай задачай польскіх арганізацый на тэрыторыі ваяводства павінна была стаць селекцыя людскога матэрыялу. «Першачарговае значэнне для паспяховай паланізацыі крэсаў мае выхаванне кадраў інтэлігенцыі, якая не адрознівалася б ад мясцовага насельніцтва паходжаннем і рэлігіяй, а па перакананнях і па культуры безумоўна польская» [4, с. 84]. Гэтыя задачы павінны былі ажыццявіць мясцовыя таварыствы, пад кіраўніцтвам польскай інтэлігенцыі, якая магла найлепш ацаніць прыдатнасць асобы да атрымання адукацыі.

Па ацэнцы А.Гертыха, арганізацыя іншамоўнага насельніцтва на крэсах польскім арганізаваным рухам з'яўлялася цяжкай задачай і магла адбыцца толькі пры ўмове цеснага супрацоўніцтва польскага грамадства і дзяржаўнай улады. Як аўтар бачыў гэтыя ўзаемаадносіны? Ад грамад-

ства патрабавалася сабраць людзей да працы. Улада павінна арганізаваць падтрымку – усялякія паслабленні, грашовыя субсідыі, асабліва на такія мэты як аплата даязджаючых інструктараў, курсы грамадскай працы, некаторыя адміністрацыйныя затраты арганізацыі і т.д., прыняцце актыўнага ўдзелу ў грамадскай працы шматлікіх служачых, судзей, настаўнікаў, іншых людзей, залежных ад дзяржавы [4, с. 80].

І сапраўды, на стварэнне і развіццё грамадскіх арганізацый вылучаліся дзяржаўныя субсідыі [2, с. 1-3, 9] і найчасцей, калі фінансаванне спынялася, спынялася і праца арганізацый. У справаздачы называюцца толькі перыяды, калі яны пачалі дзейнічаць, зрэдку перыяд інтэнсіўнай працы, але, каб адказаць на пытанні аб эфектыўнасці працы на пэўным адрэзку часу, трэба дакладна заняцца вывучэннем гэтых арганізацый.

Літаратура і крыніцы

1. Opracowanie zagadnienia polskiego stanu posiadania w wojewydstwie Nowogrydzkim. – Nowogrydek, 1939.

2. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Фонд 551. Вопіс 1. Справа 1063.

3. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Фонд 1. Вопіс 10. Справа 832.

4. Giertych Jкdrzej. O program polityki kresowej. – Warszawa: Nakladem towarzystwa wyd. «Patria», 1932. – 148 s.

П.Т. Стецкевич, ГрГУ им. Я.Купалы, г. Гродна

ИДЕОЛОГИЧЕСКИЕ ПЛАТФОРМЫ ЕВРЕЙСКИХ ПОЛИТИЧЕСКИХ ПАРТИЙ ВО II РЕЧИ ПОСПОЛИТОЙ, ДЕЙСТВОВАВШИХ НА ТЕРРИТОРИИ ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ В 1921 – 1926 гг.

Правое крыло в еврейской политической жизни представляло ортодоксальное, или консервативно-клерикальное, движение. Оно было представлено существовавшей с 1909 г. всемирной федерацией «Союз Израиля» («Agudas Jisroel»). На польских землях филиал этой организации был основан в 1916 г. первоначально под названием «Союз правоверных» («Agudas Hoortodoxsim»). В 1918 г. организация приняла название «Мир верным израильтянам») («Szlojmej Emunej Jisroel»), а в 1919 г. была официально переименована в «Agudas Jisroel» [1, с. 261].

Программа организации была принята 14 марта 1917 г. на конференции в Варшаве [2, с. 26]. Основными задачами организации были признаны: 1. Защита религиозных дел евреев. 2. Укоренение и развитие в жизни принципов еврейской религии среди евреев. 3. Основание и субсидирование религиозных школ различных типов: средних (хедеров), высших (иешибот) и семинарий. 4. Общественно-благотворительная и куль-

турная деятельность. 5. Создание трудовых мастерских, кооперативов, содействующих организаций и товариществ.6. Основание в Палестине крестьянских поселений для ортодоксальных евреев [2, с. 27].

«Agudas Jisroel» выступал за национальное возрождение евреев в Палестине в бесспорной гармонии с принципами еврейской религии. Иврит признавался священным языком литургии, идиш – языком повседневного общения, польский язык – единым государственным языком. Во внутригосударственной политике организация стремилась к равноправию на основе Конституции, но при этом старалась добиться признания за евреями прав отдельной нации, предоставления им автономии в культурных, общественных и религиозных делах под надзором государственных властей. Еврейские гмины должны были приобрести религиозный характер [3, с. 35].

Важную роль в еврейской политической жизни играло националистическое движение в виде сионизма. Начиная с 1916 г. в Польше одна за другой возникли несколько сионистских партий [1, с. 265]. Важнейшей из них была «Сионистская организация в Польше» («Histadrut ha Cyjonith be'Polonijah»). Внутри партии существовали три основных течения: «Время строить» («Eth Libnoth»), «На страже» («Al Hamiszmar») и ревизионисты. Каждое из них имело собственные программные установки, касающиеся создания еврейского государства в Палестине.

Главными постулатами программы фракции «Eth Libnoth» в этом вопросе были: 1. С целью достижения как можно большего еврейского присутствия в Палестине стремиться к мобилизации значительных капиталов для работы по колонизации территории Палестины. 2. Удаление особого внимания поддержке частной инициативы в деле строительства Палестины.

Главной задачей «Al Hamiszmar» в палестинском вопросе было недопущение несионистских элементов к руководству строительством автономии, что по мнению членов фракции могло угрожать планом создания еврейской государственности в Палестине.

Ревизионисты в своей палестинской программе требовали: 1. Бесплатной передачи евреям необрабатываемых государственных земель в Палестине. 2. Проведение аграрной реформы. 3. Ведение политики протекционизма по отношению к еврейской промышленности. 4. Создание в Палестине еврейских вооруженных сил. 5. Назначение евреев на государственные должности в Палестине.

В вопросах внутрипольской политике «Сионистская организация» выдвигала постулат национальной автономии, основанной на организации еврейских гмин, которые должны носить светский характер. Национальным языком сионисты считали иврит, идиш же, как язык народных масс, должен был получить равноправный статус в диаспоре [2, с. 26].

К сионистскому движению принадлежала также клерикально-националистическая партия сионистов – ортодоксов «Духовный центр» («Mizrachi»). Первая конференция этой партии в Польше состоялась в июле 1917 г. в Варшаве [2, с. 26].

В своей программе партия использовала лозунг «Религия, наука и труд». Руководство партии считало, что национально-культурное развитие должно осуществляться на принципах религии и еврейских традиций. В вопросах экономики «Mizrachi» вела работу в направлении подготовки еврейской молодежи к труду на земле [2, с. 26]. «Mizrachi» не препятствовала участию в строительстве еврейского государства в Палестине несионистских элементов. Партия последовательно выступала за создание в Палестине еврейской национальной автономии и государства [1, с. 268].

В вопросах политики внутри Польши «Mizrachi» стремилась к достижению полного равноправия евреев на основе Конституции. Политическое урегулирование еврейской проблемы партия видела в национальной автономии, основанной на еврейских национально–религиозных гминах, объединенных в союз еврейских гмин Речи Посполитой [2, с. 26]. Идиш «Mizrachi» считала национальным языком. Образование должно было носить светско–религиозный характер.

Третьей существовавшей во II Речи Посполитой партией сионистского тока была Всемирная сионистская партия труда («Maflegeth Awodah Cyjonit Hitachduth»), которая была образована в 1920 г. [1, с. 270]. Программа партии была принята на III всемирной конференции в Берлине в 1922 г. [2, с. 26].

Программа партии предусматривала:

1. Создание в Палестине национального центра еврейской свободной трудящейся общественности на основе социалистического хозяйства и еврейской культуры.

2. Возрождение национальной жизни в странах еврейской диаспоры на основе автономии своего производства и укоренение древнееврейской культуры [4, с. 70].

Достижение намеченных целей предполагалось путем:

1. Создания «халюцевского» (пионерского) движения как основы для подготовки кадров эмиграции в Палестину [2, с. 26].

2. Направления в Палестину трудящихся производственной среды [2, с. 26].

3. Социального и политического объединения евреев в государствах их проживания [2, с. 26].

4. Защиты рабочих от эксплуатации [2, с. 27].

5. «Ускорение сионизма» [2, с. 27].

Согласно программе партии, национальное и общественной освобождение евреев являлось монолитным и взаимосвязанным процессом, который должен был идти по пути эволюции. Конечная реализация сионистской идеи должна была произойти путем постепенного объединения всех общественных элементов в умственном и физическом труде. Классовое содержание должно было подчиниться национальному фактору. Партия считала, что национальным еврейским языком является иврит [4, с. 71].

Сравнительно небольшим влиянием среди масс пользовалось еврейское лево-либеральное движение или так называемые народники. В 1917 г. в Варшаве прошла первая конференция «Еврейской народной партии в Польше» («Jidysze Folkpartaj in Pojen») [1, с. 263]. В своей программе, принятой в 1920 г., народники заявили, что евреи в Польше являются коренными жителями и представляют собой отдельную национальную группу [2, с. 26].

Сущность своих политических взглядов партия представила в части программы, посвященной национальному вопросу. Фолкисты выступали с постулатом культурно-национальной автономии. Они требовали создания общественно-правового еврейского народного союза, который путем демократических выборов избрал бы Еврейский народный совет и автономный еврейский парламент. В ведении Народного совета должны были находится вопросы просвещения, культуры, здравоохранения, а также частично народного хозяйства-организации кредита, страхования, кооперации. Согласно программе партии должны были быть созданы еврейские местные органы самоуправления в виде светских кагалов гмин и поветов. Официальным языком в автономных инстанциях, а также в системе начального образования должен был стать идиш. На территории компактного проживания еврейского населения идиш должен был быть допущен для пользования в общегосударственных инстанциях [1, с. 264].

Помимо ортодоксов и сионистов, важную роль в политической и общественной жизни евреев во II Речи Посполитой играло социалистическое движение, которое сформировалось в последние десятилетия XIX в. [1, с. 264].

Самой влиятельной социалистической партией, действовавшей на территории Польши в межвоенный период, был образованный в 1897 г. Всеобщий еврейский рабочий союз («Algemener Jidiszer Arbeter Bund») [2, с. 26].

Являясь легальной политической партией, Бунд с 1919 г. участвовал в выборах в Сейм. На выборах в Сейм в 1922 г. Бунд выступил с собственной программой, главными положениями которой были:

В социально – экономической области:

1. 8-часовой рабочий день;

2. Социальное обеспечение за счет государства в случае болезни, безработицы, старости;

3. Отмена косвенных налогов и утверждение единой системы прямых налогов;

4. Свобода собраний, слова, прессы и забастовок.

В национальном вопросе:

1. Равноправие всех граждан государства и признание их языковых прав в администрации, на предприятиях, в школах и т.д.;

2. Отмена всех правовых ограничений для еврейского народа;

3. Преподавание в школах для еврейских детей на идише [5, с. 63].

Среди далеко идущих планов Бунда следует выделить:

1. Уничтожение капитализма и строительство социалистического общественного строя.

2. Объединение и организация рабочего класса и остального трудящегося народа на борьбу с капитализмом.

3. Захват власти рабочим классом и управление в переходный период к социализму даже посредством диктатуры.

4. Поддержка мирных отношений между народами и государствами.

5. Защита прав национальных меньшинств.

6. Защита права на самоопределение всех народов [2, с. 26].

Значительным влиянием среди еврейского населения во II Речи Посполитой пользовалась основанная в 1906 г. в Полтаве Еврейская социал–демократическая рабочая партия «POALEJ-CJON» [6; 28]. В 1920 – 1922 гг. внутри партии произошел раскол, который привел к образованию двух новых партий – Еврейской социалистической рабочей партии «POALEJ-CJON» (POALEJ–CJON правая) и Еврейской социал-демократической рабочей партии «POALEJ-CJON» (POALEJ–CJON левая).

Основными программными установками партии POALEJ–CJON правая являлись:

1. Признание социализма и классовой борьбы в международной, государственной и национальной еврейской жизни.

2. Создание в Палестине еврейского государства, основанного на социалистических принципах.

3. Культурная и национальная автономия еврейских гмин с чисто светской структурой и демократическим самоуправлением, выделение религиозных дел из компетенции общественных институтов. Идиш считался языком всеобщего пользования в автономных еврейских институтах и языком общения в школе (но и ивриту в школе, согласно программе партии, так же должны были обучаться в достаточной мере). В Палестине признавалось преобладание иврита над идишем [7, с. 170].

Партия POALEJ – CJON левая выступала со следующей программой:

1. Обобществление средств производства и изменение общественного строя на социалистических началах.

2. Создание в Палестине национального центра для еврейских рабочих.

3. Создание в Польше единой классовой профессиональной организации пролетариата без учета национальной принадлежности.

4. Равноправие и создание в Польше автономных институтов для соблюдения интересов еврейских масс.

5. Исключение религиозных функций из компетенции еврейских гмин.

6. Идиш становиться национальным языком для евреев в Польше [2, с. 26].

Таким образом, практически все еврейские партии, действовавшие на территории II Речи Посполитой, имели хорошо продуманные и подготовленные политические программы, соответствовавшие целям и задачам, поставленным различными течениями еврейской политической мысли.

Литература и источники

1. Holzer Jerzy. Mozaika polityczna Drugiej Rzeczypospolitej. – Warszawa: Ksiazka I Wiedza,1974. – 669 s.

2. Государственный архив Брестской области. Ф. Р-1. Оп. 9. Д. 2145.

3. Свирид А. Еврейская ортодоксальная партия «Агудат Израэль» и еврейское политическое движение во II Речи Посполитой (1919- 1939 гг.) // Моладзь Берасцейшчыны. Зборник студэнцкіх навуковых прац. – Брэст, 1997. – 141 с.

4. Свирид А. Сионистская партия труда «Hitachuuth» («Объединение») во II Речи Посполитой с момента образования до государственного переворота 1926 г. // Моладзь Берасцейшчыны.: Сборник научных статей студентов исторического факультета Брестского государственного университета имени А.С.Пушкина. Выпуск 2-й. – Брест, 1995. – 113 с.

5. Костючик В. Бунд в политической жизни Польши в межвоенный период (20–30 годы). // Моладзь Берасцейшчыны. Сборник научных статей студентов исторического факультета Брестского государственного университета имени А.С.Пушкина. Выпуск 2-й. – Брест, 1995. – 113 с.

6. Найман О.Я. Еврейські партії та об'єднання Україні (1917- 1925): Монографія. – Київ: ІПІЕНД, 1998. – 196 с.

7. Свирид А. Н. Еврейская социалистическая рабочая партия «Poalej cjon» в Полесском воеводстве. // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблема развіцця заходняга рэгіёна Беларусі. Матэрыялы міжнароднай навукова- практычнай канферэнцыі. Брэст. 23-24 красавіка 1998 г.: У 2-х частках. Ч. 2. – Брэст: Выдавецтва С. Лаўрова, 1998. – 338 с.

А.К. Гецевич, ГрГУ им. Я.Купалы, г. Гродно

ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ПОЛЬСКИХ ПОЛИТИЧЕСКИХ ПАРТИЙ НА ТЕРРИТОРИИ г. ЛИДЫ И ЛИДСКОГО ПОВЕТА (МАРТ 1921– МАЙ 1926 гг.)

Политическая жизнь Лидчины в 1921 – 1926 гг. была довольно пестрой. На территории повета действовали отделения и представители многих крупных польских политических партий.

Особый вес здесь имела ПСЛ «Освобождение», в 1921–1924 гг. это движение было наиболее активной политической организацией в названном регионе. Наибольший интерес к повету движение начало проявлять в период подготовки и проведения выборов в сейм 1922 г.

С целью укрепления влияния ПСЛ «Освобождение» был организован окружной съезд в г.Лиде. Созван он был 3 октября 1922 г. На него прибыло 3250 делегатов из Виленского и Новогрудского воеводств. Рассматривались вопросы формирования предвыборного списка партии и предвыборной программы. Согласно принятым решениям съезда, в избирательном округе №62, в состав которого входили г.Лида и Лидский повет, в списке течения находились жители г.Лиды и повета Б.Мисан – ад-

вокат, В.Силюк – крестьянин. ПСЛ «Освобождение» активно проводило агитацию, особенно среди крестьян. Однако своими высказываниями по вопросам земельной реформы агитаторы партии нередко выступали на антигосударственных позициях, пользовались популистскими лозунгами, которые были просто не выполнимы [1, л. 630].

Параллельно с агитацией ПСЛ «Освобождение» проходила агитационная кампания и ее союзника Польского Народного Союза «Возрождение». Основная агитационная деятельность союза проходила на территории Лидского повета. Агитацию здесь проводили братья Л. и А.Клышенко, но их деятельность носила пассивный характер [2, л.213–214].

Во время избирательной кампании активизировалась и ПСЛ «Пяст». В Лидском повете агитационными акциями руководил А.Дубровник. Прошли собрания в Щичине, Рожанке, Желудке, Эйшишках, Василишках, и Белогрудской гмине. Дубровник знакомил собравшихся со сложившейся политической ситуацией в стране, с программой течения. Распространялись газеты «Воля Народа», «Пяст».

Таким образом, ведущие политические силы Польши довольно активно участвовали в предвыборной кампании на территории западной Беларуси, рассчитывая получить новый электорат и укрепить свои позиции в новом парламенте за счет депутатских мандатов с востока.

В итоге на выборах в округе №62, куда входили г.Лида и Лидский повет, была отмечена высокая избирательная активность – 58 %. Список ПСЛ «Освобождение» получил около 35 % голосов избирателей. Депутатские мандат получили Ст.Баллин, Ф.Головач, С.Воевудский [3, с. 33].

После победы на выборах движение продолжало наращивать свои усилия в регион. Так, только в мае 1923 г. ПСЛ «Освобождеине» провело ряд митингов и собраний в г.Лиде и повете. В основу выступлений ораторов были положены текущие политические и социальные проблемы, а 28 ноября 1923 г. прошел поветовый съезд ПСЛ «Освобождение» под руководством Ст.Баллина и Ф.Головача по вопросам сервитутов. [4, л. 4-5].

По заключению полиции в период 1921–1923 гг. ПСЛ «Освобождение» была самой влиятельной из существовавших на территории повета политических организаций, имела сильное влияние в гминных радах, сельской местности. На территории повета действовало около 25 первичных комитетов движения [5, л. 2-4].

Со времен выборов 1922 г. определенное влияние получило здесь ПСЛ «Пяст». Новым лицом движения в повете стал, согласно сводкам полиции, П.Мартишевский. Вместе с тем ПСЛ «Пяст» не смогло составить достойной конкуренции «Освобождению».

На протяжении 1924 г. «Освобождение» оставалось единственным крупным политическим движение в регионе. Однако, в конце года, в результате партийного кризиса и последовавшего за ним раскола, из движения ушли депутаты, представлявшие интересы восточных воеводств Польши. Лидер местного комитета Ст.Баллин, создал Независимую крестьянскую партию (НКП), которая вскоре составила серьезную конкуренцию ПСЛ «Освобождение».

Новым лидером «освобожденцев» стал депутат А.Дубровник. Несмотря на то, что партия ослабла и часть приверженцев ушла за бывшим лидером Ст.Баллиным, А.Дубровник активно проводил агитационно-разъяснительную работу. Так, 8 декабря 1924 г. была проведена отчетная конференция в Жирмунах, на которой присутствовали 150 человек, 9 декабря 1924 г. подобная конференция прошла и в Вороново (300 человек) [6, л. 2-4].

Ст.Баллин начал свойственную ему активную деятельность во главе НКП уже в январе 1925 г., правда, она проявлялась в основном через распространении агитационной литературы.

Некоторую активность в начале 1925 г. проявляли также представители христианских демократов (ХД). 2 января 1925 г. в Лиде их сторонники организовали отчетную конференцию. Депутат кс. А.Ольшанский критиковал социально-экономический строй СССР, земельную реформу, были рассмотрены и другие острые социальные вопросы. На конференции присутствовали 200 человек. К сожалению, полиция не приводит сведения, был или не был организован секретариат данной политической партии в регионе, однако, судя по всему (в последующих отчетах за 1925 г. ХД не фигурирует), такового организовано не было [7, л. 96-98].

В феврале 1925 г. в Лидский повет зачастили представители ППС. На этом этапе их деятельность наиболее четко прослеживалась среди профсоюзных организаций города. Так, в феврале 1925 г. в Лиду из Вильно на собрания профсоюза железнодорожников несколько раз приезжал представитель Виленского Окружного Комитета Ст.Плавский. Согласно отчетам полиции к концу февраля представители ППС имели сильное влияние (более 80 %) на рабочих стекольной промышленности и металлистов, железнодорожников, в то время как ПСЛ «Освобождение» имело сильно влияние в профсоюзах предприятий пищевой промышленности (около 60 %).

Все это привело к созданию фактической базы сторонников ППС и появлению в апреле 1925 г. секретариата ППС в Лиде во главе с Томашевским [8, л. 792-794].

Начиная с мая 1925 г. ППС перехватывает лидерство у ПСЛ «Освобождение» в Лиде и повете. С целью укрепления в регионе 5 июля 1925 г. местным комитетом ППС было открыто представительство Товарищества рабочего университета. В том же месяце, совместно с профсоюзом земледельцев, ППС открыла в г.Лиде Общество рабочей Молодежи [9, л. 7-8].

Осень 1925 г. прошла под знаком борьбы польских политических партий в регионе. Представители ПСЛ «Освобождение», ППС и НПХ проводили отчетно–выборные собрания, выезжали с агитационными собраниями в повет. НПХ пыталась провести несколько несанкционированных митингов на территории г. Лиды, однако все они были пресечены полицией.

26 сентября состоялось заседание лидского комитета ППС. На нем были утверждены кадровые изменения в составе комитета. Председатель

Томашевский сложил с себя полномочия, в связи с переводом его в г.Волковыск. Новый состав комитета был утвержден в следующем составе: Ф.Гуис (председатель), Капелюк, Антонович, Чайковский – члены комитета [10, л. 1407-1412].

6 декабря прошло собрание ППС в кинотеатре «Эдисон». На собрании присутствовали 400 человек. Председательствовал руководитель местного комитета ППС Феликс Гуис. На повестке дня стояли социальные вопросы, обсуждались перспективы развития партийного строительства в регионе [11, л. 10-12].

Начало 1926 г. свидетельствовало о росте популярности ППС и ослаблении ее политических противников в регионе.

Так, на заседании 10 января членов ППС под председательством Ф.Гуиса, была оценена деятельность ППС в г.Лиде как интенсивная. По словам председателя, в начале деятельности городского комитета (февраль 1925 г.) в его состав входили 7 членов, а на январь 1926 года состояли уже 39 человек.

Деятельность ПСЛ «Освобождение» в повете сводилась к единичным встречам депутатов с жителями во время их проезда в г.Вильно или другой регион [12, л. 29-31].

В феврале–марте 1926 г. активную деятельность проводила лишь ППС, которая провела 2 митинга: 14 февраля в д. Конюшаны (70 человек), 21 февраля – в г.Лиде (450 человек), на которых выказывалось недовольство решением земельного вопроса [13, л. 53-55].

Кроме того, ППС провела 32 организационные собрания в деревнях и открыла 14 новых комитетов: в д.Огородники Гончарской гмины (под пред. Моровецкого), в д.Руда Ганчарской гмины (под пред. Урбановича), д.Еремевичи Гончарской гмины (под пред. Шумейко), д.Людоры Гончарской гмины (под пред. Сихени), д.Поречье Белицкой гмины (под пред. Бартошевича), д.Лозяны Белицкой гмины (под пред. Жилинского), д.Велички Белицкой гмины (под пред. Драгуна), д.Мосевичи Тарновской гмины (под пред. Мухладо), д.Поречаны Тарновской гмины (под пред. Вальчика), д.Ольжево Тарновской гмины (под пред. Ничипора), д.Полубники Тарновской гмины (под пред. Општера), д.Радивонишки Тарновской гмины (под пред.Казюты), д.Цвербиты Тарновской гмины (под пред. Касперского), д.Пески Лебедской гмины (под пред. Коробач). Всего за данный период новыми членами ППС стали 140 человек (по данным полиции и подсчётам автора) [14, л. 74-86].

В апреле 1926 г. на политической арене повета появилось Кресовое крестьянское строннитство, которое возглавил А.Дубровник. 2 апреля 1926 г. он выступил на митинге в Германишках Седлицкой гмины. Речь А.Дубровника была направлена на критику деятельности НПХ, выступающий заявил о планах на быструю организацию сети сельских комитетов нового движения. В это же время представитель НКП Баллин с целью сорвать выступление Дубровника попытался организовать митинг в Трокелях (соседствующие населенные пункты, 9 км друг от друга), однако разреше-

ние местных властей не получил. Деятельность НКП проходило посредством пассивной агитации (листовки, газеты).

Общественно – Народный Союз, после долгого перерыва, напомнил о себе организовав митинги в Лиде (депутат Поповски) и д.Эйшишках (Рачковский).

Активно вела себя и ППС, которая открыла 9 новых деревенских комитетов в Лебедской гмине: д.Лесники (под пред. Позняка, 9 членов), д.Большое село (под пред. Ковальчука, 8 членов), д.Малыши (под пред. Шимона, 8 членов), д.Леневцы (под пред. Енко, 6 членов), д.Голдово (под пред. Ковальчука, 8 членов), д.Игнатовцы (под пред. Тарасюка, 6 членов), д.Климовичи (под пред. Жамойтина, 6 членов), д.Семашки (под пред. Войтюшкевича, 6 членов), д.Пасюты (под пред. Ощмяны, 6 членов). Открыто было и 2 ячейки в Докудовской гмине – в Докудово (под пред. Сойко) и д.Петры (под пред. Сягло).

В мае 1926 г. Кресовое крестьянское стронництво под предводительством депутат А.Дубровника провело 3 митинга: в г.Щучине, м.Белогруде (несанкционирован, разогнан полицией), в Желудке. На митингах была оглашена и принята резолюция, основными положениями которой были: избрание Ю.Пилсудского президентом, роспуск сейма и сената, создание рабоче-крестьянского правительства.

НКП безуспешно попыталась провести несанкционированный митинг в фольварке Дворище Жирмунской гмины.

ППС, как всегда, 1 мая провела демонстрацию в г.Лиде. В ней участвовали профсоюзы города, представители 25 новых деревенских первичных организаций, члены и сторонники ППС. На мероприятии присутствовал и представитель Окружного комитета партии в Вильно Муравский. На демонстрации собралось 1000 человек.

Кроме того, партия продолжила расширение сети своих ячеек, было проведено 8 собраний и организовано 3 комитета партии: д.Оленковцы Лебедской мины (под предс. Мася, 6 членов), д.Скрыбовцы (под пред. Коробача, 3 члена), д.Новосады (под пред. Юшкевича, 4 члена) [15; л. 120-126].

Таким образом, Лидчина была местом активной деятельности польских политических партий и движений.

Литература и источники

1. Литовский Центральный государственный архив. Ф. 119. Оп. 1. Д. 3. Л. 630.

2. Литовский Центральный государственный архив. Ф. 119. Оп. 1. Д. 91. Л.213–214.

3. Belcikowska A. Stronnictwa polityczne w Polsce. – Warszawa, 1926. – C. 33.

4. Государственный архив Гродненской области (ГАГО) Ф. 200., Оп. 2. Д. 6. Л. 4-5.

5. ГАГО, Ф. 551. Оп. 1. Д. 143. Л. 2-3.

6. ГАГО, Ф. 551. Оп. 1. Д. 143. Л. 4.

7. ГАГО, Ф. 200. Оп. 1. Д. 17. Л. 96-98.
8. ГАГО, Ф. 200. Оп. 1. Д. 17. Л. 792-794.
9. ГАГО, Ф. 200. Оп. 2. Д. 6. Л. 7-8.
10. ГАГО, Ф. 200. Оп. 1. Д. 17. Л. 1407-1412.
11. ГАГО, Ф. 200. Оп. 2. Д. 8. Л. 10-12.
12. ГАГО, Ф. 200. Оп. 2. Д. 8. Л. 29-31.
13. ГАГО, Ф. 200. Оп. 2. Д. 8. Л. 53-55.
14. ГАГО, Ф. 200. Оп. 2. Д. 8. Л. 74-86.
15. ГАГО, Ф. 200. Оп. 2. Д. 8. Л. 120-126.

В.Л. Сарочык, ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

ЯЎРЭЙСКІЯ ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАРТЫІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921 – 1939 гг.

Па ўмовах Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. тэрыторыя Заходняй Беларусі была ўключана ў склад Польскай дзяржавы. Як і ва ўсёй Польшчы, пануючае эканамічнае і палітычнае становішча ў Заходняй Беларусі займала польская буржуазія і памешчыкі. Эканамічна параўнальна моцнай была яўрэйская буржуазія. Але ў палітычных адносінах яна не мела значнай вагі. Аб нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд ідуць спрэчкі. І.Несцяровіч падае наступны нацыянальны склад насельніцтва Заходняй Беларусі: беларусы – 65 %, палякі – 15 %, яўрэі – 11 %. Аўтары «Нарысаў гісторыі Беларусі» М.П.Касцюк, І.М.Ігнаценка, У.І.Вышынскі прыводзяць такія дадзеныя: «У цэлым у Віленскім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах беларусаў было не 22,5 %, як сцвярджае афіцыяльная польская статыстыка, а 67 %, палякаў не 42 %, а 12-13 %, украінцаў – 5-6 %, яўрэяў – каля 9 %, рускіх – 2 %, літоўцаў – 3 %» [4, с.22]. А вось польскі гісторык Ян Ежы Мілеўскі не згодны з гэтымі дадзенымі. Ён піша, што не ў адной з гэтых прац аўтары не тлумачаць, якім чынам яны атрымалі гэтыя дадзеныя [5, с.27].

Тым не менш яўрэяў на гэтай тэрыторыі было шмат. І мелі яны свае палітычныя партыі. На «польскіх» землях у гэты час існавалі даволі моцныя традыцыі яўрэйскага палітычнага жыцця. Асабліва моцнымі яны былі на тэрыторыі, якая раней уваходзіла ў склад Расійскай імперыі. Крыху слабейшымі гэтыя традыцыі былі на тэрыторыі, якая была ў складзе Аўстрыі. На землях, якія пасля ІІІ падзелу Рэчы Паспалітай былі ўключаны ў склад Расійскай імперыі, яўрэйскія партыі і рухі былі цесна звязаны з палітычнымі арганізацыямі Расіі.

Палітычны яўрэйскі рух у 1921 – 1939 гадах, як і ў папярэднія гады, быў вельмі неаднародным. Ён складаўся з такіх напрамкаў, як кансерватыўна-клерыкальны, ліберальны, сіянісцкі і сацыялістычны.

Правым накірункам (Prawice) у яўрэйскім палітычным жыцці быў кансерватыўна-клерыкальны рух (ortodoksyjny). Гэты рух быў арганіза-

ваны ў дзейнічаючай з 1909 г. сусветнай арганізацыі Zwiazek Iesroela (Aqudas Iesroel) [10, с.261]. На польскіх землях у 1916 г. створана агуда, якая спачатку называлася Саюз Прававерных (Aqudas Haortodoksim). У 1918 годзе арганізацыя стала называцца Szelume Emune Iesroel (Спакой верным ізраільцянам), а з 1919 г. афіцыйна была перайменавана ў Aqudas Iesroel.

Цяжка сказаць, ці мела гэтая арганізацыя сваю афіцыйную праграму. Магчыма нейкія элементы праграмы змяшчаліся ва ўступнай частцы Статута. Агуда ставіла перад сабой мэты абароны правоў рэлігійных яўрэяў, падтрымкі сваёй нацыянальнай адукацыі, абароны эканамічных інтарэсаў яўрэйскага народа, правядзенне акцый у падтрымку стварэння абшчыны яўрэяў у Палесціне, якая б абапіралася на рэлігію і традыцыі яўрэяў. Але Агуда мела іншую, чым сіянізм, канцэпцыю. Справу эміграцыі яўрэяў у Палесціну Агуда лічыла другараднай у параўнанні з галоўнымі праблемамі яўрэйскага народа ў краінах яго пражывання.

Агуда не праяўляла вялікай палітычнай актыўнасці, падкрэслівала сваю лаяльнасць да Польскай дзяржавы, хоць і крытычна ставілася да палітыкі ўлады.

Трэба адзначыць, што Агуда мела сярод яўрэяў даволі значны ўплыў, але дакладна вызначыць маштабы гэтага ўплыву не прадстаўляецца магчымым. Вядома, што падчас выбараў у сейм у 1919 годзе Агуда была адной з наймацнейшых яўрэйскіх партый у большасці рэгіёнаў Польшчы. Пад уплывам Агуды знаходзілася значная частка яўрэйскай буржуазіі, а таксама сярэднія і дробныя слаі мяшчанства. Значна меншым быў яе ўплыў на рабочых.

Статут Агуды сведчыць аб тым, што яна была добра арганізаванай партыяй. Існавалі правінцыяльныя аддзелы (у 1925 годзе – каля 600) [10,с.262], хоць членам партыі не прад'яўлялася ніякіх патрабаванняў, акрамя неабходнасці плаціць узносы. Больш актыўнымі былі мясцовыя камітэты, а таксама выбраныя імі выканаўчыя камітэты. Вышэйшым органам партыі быў Агульны сход дэпутатаў, які збіраўся кожныя 3 гады. На Агульным сходзе выбіралі Цэнтральны Камітэт, які складаўся са 100 членаў. У сваю чаргу Цэнтральны Камітэт выбіраў 25 членаў Выканаўчага Камітэта.

У 30-я гады Статут Агуды, верагодна, некалькі змяніўся. Аб гэтым сведчаць некаторыя розніцы ў назвах інстанцый, з'яўленне новых органаў і г.д. Вышэйшым органам быў З'езд, на якім выбіралася 100 членаў Галоўнай Рады. Яна выбірала Выканаўчы Камітэт. Ён у сваю чаргу вызначаў лідэраў. У Выканаўчым камітэце (экзекутыве) былі таксама дэлегаты аўтаномных арганзацый: маладзёжнай Cejre AT I рабочай – Poale AI. Функцыі Сакратарыята выконвала Цэнтральнае бюро. Існавала таксама аўтаномная жаночая арганізацыя – Benaus A. I.

Праграмныя ўстаноўкі Агуды ў 30-я гады істотна не змяніліся. Але Агуда ўсё больш увагі пачала звяртаць на «палесцінскае пытанне», падтрымліваць ідэю эміграцыі, тым самым яна набліжалася да сіянісцкай праграмы пабудовы яўрэйскай дзяржавы ў Палесціне.

Агуда мела ўплыў на значную частку яўрэйскага перыядычнага друку, у тым ліку на газету «Jud» (Варшава), штатыднёвікі «Illustrierter Bess Yaakob Zurnal» і «Jidyszer Arbajter», а таксама штомесячнік «Ortodoksisze Bletelch» (Лодзь) [10, с.263].

Сярод кіраўнікоў і лідэраў Агуды выдзяляліся равіны, напрыклад: Хайм Озэр Гродзенскі, Арон Левін, Майер Шапіра. Нямала вядомых дзеячоў Агуды былі прадстаўнікамі купецтва і прамыслоўцаў, напрыклад, Эліаш Кіршбраўн і Лейба Мінсберг [10, с.264].

Адносна невялікае значэнне ў 20-х гадах меў яўрэйскі левы ліберальны рух, або так званы Ludowcy (folkisci). Пачаўся гэты рух у 1916 годзе. У 1917 годзе ўзнікла Яўрэйская Партыя Людова з Польшчы (Jidysze Folks Partaj in Pojlen) [10, с.265].

У першай палове 1926 года партыя распалася на некалькі арганізацый. Віленская арганізацыя ў жніўні 1926 года заснавала асобную партыю.

Яшчэ ў 1920 годзе JFP прыняла праграму, у якой гаварылася аб заснаванні незалежнай дэмакратычнай польскай дзяржавы з самастойным урадам. Праграма патрабавала стварэння падчас выбараў у сейм курый нацыянальных меншасцей, а таксама поўнага раўнапраўя ўсіх народаў [8, с.35].

У праграме знайшлі сваё месца таксама пытанні бясплатнага і абавязковага пачатковага навучання дзяцей на іх роднай мове, стварэння прагрэсіўнай падатковай сістэмы, як умовы падтрымкі развіцця рамёстваў. Сутнасць сваіх палітычных памкненняў JFP прадэманстравала ў той частцы Праграмы, якая прысвечана нацыянальнаму пытанню. Партыя прызывала яўрэяў за асобны этнас: выступала з прапановамі культурна-нацыянальнай аўтаноміі. У сувязі з гэтым прапанавалася стварэнне грамадска-прававой яўрэйскай народнай абшчыны, якая б у выніку дэмакратычных выбараў утварыла Яўрэйскую Раду Людову – аўтаномны яўрэйскі парламент. Мелася на думцы падпарадкаваць яму справы асветы, культуры, аховы здароўя, а таксама некаторыя гаспадарчыя справы (арганізацыя крэдыту, страхавое пытанне і г.д.). Таксама прадугледжвалася стварэнне мясцовага яўрэйскага ўрада ў выглядзе свецкіх кагалаў гмін і паветаў. Мовай ў аўтаномных установах, а таксама ў пачатковых школах павінен быць ідыш. У месцах высокай канцэнтрацыі яўрэйскага насельніцтва ідыш павінен быў быць дазволены да ўжывання ва ўстановах пазадзяржаўных.

JFP была апазіцыйнай партыяй у адносінах да ўрада. Яна адначасова вяла вострую барацьбу з іншымі яўрэйскімі партыямі – артадаксальнымі (кансерватыўнымі), сіянісцкімі, сацыялістычнымі. Сіянісцкія партыі адносіліся да JFP асабліва варожа, як да прадстаўніка канкурэнтнай ідэалогіі, што выступала супраць масавай эміграцыі яўрэяў у Палесціну.

У лістападзе 1929 года адбылося аб'яднанне JFP з яе віленскім філіялам – Яўрэйскай Дэмакратычна-нацыянальнай партыяй у Польшчы (Jidysze Demokratisz-Folkistisze Partaj in Pojlen) пад назвай JDFP [9, с.361].

Гэтая партыя ў 30-я гады адмовілася ад вострай крытыкі сіянізма, але і ў далейшым прапагандавала вырашэнне яўрэйскага пытання галоў-

ным чынам шляхам стварэння культурна-нацыянальнай аўтаноміі, выступала супраць масавай эміграцыі яўрэяў у Палесціну.

Вышэйшым органам партыі быў З'езд, на якім выбіралася Цэнтральная Рада. Партыя мела значны ўплыў на Саюз дробных купцоў. Выкарыстоўвала ў сваіх мэтах шматлікія выданні, у тым ліку газеты «Moment» у Вільні, «lodzer Joqblat» у Лодзі, «Der Joq» у Вільні, «Lubliner Joqblat» у Любліне, штотыднёвік на польскай мове «Obrona» ў Львове.

Лідэрам партыі быў Ноях Прылуцкі, у кіраўніцтва ўваходзілі таксама Самуэль Хіршхорн, Хірш Давід Номберг, Саул Ступніцкі, Цемах Шабад і іншыя [10,с.266].

Яўрэйскі сацыялістычны рух аформіўся на польскіх землях у апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. Спачатку гэта былі проста яўрэйскія групоўкі ў складзе польскіх сацыялістычных партый. У 1897 годзе з'явілася першая асобная яўрэйская сацыялістычная партыя – Усеагульны Яўрэйскі Рабочы Саюз (Alqemenet Jiduszet Arbeter Bund) [10, с.271]. Яе дзейнасць ажыццяўлялася на ўсёй тэрыторыі, што ўваходзіла ў склад Расіі. Утварылася партыя на з'ездзе ў Вільні, дзе сабраліся прадстаўнікі яўрэйскіх сацыял-дэмакратычных груп, усяго 11 дэпутатаў – А.Крэмер, Л.Гольдман, А.Мутнік, Дж.Міль, Д.Кац, П.Берман і іншыя [10, с.271].

Пад уплывам сіянісцкага руху ў 1905 г. у Каралеўстве Польскім з'явілася партыя, якая імкнулася аб'яднаць сацыялістычныя і сіянісцкія рухі – Яўрэйская Сацыял-дэмакратычная партыя рабочых (Паалей-Сіён). Абвясціўшы сябе прыхільнікамі некаторых тэарытычных палажэнняў марксізму (напрыклад, аб вядучай ролі рабочага класа ў рэвалюцыйным руху, дзеячы Паалей-Сіён разам з тым імкнуліся распаўсюджваць і ажыццяўляць ідэі «тэрытарыяльнага» і «духоўнага» сіянізму сярод яўрэйскіх рабочых, дробных гандляроў, інтэлігенцыі [7, с.16]. Партыя лічыла яўрэйскіх рабочых «перадавым элементам усяго яўрэйства», аднак была пераканана, што толькі «прагрэсіўны нацыяналізм» можа наблізіць яўрэйскіх працоўных да сацыялізму [9, с.350].

На паўночна-ўсходніх землях Польшчы з 1905 г. дзейнічалі невялікія групоўкі так званых сіяністаў-сацыялістаў, якія ў лістападзе 1918 г. стварылі Яўрэйскую Сацыялістычную партыю рабочых (Jidusze Socialistisze Arbeiter Partaj Ferajnjqte) [10, с.271].

Далейшы лёс яўрэйскіх сацыялістычных партый быў даволі складаным. Бунд з 1916 г. стаў самастойнай партыяй і ў 1920 г. аб'яднаўся з Галіцыйскай ZPSD. Паалей-Сіён у 1920 г. распаўся на дзве партыі: PS – левіца і PS – правіца. «Ferajniqte» далучылася ў 1922 г. як аўтаномная секцыя да партыі незалежных сацыялістаў [10, с.272].

Некаторыя групы з названых партый праз некаторы час далучыліся да Камуністычнай партыі Польшчы.

Праграмы яўрэйскіх сацыялістычных партый адрозніваліся адна ад адной. Бунд лічыў ідэю эміграцыі яўрэяў у Палесціну утопіяй і патрабаваў рашэння яўрэйскага пытання праз культурна-нацыянальную аўтаномію, а дабіцца гэтага, на думку лідэраў партыі, Бунд мог шляхам сацыялістычнай рэвалюцыі.

Паалей-Сіён лічыла, што яўрэйскае пытанне канчаткова вырашыць стварэнне яўрэйскай нацыянальнай дзяржавы ў Палесціне, прытым дзяржавы сацыялістычнай арыентацыі, а часовым вырашэннем гэтай праблемы можа быць культурна-нацыянальная аўтаномія ў складзе Польшчы. Пры гэтым прадугледжвалася, што аўтаномію можна будзе атрымаць толькі пасля перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі.

Аналагічныя пункты меліся і ў праграме «Ferajniqte».

Яўрэйскія сацыялістычныя партыі не належалі ні да адной Міжнароднай арганізацыі. Толькі PS–правіца была членам II Інтэрнацыянала.

Характэрнай з'явай ў 20-я гады была вострая барацьба ў асяродку яўрэйскіх партый. Яны дыспутавалі то з артадоксамі, то з сіяністамі, то з камуністамі. Найбольш уплывовымі былі Бунд, Паалей-Сіён, паздней PS–левіца. У гэтых партыях існавалі лакальныя арганізацыі, праходзілі іх з'езды. На чале PS стаяў Цэнтральны Камітэт і на чале Бунда – Партыйная Рада.

Усе сацыялістычныя партыі актыўна супрацоўнічалі з прафсаюзамі. З Бундам была звязана сацыял-дэмакратычная маладзёжная арганізацыя «Будучыня» (Cukunft), з PS – Яўрэйская сацыялістычная рабочая моладзь (Juqnt). Сацыялістычныя партыі мелі свой друк. Бунд выдаваў газету «Unzer Folkscajtunq» (Варшава), «Unzer Cedank» (Вільня), PS–левіца – штотыднёвік «Arbeter Welt» (Варшава).

Вядомыя дзеячы Бунда ў гэты перыяд – Віктар Альтэр, Генрык Эрліч, Ізраэль Ліхтэмштэйм, Бадліш Міхалевіч, Гершон Шуберт. Лідэры PS–левіцы – Лейб Холендэрскі, Іхот Ліц, Нухім Якаў Рафалкес і PS – правіца – Ігнацій Шынер [10,с.274].

У палітычным жыцці яўрэяў важнае месца займаў нацыяналістычны рух – сіянізм, які з'яўляўся рэакцыйна-нацыяналістычным кірункам у палітыцы і ён прадстаўляў інтарэсы яўрэйскай буйной і сярэдняй буржуазіі, распаўсюджваў свой уплыў сярод гандлёвых служачых і рамеснікаў і найбольш адсталых слаёў яўрэйскіх працоўных. Сіянізм прапаведваў ідэю «выключнасці» так званай «сусветнай яўрэйскай нацыі», лозунг «зыходу» яўрэяў з краін іх фактычнага пражывання і «нацыянальнага аб'яднання» ва ўласнай дзяржаве [9, с.348].

Сіянізм як палітычны рух узнік у 80-я гады XIX ст. ва ўмовах праграмнай палітыкі царызма і ўзмацненнага росту паўперызацыі шырокіх яўрэйскіх мас, пазбаўленых усялякіх палітычных правоў з загнаных у так званую «мяжу аседласці».

Ва ўмовах, калі яўрэйскія дробна-буржуазныя і часткова рамесна-працоўныя слаі шукалі выхад са свайго становішча ў эміграцыі ў Амерыку і Заходнюю Еўропу, яўрэйская буржуазія імкнулася выкарыстаць сімпатыі рэлігійна настроеных збяднелых яўрэйскіх мас да Палесціны з мэтай стварэння палітычнага руху, які падпарадкаваў бы яе ўладзе яўрэйскія масы, адцягваючы іх да ўдзелу ў барацьбе супраць царызму.

Палітычную праграму сіянізму даў доктар Тэадор Герцэль, які прапанаваў у 90-я гады XIX ст. ідэю аб стварэнні «яўрэйскай дзяржавы» як практычную мэту (на першым сіянісцкім кангрэсе ў 1897 г.) [6, с.239].

У сваёй праграме палітычны сіянізм зыходзіў з палажэння аб тым, што сусветнае яўрэйства ўяўляе быццам бы адзіную ў свеце нацыю, якая не мае сваёй тэрыторыі. На думку сіяністаў гэта робіць яўрэйскае пытанне невырашальным нават у самай дэмакратычнай дзяржаве. Таму сіянісцкі Базэльскі кангрэс прапаноўваў наступны шлях:

1. Садзейнічаць каланізацыі Палесціны рамеснікамі, фермерамі і г.д.

2. Умацаваць пачуцці яўрэйскай нацыянальнай свядомасці.

3. Прыкласці ўсе намаганні для атрымання ад уладаў найбольш уплывовых краін свету дазволу на стварэнне нацыянальнай радзімы для яўрэяў у Палесціне [6, с.240].

Для ажыццяўлення гэтых задач сіяністы зварочваліся з хадайніцтвамі да глаў самых багатых краін свету, уключаючы і Мікалая II, з прапановамі прызнаць іх праграму як сродак барацьбы супраць рэвалюцыйнага руху сярод яўрэйскіх мас.

Сваёй нацыянальнай мовай сіяністы лічылі старажытнаяўрэйскую (іўрыт), з дапамогай якой павінна было праводзіцца «культурнае адраджэнне яўрэйскага народа», а тагачасная яўрэйская мова ідзіш разглядвалася як «немінучае зло», якое магчыма было выкарыстаць для агітацыі сярод шырокіх яўрэйскіх мас у духу сіянізму.

Агульнасіянісцкая партыя складалася з некалькіх груп, аб'яднаных агульнасцю мэты – стварэнне нацыянальнай яўрэйскай дзяржавы ў Палесціне. Галоўнымі з гэтых груп былі наступныя:

1. Histadruth – Mizrachi («Мізрахі»), якая ўтварала клерыкальнае крыло сіянізму і адрознівалася ад клерыкальнай Aqudes Iersroel у пытаннях стаўлення да палітычнага сіянізму, да якога «Мізрахі» ставілася станоўча. Дзейнасць «Мізрахі» канцэнтравалася ў рэлігійных кагалах. Асаблівую ўвагу яна надавала рэлігійнаму выхаванню на старажытнаяўрэйскай мове і абароне рэлігійных традыцый, напрыклад, святкаванню суботы. У пытанні аб Палесціне гэтая група змыкалася з крайне правым крылом сіянізму – з рэвізіянізмам. Мэтай і імкненнем «Мізрахі» было стварэнне ў Палесціне яўрэйскага народнага «месцапрабывання» [6, с.241]. Лозунг гэтай групы наступны: «Рэлігія, навука, праца!».

«Мізрахі» мела на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства тры аддзелы: у Баранавічах, Лідзе, Нясвіжы [3, с.188]. Найбольш вядомымі і значнымі дзеячамі груп былі Брот, Фарбштэйн, равін Рубінштэйн [1, с.28].

Адзін з аддзелаў «Мізрахі» існаваў і ў Сувалках. На чале гэтага аддзела знаходзіліся: Чопа Кірсміанскі (старшыня), Хена Кірсміанскі (намеснік старшыні), Шоха Шонтэф (сакратар). Усяго ў гэты аддзел уваходзіла 20 членаў. У архіўных матэрыялах ёсць справаздача каменданта пастэрунка Беластоцкага ваяводства С.Паёнка аб ліквідацыі «яўрэйскай арганізацыі» «Mizrachi», старшынёй якой быў Ёзэф Храмніцкі, сакратаром – Ёзэф Шапіра, а скарбнікам – Мая Шварцманоўна [2, с.7].

Дзеля прыцягнення да сябе большай увагі «Мізрахі» ў сакавіку 1934 года арганізавала публічную лекцыю ў Нясвіжы на тэму абудовы Палесціны і ў красавіку 1934 года – 2 сходы ў Баранавічах і адзін сход у Лідзе,

дзе былі абмеркаваны справы абудовы Палесціны ў рэлігійным духу, спынення эміграцыі, а таксама крытыкавалася дзейнасць яўрэйскіх «левіцовых» арганізацый.

2. Фракцыя Грынбаўма – «Al Hamiszmar» («На стражы») утварала так званы «радыкальны сіянізм», і ў лоне гэтай арганізацыі пачалася ў 30-я гады змена сімпатый у бок рэвізіяністаў, вядучы тым самым за сабою страту дамінуючых папярэдніх пазіцый гэтай групы. На гэтыя змены ўнутры арганізацыі паўплывалі палесцінская праблема і адносіны Англіі. Не без значэння былі і варожыя адносіны грынбаўманцаў да дзяржавы, з якой усё большая частка яўрэяў пераставала быць салідарнымі [3, с.190].

3. Фракцыя «Eth Libnoth» («Час будаваць»), кіраўнікамі якой былі Готліб і Гефтман. Націск гэтая група рабіла на падтрымку прыватнай капіталістычнай ініцыятыве ў адбудове Палесціны і на падтрымку ўрада Пілсудскага.

Гэта арганізацыя мела чатыры аддзелы: 1) Кетен – Kajemeth, так званы аддзел па вырашэнні пытання пакупкі зямлі ў Палесціне; 2) Кетен – Hajesod, так званы аддзел па справах каланізацыі і культуры; 3) палесцінскі аддзел – падтрымка эміграцыі ў палесціну; 4) Hechaluc – Himerkazi – аддзел прафесійнай адукацыі і маральнага выхавання кандыдатаў да пражывання ў палесціне [3, с.190].

Пад уплывам фракцый «Eth Libnoth» і «Al-Hamiszmar» знаходзіліся 30 аддзелаў (каля 2000 членаў).

4. Рэвізіяністы – група: Жабацінскага, так званая «Bryth-Hazoar». Рэвізіянізм з'яўляўся крайне правым крылом у сіянісцкім руху. Асновай рэвізіянісцкай праграмы з'яўлялася: прыгнечанне працоўнага арабскага насельніцтва, барацьба з нацыянальна-вызваленчым рухам арабаў, стварэнне яўрэйскай дзяржавы на абодвух баках Іардана, стварэнне яўрэйскай узброенай сілы, барацьбы за знішчэнне камунізма [6, с.242].

Дзеля ажыццяўлення гэтых мэт рэвізіяністы стварылі ў Польшчы і іншых краінах свае паўваенныя арганізацыі моладзі («Бейтар») і арганізацыі былых ваенна-служачых («Брыт гахаіл») па ўзоры гітлераўскіх штурмавых атрадаў і пры садзейнічанні польскага ўрада. Рэвізіяністы таксама стваралі школы ваеннага навучання для каманднага састава гэтых атрадаў, кіраўнікамі якіх былі афіцэры польскай арміі.

У барацьбе супраць рэвалюцыйнага руху рэвізіяністы цесна супрацоўнічалі з Дэфензівай (ахранкай), выдаваючы ў рукі паліцыі рэвалюцыйных працоўных [6, с.243].

У адносінах да СССР рэвізіяністы вялі самую шалёную траўлю, блакіруючыся з белагвардзейскімі элементамі (дамова з правадыром рэвізіянізму Жабацінскім і Пятлюрай аб сумеснай арганізацыі ваенных сіл для пахода на СССР) [6, с.243].

Рэвізіяністы адкрыта заяўлялі, што разлічваюць на вайну, і былі ўпэўнены, што калі першая сусветная вайна дала яўрэйскаму народу «дэкларацыю Бальфура», то другая сусветная вайна дасць ім яўрэйскую дзяржаву. Сіяністы сістэматычна вялі антысавецкую прапаганду. Пад прыкрыццём кампаніі «Дапамога сваім братам у СССР» рэвізіяністы разгарнулі

барацьбу супраць Савецкага Саюза, распаўсюджваючы вымыслы аб антыяўрэйскай палітыцы ў СССР.

У 1932 годзе група Жабацінскага рспалася. Значная яе частка далучылася да былога сакіраўніка Жабацінскага – Гросмана. Новастворaная арганізацыя Гросмана, т.зв. «Bryth-Hacanaim» у некаторых пытаннях была салідарна з пранцыпамі «Histadruth ha' Cyjonith be' Polonijah» (сіянісцкая арганізацыя ў Польшчы). У сваю чаргу тая не выступала агрэсіўна супраць гросманістаў, як гэта рабіла рэвізіянісцкая група Жабацінскага [3, с.189].

На 1934 год уплыў групы Жабацінскага ва ўсіх гарадах Навагрaдскага ваяводства быў практычна роўны ўплыву «Histadruth ha' Cyjonith be' Polonijah» [3, с.190].

У рэвізіянісцкай групоўцы Жабацінскага існавалі наступныя аддзелы:

1) аддзел па справах пакупкі зямлі ў Палесціне;

2) аддзел па справах каланізацыі рэвізіяністаў у Палесціне;

3) аддзел па справах каланізацыі яўрэяў выхадцаў з Германіі і інш [3, с.191].

Як частка групы Жабацінскага існавала т.зв. «Таварыства сіяністычнай моладзі імя Тэадора Герцэля» ў Лідзе, якое налічвала каля 45 членаў.

Арганізацыя сіяністаў-рэвізіяністаў дзейнічала і на тэрыторыі мястэчка Сейны (каля 60 членаў) і гэта такія групы, як «Bejtar» і «Brith Chachjat». Кіраўнікамі гэтых груп былі купец Хаім Перыц і гандляр Борух Энштэйн.

Калі гаварыць аб арганізацыйнай структуры сіянізму, то трэба адзначыць, што сіянісцкая партыя ў Польшчы з'яўлялася састаўной часткай сусветнай сіянісцкай арганізацыі, вышэйшым органам якой з'яўляўся Сусветны Кангрэс (праходзіў раз у два гады), які выбіраў Экзекутыву (выканаўчы орган) на аснове кааліцыі асобных сіянісцкіх груп. Выбраная на апошнім кангрэсе экзекутыва з'яўлялася кааліцыяй правых PS з т.зв. радыкальнымі сіяністамі.

Вышэйшай уладай сіянісцкай партыі ў Польшчы быў Краёвы З'езд, які выбіраў Цэнтральны Камітэт з сакратарыятам на чале. Акрамя агульнасіянісцкіх праходзілі і асобныя мясцовыя ці краёвыя з'езды «Mizrachi», рэвізіяністаў, «Etu Libnoth» і «Al Hamiszmar».

Кожная з сіянісцкіх груп мела сонацкія арганізацыі рэлігійнага («Cejre – Mizrachi»), спартыўнага («Makabi»), скаўцкага («Гашамер Гацаір») і культурна-асветніцкага характару [6, с.244].

Пад уплывам сіянізму знаходзіўся амаль увесь штодзённы яўрэйскі буржуазны друк (акрамя фалкісцкай газеты «Віліер Тог» і агудаўскай «Ідзіше Тогблат»).

Штодзённая газета на яўрэйскай мове «Момант» і штодзённая газета на польскай мове «Наш пшэглёнд» – з'яўляліся органамі рэвізіянізму пры дапамозе групы «Eth Libnoth». «Момант» з'яўляўся таксама трыбунай для «Mizrachi». Цэнтральны орган сіянізму «Гайнт» з'яўляўся галоўным чынам органам групы Грынбаўма [6,с.245].

Імкнучыся стварыць сваю асабістую палітычную апору сярод яўрэйскага насельніцтва, урад Пілсудскага на тэрыторыі Заходняй Беларусі арганізаваў яўрэйскую групу пілсудчыкаў пад назвай «Яўрэйскі Клуб Дзяржаўнай Думкі» на чале з Гіршбергам, тым самым забяспечваючы сабе тыл на выпадак вайны з СССР. У 1929-1930 гг. група налічвала ўсяго некалькі дзесяткаў членаў у Вільні і Беластоку. Пачынаючы з 1933 года, група ўзмацніла сваю агітацыйную і арганізацыйную працу ў мястэчках і пры дапамозе местачковага равіна, адваката і ўрача стварала свае арганізацыі [6, с.253].

Гледзячы на справаздачы, якія былі апублікаваны ў органе гэтай групы «Унзэр Шцімэ» №27, 1934 г. «Клуб мыслі панствовэй» меў у Віленскім ваяводстве 6 павятовых арганізацый, якія ахоплівалі каля 200 аддзяленяў, у Навагрудскім ваяводстве – 3 павятовых, 10 местачковых арганізацый, у Беластоцкім ваяводстве – 3 павятовых і ў Палескім – 6 павятовых арганізацый.

Аб сутнасці праграмы гэтай групы «Унзэр Шцімэ» (15.11.1934 г.) піша так: «Наша задача – развіваць думкі аб мірнай садружнасці яўрэяў з польскім народам для справы пабудовы вялікай Польшчы. Мы павінны згрупіравацца вакол польскай грамадскасці вакол маршала Пілсудскага» [6, с.254]. Лозунгам групы з'яўлялася: «Польшча для нас, мы для Польшчы» [6, с.255].

Негледзячы на шэраг спроб з боку «яўрэйскага клуба дзяржаўнай думкі», гэтай групе ўсё ж такі не ўдалося пранікнуць у масы.

Зыходзячы з усяго вышэй сказанага, можна зрабіць выснову, што яўрэйскі палітычны рух у даследуемы перыяд развіваўся ў вельмі складаных умовах.

У барацьбе за нацыянальныя правы ўдзельнічалі палітычна актыўная частка яўрэйскага пралетарыяту, дэмакратычная інтэлігенцыя, купецтва, а таксама нацыянальна свядомыя прадстаўнікі дробнай буржуазіі.

Палітычны рух у 1921–1939 гг., як і ў папярэднія гады, быў вельмі неаднародны. Ён складаўся з такіх напрамкаў, як кансерватыўна-клерыкальны, ліберальны, сацыялістычны і сіянісцкі.

Агульным, што аб'ядноўвала дзейнасць яўрэйскіх палітычных партый, была ідэя абароны нацыянальных, палітычных і эканамічных інтарэсаў і правоў яўрэйскага насельніцтва.

А вось тактыка партый была далёка не аднолькавай: распаўсюджванне і ажыццяўленне ідэі «тэрытарыяльнага» і «духоўнага» сіянізму і пропаведзь ідэі «выключнасці» так званай «сусветнай яўрэйскай нацыі» і стварэнне сваёй дзяржавы ў Палесціне, ідэя стварэння нацыянальных меншасцей і г.д.

Літаратура і крыніцы

1. Государственный архив Гродненской области (ГАГО). Фонд 209. Опись 31. Дело 10: «Донесения тайного агента о еврейском населении и списки членов еврейских организаций». – 89 с.

2. ГАГО. Фонд 209. Опись 1. Дело 17: «Переписка с полицейским участком о сборе сведений о литовских и еврейских политических организациях». – 55 с.
3. ГАГО. Фонд 662. Опись 3. Дело 38: «Месячные отчёты и донесения Новогрудского управления». – 122 с.
4. Касцюк М. П., Ігнаценка І. М. Нарысы гісторыі Беларусі. – Ч. ІІ. – Мінск, 1994. – 480 с.
5. Мілеўскі Я. Е. Заходняя Беларусь: да пытання тэрыторыі і насельніцтва // БГЧ. – 1998. – № 3. – С. 27-38.
6. Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине. – Минск: Изд-во Бел. АН., 1935. – 335 с.
7. Zrodta A. Program Ï ydowskiej Socjalno-Demokratyczes Partii Robotniczej (Poale-Syion). – Warszawa, 1918. – 20 s.
8. Halpen J. Polityka ïydowska w Sejmie i Senacie Rzeczypospolitej Polskiej 1919-1933 // Sprawy Narodowosciowe. – 1933. – Z. 1. – S. 29-70.
9. Hafftka A. Ï ydowskie ugrupowania polityczne w Polsce // Sprawy Narodowosciowe. – 1930. – Z. 3-4. – S. 341-363.
10. Holzer Jerzy. Mozaika polityczna Drugiej Rzeczypospolitej. – Warszawa, 1974. – 669 s.

И.А. Украинец, ГИИ МЧС РБ, г. Гомель

СЕНТЯБРЬ 1939 ГОДА – СУДЬБОНОСНЫЙ МОМЕНТ В ИСТОРИИ ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ

Западная Беларусь в сентябре 1939 г. оказалась втянута в драматические события начавшейся второй мировой войны. В начале войны белорусский народ влился в состав единого социалистического государства. Это было одним из результатов «большой политики» Гитлера и Сталина, отражённой в пакте Молотова – Риббентропа от 23 августа 1939 г. и в дополнительных секретных протоколах к нему.

Ввод войск в Западную Беларусь и её присоединение можно назвать репетицией перед включением в сферу влияния Советского Союза Бессарабии и Прибалтийских государств. Именно в Западной Беларуси советское руководство испробовало политику, которая потом активно использовалась во всей Восточной Европе, т.е. приобщение новых присоединённых территорий к строительству социализма. «В будущем малым государствам придётся исчезнуть. Вы уже сейчас должны знакомить Ваш народ с советской системой, которая в будущем воцарится повсюду в Европе», – заявлял Молотов исполняющему обязанности премьер-министра Литвы Креве-Мийкявичусу [4, с. 39].

Предоставлять право населению, проживавшему на территории Беларуси, самостоятельно решать свою судьбу никто не собирался. Соответственно границы Западной Беларуси перекраивались по усмотрению

советского руководства. Вскоре после того, как Западная Беларусь вошла в состав БССР, возникла угроза утраты части Брестской области в пользу Украины. На этом настаивал Н.С.Хрущёв [6, с. 157-158]. Решениями Политбюро ЦК ВКП (б) от 4 сентября – 3 октября 1939 г. был определён весь процесс воссоединения, учитывая мельчайшие детали [3, с. 119].

Отношение населения региона к вхождению в состав БССР было неоднозначным, что определялось его полиэтничностью и социальным составом. Местное белорусское население реагировало на это событие по-разному. Зажиточные слои и интеллигенция Западной Беларуси восприняли воссоединение достаточно настороженно, поскольку в их среде было известно о трагических событиях 30-х годов в БССР, связанных с коллективизацией и борьбой с «нацдемовщиной» [8, с. 30]. В свою очередь беднейшая часть населения радовалось такому решению советского руководства [2, с.20]. Конечно, местные поляки отнеслись к этой акции наиболее негативно [12, с.91], хотя были среди них и те немногие, которые считали, что Красная Армия станет воевать с Германией [7, с. 41].

Среди жителей Восточной Беларуси также не наблюдалось единства по отношению к данным событиям. Помимо одобрения и радости наблюдалось и сочувствие Польше, так как были люди, считающие, что СССР нанёс ей удар в спину [9].

Социальный состав и полиэтнический характер населения Западной Беларуси во многом определили советскую политику репрессий и депортации части населения. В политике депортации Западная Беларусь оказалась как бы испытательным полигоном. Затем по этому сценарию органы НКВД проводили политику депортации других народов: чеченцев, калмыков и др.

Сразу после вступления Красной Армии на территорию Западной Беларуси начались политические репрессии в отношении польского населения. Они проводились в рамках политической нейтрализации «контрреволюционных элементов» [10, с. 89]. У части белорусского населения выселение поляков вызвало положительную реакцию [11, с. 72]. Однако с конца 1939 года начались репрессии и против белорусов, которые продлились вплоть до начала Великой Отечественной войны [1, с.112]. Репрессиям подверглись не только крестьянство, но и интеллигенция, в результате чего к 1941 году большая часть интеллигенции Западной Беларуси эмигрировала либо была уничтожена.

Таким образом, вскоре после присоединения Западная Беларусь стала иметь жалкий вид. Многие товары исчезли из магазинов, шло разграбление культурных ценностей, закрывались костёлы [5]. Березу-Картузскую заменили лагеря НКВД, а колхозы – помещиков. Но при этом было обеспечено развитие белорусской нации, как единого этнического организма, что было бы невозможно в разделённых государствах.

Литература и источники

1. Адамушка У. Палітычныя рэпрэсіі 20-50 гг. на Беларусі. – Мн., 1994.
2. Волкогонов Д.А. Драма решений 1939 // Новая и новейшая история. – 1989. – № 4.
3. Документы внешней политики, 1939 г. Т.22. – Кн. 2. – М., 1992.
4. Донгаров А. Между Рейном и Волгой // Родина. – 1991. – № 5.
5. Карпюк А. Хроніка майго пакалення // Полымя. – 1990. – №10.
6. Пономаренко П.К. События моей жизни // Нёман. – 1992. – № 3.
7. Сандалов Л.М. Пережитое. – М., 1966.
8. Туранок Ю. Беларусь пад нямецкая акупацыяй. – Мн., 1993.
9. Филиал государственного архива Гомельской области. Ф.702. Оп.1. Д.64. Л. 72, 73.
10. Хацкевич А. Арышты і дэпартацыі ў заходніх абластях Беларусі (1939–1941 г.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1994. – № 1.
11. Там жа. – № 2.
12. Хрущёв Н.С. Мемуары // Вопросы истории. – 1990. – № 7.

І.А. Саракавік, Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, г. Мінск

МІЛІЦЫЯ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ: СТАНАЎЛЕННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ (1939 – 1941 гг.)

Вызваленне Заходняй Беларусі і далучэнне яе да БССР паставіла перад органамі Народнага камісарыята ўнутраных спраў Беларускай ССР у цэлым і міліцыяй у прыватнасці задачы ўтварэння і развіцця сваіх структур у заходніх рэгіёнах Беларусі, падтрымання там грамадскага парадку і вядзення барацьбы з рознымі відамі злачынстваў, ізаляцыі антысавецкіх элементаў, актыўнага ўдзелу ў максімальна інтэнсіўных грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных і культурных пераўтварэннях на савецкай аснове вялізнай тэрыторыі з буржуазным грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным ладам. Іх выкананне патрабавала высокага прафесіяналізму, напружання, асаблівай адказнасці кожнага супрацоўніка міліцыі. Невыпадкова яшчэ 15 верасня 1939 г. ЦК УКП(б) сваёй пастановай зацвердзіў Палажэнне аб палітычным аддзеле Галоўнага ўпраўлення рабоча-сялянскай міліцыі НКУС СССР і Інструкцыю аб рабоце палітаддзелаў галоўных упраўленняў і аддзелаў НКУС СССР.

Галоўнай задачай палітаддзелаў з'яўлялася камуністычнае выхаванне асабовага складу, умацаванне яго маральна-палітычнага стану і службовай дысцыпліны. Абапіраючыся на палітаддзелы і партыйныя арганізацыі тэрытарыяльных органаў міліцыі, палітаддзел Галоўнага ўпраўлення міліцыі НКУС павінен быў мабілізаваць супрацоўнікаў на паспяховае выкананне задач, якая пастаўлены былі перад імі дырэктыўнымі органамі [1, с. 33].

Першапачаткова ў Заходняй Беларусі адбывалася станаўленне міліцыі, якая арганізацыйна ўваходзіла ў НКУС БССР і яго абласныя ўпраўленні. 2 лістапада 1939 г. загадам НКУС СССР у адпаведнасці з прынятым пятай (нечарговай) сесіяй Вярхоўнага Савета СССР першага склікання рашэннем, «Аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і ўз'яднанні яе з Беларускай Савецкай Сацыялістычный Рэспублікай» утвораны ўпраўленні НКУС па Беластоцкай, Навагрудскай, Пінскай, Вілейскай абласцях [2, спр. 1, арк. 109 – 111]. Загадам НКУС СССР ад 29 лістапада 1939 г. было ўтварана УНКУС па Брэст-Літоўскай вобласці БССР [2, спр. 1, арк. 113].

Аднак такая тэрытарыяльная структура доўга не пратрымалася. У яе былі ўнесены адпаведныя карэктывы. 20 снежня 1939 г. загадам НКУС БССР за подпісам старшага маёра дзяржбяспекі Л.Цанавы аб'яўлены назвы і дыслакацыя органаў НКУС у заходніх абласцях Беларусі ў адпаведнасці з указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб іх адміністрацыйным падзеле:

УНКУС па Беластоцкай вобласці (г.Беласток): Беластоцкі гараддзел (г.Беласток), Гродненскі павятовы аддзел (ПА) (г.Аўгустова), Сакольскі ПА (г.Сокал), Бельскі ПА (г.Бельск), Ломжанскі ПА (г.Ломжа), Высока-Мазавецкі ПА (г.Высокі Мазавец), Грыўскі ПА (г.Граеў);

УНКУС па Баранавіцкай вобласці (г.Баранавічы): Навагрудскі ПА (г.Навагрудак), Вілейскі ПА (г.Вілейка), Шчучынскі ПА (г.Шчучын), Стаўбцоўскі ПА (г.Стаўбцы), Слонімскі ПА (г.Слонім), Нясвіжскі ПА (г.Нясвіж), Лідскі ПА (г.Ліда);

УНКУС па Вілейскай вобласці (г.Вілейка): Ашмянскі ПА (г.Ашмяны), Свянцянскі ПА (г.Свянцяны), Браслаўскі ПА (г.Браслаў), Дзісенскі ПА (г.Глыбокае), Маладзечанскі ПА (г.Маладзечна), Пастаўскі ПА (г.Паставы);

УНКУС па Пінскай вобласці (г.Пінск): Столінскі ПА (г.Столін), Драгічынскі ПА (г.Драгічын), Лунінецкі ПА (г.Лунінец), Косаўскі ПА (г.Косава);

УНКУС па Брэсцкай вобласці (г.Брэст): Кобрынскі ПА (г.Кобрын), Пружанскі ПА (г.Пружаны). Брэсцкі ПА НКУС расфарміроўваўся, яго асабовы склад накіроўваўся на ўкамплектаванне УНКУС па Брэсцкай вобласці [2, спр. 13, арк. 95 – 96].

Аднак гэтым загадам не была завершана арганізацыйная пабудова міліцыі Беларусі ў яе заходніх абласцях. У сувязі з вялікім аб'ёмам спецыяльнай працы, выкліканым далучэннем да Савецкага Саюза Літвы, Латвіі, Эстоніі, заходніх раёнаў Беларусі і Украіны, Паўднёвай Бесарабіі і Паўночнай Букавіны, Народны камісарыят унутраных спраў СССР указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР 3 лютага 1941 г. быў падзелены на два наркаматы: НКУС СССР і НКДБ СССР. У складзе першага знаходзілася і Галоўнае ўпраўленне міліцыі [3, с. 26]. Аналагічныя змены адбыліся і ў саюзных рэспубліках. У прыватнасці, 4 сакавіка 1941 г. указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР НКУС Беларускай ССР быў падзелены на Народны камісарыят дзяржаўнай бяспекі БССР і Народны камісарыят унутраных спраў БССР [4, с. 297].

Супрацоўнікі міліцыі ў новай структуры органаў НКУС БССР складалі галоўную сілу, ім надавалася асаблівая значнасць. Так, на 23 мая 1941 г. з 865 работнікаў НКУС БССР 253 былі супрацоўнікамі міліцыі, ва УНКУС Баранавіцкай вобласці адпаведна 302 і 158, УНКУС Беластоцкай вобласці – 353 і 190, а ў Нясвіжскім райаддзеле УНКУС Баранавіцкай вобласці – 71 і 54 [5, спр. 35, арк. 1, 29, 31, 41, 52 – 53, 64, 76].

Міліцыя ў той час мела разгалінаваныя службы: палітычную, па барацьбе з бандытызмам, крымінальнага вышуку, барацьбы з крадзяжом сацыялістычнай уласнасці і спекуляцыяй, аператыўную, пашпартна-вышуковую, віз і рэгістрацыі замежных грамадзян, службы і баявой падрыхтоўкі, актаў грамадзянскага стану, ДАІ, ветэрынарнай інспекцыі, камендатуры. Аналагічныя падраздзяленні былі ва ўпраўленнях НКУС абласцей і супрацоўнікі гэтых службаў у райаддзелах УНКУС [5, спр. 35, арк. 31 – 41, 52 – 53, 64 – 76].

Камплектаванне органаў міліцыі ў заходніх абласцях БССР вялося двума шляхамі: сюды накіроўваліся (асабліва з БССР і РСФСР) палітычна і ідэалагічна праверaныя і надзейныя супрацоўнікі, добра падрыхтаваныя прафесійна, і тут утвараліся кароткатэрміновыя школы для падрыхтоўкі начальніцкага і радавога складу міліцыі з ліку мясцовага насельніцтва, перш за ўсё сялян, рабочых, былых падпольшчыкаў.

Дзейнасць міліцыі ў Заходняй Беларусі адбывалася ў складаных умовах пераходу ад аднаго дзяржаўнага ладу да другога, набліжэння вайны. Калі ва ўсходніх абласцях Беларускай ССР барацьба міліцыі вялася ў асноўным з агульнакрымінальнымі злачынствамі (крадзяжамі, хуліганствам і г.д.), то ў заходніх – перш за ўсё з палітычным і крымінальным бандытызмам, а таксама з рознымі відамі прафесіянальнай злачыннасці, якія існавалі ў Другой Рэчы Паспалітай. Сваю працу яны ажыццяўлялі ў цесным кантакце з органамі дзяржаўнай бяспекі і пры дапамозе членаў брыгад садзейнічання міліцыі [6, с. 150].

Сваю працу па ахове грамадскага парадку, барацьбе з рознага роду злачынствамі супрацоўнікі міліцыі ў Заходняй Беларусі ў цэлым выконвалі станоўча. У многім гэта тлумачылася не толькі іх прафесіяналізмам, але і тым становішчам, якое назіралася на гэтых землях у той час: закрытасць іх ад усходняй часткі БССР (туды можна было трапіць толькі па пропуску), павялічаны кантынгент Чырвонай Арміі, татальны кантроль улады над усімі сацыяльнымі слаямі грамадства, надзея значнай часткі працоўных на лепшае будучае ў сувязі з прыходам Чырвонай Арміі і вызваленнем іх ад польскага панавання. Гэта надзея знешне падмацоўвалася даступнасцю адукацыі, у тым ліку на роднай мове, лячэбнай дапамогі праз адкрыццё бальніц, фельчарскіх пунктаў, культурна-асветніцкіх устаноў і г.д.

Імкненне улады як мага хутчэй правесці ў Заходняй Беларусі палітыка-эканамічныя, сацыяльныя, духоўныя пераўтварэнні па савецкаму ўзору падштурхоўвала іх і да неправамерных дзеянняў у адносінах да асобных сацыяльных катэгорый насельніцтва, што вылівалася ў шматлікія палітычныя рэпрэсіі. Да гэтай справы былі прыцягнуты не толькі органы дзяржаўнай бяспекі, але і органы ўнутраных спраў, у тым ліку і міліцыі.

Рэпрэсіі супраць «контррэвалюцыйных, антысавецкіх, нацыяналістычных элементаў» пачаліся з першага дня ўступлення падраздзяленняў Чырвонай Арміі на землі Заходняй Беларусі. Ужо на 7 кастрычніка 1939 г. органамі НКУС былі арыштаваны 2708 чалавек, праз тыдзень – 3535, у тым ліку, як значылася ў паведамленні Наркамата ўнутраных спраў, 389 буйных памешчыкаў, дваран, капіталістаў, 354 прадстаўнікі былой польскай адміністрацыі, 648 паліцэйскіх, жандараў, мытнікаў, 348 кіраўнікоў партый і арганізацый. Данясенне ад 22 кастрычніка 1939 г. паведамляла, што ў турмах Заходняй Беларусі знаходзіліся 4315 чалавек [7, с. 89].

«Віна» гэтых «контррэвалюцыйных, антысавецкіх, нацыяналістычных элементаў» заключалася толькі ў тым, што яны былі карэннымі жыхарамі і займалі пэўнае сацыяльнае становішча ў дзяржаве – Другой Рэчы Паспалітай, заходнебеларускія землі якой былі ў 1921 г. да яе далучаны Савецкай Расіяй на аснове міждзяржаўнага Рыжскага дагавору. 17 верасня 1939 г., парушаючы гэты, а таксама дагавор аб ненападзенні ад 25 ліпеня 1932 г. і пратакол ад 25 мая 1934 г. паміж СССР і Польшчай, Савецкі Саюз анексіраваў гэтыя землі і стаў устанаўліваць там свой палітычны рэжым. Таму дзеянні Савецкай улады супраць гэтых «элементаў» былі антыправавымі.

Апрача ўдзелу міліцыі ў арыштах так званых «антысавецкіх элементаў», яна, выконваючы загады дырэктыўных органаў, займалася праблемамі дэпартацыі насельніцтва з заходніх абласцей Беларусі ў адпаведнасці з сакрэтнай пастановай СНК СССР ад 5 снежня 1939 г., якая прадугледжвала высяленне асаднікаў і работнікаў лясной аховы [7, с. 90].

Тайная буйнамаштабная аперацыя праводзілася сакрэтна. Практычна яна пачала ажыццяўляцца 10 лютага 1940 г., калі маразы даходзілі да 37 – 42° С, назіраліся вялікія снегапады, снежныя завеі і заносы на дарогах [8, с. 203]. Па дадзеных акадэміка М.П.Касцюка, агульная колькасць рэпрэсіраваных дасягнула 50732 чалавек. 2160 жыхароў па розных прычынах засталіся невыселенымі [8, с. 204].

Наступнай акцыяй супраць насельніцтва Заходняй Беларусі, у якой актыўны ўдзел прымала міліцыя, было высяленне жыхароў заходняй васьмісотметровай пагранічнай паласы згодна з пастановай Саўнаркама СССР «Аб ахове дзяржаўнай мяжы ў заходніх абласцях УССР і БССР» ад 2 сакавіка 1940 г. Адсяленню падлягалі 7442 гаспадаркі з насельніцтвам у 35,3 тыс. чалавек [8, с. 206].

13 красавіка 1940 г. праводзілася чарговае высяленне 8055 сем'яў рэпрэсіраваных памешчыкаў, афіцэраў, паліцэйскіх і іншых асоб колькасцю 26 777 чалавек [8, с. 208].

Падобныя аперацыі праваахоўных органаў, уключаючы міліцыю, праводзіліся практычна да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Т.С.Процька лічыць, што ў Заходняй Беларусі ў гэты час было рэпрэсіравана ў адміністрацыйным парадку каля 100 тыс. чалавек [9, с. 606]. А.Ф.Хацкевіч больш дакладна прыводзіць звесткі: 125 тыс. чалавек, не ўлічваючы ваеннапалонных польскай арміі [10, с. 75 – 76]. У.Ф.Ладысеў і П.І.Брыгадзін

згодны з ім [11, с. 204]. Я.Запруднік лічыць, што з Заходняй Беларусі (разам з Вільняю) было дэпартавана каля 300 тыс. чалавек [12, с. 105], але пераканаўчых доказаў гэтай лічбы не прыводзіць.

Падаецца, што больш пераканаўчыя звесткі М.П.Касцюка: каля 150 тыс. чалавек былі рэпрэсіраваны ў заходніх абласцях Беларусі (без ваеннапалонных польскай арміі і без выселеных з Беларусі бежанцаў) [8, с. 211].

Такім чынам, з далучэннем Заходняй Беларусі да БССР і СССР адразу пачалося станаўленне і дзейнасць органаў міліцыі. Фарміраванне яе павятовых і абласных структур адбывалася аператыўна ў адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам і ў другой палове снежня 1939 г. было завершана. Іх камплектаванне праводзілася як за кошт супрацоўнікаў міліцыі з усходніх абласцей БССР, іншых саюзных рэспублік, перш за ўсё РСФСР, так паступова і з мясцовых прыхільнікаў Савецкай улады.

Асноўны аб'ём працы міліцыі быў накіраваны на падтрыманне грамадскага парадку і барацьбу са злачыннасцю ў спецыфічных умовах пераходу гэтых зямель ад аднаго грамадска-палітычнага, эканамічнага і духоўнага ладу да другога. У цэлым з гэтай задачай яна справілася.

Адначасова, з'яўляючыся састаўным звяном механізма савецкай таталітарнай дзяржавы, міліцыя прымала непасрэдны ўдзел, як і іншыя праваахоўныя органы, у ажыццяўленні масавых рэпрэсій розных сацыяльных, нацыянальных, рэлігійных слаёў насельніцтва Заходняй Беларусі.

Літаратура і крыніцы

1. Мулукаев Р.С., Скилягин А.Г. История советской милиции: Хронолог. справ. – Л., 1976.

2. Архіў МУС Рэспублікі Беларусь. Ф. 51. Воп. 1.

3. Лубянка. ВЧК – ОГПУ – НКВД – НКГБ – МГБ – МВД – КГБ. 1917 – 1960: Справочник. – М., 1997.

4. Органы государственного управления Белорусской ССР (1919 – 1967 гг.). – Мн., 1968.

5. Архіў МУС Рэспублікі Беларусь. Ф. 23. Воп. 1.

6. Очерки истории милиции Белорусской ССР. 1917 – 1987. – Мн., 1987.

7. Хацкевіч А. Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939 – 1941 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1994. – № 1.

8. Касцюк М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. – Мн., 2000.

9. Протько Т.С. Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917 – 1941 гг.) / Т.С. Протько. – Мн., 2002.

10. Хацкевіч А. Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939 – 1941 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1994. – № 2.

11. Ладысеў У.Ф., Брыгадзін П.І. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917 – 1939 гг.). – Мн., 2003.

12. Запруднік Я. Беларусь на гістарычных скрыжаваннях / Навук. рэд. У.Арлоў; пер. з анг. М. Раманоўскага. – Мн., 1996.

М.В. Васілючак, ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

АБ НЕКАТОРЫХ НЕГАТЫЎНЫХ МОМАНТАХ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ НАПЯРЭДАДНІ ВАЙНЫ (ВЕРАСЕНЬ 1939 – ЧЭРВЕНЬ 1941 гг.)

1 верасня 1939 года фашысцкая Германія без абвяшчэння вайны напала на Польшчу. Адсталая ў эканамічнай, слабая ў ваенных адносінах буржуазная Польшча не змагла супрастаяць большым сілам агрэсіўнага праціўника. Польскі ўрад і камандаванне ўзброеных сіл пакінулі армію, народ і самі ганебна ўцяклі за мяжу.

17 верасня 1939 года па распараджэнню ўрада СССР Чырвоная Армія перайшла савецка-польскую мяжу і пачала вызваленчы паход на захад. На сённяшні дзень вядома, што ўжо 23 жніўня 1939 года паміж фашысцкай Германіяй і Савецкім Саюзам быў падпісаны дагавор аб узаемным ненападзе, дзе быў дадатковы сакрэтны пратакол аб сферах уплыву, які прадугледжваў ліквідацыю польскай дзяржавы і падзел яе тэрыторыі [8, с. 253].

Невялікая польская армія і дрэнна ўзброеная – усяго 45 тыс. чалавек – не магла аказаць значнага супраціўлення добра ўзброеным часцям Чырвонай Арміі, якія налічвалі 200802 салдат і афіцэраў, і на працягу 7-8 дзён уся тэрыторыя Заходняй Беларусі была вызвалена [10, с. 122]. На вызваленай тэрыторыі пачаліся пераўтварэнні па ўзору, якія адбываліся ў свой час у БССР у перадваенны перыяд. З пераходам савецка-польскай мяжы асноўную работу па навядзенню рэвалюцыйнага парадку, па барацьбе з агентамі польскай разведкі і ўстанаўленню Савецкай улады правялі работнікі ўнутранных спраў Беларусі – чэкісты. Так, народны камісар унутранных спраў БССР старшы маёр дзяржаўнай бяспекі Л.Цанава ў лісце на імя сакратара ЦК КП(б)Б П.К.Панамарэнка ад 17 кастрычніка 1939 года паведамляў пра арышты на тэрыторыі Заходняй Беларусі за першы месяц вызвалення: «Усяго арыштаваных на 15 кастрычніка 1939 года значыцца 3535 чалавек, у тым ліку»:

1. Буйных прадстаўнікоў з памешчыкаў, князёў, дваран і капіталістаў, падазроных у шпіянажы – 389.

2. Рэакцыйных прадстаўнікоў урадавай адміністрацыі:

а) ваяводаў, старастаў, намеснікаў ваяводаў і старастаў, бургамістраў, іх бліжэйшых памочнікаў – 354.

б) кіраўнікоў контррэвалюцыйных партый і актыўных членаў – 108.

3. Бандытаў – 108.

4. Кулакоў, бяжаўшых з СССР у Польшчу, звязаных з польскай разведкай – 74.

5. Агентаў польскай разведкі і правакатараў – 409 і так далей [12, с. 190-191].

Як бачна з вышэй прыведзенных дадзеных, за няпоўны месяц новай улады савецкімі чэкістамі былі выяўлены і арыштаваны некалькі тысяч

чалавек. На мой погляд, не ўсе рэпрэсаваныя гэтага заслугоўвалі. Але пачатая работа па навядзенню рэвалюцыйнага парадку і далей будзе праводзіцца да пачатку вайны. Вядома, такая з'ява не магла знайсці сярод насельніцтва Заходняй Беларусі паразумення і адабрэння.

Негатыўнай з'явай у заходніх раёнах Беларусі было стаўленне ўладаў да царквы, касцёла, наогул да духавенства. Так, з верасня 1939 года пачалася палітыка тэрору супраць мясцовага духавенства. На тэрыторыі Лідскага павета Ліпнішкоўскай гміны ў 1939 годзе былі расстраляны два ксянзы і святар Жыжэмскай царквы Уладімір Бук. У шэрагах вёсак моладзь, падбухтораная былымі членамі КПЗБ, пілавалі крыжы, якія былі ў населенных пунктах. У гэты час быў рэпрэсіраваны органамі НКУС ксёндз Гераненскага прыходу. Не дзіўна, што мясцовае насельніцтва выказвала пратэст з гэтай нагоды ў час выбараў у Вярхоўны Савет 24 сакавіка 1940 года. На некатарых бюлетэнях на беларускай мове было напісана «Няхай жыве польская дзяржава! Няхай жыве Польшча!» [9, с. 104, арк. 4]. Аналагічныя негатыўныя з'явы адбываліся і на тэрыторыі другіх паветаў Заходняй Беларусі ў перадваенны перыяд.

Адным з негатыўных момантаў у заходніх раёнах Беларусі з'яўлялася тое, што ўсе партыі, якія дзейнічалі на тэрыторыі Польшчы, куды ўваходілі і землі Заходняй Беларусі, былі забаронены. Была толькі адна партыя – Усесаюзная камуністычная партыя бальшавікоў. Неабходна ўлічваць, што з мясцовага насельніцтва не было членаў гэтай партыі, бо былая Кампартыя Заходняй Беларусі ў 1938 была распушчана Камінтэрнам. Былых членаў КПЗБ не аднаўлялі ў КП(б)Б, гэты працэс пачаўся толькі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Але ва ўмовах падазронасці, звязанай з роспускам КПЗБ, у партыі было адноўлена толькі невялікая частка камуністаў – усяго 46 чалавек. Пераважная ж большасць, у тым ліку актыуныя арганізатары рэвалюцыйнай барацьбы супраць польскіх улад, засталіся па-за партыяй. У стаўленні да іх яшчэ доўгі час праяўлялася дыскрымінацыя. І толькі з 1956 года абвінавачванні супраць КПЗБ былі зняты, была дадзена высокая ацэнка КПЗБ, яе роспуск быў прызнаны неабгрунтаваным [14, с. 69].

Незразумелым для мясцовага насельніцтва Заходняй Беларусі з устанаўленнем Савецкай улады пры выбарах у народны сход (1939 год), у Вярхоўны Савет (сакавік 1940 год) і ў мясцовыя Саветы (снежань 1940 год) была адна кандыдатура, якую вылучалі і давалі на яе дазвол партыйныя і савецкія органы. І не выпадкова, што мясцовае насельніцтва абуралася і выказвала адкрыта супраць такой палітыкі свой пратэст. Так, у час выбараў адзін з настаўнікоў Крынкаўскай школы Беластоцкай вобласці публічна заявіў: «Камуністы толькі здзекваюцца над народамі, самі назначаюць кандыдатаў і сілай застаўляюць галасаваць, навошта забіраць час і застаўляць другіх пераліваць з пустога ў парожняе»[6, арк. 20].

У перадваенны перыяд у заходніх абласцях праводзілася мэтанакіраваная палітыка савецкага ўрада да заможных сялян па абмежаванню іх зямлі, па павышэню грашовых і натуральных падаткаў, забароны арэнды і найму рабочай сілы. 18 красавіка 1941 года ЦК КП(б)Б і СНК СССР прынялі пастанову «Аб устанаўленні гранічных норм землекарыстанне

на адзін сялянскі двор па Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцях». У гэтай пастанове прадугледжвалася, што адзін двор мог карыстацца сваёй зямлёй не больш як 10 – 12; 15 гектарамі. Гэта залежыла ў першую чаргу ад мясцовых умоў, складу сям'і і г.д. У цэлым у 12,2 тысячы гаспадарак было адрэзана 26,4 тысячы га зямлі [1, с. 263]. Адрэзкі зямлі выклікалі незадаволенасць і супраціўленне значнай часткі сялян, якія сваёй добрай працай стваралі капітал, а затым куплялі зямлю. Гэта датычылася часткі заможнага сялянства.

У перадваенны перыяд урадам Беларусі праводзілася значная работа па абмежаванню і канфіскацыі будоўлі і маёмасці заможнай часткі насельніцтва. У гэтай справе важная роля належала пастанове СНК БССР ад 10 мая 1940 г. №672 «Аб муніцыпалізацыі і нацыяналізацыі будоўляў на тэрыторыі заходніх абласцей БССР». Згодна з гэтай пастановый у жыхароў, што мелі будоўлі, плошча якіх складала больш 113 м^2, належала забраць іх на карысць дзяржавы. Толькі ў Іўеўскім раёне было выяўлена 15 пабудоў, якія падлягалі нацыяналізацыі [3, арк. 46]. Пры правядзенні муніцыпалізацыі і нацыяналізацыі пабудоў на тэрыторыі заходніх абласцей БССР у некаторых раёнах мясцовымі органамі ўлады былі дапушчаны памылкі, якія заключаліся ў тым, што ў некаторых выпадках няправільна вылічвалі плошчу дамоў, і муніцыпалізаваліся дамы плошчай менш 113 м^2. Таксама ў парушэнні правоў праводзіліся высяленні жыхароў у адміністрацыйным парадку з муніцыпалізаваных і нацыяналізаваных дамоў, а таксама выпадкі канфіскацыі ў гаспадароў муніцыпалізаваных дамоў прадметаў хатняга ўжывання [11, с. 50]. Вядома, такія дзеянні мясцовых улад не знаходзілі паразумення ў большасці насельніцтва заходніх раёнаў Беларусі.

Кадравая палітыка, якая праводзілася Савецкай уладай у заходніх абласцях, мела не толькі станоўчыя вынікі, але і адмоўныя. На працягу 1939 і 1940 гадоў у заходнія раёны Беларусі было накіравана каля 31 тысячы партыйных, камсамольскіх, савецкіх работнікаў, спецыялістаў народнай гаспадаркі, аховы здароўя, народнай адукацыі і культуры і г.д. [2, с. 211]. Тут ўзнікае законнае пытанне, чаму ажыццяўлялася такая масіраваная пасылка работнікаў усіх узроўняў і спецыяльнасцей у заходнія вобласці, дзе жылі браты-беларусы. Адной з галоўных прычын гэтага быў сляпы недавер да мясцовага насельніцтва, асабліва палякаў і беларусаўкаталікоў. Прысланыя з усходу кадры не заўсёды адпавядалі патрэбным маральным або прафесійным якасцям. Так, на працу сакратаром партыйнай арганізацыі скуранога завода №6 г.Крынкі Беластоцкай вобласці быў накіраваны Д.В.Жаркоў, які 23 мая 1938 г. Асташынскім РККП(б) атрымаў партыйнае спагнанне – строгую вымову за п'янку і дэбош [4, арк. 56]. Другі прыклад. На пасаду загадчыка Крынкаўскага раёна аховы здароўя была накіравана А.І.Аляксандрына, член УКП(б), якая не мела сярэдняй адукацыі. У той час тут былі мясцовыя медыкі з вышэйшай адукацыяй [5, арк. 40]. Негатыўныя моманты ў работнікаў прысланых з усходу былі і ў другіх раёнах. Возьмем Воранаўскі раён Баранавіцкай вобласці. Так, міліцыянер Голад у вёсцы Дзявенішкі арыштаваў без падстаў настаўніка і адну грамадзянку, якіх пратрымаў двое сутак [7, арк. 67]. Старшы апера-

тыўны работнік дзяржбяспекі, будучі п'яным, прыставаў да дзвюх дзяўчат, якія жылі ў Воранаве, – Ялынскай і Барэша. А калі яны пачалі ўцякаць, ён пачаў па іх страляць. Назаўтра ні ў чым не павінных дзяўчат арыштавалі органы НКУС. І толькі пасля ўмяшання сакратара райкама партыі дзяўчат вызвалілі [1, с. 84].

Страшнай падзеяй у заходніх абласцях з'явіліся масавыя рэпрэсіі і дэпартацыя мясцовага насельніцтва. Дэпартацыя, згодна з архіўнымі дакументамі, праводзілася ў 4 этапы. 1-ы этап праводзіўся 10–13 лютага 1940 года паводле пастановы Саўнаркама СССР ад 5 снежня 1939 года і з 5 абласцей Беларусі падлягала высяляць у аддаленыя раёны Савецкага Саюза 9810 гаспадарак (52892 чалавекі) польскіх асаднікаў і служачых лясной аховы. Усяго з кастрычніка 1939 года да 22 чэрвеня 1941 года органамі НКУС-НКДБ БССР у Заходняй Беларусі былі рэпрэсіраваны больш за 135 тысяч палякаў, беларусаў, рускіх і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей, з іх высланы ў раёны Сібіры, Далёкага Усходу і на Поўнач больш за 120 тыс. чалавек [13, с. 342-343].

Але, нягледзячы на шэраг адмоўных момантаў, працоўныя заходніх абласцей Беларусі за кароткі гістарычны тэрмін дабіліся значных поспехаў у будаўніцтве новага ладу. У заходніх абласцях за няпоўныя два гады было цалкам ліквідавана беспрацоўе, узнят матэрыяльны і сацыяльны ўзровень рабочых і сялян. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР дало магчымасць амаль усяму беларускаму этнасу разам жыць, працаваць, абапіраючыся на эканамічны і навукова-тэхнічны патэнцыял ўсёй савецкай краіны!

Літаратура і крыніцы

1. Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця. У 3 частках. Ч.3. – Гродна, 2003. – С.84.
2. Беларускі гістарычны зборнік. Беларускае гістарычнае таварыства 20. – Беласток, 2003. – С.211.
3. ДА ГАГВ. Фонд 4. Воп.44. Спр.1.
4. ДА ГАГВ. Фонд 4. Воп. 44. Спр.52.
5. ДА ГАГВ. Фонд 4. Воп. 44. Спр.76.
6. ДА ГАГВ. Фонд 4. Воп.44. Спр.81.
7. ДА ГАГВ. Фонд 6. Воп. 56. Спр.2. Арк.67.
8. Нарысы Гісторыі Беларусі: У 2ч. Ч.2. – Мн., 1995. – С.253.
9. Памяць. Іўеўскі раён. – Мн., 2002. – С. 104; Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гродзенскай вобласці. Фонд 2460. Воп.55. Спр.1. Арк.4.
10. Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць. – Мн., 2000. – С.122.
11. Собрание постановлений и распоряжений правительства Белорусской Советской Социалистической Республики. – Мн., 1941. – № 3. – С.50.
12. Шлях да узаемнасці. Droga ku wzaemnosci. Mat. X Міжнароднай навуковай канферэнцыі: Гродна – Мір, 24 кастрычніка 2002 г. У 2-х частках. Частка II. – Гродна, 2004. – С. 190-191.
13. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 тамах. Том 3. – Мн., 1996. – С. 342-343.
14. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 тамах. Том 4. – Мн., 1997. – С.69.

Daniel Bożkowski, Biaiystok

ZACHODNIA BIAJORUŃ W ŃWIETLE RAPORTYW ZWZ DO CZERWCA 1941 R.

Do dzień bardzo niewielu historykyw stawia sobie pytanie, na ile dokiadne byiy raporty przygotowywane przez ZWZ dotycz№ce sytuacji na ziemiach Biaiorusi Zachodniej, wysyiane do Paryża i Londynu, na podstawie ktyrych Rz№d RP na wychodцstwie oraz Sztab Naczelnego Wodza budowali obraz sytuacji w Kraju. Zawartoњж tych raportyw pokazuje nam także, jakie informacje byiy dostкpne centrali ZWZ w Warszawie, a przynajmniej, jakie wnioski wyci№gano na podstawie szcz№tkowych informacji spiywaj№cych zza niemiecko-radzieckiej linii granicznej. Niniejsze rozważania opariem na raportach wysyianych z kraju i zamieszczonych w pierwszym tomie zbioru Armia Krajowa w dokumentach 1939–1945, obejmuj№cym informacje przesyiane od wrzeњnia 1939 do czerwca 1941 r.

Jeden z pierwszych zbiorczych raportyw wysiany zostai na pocz№tku stycznia 1940 r. W czkњci dotycz№cej „okupacji sowieckiej» możemy m.in. wyczytaж, że „wojska sowieckie zachowywaiy sik na ogyi poprawnie. W każdym razie instrukcje dowydztwa sziy w tym kierunku, a ekscesy, ktyre tu i ywdzie sik zdarzaiy, należy kiaњж na karb braku dyscypliny. Dowydztwo wojsk sowieckich tкpiio na ogyi antypolskie wyst№pienia band ukraicskich i Żydyw, czksto nawet antypolskie wyst№pienia wojska sowieckie uњmierzaiy krwawo» [1]. Informacja ta jest czkњciowo poprawna, gdyż faktycznie Armia Czerwona miaia zakaz jakichkolwiek dziaiac wymierzonych w ludnoњж cywiln№; w koccu zgodnie z wszechobecn№ propagand№ wkraczaia jako armia wyzwoleccza. Widaж jednak wyraцnie, że oparto sik o dane napiywaj№ce z poiudnia Polski, z Lwowa, na co wskazuj№ informacje o ekscesach ludnoњci ukraicskiej oraz zamieszczone dalej w dokumencie sprawozdania z sytuacji panuj№cej w mieњcie, brak jest natomiast jakichkolwiek wzmianek o postawie ludnoњci biaioruskiej, chociaż wiemy już dzień o wielu antypolskich wyst№pieniach lokalnej ludnoњci [2].

O braku rozeznania w sytuacji panuj№cej na terenach wi№czonych do Biaioruskiej SRR ńwiadczy inny fragment tego raportu, w ktyrym jest mowa o utworzeniu „trzech dzielnic»: Zachodniej Ukrainy, Zachodniej Biaiorusi oraz terenyw nie wcielonych do BSRR (11 powiatyw Biaiostockiego i Jomżycskiego [3]), maj№cych stanowiж zacz№tek ewentualnej Polski Radzieckiej. „Na tym ostatnim terytorium – czytamy w raporcie – nie przeprowadzono plebiscytu za poi№czeniem z ZSRR» [4]. Bardzo interesuj№ca jest też zamieszczona w raporcie informacja o postawie ludnoњci biaioruskiej: „Element biaioruskie z wrodzon№ sobie skrytoњci№ i nieufnoњci№ odnosi sik o nowych wiadz (bolszewicy, Litwini), a wobec nikiego uњwiadomienia narodowego nie ulega ryżnym orientacjom politycznym w takim stopniu jak Ukraiccy. Należy przy tym zaznaczyж, że wiadze sowieckie na obszarach etnograficznych biaioruskich nie wprowadzaj№ biaiorusynizacji, chociaż zewnкtrznej (jкzykowej), tylko bezwzglкdn№ rusyfikacjк. W ostatnim czasie ujawnia sik fala wychodцstwa także i z obszaryw

biaioruskich na teren okupacji niemieckiej» [5]. Ostatnia czkњж informacji jest caikowicie bikdna, gdyї sugeruje, їe osobami chc№cymi przedostaж sik na stronк niemieck№ mog№ byж osoby narodowoњci biaioruskiej „zraїone» radzieck№ polityk№. Wiadomo zaњ, їe byia to ustalona pomikdzy Niemcami a ZSRR wymiana ludnoњci, ktyra dla Biaiorusinyw, Ukraiccyw i Rosjan zakiadaia tylko jeden kierunek „przemieszczania sik» – na wschyd. Z Zachodniej Biaiorusi do strefy niemieckiej starali sik przedostaж giywnie polscy Їydzi – uchodцcy wojenni.

Kolejny raport zbiorczy dotari na zachyd w lutym 1940 r. O „sprawach biaioruskich» w czkњci dotycz№cej Biaiorusi Zachodniej znalazio sik tam tylko jedno, ale za to bardzo interesuj№ce stwierdzenie: „Juї pierwszy okres rz№dyw sowieckich w Polsce poci№gn№i za sob№, po pocz№tkowo dosyж korzystnych wraїeniach, dotycz№cych dyscypliny wkraczaj№cych wojsk sowieckich i ich tolerancyjnego stosunku do ludnoњci, duї№ pogard№ i niechкж ludnoњci do tego okupanta. Bolszewicy nie zaimponowali nawet – kulturalnie zacofanym i їyj№cym na stosunkowo niskim poziomie materialnym i umysiowym – masom ludowym na naszych kresach wschodnich. Te ujemne wraїenia, jakie odbierai Poleszuk, Biaiorusin, czy biedny gyral karpacki, przy zetkniкciu sik z okupantem ze wschodu w ostatnim okresie znacznie sik jeszcze pogikbiiy. <...> Znaczna wikkszoњж ludnoњci ziem wschodnich jest bezwzglкdnie antysowiecka, nawet tam, gdzie z wkroczeniem bolszewikyw wi№zano znaczne nadzieje. Kolportowano w Brzeњciu powiedzenie chiopa poleskiego, ktyry powiedziai, їe „rz№d polski przez 20 lat nie mygi przerobiж nas na Polakyw, a bolszewicy zrobili to w ci№gu trzech miesikcy» [6]. Oczywiњcie, autor raportu wybieraj№c t№ niesprawdzon№ pogioskк na dowyd „prapolskiego» nastawienia ludnoњci biaioruskiej zupeinie nie prybuje zastanowiж sik nad sensem tej wypowiedzi. Nie chodzi tu przecieї o „bycie Polakiem», a o istnienie w okreњlonej strukturze jako obywatel polski, co w przypadku lat mikdzywojennych w sposyb arbitralny upraszczano do pojкcia „bycia Polakiem». Dla biaioruskiego chiopa oznaczaio to po prostu odwrycenie akcentyw propagandy radzieckiej, ktyra na kaїdym kroku podkreњlaia potrzebк stworzenia nowego cziowieka – radzieckiego. Deklaracja chiopa jest prosta, z ekonomicznego punktu widzenia (w koccu to byt okreњla њwiadomoњж) woli byж „Polakiem» niї „Ruskim».

W marcu 1940 r. w kolejnym meldunku, pojawia sik problem szkoiy i szkolnictwa w jкzyku polskim. „Ludnoњж biaioruska – czytamy w raporcie – ktyra dawniej walczyia o szkoik biaiorusk№, obecnie z wielkim charakterem walczy o szkoik polsk№, przeciwko wprowadzeniu biaioruskiej; tylko dzikki tej twardej walce szkolnictwo polskie jeszcze nie zostaio zlikwidowane» [7]. Jest to informacja tylko czkњciowo prawdziwa i dotyczy wyi№cznie niektyrych rejonyw obwodu biaiostockiego, gdzie faktycznie chiopi biaioruscy protestowali przeciwko likwidacji polskiej szkoiy i powoiywaniu szkoiy biaioruskiej. Jednak argumenty, ktyre zupeinie zaskoczyiy wiadze radzieckie, byiy zupeinie inne niї „miioњж» do jкzyka polskiego. Domagaj№c sik pozostawienia szkoiy polskiej lub utworzenia szkoiy rosyjskiej motywowano to giywnie tym, їe jкzyk biaioruskie nie jest jкzykiem z przyszioњci№. Dla dzieci – zdaniem wielu chiopyw – znacznie korzystniejsza jest nauka rosyjskiego lub polskiego, gdyї tylko znajomoњж tych jкzykyw miaia pozwoliж na ewentualny awans spoieczny.

Ostatni raport omawiaj№cy szerzej sytuacjк panuj№c№ na terenach Zachodniej Biaiorusi wysiany zostai w kwietniu 1941 r. Przedstawiai on sytuacjк wojskow№ i konspiracyjn№ na tych terenach, podkreњlai teї znacznie trudniejsze niї po stronie niemieckiej warunki pracy. Wynikaio z niego, їe praca organizacyjna na Nowogrydczyцnie i Polesiu ogranicza siк jedynie do kontaktyw mikdzy wкdruj№cymi emisariuszami a pojedynczymi ludцmi. Powodem tej niezbyt aktywnej postawy ludnoњci jest zdaniem autoryw raportu fakt, їe „Nie ma tam zbiorowej odpowiedzialnoњci i bolszewicy nie s№ tak skionni do rozstrzeliwania ludzi z lada powodu albo i bez powodu jak Niemcy, ale niezmierne trudnoњci powoduje znacznie wiкksze wnikanie ich w sprawy spoieczecstwa polskiego niї pod okupacj№ niemieck№. Nie separuj№ siк oni od Polakyw, przeciwnie, wiaї№ wszкdzie i narzucaj№ siк, a przenosz№c walkк na piaszczyznк socjaln№ potrafili zjednaж sobie pewn№ czkњж spoieczecstwa polskiego, giywnie spoњryd miodzieїy proletariackiej i pewnej czkњci zaiamanej moralnie inteligencji. <...> Systemem swych zarz№dzec biurokratycznych tak spкtali spoieczecstwo, їe szersza praca przeciwko bolszewizmowi jest niemoїliwa. <...> Zaznacza siк tam zupeina obojкtnoњж Biaiorusinyw i Ukraiccyw do pacstwowoњci polskiej, przy jednoczesnej wrogoњci do bolszewikyw na podioїu gospodarczym» [8].

Raport ten, ostatni przed wybuchem wojny niemiecko-radzieckiej, pokazuje, їe pocz№tkowy, doњж optymistyczny obraz postawy ludnoњci biaioruskiej ulegi wyraцnej zmianie. Nadal sprawy bytowe s№ dla biaioruskiej ludnoњci giywnym punktem odniesienia w kwestii „zadowolenia» z nowej sytuacji politycznej, natomiast nie widaж juї tego, przywoiywanego wczeњniej w raportach, „przywi№zania do polskoњci i tksknoty za Polsk№». Tej tksknoty najprawdopodobniej nigdy nie byio, zaњ to, co pojawiaio siк w sprawozdaniach wynikaio z „podkolorowywania» meldunkyw. Pamiktaж teї naleїy, їe obraz „okupacji sowieckiej» na ziemiach Zachodniej Biaiorusi przedstawiany byi najczkњciej przez konspiracjк dziaiaj№c№ w Biaiymstoku i okolicach. Nie posiadaia ona w swych szeregach ludnoњci biaioruskiej, ktyrej nie ufano i postawк tejїe mogia opisywaж giywnie w oparciu o informacje z drugiej rкki. Spojrzenie na kwestiк biaioruskі№ wyi№cznie przez pryzmat prostego, prymitywnego chiopstwa, wykluczaio zrozumienie postaw i zachowac, ktyre obserwowano wњryd Biaiorusinyw – obywateli odchodz№cej juї do historii wieloetnicznej II RP.

Sytuacja ta widoczna jest doskonale w raportach wilecskiego ZWZ z tego samego okresu, jednak tu przewaїaj№ opinie oparte o pogl№dy biaioruskich elit przebywaj№cych w Wilnie i ocalaiych z aresztowac prowadzonych przez NKWD jesieni№ 1939 r., tuї przed przekazaniem Wilna Litwie: „Politycznie inteligencja biaioruska (dziaiacze polityczni) kuma siк z Litwinami i orientuje siк na Berlin, wierz№c razem z Litwinami w zwycikstwo Hitlera. Ich polityczna koncepcja jest nastкpuj№ca: Hitler jako zwycikzca buduje wielkie pacstwo biaioruskie z granicami pod Leningradem i Kaiug№, a na zachodzie nad Bugiem o zaludnieniu 30 milionyw mieszkaccyw pod protektoratem Niemcyw. Dziaiacze ci licz№, їe w przeci№gu kilkudziesikciu lat taki organizm pacstwowy wzmocni siк, masy zostan№ uњwiadomione i przy nastкpnym konflikcie taka

Biaioruњ uzyska caikowit№ niepodlegioњж. Samo przez sik zrozumiaie, їe w ich pojkciu granice zachodnie takiej Biaiorusi, kosztem Polski znalaziyby sik gdzieњ nad Bugiem» [9]. Raport ten powstai w lutym 1941 r., po nawi№zaniu przez komendk Okrkgu Wilecskiego ZWZ kontaktu z dziaiaczami biaioruskim w celu omywienie ewentualnej wspyipracy polsko-biaioruskiej. Na wysunikte przez stronk polsk№ ї№danie jasnej deklaracji lojalnej wspyipracy przeciwko Niemcom przedstawiciel strony biaioruskiej w osobie dr Stanisiawa Hrynkiewicza oњwiadczyi, їe nawet kilkunastoletni byt pacstwowy w oparciu o Niemcy moїe przynieњж Biaiorusinom niezwykle korzystne warunki w zakresie rozwoju kulturalnego i stworzenia podstaw niepodlegiego pacstwa biaioruskiego [10]. Ta postawa biaioruskich elit wynikaia poњrednio z nadziei, jakie czynili im jesieni№ 1939 r. przedstawiciele Micska, mywi№c o utworzeniu zjednoczonej z wszystkich ziem biaioruskiej republiki. Poniewaї okazaio sik to ziudzeniem jedyn№ siia zdoln№ speiniж te marzenia byi drugi z totalitaryzmyw. To zań byio nie do przyjkcia dla ZWZ, ktyry konsekwentnie realizowai zalecenia Rz№du RP na emigracji, zawarte w wysianych w teren rozkazach, aby: „Wejњж w їycie narodu ukraicskiego i biaioruskiego, nawi№zaж z nim wspyln№ niж porozumienia nie tyle w piaszczyцnie dawnej pacstwowoњci polskiej, o ile otwieraj№c№ moїliwoњci braterskiego porozumienia sik w obliczu wspylnego wroga. Prestiїe polskoњci winien byж oczywiњcie zachowany. Akcjk tk prowadziж naleїy ostroїnie, bior№c pod uwagk, їe wikcej nam chodzi o informacjk, co sik u nich dzieje, wykorzystanie ich do wspylnej akcji przeciwko bolszewikom, niї o przes№dzanie wspylnego wspyiїycia» [11].

Dla њwiadomych narodowo Biaiorusinyw byio to zbyt maio, dla pragmatycznych biaioruskich chiopyw jeszcze mniej.

Literatura

1. Armia Krajowa w dokumentach 1939-1945, Tom I: wrzesiec 1939 – czerwiec 1941. – Warszawa 1990. – S. 64.

2. Zob. M. Wierzbicki, Polacy i Biaiorusini w zaborze sowieckim. Stosunki polsko-biaioruskie na ziemiach pyinocno-wschodnich II Rzeczypospolitej pod okupacj№ sowieck№ 1939–1941, Warszawa 2000 oraz K. Jasiewicz, Zagiada Polskich Kresyw. Ziemiacstwo polskie na Kresach Pyinocno-Wschodnich Rzeczypospolitej pod okupacj№ sowieck№ 1939-1941. – Warszawa, 1997.

3. Co odpowiada w miark dokiadnie terytorium obwodu biaiostockiego.

4. AK w dokumentach. – S. 65.

5. Ibidem, s. 71.

6. Ibidem, s. 106-107.

7. Ibidem, s. 174.

8. Ibidem, 490-491.

9. Wierzbicki M., Polacy i Biaiorusini.... – S. 326.

10. Tomaszewski L., Kronika wilecska 1939-1941. – Warszawa, 1990. – S. 142-143.

11. AK w dokumentach. – S. 299.

П.В. Микульчик, первый секретарь Гродненского горкома КПБ, г. Гродно

РОЛЬ И МЕСТО КОММУНИСТИЧЕСКОЙ ПАРТИИ БЕЛАРУСИ В ПОСТРОЕНИИ ГРАЖДАНСКОГО ОБЩЕСТВА

Всем вам известно, что Коммунистическая партия Беларуси в политическом спектре белорусского общества занимает особое место, потому что является правопреемницей КПБ в составе КПСС, то есть, в составе бывшей правящей партии, носительницы передовых идей и целей, под руководством которой советский народ построил величайшую державу в такие короткие сроки, каких не видывал мир, победил в самой страшной из всех войн, снова восстановил страну из разрухи, создал индустрию более мощную, чем в некоторых развитых европейских странах.

Разумеется, рамки короткого выступления не позволяют ответить на следующие вопросы: Почему такая многочисленная, сильная и мощная партия потеряла свое влияние в народе и позволила развалить такую великую страну?

В нынешних условиях перед партией встают новые сложные вопросы и дилеммы. Как же относиться нам, коммунистам, к диаметрально противоположным процессам и явлениям? С одной стороны, у нас идет разрушение бывших социалистических устоев, с другой стороны – полным ходом происходит капитализация общества. А наша Компартия поддерживает политический курс Президента, направленный на построение нового общества. Но какого? Создаваемая белорусская модель социально-ориентированной экономики в известной степени примыкает к социалистической общественной формации, во многом использует советский опыт развития. Она смягчает жесткую, эгоистичную систему капитализма. Компартия Беларуси всемерно содействует прогрессу общества, поддерживает новые тенденции, рожденные жизнью и выражающие чаяния трудового народа. Члены КПБ поддерживают реформы, направленные на развитие производственных сил страны, повышение эффективности общественного производства и уровня жизни народа.

Однако наша республика тоже идет путем постепенного, взвешенного перехода к рыночной экономике, с определенным удельным весом частного сектора, развития малого и среднего бизнеса. Поэтому на фоне других стран СНГ наша Беларусь – это динамично развивающаяся, благополучная страна. В международных организациях ее называют «европейским тигром». А причины нашего успеха заключаются в том, что Беларусь в основном сохранила все лучшее и передовое, что было накоплено в советское время. И как итоговый результат: Беларусь успешно преодолевает экономический кризис.

«Экономическое чудо» в Беларуси достигнуто без монетаристских реформ, которые настойчиво предлагались нам западными советчиками.

И все же Компартия Беларуси выступает против целого ряда непопулярных мер, проводимых государством. Это касается в определенной мере либерализации розничных и частной приватизации государственной собственности в ряде отраслей и некоторых других факторов. В частности, уже сегодня в Беларуси зарегистрировано свыше 60 тысяч предприятий негосударственной собственности и около 200 тысяч индивидуальных предпринимателей, которыми произведено свыше 40 % промышленной продукции.

В розничном товарообороте их доля составляет около 70 %, хотя экономическая эффективность частного сектора в настоящее время еще ниже государственного. К тому же эти процессы в какой-то мере усиливают социальную дифференциацию работников, разделение общества на богатых и бедных. Усиление дифференциации общества зачастую происходит за счет ликвидации социальных завоеваний бывшего социалистического общества – почти бесплатного жилья, образования, медицинской помощи, низких цен на продукты питания, лекарства, культурных ценностей, спортивно-оздоровительных услуг, содержание детей и престарелых людей в соответствующих лечебных и профилактических заведениях. Не будем указывать и другие имевшиеся у людей труда преимущества.

Один из больных вопросов для трудящихся сегодня – контрактная форма трудовых отношений, которая усиливает их зависимость от нанимателя. Тем более что в социальном государстве должна быть высокая дисциплина труда, но отнюдь не дисциплина «палки и кнута», которая насаждается и узаконивается ныне контрактной системой. Не лучше ли шире и эффективнее развивать трудовое соперничество в коллективах, между районами, городами, областями.

Восстанавливая в 1995–1996 гг. коммунистическую партию Беларуси, мы рассчитывали на поддержку рабочего и крестьянина, интеллигента и государственного служащего, организатора производства и патриотически настроенного предпринимателя, на молодежь. Особые надежды мы связываем с интеллигенцией. В связи с этим на передний план теперь выдвинута идеологическая работа партии среди населения и в первую очередь среди молодежи. Специфика идеологической работы КПБ на современном этапе выражается в том, что идеология компартии и идеология нашего государства не конфликтуют, а дополняют друг друга. Формирование государственной идеологии, объединяющей всех граждан страны в целях превращения Беларуси в сильное и процветающее государство, на воспитании гражданственности, государственного самосознания, патриотизма, интернационализма, стремление к социальной справедливости. Отсюда видно, что КПБ заняла ведущее, главное место на политической сцене Беларуси, приобретает определенный авторитет в обществе. У партии есть все возможности выполнить свою миссию по объединению всех патриотических сил, консолидировать общество.

Главное внимание уделяется организационному укреплению первичных партийных организаций, росту рядов партии, а также повышению активности и ответственности коммунистов в свете требований постановлений VII съезда КПБ, последующих пленумов ЦК, ЛК и своих собственных решений. С этой целью через газету «Гродненская правда» мы обратились к жителям города с призывом поддержать нас.

Горком партии создал молодежную секцию, проведено организационное собрание. Однако мы не уповаем на то, что молодые коммунисты самостоятельно, без помощи умудренных опытом партийцев, помогут разрешить проблему омоложения наших рядов. В этом процессе должно быть место буквально каждому члену организации.

Хотелось бы видеть в наших рядах будущих управленцев, депутатов, руководителей.

Мы стараемся в полной мере показать свою сплоченность, боевитость, проявить волю и мудрость, потому что нынешняя ситуация не оставляет нам времени на раздумья. В развернувшейся острейшей политической борьбе может выстоять и победить лишь организация, объединившая единомышленников, скрепленная жесткой дисциплиной и умеющая в силу своей организованности оперативно реагировать на постоянно меняющиеся реалии жизни. Это – залог и гарантия победы. Победы сегодня, завтра, всегда.

В.Ф. Голубеў, Інстытут гісторыіі НАНБ, г. Мінск

СЯЛЯНСКАЯ ГРАМАДА НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў XVI –XVIII ст. (паводле новых крыніц з архіваў Беларусі і Польшчы)

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі даволі трывала ўстанавілася меркаванне, што пасля правядзення ў XVI ст. у Вялікім княстве Літоўскім аграрнай рэформы на захадзе Беларусі, акрамя значных эканамічных пераўтварэнняў, адбылася і ліквідацыі такога сацыяльна-гаспадарчага інстытута, як сельская абшчына (грамада). Адным з першым такую думку выказаў М.В.Доўнар-Запольскі, які лічыў, што ў заходняй частцы ВКЛ абшчына знікла «ў выніку ўвядзення там кіравання на падставе Уставы» [1, с. 8]. Падобныя сцвярджэнні ўтрымліваюцца і ў некаторых сучасных абагульняльных працах [2, с. 221; 3, с. 92].

Аднак выяўленыя ў апошнія гады беларускімі гісторыкамі новыя матэрыялы сведчаць пра тое, што нягледзячы на індывідуалізацыю сялянскага землекарыстання, якая сапраўды пачала шырока распаўсюджвацца пасля правядзення валочнай памеры, сельская грамада на захадзе Беларусі не знікла. Больш за тое, у некаторых выпадках яе функцыі нават пашырыліся, а да канца XVII – пачатку XVIII ст. у некаторых уладаннях

абшчына ператварылася ў орган сялянскага самакіравання, які афіцыйна прызнаваўся дзяржавай. Менавіта на дакументы, якія ўтрымліваюць інфармацыю аб стаўленні дзяржаўнай улады да дзейнасці сельскай абшчыны (грамады) ў заходнім рэгіёне Беларусі на працягу XVI – XVIII ст., мы будзем рабіць асноўны акцэнт у дадзенай публікацыі.

Напачатку хочам звярнуць увагу на вельмі цікавы і змястоўны дакумент, які датычыцца існавання абшчыннага копнага суда на Гарадзеншчыне ў XVI ст. Гэта «Ліст гарадзенскага падкаморага Грыгорыя Масальскага да насельніцтва Гарадзенскага павета аб правілах склікання коп і прызначэнні месцаў капавішчаў» ад 22 кастрычніка 1590 г., які быў выяўлены і апублікаваны І.М.Бобер [4, с. 72-76]. Дакумент змяшчаецца ў складзе актавай кнігі Гарадзенскага земскага суда за 1590 – 1592 гг., якая захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў г.Мінску [5]. Цікавасць згаданы ліст выклікае з некалькіх прычын. Самае галоўнае, што гэта пакуль адзіны дакумент, які не проста гаворыць пра існаванне практыкі копных судоў на Гарадзеншчыне, а паказвае, што дзейнасць гэтых судоў падтрымлівалася і нават пэўным чынам арганізоўвалася тут з боку дзяржавы. Болып за тое, як вынікае з тэксту, Г.Масальскі выконваў пастанову, змешчаную ў 9 артыкуле 14-га раздзела Статута ВКЛ 1588 г., на што ён і спасылаўся ў сваім лісце [4, с. 74]. У Статуце адзначалася наступнае: «... где досихмест копы не бывалн, которые коповніца кождый подкоморий в повете своем назначити и села тых, хто ся там становити будеть, описати маеть. А на Руси и инде, где здавна копы бывали, там мают быти и тепер копы отправованы на старых коповніцах тым обычаем, яко первей того бывало. А на тых теж местцах, где досель копы не бывали, таковым же порядком и поступком копы збираны и отправованы быти мають, яко ся и на Руси заховывало и заховуеть» [6, с. 337]. Такім чынам, прызначэнне месцаў капавішчаў на Гарадзеншчыне было не ўласнай ініцыятывай Г.Масальскага, а хутчэй за ўсё адным з этапаў агульнадзяржаўнай кампаніі, у ходзе якой інстытут суда грамады (копны суд) распаўсюджваўся на ўсю тэрыторыю ВКЛ. На карысць гэтай версіі таксама сведчыць факт прызначэння капавішчаў троцкім падкаморым князем Багданам Агінскім у Троцкім ваяводстве ў лістападзе 1590 г., амаль у той жа час, што і ў Гарадзенскім павеце [7, с. 80-90]. Усяго ў Гарадзенскім павеце ў 1590 г. было прызначана шэсцьдзесят капавішчаў, з іх трыццаць тры былі – «пры касцёле», семнаццаць – «пры царкве», пяць – пры гаспадарскіх дварах, тры пры рынках і два – «пад гаем бярозавым» – у Гудзевічах і Лабне [4, с. 74-75]. Адзначым, што рэгламентацыі правядзення копных судоў і тым больш вызначэння месцаў капавішчаў не было ў папярэдніх Статутах ВКЛ 1529 і 1566 гг.

Тое, што дзяржава ў Статуце ВКЛ 1588 г. не толькі заканадаўча аформіла існаванне судоў грамады, але пэўным чынам пачала пашыраць іх дзейнасць на тэрыторыю ўсяго ВКЛ, можна ацэньваць як спробу далейшага падпарадкавання грамады органам улады. Але, з другога боку, гэты факт сведчыць і аб прызнанні дзяржавай абшчыны як аднаго з сацыяль-

ных інстытутаў тагачаснага грамадства і ўключэнні інстытута копных судоў у агульнадзяржаўную судовую сістэму.

Яшчэ больш выразна стаўленне ўладаў да сельскай абшчыны прасочваецца па матэрыялах другой паловы XVII – XVIII ст. Мы будзем у асноўным аперыраваць матэрыяламі, якія тычацца дзяржаўных уладанняў, але адзначым, што шматлікія сведчанні функцыянавання абшчыны ёсць і ў адносінах да прыватных і царкоўных вёсак і валасцей. Менавіта ў гэты час устойлівае распаўсюджанне ў адносінах да сялянскай абшчыны набыў тэрмін «грамада». Ён стаў выкарыстоўвацца не толькі ў сэнсе абазначэння групы насельніцтва пэўнай тэрыторыі, але і ў абазначэнні абшчыны як сацыяльна-гаспадарчага інстытута.

*А*дным з найбольш характэрных дакументаў, які зафіксаваў існаванне і прызнаў эканамічныя правы сельскай грамады, з'яўляецца выяўлены намі ў Галоўным архіве старажытных актаў (АОАВ) у Варшаве прывілей караля Яна III ад 1678 г. грамадзе вёскі Рэчыца Брэсцкай эканоміі [8, арк. 17]. З дакумента вынікае, што абшчына дадзенай вёскі раней ужо звярталася да вярхоўнай улады з просьбай паменшыць павіннасці і атрымала ў 1672 г. прывілей караля Міхала Карыбута Вішнявецкага. Прывілей апошняга спасылаецца на ліст камісараў Брэсцкай эканоміі Андрэя Ушынскага і Андрэя Катоўскага, складзены 2 лістапада 1649 г. у адказ на скаргу «грамады вёскі Рэчыцы» [6]. Цікавасць выклікае не толькі тое, што ў адказ на скаргу грамады ёй былі ўстаноўлены ўдакладненыя павіннасці, а сам факт кантакта дзяржаўнай улады (на самым высокім узроўні!) з грамадой асобнай вёскі. Між іншым, дакумент сведчыць пра выпадкі набыцця грамадой зямлі, што зусім не адмаўлялася дзяржавай. Для ўладаў галоўным было тое, каб і з гэтых грунтаў у скарб ішоў чынш: «З моргаў новапрынятых, а таксама з даўнейшых па грошы польскія чатыры, а з валокі Маджэеўскай, якую ўся вёска, купіўшы ў пана Яна Рошчыца, на моргі разабрала, з кожнага морга па восем грошаў польскіх» [6]. Грамада і надалей адыгрывала важную ролю ў сацыяльным і гаспадарчым жыцці вёскі Рэчыца, у тым ліку і ў землекарыстанні. Так, інвентар 1721 г. сведчыў, што ўсе 9 валок гэтай вёскі знаходзіліся ў карыстанні грамады: 2 1/2 цяглых валок «уся грамада абрабляе і плаціць з валокі па 1 тынфу і 1 шастаку бітаму», а 6 3/4 валок чыншавых «уся грамада абрабляе і плаціць з валокі па 10 тынфаў» [арк. 321]. Грамада карысталася зямлёй і разам адбывала з яе павіннасці і плаціла падаткі не толькі ў Рэчыцы, а і ў суседніх Рэчыцкага ключа, а таксама ў іншых ключах Брэсцкай і Кобрынскай эканомій. Гэтыя факты фіксаваліся ў складзеных рэвізорамі дакументах і прызнаваліся дзяржавай за правіла. Так было ў вёсцы Цевялі Чаравацкага ключа Кобрынскай эканоміі, калі падчас рэвізій 1721, 1722, 1723, 1724, 1726, 1729 гг. камісары запісвалі, што ўсю зямлю трымае «грамада Цевялоўская ў адпаведнасці з законам па тынфаў 22» [2, с. 27, 45, 87, 112, 161]. Такія ж запісы ў інвентарах маюцца пры вёсках Тулічы, Востраў і іншых.

Больш за тое, рэвізоры адзначалі, што былі выпадкі, калі грамада здавала сваю зямлю ў карыстанне «пастароннім людзям» (недзяржаўным сялянам) і нават шляхце. Напрыклад, у 1722 г. у в.Востраў таго ж Чаравіцкага ключа, дзе кожная валока па даўняй традыцыі мела сваю назву, «у валоцы «Косіч» грамада я.м. пану Рушчыку адвяла 1/3 чыншавай і 1/6 пустой», «валоку «Русіновіч» грамада адвяла п. Міхалу Андраноўскаму», а ў «валоцы «Крошчыц» грамада адвяла е.м. пану Рушчыку 1/4 чыншавай» [арк. 31]. Былі падобныя выпадкі здачы абшчыннай зямлі і ў іншых суседніх вёсках. Звяртае на сябе ўвагу тое, што дзяржаўныя чыноўнікі звычайна не пярэчылі такім з'явам, не забаранялі іх, а толькі фіксавалі іх у інвентарах.

Нам удалося знайсці дакумент, які больш дэталёва раскрывае практыку распараджэння грамады зямлёй. Гэта дакладная запіска рэвізора Траяноўскага, які ў 1731 г. даводзіў да ведама кіраўніцтва Кобрынскай эканоміі, што ў в.Косішчы пан Марцін Грабоўскі са сваімі братамі трымаў кавалак грунту «ва ўрочышчу Груды ад селяніна набыты» і з той зямлі ужо некалькі гадоў «ніякіх падаткаў не плаціць ні да грамады, ні да двара» [арк. 121]. У выніку расследавання аказалася, што пан Грабоўскі «што-гадовага чыншу і з іншых земляў і лугоў, якія належаць, акрамя згаданых Грудоў, да грамады Косіцкай, не хоча аддаваць і яшчэ паборцаў заўжды б'е» [арк. 122 адв.]. Тут больш за ўсё заслугоўвае ўвагі той факт, што грамада практычна атрымала дазвол на распараджэнне ворыўнай зямлей вёскі. Разам з тым, дзяржава давала магчымасць сялянам (грамадзе) здаваць зямлю ў арэнду пастароннім людзям толькі з умовай поўнай выплаты з гэтай зямлі чынша і, пры неабходнасці, адбывання іншых павіннасцяў. Але разам з аднаўленнем гаспадаркі пачынаючы з 40-х гадоў XVIII ст. такое права паступова абмяжоўвалася. Так, у дэкларацыі, што была ўнесена ў інвентар Брэсцкай і Кобрынскай эканомій за 1742 г., ужо канстатавалася, што «хлопства... са злосці і сваволі сваёй грунты эканамічныя пастароннім людзям прадаваць, застаўляць і заводзіць звыклі» [арк. 72 адв., 176-177]. У тэксце дэкларацыі ўказвалася, што з моманту яе выдання ні адзін селянін «прадаваць, застаўляць і ніякім іншым спосабам заводзіць грунтаў эканамічных не павінен» [арк. 72 адв., 176-177]. Больш за тое, сялянам рэкамендавалася выкупляць назад зямлю, якую яны раней здалі ў заставу. У большасці выпадкаў гэтую зямлю «здавала» грамада, таму яна і павінна была яе выкупляць.

Мы маем у распараджэнні больш шырокую колькасць дакументаў, чым прыведзена ў дадзеным паведамленні, якія сведчаць аб існаванні і функцыянаванні сялянскай грамады ў заходнебеларускай вёсцы ў XVI – XVIII ст. З іх вынікае, што роля і месца грамады ў жыцці вёскі на працягу гэтага перыяду былі не аднолькавыя. Калі ў часы крызісаў дзяржава абшчыну нават падтрымлівала, то ў гады эканамічнай адбудовы старалася абмежаваць, але ў любым выпадку імкнулася кантраляваць. Галоўнае, што абшчына працягвала існаваць як сацыяльны і гаспадарчы інстытут і, як сведчаць выкарыстаныя намі крыніцы, успрымалася органамі ўлады як аб'ектыўная рэальнасць.

1. Довнар-Запольский М.В. Очерки по организации западнорусского крестьянства в XVI в. – Киев, 1905.

2. Сагановіч Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. – Мінск, 2001.

3. Эканамічная гісторыя Беларусі. – Мінск, 1995.

4. Бобер І.М. Ліст гарадзенскага падкаморага Грыгорыя Масальскага да насельніцтва Гарадзенскага павета аб правілах склікання коп і прызначэнні месцаў капавішчаў // Архіварыус. Выпуск 1. – Мінск, 2001.

5. НГАБ. Ф. 1755. Воп.1. Спр. 10. Арк. 825 – 827.

6. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. – Мінск, 1989.

7. Акты издаваемые Виленскою археографическою комиссиею (АВАК). Т. XVIII. Акты о копных судах. – Вильна, 1891.

8. AGAD. Zbiyr z Muzeum Narodowego, nr. 1168.

9. AGAD. Archiwum Rodzinne Poniatowskich, nr. 198.

10. AGAD. Archiwum Rodzinne Poniatowskich, nr. 186.

11. AGAD. Archiwum Rodzinne Poniatowskich, nr. 214.

12. AGAD. ЦГА Літвы. Ф. ДА. Спр. 11499.

І.Ф. Кітурка, ІПА ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

ЗАХОДНЕЕЎРАПЕЙСКІ ВОПЫТ У МАДЭРНІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ ВКЛ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII ст.: ІДЭІ І РЭАЛІЗАЦЫЯ (на прыкладзе Гарадзенскай эканоміі)

У даіндустрыяльным грамадстве дабрабыт насельніцтва і эканамічная бяспека дзяржавы прама залежалі ад узроўню развіцця сельскай гаспадаркі. Сельская гаспадарка ў феадальную эпоху характарызавалася пэўнай руціннасцю і панаваннем традыцыі як у эканамічным, так і ў сацыяльным жыцці. На працягу стагоддзяў амаль не змяняліся прылады працы, спосабы апрацоўкі глебы і ўвогуле спосабы вядзення гаспадаркі.

Пераломным момантам у гэтым працэсе на землях ВКЛ, як і ўсёй Рэчы Паспалітай, стала другая палова XVIII ст. У гэты час Рэч Паспалітая стала месцам сустрэчы дзвюх культур: традыцыйнай і ідэалогіі новага часу – Асветніцтва з характэрным для яго культам розуму, адукаванасці і навукі. Пад уздзеяннем гэтай ідэалогіі ў краіне пачала адбывацца сапраўдная рэвізія светаўспрымання ў палітычнай, філасофскай, грамадскай і эканамічнай галінах.

Як сведчыць гістарычны вопыт, рашаючы ўплыў на правядзенне рэформ у грамадстве аказваюць інтэлектуальныя змены, якія адбываюцца ў першую чаргу у сферы ідэалогіі. Неабходнасць новаўвядзенняў, пе-

раходу ад кансерватызму да рэформаў, сфармуляваныя філасофіяй, абавязкова стымулююць перамены ў эканоміцы і палітыцы. Так, у другой палове XVIII ст. у свядомасці найбольш прагрэсіўнай часткі палітычнай эліты Рэчы Паспалітай у сувязі са слабасцю цэнтральнай улады, паглыбленнем феадальнай анархіі і пэўнай адсталасцю эканомікі дзяржавы абудзілася пачуццё небяспекі за будучае краіны і асэнсаванне неабходнасці рэфармавання, у тым ліку і эканамічнага.

Даследаванне гаспадарчага развіцця ВКЛ у другой палове XVIII ст. паказвае, што гэты час характарызаваўся значнымі зменамі ў арганізацыі эканамічнага жыцця і нават у яго разуменні, а не простым ажыўленнем эканомікі, як гэта падаецца ў многіх падручніках [1]. На тэрыторыі ВКЛ эканамічныя пераўтварэнні насілі інавацыйны характар як для развіцця прамысловасці, так і сельскай гаспадаркі, грунтаваліся на гаспадарчым вопыце еўрапейскіх краінаў і, па сутнасці, з'яўляліся першай спробай сапраўднай мадэрнізацыі краіны.

У адпаведнасці з традыцыяй еўрапейскай гістарычнай навукі ў дадзеным артыкуле пад тэрмінам «мадэрнізацыя» мы разумеем працэс пераўтварэння дапрамысловага грамадства ў прамысловае, дзе першы перыяд вызначаецца як развіццё аграрных адносін з элементамі гандлёвага капіталізму [2, с. 5][1].

Абуджэнню дыскусіі пра неабходнасць рэфармавання сельскай гаспадаркі садзейнічала павелічэнне колькасці эканамічных выданняў і распаўсюджанне іх на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Літаратура вучыла назіраць і думаць, паказвала былую веліч дзяржавы і існуючае становішча, прыводзіла прыклады заняпаду краіны, вучыла праектаваць рэформы, абапіраючыся на гістарычныя веды, еўрапейскі вопыт і рэальнае гаспадарчае і грамадскае жыццё [3, с. 12].

Фактычна ва ўсіх эканамічных выданнях падкрэслівалася, што пераймаць добры вопыт іншых краінаў – гэта зусім не ганебна, а, наадварот, разумна і карысна, паколькі «сапраўднае гаспадарства грунтуецца не толькі на працы рук, але і на працы галавы» [4, с. 3], таму ўсе краіны Еўропы карыстаюцца лепшымі вынаходніцтвамі сваіх суседзяў [5].

Кнігі гаспадарчага зместу, перакладзеныя з французскай, нямецкай, англійскай моў, выдаваліся ў другой палове XVIII ст. у друкарнях як на тэрыторыі Кароны, так і ў Вялікім княстве, у тым ліку ў Вільні, Гародні, Нясвіжы, Берасці. У гэтых выданнях даказвалася перавага так званага «новага земляробства», якое прапагандавала змяненне прынцыпаў вядзення сельскай гаспадаркі. У прыватнасці, прадугледжвалася:

• абавязковая ліквідацыя паравай сістэмы і ўвядзенне шматпольнага севазвароту;

---

[1]Падрабязней пра характарыстыку тэрміна "мадэрнізацыя" гл.: Кітурка І. Да пытання пра ўжыванне тэрміну "мадэрнізацыя" адносна эканамічнай гісторыі Беларусі другой паловы XVIII ст. // Гістарычны альманах. – Т. 9. – Гародня, 2003. – С. 26 –35.

• вывядзенне новых парод жывёлы і павялічэнне яе колькасці;

• спалучэнне збожжавага земляробства з вырошчваннем кармавых раслін і тэхнічных культур, неабходных для прамысловасці;

• выкарыстанне новых сельскагаспадарчых прылад працы;

• добрае ўгнаенне глебы.

Самай важнай эканамічнай рэкамендацыяй было выкарыстанне ў сельскай гаспадарцы навуковых адкрыццяў і дасягненняў.

Аналізуючы эканамічную літаратуру, якая была выдадзена ў Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст., відавочна эвалюцыя гаспадарчых поглядаў. Так, калі ў часопісе «Новыя эканамічныя і навуковыя веды» (1758 г.) яшчэ гаварылася пра неабходнасць захавання фальваркаў і трохполля [6, с. 36-38], то ў наступных выданнях часопіса менавіта гэтыя спосабы гаспадарання падвяргаліся найбольшай крытыцы і даказвалася іх эканамічная неэфектыўнасць.

Упершыню ў Рэчы Паспалітай значную ўвагу прыцягнула пытанне неабходнасці прадастаўлення сялянам свабоды, у тым ліку і эканамічнай. Гэтае палажэнне разумелася, бадай што як самае галоўнае, бо «цяжар вялікай, часам невыноснай працы так ганіць цела і розум беднага земляроба, што ён працуе без задавальнення, без ахвоты, поўны роспачы, апускаецца ва ўсім і ледзь памятае, што ён створаны вольным чалавекам і адрозніваецца ад жывёлы, якая штодзень працуе побач» [6, с. 163]. Разам з тым сцвярджалася, што «дасканалымі земляробамі могуць быць толькі людзі вольныя, адукаваныя, дасціпныя, вынаходлівыя, якія маюць уласнасць... і пачуццё бяспекі ў сваіх сядзібах» [5].

Ідэя прадастаўлення сялянам эканамічнай свабоды ўваходзіла ў супярэчнасць з распаўсюджанай у той час сістэмай фальваркаў, якія апрацоўваліся пераважна працай феадальна залежных сялян. Для вырашэння гэтага пытання прапаноўваліся два асноўныя варыянты: альбо ліквідацыя фальваркаў і раздача грунтаў сялянам за вызначаную плату [7, с. 162-173], альбо выкарыстанне наёмных работнікаў, паколькі ў параўнанні з паншчыннай працай «наёмныя людзі прынясуць для фальварку больш прыбытку» [8].

Пад уплывам эканамічнай літаратуры ў ВКЛ узнялася сапраўдная хваля рэфарматарскіх ініцыятыў, разгляд і аналіз якіх уваходзіў у кампетэнцыю створанай на канвакацыйным сойме 1765 г. Эканамічнай рады літоўскага скарбу (Скарбавай камісіі ВКЛ). Аднак практыка рэалізацыі тэарэтычных выкладак эканамічных выданняў мела свае асаблівасці.

Так, правядзенне розных гаспадарчых эксперыментаў маглі дазволіць сабе магнаты, якія мелі ў распараджэнні значныя грашовыя сродкі. Рэформы, накіраваныя на вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці і прадастаўленне ім пэўнай эканамічнай свабоды, праводзілі ў сваіх уладаннях П.Бжастоўскі, І.Храптовіч, І.Масальскі і інш. Яны ж выступалі ў ролі ініцыятараў, фундатараў, а часам і аўтараў перакладаў замежных эканамічных выданняў.

Сярэдняя і дробная шляхта ў пераважнай большасці не рызыкавала і не звяртала ўвагі на «выдумкі» палітычнай і эканамічнай эліты.

У дзяржаўных уладаннях ВКЛ у другой палове 60-х г. XVIII ст. была ажыццяўлена аграрная рэформа, аўтарам і ініцыятарам якой быў надворны падскарбі ВКЛ і генеральны адміністратар каралеўскіх сталовых эканомій Антоній Тызенгаўз [9]. Пры аналізе асноўных палажэнняў гэтай рэформы становіцца відавочным, што А.Тызенгаўз хацеў спалучыць прапагандуемае ў краіне «новае земляробства» з захаваннем асноў феадальнай гаспадаркі. Па яго ініцыятыве за мяжой купляліся новыя гатункі збожжа, новыя пароды жывёлы, сельскагаспадарчыя прылады. Сяляне абавязаны былі садзіць пры хатах сады, праводзіць рэкультывацыю глебы. Але пры гэтым сельскае насельніцтва эканомій было пераведзена на адпрацовачную павіннасць, якая не стымулявала зацікаўленасць сялян у выніках сваёй працы.

Як вядома, галоўнай мэтай рэфарматарскіх памкненняў А.Тызенгаўза быў «вялікі мануфактурны план», у адпаведнасці з якім у Гародні і яго прадмесці Гарадніцы з улікам лепшых еўрапейскіх традыцый былі пабудаваны звыш 15 мануфактур. Аднак гэта не прынесла чаканых вынікаў у выпуску прамысловай прадукцыі еўрапейскага ўзроўню. Сярод прычын правалу мануфактурнага плану было і тое, што на прадпрыемствах выкарыстоўвалася бясплатная праца каралеўскіх сялян, якія не мелі адпаведнай кваліфікацыі і эканамічнай зацікаўленасці.

І аграрная, і мануфактурная рэформы толькі ўскладнілі сацыяльна-эканамічную сітуацыю ў сталовых эканоміях. У 1775 г. вялікі гетман Міхал Агінскі даносіў каралю, што ва ўсіх літоўскіх эканоміях адбываецца разбурэнне сялянскіх хат і перасяленне некалькіх сем'яў да адной хаты, каб менш плаціць падымны падатак [10]. У найбольш складаным становішчы апынулася Гарадзенская эканомія – цэнтр эканамічных і культурных пераўтварэнняў А.Тызенгаўза, колькасць насельніцтва якой з 1765 г. па 1780 г. зменшылася на 8 %. У дакуменце 1777 г. пра стан Скідальскага ключа гэтай эканоміі насупраць значнай колькасці сялянскіх прозвішчаў адзначалася: «паншчыны эканамічнай не адпрацоўвае, пайшоў па хлеб» [11].

Далейшае развіццё Гарадзенскай эканоміі паказвае, што ў ёй адбылася пэўная пераарыентацыя дзяржаўнай палітыкі ў бок паслаблення павіннаснага ціску і пераводу сялян цэлымі вёскамі і нават ключамі на грашовую рэнту. Такі працэс ужо меў месца ў сярэдзіне – другой палове XVII ст., але тады ён быў выкліканы збожжавым крызісам у Заходняй Еўропе і наступствамі для Беларусі вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654 – 1667 г.). Паступовае адмаўленне ад паншчыны на карысць чыншу ў 80 – 90-я г. XVIII ст. сведчыла пра прызнанне дзяржавай таго, што феадальная гаспадарка, заснаваная на павіннасным ціску падданых, вычарпала мажлівасці свайго развіцця.

Складзенае ў 1782 г. каралеўскім шамбелянам Т.Урускім данясенне каралю аб стане ў эканоміях сведчыць, што «зробленыя палёгкі і льготы далі магчымасць амаль усім падданым лепш брацца за гаспадарства і садзейнічалі таму, што шмат збеглых вярнуліся назад» [12]. Толькі ў Янаўскім ключы Гарадзенскай эканоміі за перыяд 1780 – 1782 гг. з'явіліся 6 новаа-

селых вёсак, у якіх была 141 гаспадарка [13]. У цэлым у эканоміі з 1780 па 1783 г. колькасць гаспадарак павялічылася на 373, коней і валоў – на 5371, кароў – на 2035 [14].

Такім чынам, гаспадарчае жыццё ў ВКЛ у другой палове XVIII ст. адчувала пэўны ўплыў ідэй еўрапейскага Асветніцтва. На старонках эканамічных выданняў абмяркоўваліся праблемы, якія па сутнасці складалі сацыяльна-эканамічную аснову феадальнага грамадства. Разам з тым магчымасць рэалізацыі іх на практыцы залежала ад шмат якіх фактараў. Рэформы А.Тызенгаўза паказалі, што эканоміка не можа развівацца толькі па загаду асобы ці дзяржавы. Яна мае свае ўласныя законы і прынцыпы развіцця. І нават простае перанясенне лепшых эканамічных інавацый на непадрыхтаваную глебу без усялякага ўліку мясцовых асаблівасцяў (як тое зрабіў са сваім «мануфактурным планам» у ВКЛ А.Тызенгаўз) не прыносіць ніякага плёну.

Літаратура і крыніцы

1. Эканамічная гісторыя Беларусі. Вучэбны дапаможнік / Пад агульнай рэд. В.І.Галубовіча. – Мн.: Экаперспектыва, 1998; Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): Вучэб. – метад. комплекс / Навук. рэд. А.М.Алпееў. – Мн.: ЗАТ «Веды», 2003. – С. 56 – 57 і інш.

2. От аграрного общества к государству всеобщего благосостояния: Модернизация Западной Европы с XV в. до 1980-х гг. – М.: РОССПЭН, 1998. – 432 с.

3. Z dziejyw polskiej muњli filozoficznej i spoiecznej. T. II. Wiek XVIII – Oњwiecenie. – Warszawa, 1956. – 364 s.

4. O rolnictwie dla wygody gospodarzow w Pawiowie mieszkai№cych. – Wilno, 1770.

5. Folwark w ktorym Grunta nie zostawuj№ sik nigdy ugorem. Przeioїony na polski jkzyk przez X. Grzegorza Kniaїewicza Matem. JW. JX. Biskupa Wilen. – W Wilnie w Drukarni J. K. M. Rїpltey Akademickiej Societatis Jesu, 1770. Przedmowa.

6. Nowe wiadomosci ekonomiczne i uczone albo Magazyn wszystkich nauk do szczkњliwego їycia ludzkiego potrzebnych. Wydane przez Wawrzynca Mitzlera de Kolof Filozofii i Medycyny Doktora, Historii Rzeczypospolitey Pisarza, ryїnych Akademii cudzozemskich Towarzysza J.K.M.K. – T. 1. – Warszawa 1758. – 743 s.

7. Przykiad nowy bardzo iatwego a znacznego pomnoїenia intraty z dobr dziedzicznych // Wybor wiadomoњci gospodarskich. T. 1. Przez X. Piotra Switkowskiego. – Warszawa, 1786. S. 162–173.

8. Biblioteka Narodowa w Warszawie. Archiwum Czartoryskich, m/f 1643, s. 556 ("Uwagi nad gospodarstwem niektyrych czkњci Litwy").

9. Голубеў В., Кітурка І. Аграрная рэформа Антонія Тызенгаўза // Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 3. – Мн.: Экаперспектыва, 2004. – С. 178 – 186.

10. Галоўны архіў старажытных актаў у (ГАСА) Варшаве. Ф. Archiwum Kameralne (АК). Спр. III/268. Арк. 17.

11. ГАСА, АК. Спр. III/166. Арк. 13.

12. ГАСА, АК. Спр. III/68. Арк. 5.

13. ГАСА, АК. Спр. III/183. Арк. 3 – 13.

14. ГАСА, АК. Спр. III/163. Арк. 1.

І.В. Соркіна, ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

АСАБЛІВАСЦІ УРБАНІЗАЦЫІ ЗАХОДНЯГА РЭГІЁНА БЕЛАРУСІ Ў ЧАСЫ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (канец XVIII – пачатак XX ст.)

У сучаснай урбаністыцы выдзяляецца тэндэнцыя разумення урбанізацыі як працэсу распаўсюджання гарадскога тыпу адносін, гарадскога ладу жыцця. Урбанізацыя вызначаецца як гістарычны працэс узрастання ролі горада ў развіцці грамадства. Урбанізацыйныя працэсы выклікаюць змены ў сацыяльнай і дэмаграфічнай структуры грамадства, культуры, ладзе жыцця, псіхалогіі. Урбанізацыя разглядаецца не як універсальны, а як канкрэтна-гістарычны феномен: узнікненне урбанізацыі як працэса звязваецца з фарміраваннем капіталістычных адносін [1, с. 15.].

Перыяд развіцця капіталістычных адносін на беларускіх землях, калі адбывалася трансфармацыя традыцыйнага феадальна-прыгонніцкага грамадства ў прынцыпова новую якасць – індустрыяльную цывілізацыю, прыпадае на часы, калі Беларусь знаходзілася ў складзе Расійскай імперыі. Эканамічна адсталая Расія, дзе перажыткі даўніны выяўляліся найбольш моцна, эканамічныя рэформы праводзіліся са спазненнем, непаслядоўна, ўвасабляла сабой даганяючы тып мадэрнізацыі. Гэта не магло не адбіцца на тэмпах, формах і выніках як мадэрнізацыі беларускіх земляў у цэлым, так і урбанізацыі ў прыватнасці. Індустрыялізацыя, якая найбольш стымулюе рост гарадоў, слаба кранула ў XIX ст. беларускія землі. Аграрная правінцыя Расіі не магла прэтэндаваць на імклівае развіцце гарадскога жыцця. Ва ўмовах Расійскай імперыі тармазіліся і працэсы горадаўтварэння на аснове гандлю. Моцная дэфармацыя урбанізацыйных працэсаў на тэрыторыі Беларусі адбывалася ў выніку мераў расійскіх уладаў па высяленню яўрэяў з сельскай мясцовасці ў гарады і мястэчкі. У выніку палітыкі штучнай «урбанізацыі» яўрэйскага насельніцтва ў заходніх губернях фарміраванне гарадскога насельніцтва Беларусі ішло не столькі эканамічным шляхам, колькі з'яўлялася вынікам юрыдычна-адміністрацыйнага прымусу з боку царскіх уладаў. Працэс вымывання беларускага і наогул хрысціянскага насельніцтва гарадоў Беларусі, які пачаўся яшчэ ў Рэчы Паспалітай, актыўна працягваўся. У выніку урбанізацыя, якая ўкшталтавала сучасныя нацыі і сучасныя нацыянальныя дзяржавы, на беларускіх землях ва ўмовах Расійскай імперыі абыйшла бокам беларусаў. Беларусы ператвараліся ў няпоўнаскладовую сялянскую нацыю з характэрнай неурбанізаванай ці недаурбанізаванай ментальнасцю. Феномен небеларускасці гарадоў Беларусі зафіксаваў Першы Усерасійскі перапіс насельніцтва 1897 г. Беларусаў у гарадах пражывала каля 109 тыс., ці крыху болей за 2 %. Па сваім складзе гарады Беларусі былі яўрэйска-рускімі. Удзельная вага беларусаў сярод гараджан складала 17 % [2, с. 169.]. Беларусы запаўнялі сферу найму і гарадскога земляробства, у сферу ж кіра-

вання і гандлёва-прамысловай дзейнасці амаль не ўваходзілі. Можна цалкам пагадзіцца з высновай З.Шыбекі аб тым, што адным з самых трагічных вынікаў далучэння Беларусі да Расійскай імперыі было запавольванне і дэфармацыя ўрбаністычнага працэсу, які забяспечваў фармаванне поўнаскладовай беларускай нацыі.

Звернемся да разгляду канкрэтных вынікаў урбанізацыі і яе рэгіянальных асаблівасцей у Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст., якія знайшлі адлюстраванне ў гістарычнай літаратуры. Найважнейшы паказчык урбанізацыйных працэсаў – рост гарадскога насельніцтва і удзельнай вагі гараджан сярод усяго насельніцтва (ступень урбанізацыі). З 1796 па 1861 г. насельніцтва 42 гарадоў Беларусі павялічылася з 79,1 тыс. да 319,9 тыс. чалавек (у 4 разы) [3, с. 32.]. Аднак рост гарадскога насельніцтва ў гэты час быў пераважна вынікам сістэмы абмежавальных законаў адносна яўрэяў. Сярод стымулаў, якія абумоўлівалі эканамічнае развіццё гарадскіх паселішчаў, істотных змен у канцы XVIII – першай палове XIX ст. не адбылося. Урбанізацыя ў гэты перыяд не стала адной з асноўных рыс развіцця грамадства, гарадскі рынак абслугоўваў у асноўным толькі гарадскія патрэбы, гарадская эканоміка не прэтэндавала на вядучае месца ў эканамічным жыцці Беларусі [4, с.132.]. Больш паспяхова урбанізацыйныя працэсы праходзілі ў парэформенны перыяд, асабліва ў канцы XIX – пачатку XX ст. З 1863 г. па 1913 г. колькасць гараджан узрасла з 350,8 тыс. да 983,3 тыс. (у 2,8 разы) [2, с. 58.]. Ступень урбанізацыі ў Беларусі змянялася наступным чынам: 1796 г. – 3,5 %; 1861 г. – 10 %; 1863 г. – 10,4 %; 1885 г. – 11,9 %; 1897 г. – 10,1 %; 1913 г. – 11 %. [2, с. 59.]. Для параўнання: у 1913 г. у цэлым па Расійскай імперыі доля гараджан у структуры ўсяго насельніцтва складала 14,4 %; у Англіі – каля 50 %; Нідэрландах – 36 %; Францыі – 20 %; Германіі – 16 % [5, с. 209.]. Звяртае на сябе ўвагу той факт, што з 1885 па 1913 год удзельная вага гараджан у беларускім краі памяншалася: адбывалася дэурбанізацыя. Аднак значная частка неземляробчага насельніцтва канцэнтравалася ў мястэчках, але да гараджан яно афіцыйнай статыстыкай не залічвалася. Па падліках А.Лютага, у мястэчках Беларусі ў канцы XVIII ст. налічвалася каля 105 тыс. чалавек свабодных саслоўяў, а ў 50-я гады XIX ст. – каля 208 тыс. [3, с. 45.]. Лічбы, што прыводзяцца ў працы З.Шыбекі, датычаць колькасці ўсіх жыхароў мястэчак: у 1863 г. – 297 тыс., 1904 – 1909 г. – 593 тыс. [2, с. 217.]. Калі да афіцыйна ўлічанага гарадскога насельніцтва дадаць колькасць жыхароў буйных мястэчак (з насельніцтвам больш 2 тыс. чал.), то ўдзельная вага гарадскога насельніцтва ў беларускім краі складзе ў 1863 г. 13,1 %, у 1897 г. – 14 %, 1913 г. – 15,9 % [2, с. 60.]. Значыць, з улікам мястэчак у Беларусі працэс урбанізацыі адбываўся больш інтэнсіўна і бесперапынна.

Агульныя тэндэнцыі ў дынаміцы гарадскога насельніцтва складваліся з цэлай гамы прыкладаў развіцця асобных гарадоў. Асабліва высокімі тэмпамі росту колькасці насельніцтва ў першай палове XIX ст. вылучаліся Брэст (на 1112 %); Ліда (на 695 %); Пружаны (на 664 %); Бабруйск (на 658 %); Слонім (на 623 %); Гродна (на 406 %); Кобрын (на 387 %); Ваў-

кавыск (на 342 %); Навагрудак (на 398 %); Магілёў (на 392 %) [3, с. 36.]. У канцы XVIII ст. да буйных гарадоў з колькасцю насельніцтва больш 10 тыс. чал. адносіўся толькі Віцебск. У 1861 г. буйных гарадоў было ўжо 9: Віцебск, Полацк, Гродна, Брэст, Мінск, Бабруйск, Пінск, Магілёў, Гомель. У другой палове XIX ст. – пачатку XX ст. фенаменальны рост паказаў Гомель: на 797,6 %. У 1913 г. Гомель побач з Мінскам і Віцебскам увахадзіў у тройку буйнейшых беларускіх гарадоў – з насельніцтвам больш 100 тыс. чал. Да групы буйных гарадоў з насельніцтвам ад 40 да 100 тыс. чал. належалі Гродна (61,6 тыс. чал.), Брэст (57,3 тыс. чал.), Магілёў (54,2 тыс. чал.), Бабруйск (45,3 тыс.чал.) [2, с. 219 – 220.].

Урбанізацыя мела рэгіянальныя асаблівасці. Выявіць удзельную вагу гараджан сярод усяго насельніцтва ў розных губернях беларускага краю дазваляюць матэрыялы перапісаў насельніцтва ў Расійскай імперыі і інш. статыстычныя звесткі. Па падліках А.Лютага, ступень урбанізацыі па губернях на канец XVIII – пачатак XIX ст. выглядала наступным чынам: Віленская губерня – 4 %; Віцебская – 6,9 %; Мінская – 3,3 %; Магілёўская – 3,4 %; Гродзенская – 1,9 %. Гэты ж паказчык на 1861 г. выглядае паіншаму: Віленская губерня – 4,3 %; Віцебская – 16,6 %; Мінская – 9,2 %; Магілёўская – 10,5 %; Гродзенская – 10,7 % [3, с. 39.]. Паводле матэрыялаў Першага Усерасійскага перапісу насельніцтва 1897 г., жыхары гарадоў у Віцебскай губерні складалі 14,49 % ад агульнай колькасці насельніцтва, Мінскай – 10,5 %, Магілёўскай – 8,7 %, Гродзенскай – 15,88 % [6, с. 39.]. Такім чынам, найбольшыя поспехі ва урбанізацыйных працэсах у XIX ст. зрабіла Гродзенская губерня: ступень урбанізацыі на працягу стагодзя тут павялічылася з 1,9 % да 15,88 %.

Выявіць і прааналізаваць іншыя рэгіянальныя асаблівасці урбанізацыі ў Беларусі можна з дапамогай матэрыялаў гандлёва-прамысловага перапісу 1900 г. па эканамічным раянаванні Еўрапейскай Расіі, якія былі апублікаваныя міністэрствам гандлю і прамысловасці ў пачатку XX ст. [7]. Гэта крыніца дазваляе вызначыць зоны (арэалы) гандлёвага ўплыву гарадоў. Натуральна, што за гандлёвым уплывам ішлі прамысловы, палітычны, культурны. На падставе дадзеных гандлёва-прамысловага перапісу 1900 г. З.Шыбека ўстанавіў, што да канца XIX ст. на тэрыторыі сучаснай Беларусі склалася пяць эканоміка-геаграфічных сістэм гарадоў: 1. Паўночная: Віцебск, Полацк, Дзісна, Друя, Дрыса, Лепель, Гарадок, Сянно, Відзы, Сураж. 2. Усходняя: Магілёў, Орша, Горкі, Копысь, Быхаў, Чавусы, Чэрыкаў, Мсціслаў, Клімавічы, Бабінавічы. 3. Паўднёвая: Гомель, Пінск, Рагачоў, Рэчыца, Мазыр. 4. Заходняя: Гродна, Брэст, Кобрын, Пружаны, Слонім, Ваўкавыск, Ліда, Ашмяны, Навагрудак. 5. Цэнтральная: Мінск, Бабруйск, Барысаў, Вілейка, Радашковічы, Докшыцы, Ігумен, Слуцк, Нясвіж [2, с. 73.].

Захад выдзяляўся павышанай канцэнтрацыяй гараджан: займаў першае месца па гэтаму паказчыку ў 1863 г. і ў 1913 г., другое месца пасля цэнтра – у 1885 г. і 1897 г. У 1913 г. захад сканцэнтраваў 24,4 % усяго

гарадскога насельніцтва Беларусі; цэнтр – 23,6 %; поўнач – 19,2 %; поўдзень – 19 %; усход – 13,8 % [2, с. 218.].

Захад і цэнтр Беларусі вылучаліся і шчыльнай сеткай мястэчак. Па звестках А.М.Карпачова, у другой палове XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі налічвалася 398 мястэчак (ва ўсходняй частцы (да 1772 г.) – 81, на захадзе і ў цэнтры (у пачатку 1790-х г.) – 317 [8, с. 108.]. У заходнім і цэнтральным рэгіёнах было сканцэнтравана больш паловы мястэчак гарадскога тыпу (мелі больш 500 жыхароў і пераважна неземляробчы характар). У заходнюю эканоміка-геаграфічную сістэму гарадоў уваходзілі 44 мястэчкі гарадскога тыпу ці 31,4 % ад іх агульнай колькасці ў 1900 г., у цэнтральную – 31 (22,2 %), усходнюю – 24 (17,1 %), паўднёвую – 22 (15,7 %) і паўночную – 19 (13,6 %) [2, с. 218.]. Значыць, найбольшыя поспехі працэс горадаўтварэння на базе мястэчак меў на захадзе і ў цэнтры.

Рэгіянальныя асаблівасці мела эканамічная тыпалогія гарадоў і мястэчак Беларусі ў разглядаемы перыяд. Прамысловая функцыя гарадоў пераважала сярод гарадоў захаду, цэнтра і поўдня Беларусі, гандлёвая – сярод паўночных гарадоў. Найбольшай аграрнасцю вылучаліся гарадскія цэнтры на ўсходзе. Калі за аснову раянавання прыняць распаўсюджанасць функцыянальнай дамінанты тагачаснага горада – прамысловасць, то выразна вылучаюцца паўднёва-заходні рэгіён з 24 прамыслова-гандлёвымі гарадамі і паўночна-ўсходні рэгіён з 20 непрамысловымі аграрна-гандлёвымі гарадамі [2, с. 75, 78.]. Эканамічная арыентацыя мястэчак таксама мела свае рэгіянальныя асаблівасці. На захадзе, у цэнтры і на ўсходзе яны больш паспяхова набывалі прамысловы характар. Доля прамысловых мястэчкаў была найбольшай на ўсходзе, дзе яны кампенсавалі аграрнасць афіцыйных гарадоў. Найвялікшай удзельнай вагай гандлёва-прамысловых мястэчак вылучаўся захад Беларусі. Гандлёвых мястэчкаў найбольш было на поўначы і поўдні, дзе такая асаблівасць абумоўлівалася камунікацыйнымі цяжкасцямі азёрнага і палескага раёнаў.

Аналіз грузаабаротаў гарадоў Беларусі ў парэформенны перыяд сведчыць аб тым, што толькі ў гарадах захаду і цэнтра прывоз тавараў пераважаў над іх адпраўленнем. Калі гарады поўдня, поўначы і ўсходу спецыялізаваліся на зборы і адпраўцы сельскагаспадарчых прадуктаў, то гарады захаду і цэнтра на дастаўцы і размеркаванні прамысловых тавараў. А гэта сведчыла аб большай капіталізацыі захаду і цэнтра, а таксама аб больш інтэнсіўным росце ў гэтых раёнах гарадоў. У басейнах Дняпра, Прыпяці і Заходняй Дзвіны з-за пашыранага ляснога гандлю развіццё прамысловасці і урбанізацыя ў нейкай ступені стрымлівалася. Грашовыя сродкі і людскія рэсурсы адцягваліся на распрацоўку і транспарціроўку лясных багацяў [2, с. 121.].

Матэрыялы гандлёва-прамысловага перапісу 1900 г. дазваляюць разглядзець і такі паказчык, як мера рассейвання прамысловых і гандлёвых капіталаў, што паказвае ступень разнастайнасці гандлёва-прамысловай дзейнасці ў паселішчах Беларусі. На поўначы ні гарады, ні мястэчкі не пераўзыходзілі звычайныя сельскія паселішчы па структурнай разнастай-

насці мясцовай прамысловасці. Блізкасць буйных прамысловых цэнтраў Пецярбурга і Рыгі паралізавала развіццё шматгаліновай прамысловасці паўночных гарадоў. Выключэнне складаў Віцебск. На захадзе мясцовая прамысловасць таксама зазнавала ўплыў звонку, у асноўным з боку польскага прамысловага раёна. Аднак даўнія традыцыі прадпрымальніцтва дазвалялі заходнім гарадам Беларусі стаць на шлях спецыялізацыі прамысловай вытворчасці (Гродна – тытунёвая галіна, Брэст – папераапрацоўчая). Прамысловасць такіх гарадскіх цэнтраў вылучалася галіновай аднастайнасцю. Мера рассейвання прамысловых капіталаў зніжалася. На захадзе яна была самай нізкай сярод беларускіх гарадоў. Паколькі гарадская прамысловасць заходняга рэгіёна арыентавалася на ўсерасійскі рынак, задавальненне патрэб мясцовага сельскага насельніцтва бралі на сябе негарадскія прамысловыя цэнтры. Таму значнасць заходніх гарадоў на лакальным прамысловым рынку была нізкай, а астатніх населеных пунктаў – адносна высокай. Самы высокі паказчык структурнай складанасці гарадской прамысловасці існаваў у цэнтры Беларусі, тут была самая цесная сувязь гарадской прамысловасці з патрэбамі сельскага насельніцтва і сельскагаспадарчай вытворчасці. Падобная сітуацыя назіралася і на беларускім поўдні. Цэнтральны і паўднёвы рэгіёны адчувалі меншы ўплыў прамысловых цэнтраў Расіі. Прамысловая вытворчасць цэнтральных і паўднёвых гарадоў мела для сельскага спажыўца вырашальнае значэнне, таму гарадская вытворчасць атрымала больш усебаковае развіццё. Прамысловасць гарадоў усходняй Беларусі таксама працавала на мясцовы рынак. Але яе патэнцыял у бесчыгуначным раёне не мог быць высокім, мясцовыя гарады не спраўляліся з задачай забеспячэння сельскіх жыхароў прамысловымі вырабамі. На дапамогу прыходзілі мястэчкі. Мера рассейвання прамысловых капіталаў усходнебеларускіх мястэчак была самай высокай у Беларусі, што сведчыць аб трываласці іх эканамічных сувязяў з вёскай [2, с. 121.].

Неабходна звярнуць увагу на асаблівасці нацыянальнага складу гараджан розных раёнаў Беларусі. Першы Усерасійскі перапіс насельніцтва 1897 г. зафіксаваў тэндэнцыю памяншэння прадстаўніцтва беларускага этнасу сярод гараджан у напрамку з усходу на захад: Магілёўская губерня – 30 %; Віцебская – 13,3 %; Мінская – 12 %; Гродзенская – 9 %; Віленская – 7,6 % [2, с. 185.]. Такую ж тэндэнцыю мела і прадстаўніцтва беларусаў сярод гарадской інтэлігенцыі. Гарады усходняй Беларусі (Магілёўская, Віцебская губерні) вылучаліся павышанай доляй, як правіла, праваслаўнай беларускай інтэлігенцыі, пераважна святароў. Аднак нацыянальнае адраджэнне беларусаў ініцыявала каталіцкая інтэлігенцыя шляхецкага паходжання, якая канцэнтравалася ў гарадах цэнтра і захаду, што тлумачыцца інертнасцю праваслаўнай беларускай інтэлігенцыі, іх культурнай арыентацыяй на Расію.

Рэгіянальныя асаблівасці назіраліся і ў знешнім абліччы гарадскіх паселішчаў Беларусі. Напрыклад, найвышэйшы паказчык каменнай забудовы (ад 40 да 47 %), паводле дадзеных за 1910 г., назіраўся ў Гродне,

Брэсце і Лідзе [9, с. 368.]. Паводле планіроўкі і забудовы выразна розніліся паміж сабой мястэчкі заходняга і ўсходняга рэгіёнаў Беларусі. Мястэчкі заходніх раёнаў Беларусі вылучаліся большай шчыльнасцю тэрытарыяльнага размеркавання, больш развітым цэнтрам з багатым наборам пабудоў, большым працэнтам мураванай забудовы. Заходнебеларускім мястэчкам былі таксама ўласцівыя складаная, шматвулічная структура, значная роля сектара мясцовай вытворчасці. У забудове мястэчак заходняга рэгіёна Беларусі адчуваецца ўплыў заходнееўрапейскай горадабудаўнічай культуры [10, с. 143 – 149.].

У цэлым, адзначаныя асаблівасці развіцця гарадоў розных рэгіёнаў Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. дазваляюць зрабіць выснову, што урбанізацыя найбольш паспяхова праходзіла на захадзе і ў цэнтры Беларусі.

Літаратура і крыніцы

1. Сайко Э.В. Урбанизация – явление и процесс исторического развития // Урбанизация в формировании социокультурного пространства. – М., 1999.

2. Шыбека З.В. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.). – Мн., 1997.

3. Лютый А.М. Социально-экономическое развитие городов Беларуси в конце XVIII – первой половине XIX в. – Мн., 1987.

4. Кіштымаў А.Л. Гарады і мястэчкі // Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.). – Мн., 2005.

5. От аграрного общества к государству всеобщего благосостояния. Модернизация Западной Европы с XV в. до 1980-х гг. – М., 1998.

6. Первая всеобщая перепись населения Росийской империи 1897 г. – СПб., 1903. – Т. V. Витебская губерния. – С. IV; Т. XI. Гродненская губерния. – С. V; Т. XXII. Минская губерния. – С. VI; Т. XXIII. Могилевская губерния. – С. IV.

7. Торговля и промышленность Европейской России по районам. Вып. II, XI, XII. – СПб., 1904 – 1909.

8. Карпачёв А.М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии во второй половине XVII – XVIII в.: Дис... д-ра ист. наук. – Мн., 1969.

9. Кіштымаў А.Л. Пачатак індустрыялізацыі. Урбанізацыйныя працэсы // Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.). – Мн., 2005.

10. Лакотка А.І. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры. – Мн., 1999.

Н.Б. Нестерович, Институт истории НАНБ

ХАРАКТЕР ЗАПАДНОБЕЛОРУССКОЙ ЭКОНОМИКИ В 1921–1939 гг.

В 1913 г. в Беларуси, которая являлась частью Российской империи, примерно 59 % национального дохода производилось в капиталистическом секторе экономики. Остальная часть произведенного национального дохода приходилась на мелкотоварный и патриархальный (натуральный)

уклады [10, с. 10-11]. В период нахождения западнобелорусских земель в составе Польши в 1921–1939 гг. ведущая роль капиталистического уклада в их экономике, как и всей польской экономики, продолжала возрастать. На это были направлены все хозяйственные преобразования, проводимые польским правительством, прежде всего в сельском хозяйстве, где развитие капитализма тормозилось наличием крупного помещичьего землевладения, консервировавшего в определенной мере феодальные производственные отношения.

Проведенные аграрные реформы ограничили помещичье землевладение. В белорусских воеводствах Польши (Белостокском, Виленском, Новогрудском и Полесском) оно за 1921–1929 гг. сократилось примерно на 13 %, а в 30-е годы – еще на 3,7 % [12 с. 252]. В результате некоторого уменьшения помещичьего землевладения и существенного увеличения землевладения сельской буржуазии были созданы условия для более быстрого развития капитализма в сельском хозяйстве. Однако оно по-прежнему тормозилось хотя и сократившимся, но остававшимся весьма значительным помещичьим землевладением, которое, как и ранее, порождало земельный голод в бедняцких хозяйствах, число которых еще больше возросло. Если в 1921 г. бедняки составляли 62 %, середняки – 30 %, зажиточные хозяева – 8 % западнобелорусского крестьянства, то к середине 30-х годов – соответственно 78–80 %, 15–17 % и 5 % [12, с. 254].

Нараставшее обеднение западнобелорусской деревни негативно сказывалось не только на развитии производительных сил в сельском хозяйстве, но и на общеэкономическом развитии западнобелорусского региона, поскольку подавляющее большинство (82,7 % в 1921 г.) населения здесь было занято в аграрном секторе экономики. Промышленность занимала небольшое место в структуре экономики края. Составляя 24 % территории и 13 % населения Польши, он давал лишь около 3 % всей промышленной продукции страны [11, с.197; 12, с. 243].

По мировым меркам, Вторая Речь Посполитая являлась государством со средним уровнем развития капитализма. Однако в 1921–1939 гг. существенно изменились внешние условия развития польской экономики. В результате усиления конкурентной борьбы большинство экономических связей с землями бывшей Австро-Венгрии и Германией, объявившей Польше таможенную войну, было разорвано. По политическим мотивам фактически полностью потерян рынок бывшей Российской империи (в 1938 г. доля СССР во внешнеторговом обороте Польши составляла менее 0,5 %). Данные обстоятельства значительно ограничивали возможности ориентированных на экспорт отраслей польской экономики. К этому добавлялись узость внутреннего рынка, вытекавшая из аграрного характера региона, сложность процесса формирования единого хозяйственного механизма страны из экономики территорий, входивших на протяжении длительного времени в состав различных государств [4, с. 162, 163, 170, 171, 248, 249, 264, 375; 6, с. 263; 9, с. 79, 80]. Все это определило неравномерность, цикличность развития как западнобелорусской, так и всей польской экономики: на смену периодам подъема приходили периоды спада, деп-

рессии, кризиса. В итоге к началу второй мировой войны общий объем промышленного производства в западнобелорусских землях, как и в Польше в целом, так и не достиг уровня 1913 г., а сельскохозяйственного – лишь незначительно превзошел его [4, с. 163, 352, 367; 7, с.13; 12, с. 244-249, 255-256]. В течение 1921-1939 гг. польская экономика топталась на месте, тогда как, например, Англия в 1937 г. увеличила производство промышленной продукции по сравнению с 1913 г. на 22 %, Германия – на 29 %, США – на 57 % [1, с. 10]. Польша так и не смогла подняться выше среднего уровня развития. В 1935 г. свыше 90 % рабочих зарабатывали меньше установленного правительством прожиточного минимума, составлявшего для рабочей семьи около 60 злотых в неделю. Это средние для всей Польши цифры. Положение западнобелорусских рабочих было еще хуже, поскольку заработная плата их была значительно меньшей, чем в экономически более развитых центральных (этнических) районах Польши. В августе 1937 г. средний недельный заработок рабочего Варшавского воеводства составлял 32,8 злотого, Полесского – 17,8, Новогрудского – 13,3 злотого. Разница в заработной плате доходила до 64 %. Уровень потребления в Польше был невысоким, а в западнобелорусских землях еще ниже. Если в 1934 г. потребление сахара во всей Польше составило 8,94 кг, а в центральных воеводствах 10,2, то в западнобелорусских – 4,31 кг, металла – соответственно 5,17, 4,05, 1,59 кг, угля – 383,1, 340,9, 21,8 кг [8].

Таким образом, развиваясь в 1921–1939 гг. по капиталистическому пути, экономика западнобелорусского региона сохраняла существенные остатки феодальных отношений, являлась преимущественно аграрной, что вместе с неблагоприятной для всей польской экономики внешней и внутренней коньюнктурой обусловило крайне медленные темпы, застойно-депрессивный тип ее развития, существенное отставание от среднеразвитой экономики Польши и тем более – высокоразвитых капиталистических стран, низкий уровень жизни большей части проживающего здесь населения. Другими словами, она в течение всего этого периода имела черты, характерные для отсталых, зависимых государств. Сегодня историки по-прежнему единодушны в этом.

Вместе с тем некоторые из них пытаются разрушить взгляды о колониальном или полуколониальном положении западнобелорусского региона в период его нахождения в составе Польши. В частности, стремятся доказать, что «польское правительство не имело в отношении промышленности Западной Беларуси, как и страны в целом, продуманной экономической политики и придерживалось принципов свободного предпринимательства, реагируя только финансовой политикой на изменение рынка». Элементы государственного вмешательства в развитие промышленности, планирования этого развития имели место только в 1936 году (так называемый план Э.Квятковского).

Слабость западнобелорусской промышленности и сельского хозяйства являлась следствием отсутствия на территории региона денежных средств, достаточных для их развития. Не было денег и у польского правительства «по причинам в первую очередь экономическим: необходи-

мость развития центральных промышленных районов, где существовали лучшие условия – сложившаяся инфраструктура, наличие денежных средств, близость к внутренним и внешним рынкам» [9, с. 79, 80].

Частично с такими утверждениями можно согласиться, однако главную роль в тяжелом экономическом положении «восточных кресов», отставании их экономики от экономики этнической Польши, на наш взгляд, играли не объективные законы рынка и конкуренции, а вполне «продуманная» политика польских властей, которые рассматривали аннексированные западнобелорусские земли прежде всего и в основном как сырьевой придаток экономически более развитой Центральной Польши и сознательно ограничивали их развитие.

Именно сознательно, о чем свидетельствуют многочисленные конкретные ограничительные мероприятия польского правительства в отношении западнобелорусской промышленности. Например, в 1930 г. сумма государственных кредитов, выданных Польским банком в среднем на одно предприятие Виленского и Новогрудского воеводств, была в 4,1 раза меньше, чем на одно предприятие в самой Польше [12, с. 249]. Польское правительство преднамеренно сворачивало те отрасли промышленности западнобелорусского региона, которые могли подорвать монопольное положение польских производителей на местном рынке. В этих целях оно, например, запретило строить здесь какие-либо промышленные предприятия без специального на то разрешения военного ведомства, установило на государственных железных дорогах, с одной стороны, льготные тарифы на вывоз из западнобелорусских воеводств сырья и ввоз промышленных товаров, с другой – высокие тарифы на вывоз готовых изделий и ввоз сырья и топлива [2, с. 13; 11, с. 198]. В немалой степени поэтому тяжелая промышленность не получила в Западной Беларуси развития и фактически отсутствовала. Западнобелорусская экономика была сориентирована польскими властями преимущественно на добычу и переработку сырья и сельхозпродукции, а не на производство промышленных товаров.

На протяжении всего межвоенного периода польские официальные лица сами признавали, что правительственная политика нацелена на ограничение экономики западнобелорусского края. В 1929 г. директор департамента промышленности и торговли Виленского округа, характеризуя политику правящих кругов в Западной Беларуси, констатировал, что «властными структурами государства не сделано ничего, чтобы оживить хозяйственную деятельность «восточных кресов», наоборот, делается все для того, чтобы окончательно ее разрушить» [5, с.19]. Даже когда 5 декабря 1935 г. вице-премьер польского правительства Э.Квятковский заявил о необходимости оживления западнобелорусской экономики для подъема польской промышленности, несерьезность этих намерений и формальность данного заявления были настолько очевидны, что сразу же вызвали иронические отзывы официальной прессы.

Например, «Варшавскі дзеннік народовы» 10 декабря 1935 г. писал: «Мы сделали открытие, что в наших границах существуют две Польши – «А» и «Б», городская и деревенская, западная и восточная, сильно отли-

чающиеся одна от другой в смысле капиталовложений, потребления, структуры всей жизни и т.д. Эти две части при некоторых условиях могли бы прекрасно дополнять одна другую, нужно только в Польше «Б» соответствующим образом похозяйничать. Это повлечет за собой инвестиционные расходы, но ведь каждая колония требует вложений раньше, чем она начнет давать прибыль» [3., с. 4]. Комментарии, как говорится, излишни. Еще тогда вещи и явления назывались своими именами.

Литература и источники

1. Большая Советская Энциклопедия. Т. 11. – М., 1952.
2. Егоров Г. Западная Белоруссия. – М., 1939.
3.Информационный бюллетень по изучению Западной Белоруссии, АН БССР.
4. История Польши. В 3 т. Т. 3. – М., 1958.
5. Коўкель І.І. Эканамічнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы (1921-1939 гг.) // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы міжнар. навук. – тэарэт. канф. 17-18 верасня 1999 г., Мінск. – Мн., 2000.
6. Краткая история Польши. – М., 1993.
7. Наркевич С.И. Промышленность Западной Белоруссии в период белопольской оккупации (1920-1939 гг.): Автореф. дис.... канд. экон. наук. – Мн., 1965.
8. Несцяровіч М.Б. Заходняя Беларусь: жыцце без прыхарошвання // Звязда. 2003. 17 верасня.
9. Нечухрын А.М., Васюк Г.У., Ганчароў М.М., Караў Д.У., Коўкель І.І., Кручкоўскі Т.Т., Федараў І.А. Этнасацыяльныя і палітычныя працесы ў заходнім регіене Беларусі ў 1921-1939 гг. // Этнасацыяльныя і культурныя працэсы ў заходнім регіёне Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы рэсп. навук. канф. 5-6 снежня 1997 г., / Пад рэд. І.П.Крэня. – Гродна. ГрДУ, 1998.
10. Социально-экономические преобразования в Белорусской ССР за годы Советской власти. – Мн., 1970.
11. Экономика Советской Белоруссии. 1917-1967. – Мн., 1967.
12. Экономическая история Беларуси. – Мн., 2004.

А.Ф. Вырастка, ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

ВЫПРАЦОЎКА ЗАКАНАДАЎСТВА АБ АСАДНІЦТВЕ Ў II РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ І ЯГО РЭАЛІЗАЦЫЯ

Палітыка асадніцтва ў сучаснай гістарычнай навуцы характарызуецца як сацыяльна-эканамічная і грамадска-палітычная рэформа II Рэчы Паспалітай. Аналізуючы гістарыяграфію праблемы, яскрава бачна, што на працягу 30–80-х гадоў XX стагоддзя ў айчыннай гістарычнай навуцы дадзеная палітыка падавалася выключна як грамадска-палітычная з'ява з ўлікам адсутнасці характарыстыкі заканадаўства рэформы. Сучасная гіста-

рычная навука фармулюе новыя падыходы да праблемы, што звязана з даследаваннямі генезіса палітыкі асадніцтва ў рамках эканамічнага заканадаўства. Ініцыятыва і распрацоўка рэформы прыпадае на перыяд польска-савецкай вайны 1919-1920, а арганізацыя і рэалізацыя звязана з перыядам 1921 – 1939 гг. Ініцыятыва па правядзенню палітыкі асадніцтва належала да ліку ваенных, і выражалася ў жаданні прыцягнуць у шэрэнгі ваенных большую колькасць грамадзянскага насельніцтва.

Першы этап заканадаўчага разгляду асадніцтва звязаны з рэфармаваннем усёй сістэмы землекарыстання і землеўладання ў дзяржаве і адносіцца да «аграрнай рэформы» ад 10 ліпеня 1919 года. У аснове вызначанага закона ляжаў праект парцэляцыі, які прадугледжваў са «свабодных зямель», заставаўшыхся без гаспадароў, стварыць зямельны фонд. Землі гэтага фонду падлягалі разбіўцы на парцэлы, якія прадназначаліся для свабоднай распрадажы насельніцтву [7, с.59]. Апошнім артыкулам быў вызначаны аспект у адносінах да салдат польскай арміі, а таксама да беззямельных і батракоў, які вызначаўся ў нарэзцы зямлі. Аднак пры гэтым не былі вызначаны палажэнні па сістэме зямельнай нарэзкі, структуры дзялення, крытэрыі кандыдата. Дадзеная «аграрная рэформа» насіла толькі дэкларатыўны характар, яе рэалізацыі не адбылося. Такая палітыка прывяла да недаверу сярод насельніцтва, пачалося дэзерцірства ў арміі [6, с.19].

У гэты перыяд вярхоўнае ваеннае камандаванне распрацоўвала план наступальнай аперацыі, і неабходна была правесці мабілізацыю ваенных для далейшага ходу ваенных дзеянняў. З прычыны гэтага было ўзнята пытанне аб палітыцы асадніцтва. Менавіта гэтая мера павінна была актывізаваць «патрыятычны дух» для далейшага ходу ваенных дзеянняў. У сакавіку 1920 г. пад эгідай галоўнага зямельнага упраўлення прайшла канферэнцыя, прысвечаная пытанню асадніцтва, на якой былі разгледжаны розныя праекты дадзенай палітыкі [13, с.19]. У сваіх артыкулах яны звярталіся да насельніцтва з заклікам папоўніць шэрэнгі польскай арміі. Вясной 1920 г. колькасць ваенных складала прыкладна 300 тыс. чалавек [2, с.119]. Наступленне польскай арміі з 25 красавіка 1920 года на ўкраінскім накірунку завяршылася контрнаступленнем Чырвонай Арміі, якое пачалося 4-5 ліпеня 1920 г. У склаўшайся ваенна-палітычнай сітуацыі кіраўніцтва II Рэчы Паспалітай узяло курс на выкананне асноўных патрабаванняў насельніцтва (у першую чаргу зямельнага пытання) [1, с.35] Сітуацыя ў арміі адзначалася наступнымі словамі: «заставалася мінімум дабраахвотнікаў і максімум рэкрутаванных сялян» [7, с.63].

У гэтых умовах сейм 15 ліпеня 1920 г. без абмяркавання прыняў аграрны закон, які ўтрымліваў асноўныя палажэнні закона ад 10 ліпеня 1919 года. Згодна з гэтым законам ствараўся дзяржаўны зямельны фонд, які ўключаў землі як дзяржаўныя, так і прыватныя, апошнія шляхам выкупу. Прымусоваму выкупу падвяргаліся гаспадаркі памерам больш 60 га, якія знаходзіліся паблізу прамысловых цэнтраў. Гаспадаркі, якія знаходзіліся на прускай і ва ўсходняй частках Рэчы Паспалітай, не павінны

былі прывышаць 400 га. На тэрыторыі самой Польшчы гаспадаркі па памеру не павінны былі быць больш 180 гектараў [8, с.1230]. Да іх у асноўным адносіліся прыватныя маёнткі, набытыя падчас першай сусветнай і польска-савецкай войн, гаспадаркі не маючыя юрыдычнага афармлення, і іншыя. Уласнікі гаспадарак, якія падвяргаліся прымусоваму выкупу мелі права захаваць толькі адзін забудаваны фальварак, на якім пражывала сям'я [11, с.1231].

У артыкуле 4 закона «Аб выкананні аграрнай рэформы» адзначалася, што вышэй пералічаная ўласнасць, у тым ліку і належачая дзяржаве, пераходзіць праз аграрнае міністэрства і міністэрства дзяржаўных маёмасцей да галоўнага зямельнага ўпраўлення з мэтай парцэляцыі і асадніцтва. Такім чынам, аграрны закон ад 15 ліпеня 1920 г. ў артыкуле №4 змяшчаў заканадаўчае афармленне асадніцтва [8, с.1231].

План парцэляцыі быў ахарактарызаваны ў артыкуле 27-м закона. Сутнасць яго зводзілася да дзялення ўсяго зямельнага фонду на гаспадарчыя адзінкі, якія маглі забяспечыць інтэнсіўную вытворчасць у выніку стварэння новых моцных гаспадарак, а таксама шляхам дабаўлення – павялічэння малых гаспадарак. Пры гэтым адзначалася, што памер адной такой гаспадаркі не можа прывышаць 15 га, а малазямельныя могуць быць павялічаны да 23 га на тэрыторыі Польшчы, а на «крэсах усходніх» да 45 га. Набываць зямельныя надзелы маглі ўсе грамадзяне Польшчы. Выключэнне складалі толькі тыя асобы, якія былі задзейнічаны ў справах супраць дзяржавы і з'яўляліся дэзерцірамі польскай арміі. Аднак, згодна артыкулу 29, першынства ў набыцці зямлі, аддавалася інвалідам польскай арміі, здатным да працы на зямлі, а таксама салдатам польскай арміі, якія доўгі час служылі на франтах або дабравольна прыступілі да нясення ваеннай службы [8, с.1235]. Салдаты і інваліды польскай арміі атрымоўвалі шэраг ільгот пры набыцці зямлі ў параўнанні з іншымі катэгорыямі насельніцтва, для іх ствараўся спецыяльны крэдытны фонд, які спецыялізаваўся на выданні доўгатэрміновых працэнтных крэдытаў з іпатэчным забеспячэннем [8, с.1237].

Цана зямельнага надзелу згода артыкулу 33 залежала ад якасці глебы, ад класіфікацыі гаспадаркі, ад кошту будынкаў, прадукцыйнага значэння зямлі, а таксама распалажэння ў адносінах да транспартных шляхоў і рынкаў збыту. Ацэнка зямельных надзелаў і ўстанаўленне цаны продажу была аднолькавая для ўсіх катэгорый пакупнікоў.

Такім чынам, першапачаткова палітыка асадніцтва распрацоўвалася ў рамках парцэляцыйнай рэформы. Асаднікі павінны былі падпарадкоўвацца агульным палажэнням закона разам з сялянамі, за выключэннем першынства ў набыцці зямлі і асобнай сістэмы крэдытавання для заслужаных салдат. Аграрны закон ад 15 ліпеня 1920 г. заклаў аснову для арганізацыі палітыкі асадніцтва. Палажэнні гэтага закона ляглі ў аснову закона ад 17 снежня 1920 года. Многія польскія палітыкі ўспрымалі закон «Аб надзяленні зямлёй салдат польскай арміі як выкананне аграрнай рэформы.

Каб прыдаць яшчэ большае значэнне палітыцы асадніцтва, 6 жніўня 1920 г. была выдадзена адозва «Да народнай арміі» праз старшыню Савета міністраў Польшчы Вінцэнта Вітаса. У ёй адзначалася, што «салдаты, якія доўгі час былі на фронце, або дабравольна ўступілі ў шэрагі вайскоўцаў, па заканчэнню ваенных дзеянняў атрымаюць у першую чаргу ў параўнанні з астатнімі зямлю, аб чым выразна сведчыць аграрная рэформа». І ў гэтым жа звароце дабаўлялася, што заслужаныя салдаты атрымаюць зямлю бясплатна. [12, с.19]. Восенню 1920 г. пытанне асадніцтва стала адным з асноўных і найбольш актуальных як у сейме, так і ў парламенцкіх клубах палітычных партый. Кіраўніцтва II Рэчы Паспалітай прапанавала 15 кастрычніка 1920 г. праект аб надзяленні салдат зямлёй. У сямі артыкулах закона былі сфармуляваны асноўныя палажэнні рэформы. Цэнтральнае месца ў іх займаў зямельны фонд і сістэма надзялення салдат зямлёй. Значная зацікаўленасць праяўлялася да палітыкі асадніцтва ў Юзэфа Пілсудскага, які бачыў у гэтым працэсе «забеспячэнне мяжы на ўсходзе» [5, с.12]. Вінцэнт Вітас неаднаразова веў перамовы па праблеме асадніцтва з Юзэфам Пілсудскім, падзяляў яго погляды і прыкладваў усе намаганні, каб правесці закон праз сейм і яго рэалізаваць.

Старшыня Савета міністраў Вітас 4 лістапада 1920 г. прадставіў маршалку сейма праект двух ўзаемазвязаных законаў: першы датычыўся прыняцця зямлі ва ўласнасць дзяржавы ў шэрагу паветаў, якія знаходзіліся па-за Бугам; другі акрэсліваў сістэму надання зямлі заслужаным ваенным. Праекты законаў былі разгледжаны на пасяджанні сейма 10 лістапада 1920 г. і былі перададзены камісіі па аграрных справах, якая прыняла рашэнне разглядаць закон як «выкананне аграрнай рэформы». 9 снежня 1920 г. адбылося другое чытанне па асадніцтву ў сейме, а на трэцім чытанні, якое праходзіла 17 снежня 1920 г. адбылося прыняцце законапраекта [5, с.20]. Галоўная прычына такога хуткага працэсу прыняцця закона заключалася ў заканчэнні ваенных дзеянняў і дэмабілізацыі ваенных. Са жніўня 1920 г. пачаліся мірныя перамовы паміж Польшчай і Савецкай Расіяй, а 12 кастрычніка 1920 г. быў падпісаны першапачатковы варыянт мірнага дагавору. Перад кіраўніцтвам дзяржавы стала праблема сацыяльна-эканамічнага развіцця Польшчы. [13, с.384]. Многія салдаты былі прызваны ў армію яшчэ ў жніўні 1914 года. Гэта былі ў асноўным людзі маладога ўзросту. Большасць з іх не паспела яшчэ атрымаць прафесіі. А тыя салдаты, якія да вайны мелі занятак у гандлёва-рамеснай сферы дзейнасці, або абслугоўваючага характару, не маглі аднавіць яе з прычыны адсутнасці заканадаўчых норм, слабасці эканомікі, гіперінфляцыі, вузкасці ўнутранага рынку, засілля манаполій замежнага капіталу. Гэта прыводзіла да абвастрэння праблемы беспрацоўя, якую кіраўніцтва II Рэчы Паспалітай вырашыць не магло. Пры гэтым неабходна падкрэсліць, што амаль усе салдаты паходзілі з сялян, асноўныя надзеі якіх былі звязаны з выкананнем рэформы. Другім аспектам было далучэнне новых тэрыторый, на якіх неабходна было ўмацавацца і стварыць мяжу, забяспечыць яе абарону. Менавіта гэтыя абставіны паўплывалі на мэты, якія былі ўскладзены

на асаднікаў: 1) выкананне рэформы з мэтай пазбегнуць незадавальнення ваенных супраць кіраўніцтва; 2) фарміраванне адзінай сістэмы нацыянальнай эканомікі, ў якую ўключаліся новыя тэрыторыі; 3) уздым аграрнага сектара эканомікі шляхам пераразмеркавання зямельнай уласнасці ў рамках існуючай сістэмы землеўладання, крэдытавання і датацый; 4) умацаванне пазіцый фінансавага капіталу асобамі польскай нацыянальнасці; 5) асіміляцыя насельніцтва «крэсаў усходніх», развіцце польскай нацыянальнай культуры; 6) кантроль над тэрыторыяй і мяжой. Вызначаныя мэты павінны былі быць рэалізаваны прававымі палажэннямі законаў ад 17 снежня 1920 года. Першы закон быў зарыентаваны на стварэнне зямельнага фонду з зямель, якія павінны былі перайсці ва ўласнасць дзяржавы. Такі зямельны фонд складаўся часткова з канфіскаваных зямельных ўладанняў дзяржаўнага значэння [9, с.38]. Акрамя гэтага, у склад зямельнага фонду ўваходзілі прыватныя зямельныя ўгоддзі. Да іх адносіліся гаспадаркі, уладары якіх не вярнуліся да 1 красавіка 1921 года, таксама гаспадаркі, памеры якіх перавышалі 400 га. Як бачна з вышэй пералічанага, на асадніцтва павінны былі выкарыстоўвацца землі беларускіх землеўласнікаў, якія ў час вайны не змаглі вярнуцца з бежанства да 1 красавіка 1921 года [4, с.3]. Аднак у пазнейшым у выніку прыняцця дадатковых палажэнняў асноўны зямельны фонд з прыватных зямель павінны былі складаць землі дробных землеўласнікаў, якія не вярнуліся да 1 красавіка 1921 г., і гектары з гаспадарак, якія перавышілі 400 га. Гэты закон адносіўся толькі да 22 паветаў «крэсаў усходніх». Атрымаць зямлю ва ўласнасць бясплатна маглі салдаты і афіцэры польскай арміі, якія «баранілі межы Радзімы». Сярод іх выдзяляліся інваліды і салдаты, маючыя ўзнагароды, а таксама кавалеры ордэна «Virtuli Militari» («Крыжа мужнасці»), а таксама ваенныя, якія мелі пісьмовыя прадстаўленні да ўзнагарод. Для платнага атрымання зямлі мелі доступ інваліды і іншыя ваенныя чыны, якія валодалі фізічнымі здольнасцямі для працы на зямлі, нават у тым выпадку, калі адсутнічала адукацыя ў агратэхніцы. Не маглі атрымаць зямельныя надзелы па рэформе наступныя катэгорыі: асобы, якія аказалі ваеннае супраціўленне II Рэчы Паспалітай; пакараныя за дэзерцірства; асобы, якія самавольна бралі зямлю ў карыстанне; пакараныя за рабаванне дзяржаўных маёмасцей; асобы, якія парушылі правілы аб дэмабілізацыі [9, с.42]. Вызначаўся памер асадніцкай гаспадаркі, які не мог перавышаць 45 га зямлі. Пры распрацоўцы закона мелася на ўвазе і дапамога ваенным асаднікам з мэтай забеспячэння функцыянавання асадніцкіх гаспадарак. Ім выдаваўся будаўнічы матэрыял аб'ём не больш 80 м^3, з жывога інвентару пара коней і воз [9, с.43]. Будаўнічы матэрыял і жывы інвентар для заслужаных салдат, інвалідаў, а таксама дабраахвотнікаў выдаваўся бясплатна. Для ўсіх астатніх катэгорый асаднікаў дапамога была платная, за выключэннем будаўнічага матэрыяла. Увесь працэс па надзяленню зямлёй ускладваўся на павятовы камітэт. Функцыяй Міністэрства ваенных спраў разам з ваеннымі аддзеламі дывізій і брыгад з'яўлялася тэхнічны падзел зямлі на часткі пад кантролем павятовага камітэту і Галоўнага зямельна-

га ўпраўлення. У распрацаваным законе былі ўлічаны асноўныя палажэнні для рэалізацыі палітыкі асадніцтва, але былі і пралікі, аб якіх заяўлялі палітычныя дзеячы, самыя радыкальныя сярод іх патрабавалі накіраваць закон на дапрацоўку. Пры рэалізацыі закона, які пачаўся з вясны 1921 г., усе юрыдычныя пралікі і недапрацоўкі набылі яўную форму. Гэта выражалася ў трансфарміраванай расшыранай адміністрацыйнай сістэме, што тлумачылася ў першую чаргу адсутнасцю інтэгруючай дзейнасці паміж міністэрствамі: Міністэрства ваенных спраў імкнулася падпарадкаваць Міністэрства аграрнае, і наадварот. Кожны імкнуўся выставіць свой кантралюючы орган. Па-другое, у законе ўтрымлівалася шмат недапрацовак і па зямельнаму фонду, і па крэдытаванню, і па сістэме кваліфікацыі кандыдатаў. У выніку першы год рэалізацыі рэформы набыў шмат накладак і недахопаў, што стала прычынай прыняцця шэрагу дапаўненняў да асноўнага зместу закона на працягу 20-х гадоў XX ст.

У сакавіку-красавіку 1921 г. пачаўся працэс прымання зямлі ва ўласнасць дзяржавы ў вызначанных 22 паветах. У склад гэтага арэала не ўваходзіла Сярэдняя Літва, якая уключала паветы: Віленска–Трокскі, Ашмянскі, Свянцянскі. Гэтыя паветы падпарадкоўваліся дэкрэтам генерала Жэлігоўскага. У дэкрэтах адзначалася, што заслужанныя ваенныя, інваліды, а таксама сем'і загінуўшых ваенных арміі Сярэдняй Літвы і падраздзяленняў польскай арміі, ураджэнцаў гэтых месц, таксама мелі права атрымаць як на платнай, так і на бясплатнай аснове зямлю.

Літаратура і крыніцы

1. Гак Л. Аграрная палітыка польскай буржуазіі ў Заходняй Беларусі. – Мн., 1933.

2. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 2: XIX–XX стагоддзі: Курс лекцый / П.І.Брыгадзін, У.Ф.Ладысеў, П.І.Зелінскі і інш. – Мн.: РІВШ БДУ, 2002. – 394 с.

3. ДАГВ. Ф. 196. Воп. 1. Спр. 3.

4. ДАГВ. Ф. 196. Воп. 1. Спр. 21.

5. ДАГВ. Ф. 196. Воп. 1. Спр. 24.

6. Полуян В.И., Полуян В.А. Революционно-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. – Мн.: Госиздат БССР, 1962. – 221 с.

7. Сорокин А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.). – Мн.: Наука и техника, 1968. – 186 с.

8. Dziennik Ustaw R. P. Warszawa. – 1921 r.

9. Dziennik Ustaw R. P. Warszawa. – 1922 r.

10. Dziennik Ustaw R. P. Warszawa. – 1925 r.

11. Dziennik Ustaw R. P. Warszawa. – 1926 r.

12. Stobniak- Smogorzewska J. Trudne poczatki osadnictwa wojskowego na kresah Wshodnih. – Warszawa, 1999.

13. Stobniak- Smogorzewska J. Kresowe osadnictwo wojskowe 1920-1945 roku. – Warszawa, 2003.

С.А. Юрыс, ГДТУ імя П.В.Сухога, г. Гомель

РАЗВІЦЦЁ СПАЖЫЎКААПЕРАЦЫІ ЗАХОДНЯГА РЭГІЁНУ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШЫЯ ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ (1945 – 1949)

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны спажыўкааперацыя заходняга рэгіёну БССР знешне выглядала як шматгаліновая сістэма, якая развівалася дастаткова дынамічна. Лічылася, што пайшчыкамі спажыўкааперацыі на 1.01.1941 г. з'яўлялася 48,8 % дарослага насельніцтва заходніх абласцей рэспублікі, аб'яднаных у 453 сельпо [1, л. 2]. Сума паявых узносаў у 1941 г. у цэлым па рэспубліцы складала 7 млн. 527 тыс. руб. (сярэдні пай на аднаго пайшчыка быў роўны 35 руб. 40 кап.). Такім чынам, пайшчык не мог пад пагрозай выхаду з кааператыўнага таварыства дабівацца ўплыву на рашэнні кіраўніцтва. Адзяржаўленне кааперацыі, якая ператварылася, па сутнасці, у яшчэ адно ведамства, прывяло да таго, што пайшчык са сваім першапачатковым узносам апынуўся выключаным з працэсу кіравання.

Вайна нанесла вялікі матэрыяльны ўрон, было страчана больш за 40 % матэрыяльнай базы кааператыўных арганізацый. Так, сума ўрону па Гродзенской вобласці склала 30 млн. 58 тыс. руб. [2, л. 9], Маладзечанскай – 72 млн. 845 тыс. руб. [3,л. 166], Брэсцкай – 40 млн. 360 тыс. руб. [4, л. 171].

Белкаапсаюз спыніў сваю дзейнасць у сувязі з акупацыяй у пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Па меры вызвалення заходніх абласцей рэспублікі, у адпаведнасці з пастановай СНК БССР ад 19 кастрычніка 1943 г., пачалося аднаўленне кааператыўнай гаспадаркі.

Сістэма сельпо з-за недахопа гандлёвых работнікаў, памяшканняў для магазінаў, лавак і складоў аднаўлялася павольна. Першапачаткова ўсё гандлёвае абслугоўванне насельніцтва, забеспячэнне хлебам, развіццё грамадскага харчавання ўскладвалася на райспажыўсаюзы.

Сельпо непасрэдна ствараліся пайшчыкамі. Аднак імкненне да павышэння рэнтабельнасці сельпо за кошт злучэння прывяло да таго, што па рэкамендацыі вышэйстаячых кааператыўных арганізацый праводзіўся курс на няўхільнае скарачэнне іх колькасці. Калі да вайны ў заходніх абласцях было 453 сельпо, то на 1.01.1946 – 343, на 1.01.1947 г. – 376, дасягнуўшы максімума ў 1948 г., з 1949 г. колькасць сельпо пачала скарачацца [1, л. 3]. Ідэя адміністрацыйнага ўзбуйнення кааператываў, якая выдавалася за рацыяналізацыю іх дзейнасці, была падтрымана і ў пастанове Савета Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б ад 3 мая 1949 г., у якой утрымоўваліся рэкамендацыі па аздараўленню фінансавага становішча спажывецкіх таварыстваў. Пры адсутнасці ўмоў для пашырэння гаспадарчай дзеннасці і рэнтабельнасці прапанавалася ўзбуйніць невялікія нерэнтабельныя сельпо [5, л 26].

Умовы для паляпшэння дзейнасці сельпо на месцах існавалі, але для гэтага неабходна было перабудаваць дзейнасць кааператыўных таварыстваў, развіваць дэмакратычныя пачаткі, актывізаваць удзел пайшчыкаў, падняць іх матэрыяльную зацікаўленасць у выніках дзейнасці. Вялізныя рэсурсы знікалі з-за растрат і крадзяжу, затаварвання асобных гандлёвых прадпрыемстваў, слабога кантролю за прадукцыяй прамысловасці. Растраты і крадзяжы ў спажыўкааперацыі БССР за 1946 – І949 гг. склалі 80724 тыс. руб. [6, л. 120], страты ад бесгаспадарчасці толькі па выніках 1948 г., за вынікам дазволеных, склалі 52246 тыс. руб. [7, л. 57].

Праўленнямі аблспажыўсаюзаў былі распрацаваны праграмы развіцця прадпрыемстваў рознічнага гандлю і грамадскага харчавання, баз і складоў. Адзначым, значная частка збярогшыхся за гады вайны будынкаў прыйшла ў заняпад. Неабходна было правесці вялікую работу, бо да 1945 г. уся гандлёвая сетка кааперацыі заходняга рэгіёну складала 28,6 % ад даваеннага ўзроўню. На 1.01.1945 г. у заходнім рэгіёне было створана 295 сельпо, аб'яднаных у 69 райспажыўсаюзаў, тут налічвалася 123190 пайшчыкаў [8, л. 196]. Рознічная гандлёвая сетка складалася з 1237 магазінаў, палатак і ларкоў [8, л. 195], 73 прадпрыемстваў грамадскага харчавання, 68 хлебапякарань і 96 прадпрыемстваў па выпуску тавараў спажывання [8, л. 206].

З пераходам да аднаўлення народнай гаспадаркі ў спажывецкай кааперацыі пачалася падрыхтоўка да адмены карткавай сістэмы: былі адрамантаваны гандлёвыя памяшканні і хлебапякарні, вялікая ўвага ўдзялялася будаўніцтву новых гандлёвых кропак. У выніку перыяд 1946 – 1947 гг. характарызаваўся самымі высокімі тэмпамі прыросту гандлевай сеткі 137,5 %, якія да пачатку 50-х гг. стабілізаваліся на ўзроўні 102 – 104 %. Разам з тым неабходна адзначыць, што аднаўленне ішло з вялікай цяжкасцю і нават на 1.01.1951 г. яна дасягнула толькі 73,5 % да даваеннага ўзроўню [9, л. 9].

Да вайны вытворчая дзейнасць спажывецкай кааперацыі рэспублікі была абмежавана. Ей дазвалялася займаць толькі хлебапячэннем, вытворчасцю безалкагольных напіткаў і пераапрацоўкай сельгаспрадукцыі. Валавы аб'ем прадукцыі за 1940 г. склаў 33 млн. 429 тыс. руб, у тым ліку: хлебапячэнне – 82,9 %, перапрацоўка сельгаспрадукцыі – 11,3 %. Вытворчасцю прамысловых тавараў шырокага ўжытку спажывецкааперыцыя ў гэты час не займалася.

Як кусташ музея Ядкоўскі прыкладаў вялікія намаганні, каб «узбагаціць зборы музея здабыткамі краю, тым больш, што рэгіён паміж Нёманам і Бугам менш даследаванны з пункту гледжання археалогіі» [16, с.10]. У 1924 г. Ядкоўскі прыбыў у Ваўкавыск, дзе пад Замчышчам адкапалі каменную бабу, і з 1925 г. ім быў пакладзены пачатак археалагічных раскопак на дзядзінцы старажытнага Ваўкавыска («Шведскай гары») [25]. У

1934-35 гг. раскопкі працягваў Г.І.Пех, які перадаў у гродзенскі музей 170 артэфактаў. Пазней матэрыялы раскопак ў Ваўкавыску ўвайшлі ў зборы створанага дзяржаўнага краязнаўчага музея (1940г.) [12].

Калекцыі археалогіі гродзенскага музея папаўняліся дзякуючы грамадскай ініцыятыве прадстаўнікоў інтэлігенцыі горада, з якімі Ядкоўскі асабіста сябраваў. Гэта ў першую чаргу члены Таварыства аматараў прыроды: заснавальнік гродзенскага заалагічнага парка Ян Каханоўскі (1894–1942 гг.) і натураліст, стваральнік музея прыроды (1926 г.) Станіслаў Жыўна. Так, вялікая калекцыя наканечнікаў дроцікаў і стрэл з Паўночнай Амерыкі была перададзена Жыўнай музею пасля вяртання з эміграцыі ў ЗША ў 1924 г. [12]. Ю.Ядкоўскі і Я.Каханоўскі праводзілі сумесныя гістарычныя і археалагічныя даследаванні Гродна, Аўгустова, Сувалак, распрацавалі адзін з першых на Беларусі турыстычных даведнікаў «Гродна і ваколіцы. Аўгустоўскія азёры». З вандровак Каханоўскага па р.Ула, прытоку Мерачы паміж вёскамі Кашэты і Рудня Лідскага уезда, каля в.Дубічы (недалёка ад Начы і Рудні) у 1931–36 гг. музей атрымаў калекцыю крамянёвых вырабаў мезаліта-неаліта, толькі за 1931–32 гг. звыш 1,6 тыс. адзінак захавання (далей а. з.). Ёсць знаходкі,перададзеныя Каханоўским крэмневых вырабаў з в.Шандубра,што на поўднёвы захад ад Друскенік, у 0,5 км ад знакамітага «Райграда»– старога русла Нёмана, дзе па легендзе праваліўся пад зямлю горад. Бадай, самая вялікая калекцыя эпохі каменага веку – пачатку эпохі бронзы паходзіць з тэрыторыі абмялеўшага ў 1841 г. «Салацкага паазер'я» з «астравамі» Ліхацкім і Запур'янскім, і з вёскі Запур'е, што ў 2 км на поўнач. Гэта калекцыя сфарміравалася ў выніку сумесных экспедыцый Каханоўскага і Ядкоўскага ў 1931–1936 гг. [12].

Асаблівую цікавасць, як археалагічныя крыніцы, прадстаўляюць неапублікаваныя матэрыялы раскопак пахавальных помнікаў Гродзеншчыны, даследаваныя Ю.Ядкоўскім у 1934 і 1935 гадах. Гэта курганны могільнік у Вялікай Бераставіцы, які яшчэ ў 1932 г. пачаў раскопваць уладальнік зямлі граф Станіслаў Касакоўскі, а інвентар (64 адзінкі – кераміка, упрыгажэнні) перадаў у музей [1, арк. 112-127], і могільнік X–XII ст. каля в.Мігова Гродзенскага ўезда [2, арк. 190-192]. Могільнік у Мігова, амаль разбураны ў выніку гаспадарчай дзейнасці, быў выяўлены гімназістамі лагера перадавой аховы, што дзіслацыраваўся на правабярэжжы Нёмана ў в.Коматава (р.Котра). У аддзеле РКіС ГДГАМ захоўваецца архіў Ядкоўскага, у якім аўтарам гэтых радкоў былі знойдзены дакументы, што тычацца хода і вынікаў раскопак. Гэта перыядычны друк, планы могільнікаў, аб'ектныя фатаздымкі і малюнкі, фатаздымкі пахавальнага інвентара, перапіска з удзельнікамі прац. Так, «Kurjer Poranny» ад 16.08.1935 г. у артыкуле «Археалагічнае адкрыццё каля Гродна» паведамляе наступнае: «Адкрытыя пахаванні размяшчаліся радамі, былі абнесены вялікімі валунамі з адным або двума слаямі вымасткі па абраду трупаспалення, а таксама трупапалажэння. У раскапаных пахаваннях знаходзілася па адной урне, аздобленых лінейным арнаментам або без яго. У жаночых пахаваннях знаходзіліся скроневыя колцы, бронзавыя пярсцёнкі, шкляныя пацеркі

і прасліцы з шыфера або бурштыну; у мужчынскіх – брускі, крэсіва і жалезныя зашпількі». У публікацыі змешчана і пачутае журналістам меркаванне Ю.Ядкоўскага наконт этнічнага паходжання насельніцтва рэгіёна: «...матэрыял важнага значэння для гістарычнай навукі, які даказвае, што гэта славянскія пахаванні X–XII стст. Гэта адкрыццё абвяргае прапагандуемую Літоўскую версію, якая адмаўляе рассяленне славян над Нёманам вышэй Гродна ў раннім сярэднявеччы...»[13]. У выданні «Pod prond» журналіст В.Чыстоўскі асвятляе ход прац і, ў некаторай ступені, методыку на прыкладзе раскопак двух пахаванняў: «Мясцовыя жыхары называлі гэта месца «скапцы»....Шкляныя пацеркі сведчаць, што гэта славянскае пахаванне, паколькі ў яцвяжскіх пахаваннях пацеркі не сустракаюцца....-пасля зняцця камянёў, ўтвараючых кола дыяметрам 3 м, можна яго раскопваць. Тры лапаты здымаюць зямлю слой за слоям. Нарэшце ёсць. Што? Попел. Дзе-нідзе відаць у слоі пяску нешта белае. Але, акрамя попелу, нічога не аказалася. Лёгкае расчараванне.

У наступны дзень тэрыторыю разбілі трыянгуляцыйнай сеткай. Пахаванні не круглыя, як першапачаткова здавалася, а амаль прамавугольныя з вялікіх цэлых валуноў, пастаўленых проста, памерамі пераважна каля 4 на 2 м, цела пакладзена разам з прадметамі,...урна пастаўлена пры ступнях нябожчыка, пахаванне пакрыта слоям камянёў, брукам. Для славянскіх пахаванняў характэрны адзін слой бруку, для яцвяжскіх – некалькі. Звычайна на самым пахаванні адбывалася трызна, бо побач з чалавечымі касцямі можна заўважыць косці жывёл. Пахаванне ўтварала ўзгорак, які з цягам часу рабіўся ніжэйшым; цяпер відны толькі вяршыні бакавых камянёў. Пры раскопках здымаецца спачатку толькі слой зямлі, каб адкрыць камяні, потым фатаграфуюць пахаванне. Далей здымаецца брук і слой зямлі аж да «martwicy» (слоя на якім быў збудаваны), не даставаючы аднак з яго нічога. Пасля поўнай ачысткі, яшчэ некалькі разоў фатаграфуецца, а далей урна, аздабленні, прылады, начынне (добрай захаванасці) перадаюцца ў музей; рэшткі касцей акуратна засыпаюцца.З усяго шкілета лепш за ўсё захаваліся чэрап і косці ног» [1, арк. 172].

Ядкоўскі планаваў грунтоўную навуковую публікацыю па выніках раскопак вышэй згаданых могільнікаў і, можна меркаваць, што частка дакументаў была перавезена ім у Варшаву на новае месца працы (1940 г). Матэрыялы раскопак і дакументы, якія засталіся ў Гродна, пасля адпаведнай апрацоўкі будуць у хуткім часе апублікаваны супрацоўнікамі аддзела археалогіі ГДГАМ.

Дырэктар гродзенскага музея вёў інтэнсіўную перапіску з мэтай акумуліраваць усе звесткі аб выпадковых археалагічных знаходках. Ядкоўскі правяраў атрыманую інфармацыю, дабіваўся перадачы матэрыялаў ў музей, кантраляваў або забараняў раскопкі мясцовых энтузіястаў на тэрыторыі Беластоксага ваяводства. Напрыклад, пісьмом ад 6.05.1930 г. ён патрабуе ад магістрата Індуры спыніць раскопкі гарадзішча (так званай «гары каралевы Боны») згодна з распараджэннем ад 6 марта 1928 г., арт. 35, 36, 37, 43 [2, арк. 11]. Аднак перапыніць усе самачынныя раскопкі,

відаць, было не магчыма. З другога боку, аматары археалогіі самі звярталіся па дапамогу да Ядкоўскага. Так, у 1932 г. каля в.Курашова Бельск-Падляскага павета настаўнікам М.Давідзюком былі раскапаныя тры кургана, інвентар з двух пахаванняў і іх апісанне, фатаздымкамі і малюнкамі аб'ектаў ён па просьбе Ядкоўскага даслаў у музей [2, арк.28-38]. У археалагічнай калекцыі ГДГАМ захоўваюцца матэрыялы з г.Суража Беластоцкага ваяводства з раскопак, якія праводзіў Ю.Ядкоўскі ў 1936 г. Арганізаваць і правесці даследаванні дапамог краязнаўца, вучыцель агульнаадукацыйнай школы А.Стафиньскі [10, с.89-90]. Уладальнік «Шведскай гары» ў Ваўкавыску Л.Радомскі ў 1926–1932 гг. перадаў у музей звыш 50 знаходак вырабаў з крэменю і прадметы XII–XIII стст. [12].

Калекцыі археалогіі музея папаўняліся і выпадковымі знаходкам з горада Гродна: двуручны меч XIV–XV стст. даўж. 107 мм, знойдзены на агародзе Генрыка Залеўскага пры вул.Пілсудскага №19, на глыбіні 2 м (гэты меч павінен быў стаць выдатным экспанатам запланаванай Ядкоўскім збраёўні ў Каралеўскім Замку); праселка з вул.Замкавай; наканечнік дзіды XIII ст. са Старога замка з боку вул.Св.Казіміра (1933 г.); праселка і каменная сякера з левабярэжжа Немана па вул. Крывой, што побач са старымі яурэйскімі могілкамі, дзе ў 1933 г. пракладвалі водаправод, і г.д. [2, арк. 2-8, 17, 104-105].

У жніўні 1924 г. нарэшце было прынята рашэнне аб перадачы значных плошчаў Старога замка музею. Падчас правядзення ў верасні-кастрычніку 1924 г. агульных абмераў замка, з вонкавага боку, побач з уяздной брамай Ядкоўскі заклаў шурф глыб. 0,5 – 1,5 м, шыр. 60–80 см, дзе былі знойдзены фрагменты дэкаратыўнага аздаблення фасадаў палаца, капітэль з выявай льва, некалькі дзесяткаў фрагментаў паліхромнай кафлі, сграфіці з часоў перабудовы замка пры Яне III Сабескім [16, с.7]. У 1935 г. Ядкоўскі правёў археалагічныя даследаванні інтэр'ера і абследаваў падмуркі гродзенскай Барысаглебскай царквы. Были ўскрыты пахаванні пад падлогай у алтарнай частцы і пахаванне каля паўднёва- ўсходняй апсіды. Менавіта дзякуючы напружанай працы Ядкоўскага як археолага ў 30-х гг. фактычна сфарміраваліся ўсе калекцыі раздзела археалогіі Гродзенскага дзяржаўнага музея. У выніку земляных прац і археалагічных раскопак (вясна 1931–1936 гг.) было канчаткова вырашана спрэчнае пытанне аб лакалізацыі летапіснага Городно. Аб гэтым сенсацыйным адкрыцці напісана шмат. Да сённяшняга часу добра захавалася планы, справаздачная і інш. дакументацыя [22]. Пазней археолагамі і гісторыкамі на падставе гэтых крыніц былі зроблены высновы па пытаннях гісторыі Гродна, якія часта не супадалі са сцвярджэннямі Ядкоўскага. Гэта тлумачыцца як іншай методыкай правядзення археалагічных даследаванняў Ядкоўскім (без увагі на стратыграфію культурных напластаванняў, з метадычнымі памылкамі), так і іншымі канцэптуальнымі падыходамі [24, с.9]. Раскопкі Здзіслава Дурчэўскага на Старым замку ў 1937–1939 г. праводзіліся на высокім для таго часу навуковым узроўні [5]. У выніку, атрыманыя археалагічныя матэрыялы і па сённяшні дзень з'яўляюцца бясцэннымі крыніцамі для дас-

ледаванняў. Агульная колькасць даваенных збораў з раскопак Гродна ў 1932–1939 гг. складала 11 тыс. а. д. [3, с.15].

Пасля Вялікай Айчыннай вайны пачаўся новы этап у археалагічным даследаванні Гродзеншчыны, якому адпавядае II этап камплектавання археалагічных калекцый ГДГАМ 1949–1989 гг. У рамках артыкула ўяўляецца магчымым толькі назваць найбуйнейшыя паступленні ў фонды – большасць з іх агульнавядомы па публікацыях даследчыкаў. Яны звязаны з раскопкамі маскоўскага археолага М.М.Вароніна на тэрыторыі гродзенскага Старога Замка (1949 г. – 4,717 тыс. а. з.) [18], разведкамі археолагаў Ленінградскага аддзялення Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры АН СССР С.А.Тараканавай (1951 г. – 717 а. з.), Ф.Д.Гурэвіч (1955–1956 гг. – 1766 а. з.) [4], раскопкамі К.В.Паўлавай (1965 г.), археалагічнымі раскопкамі беларускіх даследчыкаў К.Т.Кавальскай, Г.І.Пеха ў 1950-я гг. і інш.

Цікавымі археалагічнымі крыніцамі валодае ГДГАМ з раскопак гарадзішч: Індура XI – XIII стст. (кіраўнік– навуковы супрацоўнік музея К.Т.Кавальская, 1955-1956 гг.), з гарадзішча старажытнарускага горада Турыйска (сумесныя раскопкі Кавальскай і Пеха ў 1961–1962 г г.), Гальшанскага гарадзішча XII – XIV стст. (раскопкі Я.Г.Звяругі, 1970 г. – 238 а. з.). Так атрымалася, што негледзячы на вялікае значэнне гэтых матэрыялаў для гістарычных даследаванняў нашага рэгіёну, яны пачалі публікавацца ў поўным аб'ёме толькі нядаўна [19, с.123 – 137].

У 70–80-я гг. значна папоўніліся калекцыі археалогіі ГДГАМ, дзякуючы маштабным і працяглым раскопкам на гродзенскім Старым Замку археолагаў Я.Г. Звяругі ў 1971–73 гг., М.А.Ткачова ў 1971, 1985–88 г.г, А.А.Трусава ў 1977, 1981, 1983–89 гг., А.К.Краўцэвіча ў 1986–89 г.г. [24, с.15-16], а таксама раскопкам Мірскага і Крэўскага замкаў у 1980-е гг. [23].

На сучасным этапе, для забеспячэння дынамічнага мэтанакіраванага камплектавання археалагічных калекцый ГДГАМ, былі вызначаны асноўныя напрамкі гэтай дзейнасці. У 1987–1989 гг. дырэкцыяй ГДГАМ былі заключаны дагаворы аб правядзенні археалагічных даследаванняў каля в.Плёткі, і ў в.Ражанка Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. пад кіраўніцтвам супрацоўніка інстытута гісторыі НАН канд. гістарычных навук А.В.Квяткоўскай з удзелам навук. супрацоўнікаў аддзела археалогіі музея Р.М.Акінчыца, Н.А.Пачобут. У красавіку 1998 г. былі праведзены разведачныя працы ў в.Ражанка на левым беразе р.Тур'і, дзе па звестках жыхароў у 60-я гг. знаходзіліся курганы. У той жа час быў абследаваны маёнтак Пацаў, што прыкладна ў 1 км ад мястэчка на высокім ўзгорку, які ўзнімаецца ад р.Тур'і. У верасні 1998 г., верасні – кастрычніку 1999 г. праводзіліся раскопкі сярэдневяковага паселішча на месцы «Курганы» ў Ражанке. Калекцыя ўтрымлівае фрагменты паліванага, непаліванага, моранага посуду, гаршковую і каробкавую кафлю XIV–XVII ст.ст. З раскопак селішча і могільніка X ст. каля Плётак у фонды паступіла 256 а. з. [9].

У 1996 г. ад археолага Я.Г.Звяругі былі набыты калекцыі са старажытных Слоніма, Турыйска, Ваўкавыска, з гарадзішча Гарані і інш. помнікаў Верхняга Панямоння [17]. Калекцыю маёлікавага посуду з раско-

пак ганчарнай майстэрні ў Гродна перадаў у музей археолаг Р. М. Акінчыц [7]. Цікавыя матэрыялы трапілі ў музей з раскопак па вул. В.Траецкая пад кіраўніцтвам Г.М.Семянчука з ўдзелам навуковага супрацоўніка музея Н.А.Лявусік [20, с. 347 – 356]. У 2001-2002, 2004 – 2005 гг., дзякуючы актыўнаму супрацоўніцтву музея з археолагамі В.С.Абухоўскім і В.Л.Лакізай, значна папоўніліся фонды музея калекцыямі археалагічных матэрыялаў пераважна неаліта-бронзы (X – I тыс. да н.э.) з вядомых помнікаў Пархуты-1, Пархуты-2 у Дзятлаўскім р-не, Бершты-2, Бершты-4 у Шчучынскім р-не, Жылічы-1, Хамуты ў Гродзенскім р-не. Зараз у фондах археалогіі ГДГАМ захоўваецца каля 33 тыс. а. з. асноўнага фонду (лічба будзе ўдакладняцца па выніках апошняй інвентарызацыі.)

Такім чынам, разгледжаны асноўныя этапы камплектавання археалагічных калекцый аднаго са старэйшых музеяў Беларусі. Археалагічныя калекцыі – нязменная крыніца для вывучэння старажытных эпох гісторыі чалавецтва. Разам з тым яны з'яўляюцца неабходным звяном і ў вывучэнні многіх бакоў гісторыі і культуры перыяда сярэднявечча. Археалагічныя крыніцы застаюцца навуковым фактам, захоўваюцца пасля знішчэння археалагічных помнікаў, выкарыстоўваюцца ў гістарычных даследаваннях [6, с.51]. Навуковая каштоўнасць іх залежыць ад многіх фактараў. Зразумела, найбольшую каштоўнасць прадстаўляюць менавіта археалагічныя калекцыі, атрыманыя ў выніку навуковых археалагічных даследаванняў.

Гісторыя фарміравання археалагічных калекцый ГДГАМ дазваляе зрабіць некалькі высноў. У 20-я – пач. 30-х гадоў яны фарміраваліся ў асноўным дзякуючы энтузіязму краязнаўцаў і аматараў старажытнасцяў, а дзейнасць прафесіянала часта абмяжоўвалася кантролям, магла заключацца ў дапамозе правядзення распачатых раскопак, а таксама ў прыцягненні да музея рэчаў, якія знаходзіліся ў прыватных руках. Гэта было абумоўлена найперш недастатковым развіццём археалагічнай навукі і музейнай справы на Гродзеншчыне ў той час. У пасляваенны перыяд пачынаецца планамернае і мэтанакіраванае даследаванне Гродзеншчыны прафесіяналамі. Матэрыялы, якія паступалі ў музей у гэты час, у большасці, паходзілі з экспедыцый АН СССР, Інстытута гісторыі АН БССР, Архітэктурна-археалагічнай экспедыцыі Беларускага рэстаўрацыйна-праектнага інстытута, ГДГАМ. З гэтага часу археалагічныя калекцыі носяць больш поўны і сістэмны характар.

Літаратура і крыніцы

1. Архіў Ю. Ядкоўскага., справа №2.

2. Архіў Ю. Ядкоўскага., справа №3.

3. Голубович В. И., Цегак-Голубович Е. В. Новые материалы по истории Гродно // Архив ГГИАМ.

4. Гуревич Ф. Д. Древности Белорусского Понеманья. – М., 1962.; Отчёты о работах Славяно-литовского отряда Прибалтийской экспедиции за 1955 и 1956 гг. // Архив ГГИАМ.

5. Durczewski. Z. Stary zamek w Grodne w swetle wykopalisk dokonanych w latach 1937-1938. – Grodno, 1939.

6. Ісаенка У.Ф. Археалагічныя крыніцы / Энц. Археалогія і нумізматыка Беларусі. – Мн.,с. 51.

7. Калекцыйны вопіс на калекцыю маёлікавага посуду з раскопак майстэрні ганчара ў г. Гродна ў 1989-1990 гг. з раскопак Р. М. Акінчыца. // Архив ГГИАМ.

8. Калекцыйны вопіс кафлі XIV-XVIII ст.ст. з раскопак Старога замка ў Гродне. Аб'ект № 0-95. Інв. № 1. – Мн., 1995 // Архіў ГДГАМ.

9. Квятковская А. В. Отчёты о проведении археологических исследований в м. Рожанке, д. Ельне, д. Аздобичи Щучинского р-на Гродненской обл. в 1998г.; 1999г. – Мн., 1999; 2000; Отчёты о проведении археологических исследований у д. Плётки Щучинского р-на Гродненской обл. в 1997г.; 1998г.; 1999г. – Мн., 1998; 1999; 2000.

10. Кізюкевіч Н., Пачобут Н. Археалагічныя матэрыялы з даследаванняў г.Суража ў 1936г. у фондах ГДГАМ // Podlaskie zeszyty archeologichne. – Biaiystok, 2005. – № 1. – С. 89-120.

11. Клейн Л. С. Археологические источники. – Ленинград, 1978.

12. Кніга паступленняў ГДГАМ 1940-1941 г.г..

13. Odkrycia arheologiczne pod Grodnem // Kurjer Poranny. – 16 sierpnia, 1935.

14. Muzeum w Grodnie. Sprawazdanie z czynnoci za roki 1920-1922. – Grodno, 1923.

15. Muzeum w Grodnie. Sprawazdanie z czynnoci za 1923. – Grodno, 1924.

16. Muzeum w Grodnie. Sprawazdanie z czynnoci za 1924. Rocznik II. – Grodno, 1925.

17. Описи находок из раскопок Слонима в 1968г.; селища близ г. п. Красносельский Волковыского р-на в 1984 г.; селища близ д. Хведевичи Слонимского р-на в 1979 г.; городища близ д. Горани Смаргоньского р-на за 1978, 1980, 1981 гг. // Архив ГГИАМ.

18. Опись коллекции из раскопок Нижней церкви гродненской экспедиции 1949 г. под руководством Н. Н. Воронина.; Опись коллекции северного раскопа.; Опись коллекции южного раскопа.

19. Семянчук Г., Лявусік Н., Юркавец Ю. Матэрыялы з даследаванняў Індурскага гарадзішча 1955-1956 гг. // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мн., 2003. – №7. – С. 123-137.

20. Семенчук Г., Леусик Н., Юркавец Ю. Результаты археологических исследований в Гродно в 2001 году.// Badania arheoiogichne w Polsce pylnocnowschodniej i na zohodniej Biaiorusi. – Мн., 2002. – С. 347 – 356.

21. Ньneïko A. Wydobyi z zemi gryd o ktyrym nikt nie wiedziai. Wspomnie o Jyzefie Jodkowskim. Biaiystok, 2000.

22. Sprawazdanie Kuratorjum Zamkowego w Grodnie za lata 1932 i 1933 гг.

23. Трусов О. А. Отчёты о проведении археологических раскопок на территории Старого замка в г. Гродно в мае-июне 1985, Кн.1-3; апреле – июле 1986 г.; июле-октябре 1987 г. // Архив ГГИАМ.

24. Трусаў А. А., Собаль В. Е., Здановіч Н. І. Стары замак у Гродне XI – XVIII стст. – Мн., 1993.

25. Jodkowski J. Grodzisko Woikowyskie. – Grodno, 1925.

Ю.В. Юркавец, ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

ГАРАДЗІШЧА ЛЯ в. ШАДЗІНЦЫ ГРОДЗЕНСКАГА РАЁНА

На дадзены момант у Гродзенскім раёне вядома некалькі такіх археалагічных помнікаў як гарадзішчы. Гэта гарадзішча ў г.Гродна, Індурскае, Жылічскае, Адэльскае гарадзішчы. Дзякуючы наяўнасці добра бачных на паверхні земляных умацаванняў амаль усе гарадзішчы Гродзенскага раёна вядомы яшчэ з XIX ст. [2, с.154, 155, 149].

У 1999 г. студэнты Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы Ян Лялевіч і Дзяніс Нарэль ля в.Шадзінцы (Васілевіцкі с/с) выявілі раней невядомыя земляныя ўмацаванні. Абследаванне знойдзеных умацаванняў і навакольных мясцін праводзілася аўтарам ў 2004 – 2005 г.

Гарадзішча размешчана за 150 м на паўднёвы ўсход ад в.Шадзінцы (мал. 1: 1). Знаходзіцца сярод поля на схіле (мае нахіл ў паўднёвы бок). Схілы і пляцоўка гарадзішча моцна параслі дрэвамі і кустамі, так што вала амаль не бачна. З паўднёвага ад гарадзішча боку праз 20–25 м у нізіне цячэ безыменны ручай.

Мясцовая назва гарадзішча – «Касцельная гара». Мясцовыя жыхары расказалі легенду аб тым, што калісьці на гэтым месцы існаваў касцёл, які знік пад зямлёй.

Помнік вылучаецца вельмі маленькімі памерамі: унутраная пляцоўка авальнай формы, з вельмі няроўнай паверхняй, памерам 20Ч16 м. Дыяметр гарадзішча па грэбні вала 27 м па лініі захад-усход і 29 м па лініі поўнач-поўдзень (мал.2). Амаль такія ж памеры мае Верхаўлянскае гарадзішча – свяцілішча, якое знаходзіцца ў Бераставіцкім раёне [1, с. 124].

Вал размешчаны па краі пляцоўкі. Вышыня вала са знешняга боку з поўначы і з усходу складае 2 м, з поўдня – 2,5 м, і з захаду – 3 м. Вельмі

Мал. 1. Сітуацыйны план гарадзішча ля в.Шадзінцы.
(1 – гарадзішча, 2 – камень- следавік)

добра захаваліся валы з паўночнага і заходняга бакоў, паўднёвы вал – аплыты. Сляды рова не прасочваюцца. Уезд на гарадзішча адсутнічае.

Даследаванні, праведзеныя на гарадзішчы летам 2005 г. паказалі, што ўнутраная пляцоўка гарадзішча не мае культурнага слоя, адразу пад дзірваном пачынаецца мацярык, а ўсе няроўнасці пляцоўкі маюць прыроднае паходжанне.

Вал быў насыпаны з зямлі інтэнсіўнага шэрага колеру, у якой было знойдзена некалькі невялікіх кавалкаў керамічнага ганчарнага посуду і некалькі фрагментаў костак. У падножжа вала з унутранага боку знаходзілася вялікая колькасць сярэдніх і мелкіх валуноў. Амаль ля падножжа паўночнага вала з унутранага боку была выяўлена яма, глыбінёй каля 40 см, на дне якой бачныя некалькі камянёў. Мяркуючы па гэтаму факту, каменная вымастка ў падножжа вала маецца, як мінімум, з захаднягa і поўночнага бакоў.

Валы, таксама ўмацаваныя камянямі, маюць гарадзішчы Касцянёва і Кульбачына Шчучынскага раёна [3, с. 104]. Вялікая колькасць камянёў сярэдніх памераў зафіксавана пры прарэзцы вала гарадзішча Збочна Слонімскага раёна [4, с. 394].

З мэтай пошуку селішча, якое магло б адносіцца да гарадзішча, былі абследаваны навакольныя палі, але станоўчых вынікаў гэта не прынесла.

Адзіным выяўленым археалагічным помнікам, які мог быць звязаны з гарадзішчам стаў камень – следавік. Ён знаходзіцца прыкладна за 100 м. на поўнач ад гарадзішча (мал. 1: 2). Камень мае памеры каля 1,8?1Ч0,8 ? роўную паверхню, на якой маюцца 2 невялікіх паглыблення. На адным з яго бакоў прадрапаны крыж.



Мал. 2. План гарадзішча ля в.Шадзінцы

Такім чынам, знойдзеныя на помніку фрагменты керамікі вельмі маленькія і не даюць магчымасці датавання. Мяркуючы па малым памерам і адсутнасці культурнага слоя, гарадзішча магло выконваць абарончыя функцыі і з'яўляцца гарадзішчам – сховішчам, але зусім не выключаны варыянт, што гэта гарадзішча – свяцілішча.

1. Зайкоўскі Э.М. Верхаўлянскае свяцілішча // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. – Мн.,1993. – С.124

2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэд. кал.: С.В.Марцэлеў (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелСЭ, 1986. – 371 с., іл.

3. Піваварчык С.А. Сацыяльна – гістарычная тыпалогія гарадзішч Панямоння X – XIII ст. // Гістарычна – археалагічны зборнік. – Мн., 1992. – С. 93 – 108.

4. Піваварчык С.А. Археалагічныя даследаванні помнікаў фартыфікацыі ў Беларускім Панямонні // Badania archeologiczne w Polsce pyinocno – wschodnej i na zachodniej Biaiorusiw latach 2000 – 2001. – Biaiystok, 2002. – S. 393-399.

Е.Т. Колендо, БГУ, г. Минск

ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЕ ОСОБЕННОСТИ РАСПРОСТРАНЕНИЯ ПАМЯТНИКОВ МОНУМЕНТАЛЬНОГО ЗОДЧЕСТВА В ГРОДНЕНСКОЙ ОБЛАСТИ

Монументальное зодчество получило широкое распространение в Гродненской области. Область занимает лидирующую позицию в республике по количеству существовавших и сохранившихся памятников. Это объясняется рядом исторических факторов, основным из которых выступает северо-западное направление угрозы для Беларуси со стороны крестоносцев. Поэтому именно в западном регионе возникли предпосылки к развитию оборонного зодчества. Кроме того, принадлежность Западной Беларуси к Польше до 1939 года сократило пагубное влияние разрушительных тенденций 20 – 30-х гг. на памятники культуры.

В середине XIII века на территории, где граничат Гродненская, Минская и Брестская области, начало формироваться Великое княжество Литовское, столица которого располагалась первоначально в Новогрудке. С укреплением и расширением молодого государства начали появляться новые города, которые обзаводились оборонительными сооружениями, призванными защищать ВКЛ от внешних врагов. Таким образом, постепенно создавалась разветвленная сеть каменных замков и укрепленных городищ. В их расположении просматривается определенная закономерность. Они размещены не хаотично, а представляют упорядоченною структуру.

При детальном исследовании данного аспекта можно заметить, что оборонительные сооружения выстраиваются дугообразно вокруг столицы ВКЛ с ориентацией дуги на запад. Подобный полукруг напоминает собой половину многоугольника, в узлах которого находились замки. В

свою очередь вокруг этих узлов формировались многоугольники поменьше, которые были призваны защищать прилегающие территории. Исследования на топическом уровне, вероятно, могут обнаружить многогранники еще более низкого порядка. В общем виде получается сложная картина кольцеобразных структур нескольких уровней, выходящих из одной точки и направленных на запад.

Такое построение хорошо укладывается в рамки теории графов – теории Кристаллера – Леша. Суть ее состоит в том, что населенные пункты возникают не сами по себе, а стремятся занять наиболее благоприятное положение по отношению к окружающим объектам в зависимости от своего ранга. Вокруг крупных населенных пунктов формируется сетка меньших, причем по форме они напоминают правильные многоугольники (графы). К каждому крупному тяготеют одновременно 5 – 6 меньших поселений. Любому таксономическому уровню присуща своя сетка населенных пунктов.

Законы этой теории вполне логично должны были в особенности проявиться в монументальном зодчестве. Ведь если размещение простых поселений подчинялось получению экономической выгоды, то строительство оборонительных сооружений преследовало гораздо более важную цель – защиту от врагов. Поэтому учитывались не только выгоды конкретного места, но и положение его по отношению к другим замкам.

В нашем случае центром первого порядка в начале выступает первая столица ВКЛ – Новогрудок. До перенесения столицы в Вильно в 1316 году он представлял политический центр, вокруг которого концентрировалась военная сила того времени. Он контролировал земли Понемонья и мешал продвижению крестоносцев вглубь ВКЛ. С потерей своего статуса Новогрудок по-прежнему имел большое значение в плане обороны. Что подтверждается непрерывной перестройкой замка в XIII – XIV веках, в результате чего он стал, пожалуй, самым сильным городом Беларуси. Этому способствовали выстроенные позднее Костельная, Посадская, Колодезная башни, «Щитовка» и Дозорец, Малые и Меские ворота, соединенные каменными стенами и окруженные еще линией деревянных укреплений.

На расстоянии 50 – 100 км от Новогрудка появились замки второго порядка, к которым можно отнести Кревский, Лидский, Волковысский и Слонимский замки. Первоначально они охраняли подходы к Новогрудку и вглубь страны с севера, запада и юга. Первые два имели общегосударственное значение, сохранились до наших дней, а два последних имели укрепления более слабые и сведения о них дошли до нас только в документальных источниках. Их возникновение и реконструкция датируются приблизительно одним и тем же временем – первой половиной XIII столетия. Причем замки Лиды и Крева послужили основой, вокруг которой только позднее появились поселения.

С изменением политической ситуации формирующийся вокруг Новогрудка граф постепенно утратил свое влияние. Сам город потерял статус центрального места первого порядка. В новых условиях все большее значение начинает набирать Вильно. Геополитический вектор сместился от старой столицы к новой, тем самым, заложив основу складывания нового графа. Для его построения были использованы уже имеющиеся замки, то есть старый и новый многоугольники получили общую сторону в виде фортификаций Лиды и Крева. Но новая цепь, находясь на расстоянии 80 – 150 км от Вильно, уходила дальше на запад в сторону Гродно, а не на юг, как было раньше. В итоге замки Волковыска и Слонима, утратив былое значение, постепенно ушли в небытие, а замки северной части области, получив новый импульс, начали укрепляться с еще большей силой (сейчас большая часть сохранившихся памятников монументального зодчества находится на севере Гродненской области). Особая роль при этом отводилась Гродненскому замку, который должен был принимать на себя первые удары внешних агрессоров. И действительно он осаждался крестоносцами в 1284, 1296, 1306, 1311, 1312, 1328, 1361, 1363, 1373, 1376, 1393 годах.

В зоне «притяжения» крупных замков размещались оборонительные постройки третьего порядка, куда входили меньшие по размерам в основном деревянные замки, укрепленные городища и бастионные сооружения. Среднее расстояние между центром и местными укреплениями составляла 20 – 40 км, что равно многограннику с диаметром 40 – 80 км. Сейчас мало сохранилось памятников данного порядка. Наиболее хорошо они идентифицируются в Литве. Это – построенные для защиты Вильно – замки в Троках (Тракай) и Медниках (Медининкай). Исключением является сохранившийся на территории Гродненской области замок в Гераненах, расположенный приблизительно посередине между Лидой и Кревом. В остальных случаях единственным следом остаются земляные укрепления, встречающиеся в Гродненской области повсеместно. Вокруг Слонима следы земляных укреплений встречаются в деревнях Особняки, Збочно; вокруг Волковыска – Мстибово, Лысково; вокруг Гродно – Одельск; вокруг Лиды – Костенево, Кульбачина, Турийск, Городище, Трабы; вокруг Новогрудка – Дятлово, Осташин, Городище. Размещаются они неравномерно: иногда охватывая замок со всех сторон (Новогрудок), иногда прикрывая только одно направление (Слоним).

В принципе не следует исключать и узлы четвертого порядка, которые могли формироваться вокруг отдельных городищ. Но если они существовали, то у них были небольшие укрепления, и они имели местное значение. Исследование таких графов следует вести на топическом уровне и скорее уведет нас от монументального зодчества к археологическим памятникам.

Параллельно защитным цепям, организованных для обороны ВКЛ, формировалась фортификационная цепь для осуществления агрессивных целей. Она выстраивалась соседними государствами для борьбы с ВКЛ, но поскольку во многом повторяла белорусские границы, то ее можно включить в общую оборонительную систему. Основная часть этой линии находится за пределами Беларуси и поэтому не рассматривается. Ее след проявляется на территории Беларуси в виде Каменецкой башни (1276 – 1288), которая была выстроена галицко–волынскими князьями в целях обороны от молодого соседа.

Сложная система граф вышеизложенной схемы вовсе не предполагает строгое соответствие теории. Она вовсе не отменяет иные закономерности распространения памятников монументального зодчества, а скорее стремится включить их в себя. В рассматриваемый период большая роль отводилась природному фактору, а теория граф применима в первую очередь к густозаселенным территориям (В.Кристаллер вывел свою теорию на примере густозаселенных районов юга Германии). Существенным остается стремление разместить укрепления на берегах, в местах слияния рек (Гродно, Слоним, Волковыск); на господствующих высотах (Новогрудок, Крево). Но, претерпевая значительные отклонения от теоретических построений в силу различных факторов, это всего лишь подтверждает общее правило. Освоение какой-либо территории представляет собой социально-культурный процесс, и поэтому всегда будет подчиняться социальным законам.

Таким образом, налицо существование сложной взаимосвязанной системы размещение оборонительных конструкций. Ее условно можно назвать «Новогрудско-Виленской системой оборонного зодчества». Она полностью сформировалась приблизительно в XIII – XV веках в рамках романского и готического архитектурных стилей из-за постоянной угрозой внешнего вторжения. На основании вышеописанной системы при районировании культурного наследия нашей страны целесообразно выделять Новогрудско-Виленского района оборонного зодчества, включающего Гродненскую область, север Брестской и выходящий за пределы Беларуси.

Литература и источники

1. Архітэктура Беларусі: Энцыкл. Давед / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: А. А. Воінаў і інш. – Мн.: БелЭн, 1993. – 620 с.: іл.

2. Самусік А.Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі: Вучэб. дапаможнік / А.Ф.Самусік. Мн.: БДЭУ, 2004. – 209 с.

3. Ткачоў М.А. Замкі Беларусі. – Мн.: Полымя, 1977. – 84 с.

4. Гродненская область. Общегеографический атлас. – Мн.: РУП «Белкартография», 2002. – 24 с.

У.П. Серпухаў, БДУ, г.Мінск

БЕЛАРУСЫ Ў ЭТНІЧНАЙ СТРУКТУРЫ ВІЛЕНШЧЫНЫ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX СТАГОДДЗЯ НА АСНОВЕ ЛІТОЎСКІХ І ПОЛЬСКІХ КРЫНІЦ

Першыя працы, якія прадстаўлялі рассяленне насельніцтва, распаўсюджанне мовы і культуры, з'яўляюцца на пачатку XIX стагоддзя. Мелі яны спачатку апісальны характар і канцэнтравалі шчвагу на пэўных фальклярыстычных рысах. Трэба адзначыць працы С.Плятэра (1825), І.Словачыньскага (1833–1839), а таксама грунтоўнўю працу аўтараў пачатку XIX ст.: М.Баліньскага і Е.Ліпіньскага (1846) [2, с. 25]. У гэтых працах адлюстравана тагачасная лінгвістычная граніца паміж вескамі, у якіх сяляне размаўлялі па-літоўску, і тымі, у якіх карысталіся т.зв. славянскім дыялектам. Праца мае вялікую пазнаваўчую каштоўнасць, бо адлюстроўвае ўжо даўно існую сітуацыю. Аўтары выразна акрэслілі змены, якія адбываліся на літоўска-беларускім паграніччы. Эвалюцыя была вялікая і асноўвалася на перанясенні славянска-літоўскай граніцы на Захад. Вёскі, насельніцтва якіх у сваёй большасці было каталікамі, паступова паддавалася працэсам дэлітуанізацыі. На аснове старых дакументаў М.Баліньскі і Т.Ліпіньскі сцвярджалі, што да шведскіх войн у XVII ст. цэлы Віленскі павет быў літоўскамоўны. Пасля ваенных знішчэнняў пачаўся наплыў з усходу беларусаў [1, с. 58]. У вёсках на ўсход ад Вільні ў той час па-літоўску ўжо не гавораць. Ва ўсіх раёнах Віленшчыны па правы бок Віліі (Neris), а таксама ў многіх вёсках па леваму боку ракі яшчэ дамінавала ў 30-я гады літоўская мова. Аднак па ўсходняй частцы Віліі людзі размаўлялі па-польску і па-беларуску.

На падставе сур'езных даследванняў, заснаваных на багатай лінгвістычнай літаратуры, П.Гаўчас і А.Відугірыс прадставілі працэсы моўнай дэлітуанізацыі наступным спосабам: «Па аб'ектыўных прычынах ва ўсіх сферах жыцця на месцы літоўскай мовы ўсе больш і больш узмацнялася беларуская мова і часткова польская. Працэс моўнай змены паступова займаў асноўныя цэнтры, аколіцы гарадоў, найважнейшых дарог і г.д. Усе гэта прыводзіла да таго, што ў сярэдзіне XIX ст. узмацнілася славянізацыя літоўскамоўнай частцы насельніцтва. У сувязі з гэтым з'яўляецца новая форма славянізацыі вяскоўцаў – масавы пераход на польскую мову. У другой палове XIX стагоддзя щ месцах ужывання літоўскай мовы пачынае распаўсюджвацца польская мова, а не беларуская» [2, с. 25].

На тэрыторыях, якія ўваходзілі ў склад Расійскай Імперыі, праводзіліся т.зв. «рэвізіі». Гэта былі дастаткова прымітыўныя спісы насельніцтва. Выкарыстоўвалі іх у ваенных і падаткавых мэтах. Дакладнасць іх была не вельмі высокая. На некаторых тэрыторыях лічба насельніцтва была завышанай, на іншых, наадварот, заніжанай. Не толькі агульная лічба

насельніцтва насцярожвае, але і дадзеныя адносна нацыянальнага складу не дакладныя. Справа ў тым, што калі вёўся ўлік, нацыянальная свядомасць сялянскай масы, а гэта была большасць на тэрыторыі Імперыі, была нізкай. Чыноўнікі ўпісвалі нацыянальнасць, не пытаючы людзей прыватна, а толькі групова згодна ўласнага погляду ці нават інтуітыўна. Першая рэвізія, якая закранула землі былой І Рэчы Паспалітай, а таксама паўночна-ўсходнія літоўска-беларускія крэсы, была V рэвізія (1796 г.). Вынікі былі выдадзены толькі ў 1808 годзе. На літоўска-беларускіх землях (можна прыняць прыблізна абшар сучасных Беларусі і Літвы) апытана 5159,7 тыс. жыхароў, у тым ліку літоўцаў было 624,0 тыс, ці 12,1 % агульнага засялення. Трэба адзначыць, што пераважала на гэтай тэрыторыі беларускае насельніцтва – 3220,0 тыс. Польскага насельніцтва запісана 280,3 тыс. [2, с. 26].

Чарговая IX рэвізія была праведзена на падставе царскага маніфеста з 1850 года. Падобна як і ў папярэдніх перапісах, пад увагу ўзяты літоўска-беларускія землі, на якіх пражывала 6315,5 тыс жыхароў, у тым ліку 877,2 тыс. літоўцаў (13,9 % ад агульнай заселенасці). На тэрыторыі Польскага Каралеўства налічвалася 251,8 тыс. літоўцаў. Разам – 1129,0 тыс. насельніцтва літоўскай нацыянальнасці. Трохі пазней праведзена X рэвізія (1859 г.), якая ахапіла Расійскую Імперыю разам, у тым ліку і Польскае Каралеўства. Вынікі перапісу на літоўска-беларускай тэрыторыі добра паказаны ў табліцы 1.

Табліца 1.

Вынікі перапісу 1859 г. на літоўска-беларускай тэрыторыі.

Беларусы	**3 598,9 тыс.**	**ці 55,0 % агульнага нас-ва**
Літоўцы	931,7 тыс.	14,2 %
Рускія	644,7 тыс.	9,9 %
Яўрэі	551,9 тыс.	8,4 %
Палякі	338,5 тыс.	5,2 %
Украінцы	278,5 тыс	4,3 %
Латышы	155,4 тыс.	2,4 %
Немцы	21,6 тыс.	0,3 %
Іншыя нацыянальнасці	19,1 тыс.	0,3 %
Р а з а м	6 540,3 тыс.	100,0 %

Крыніца: Eberhardt P. Przemiany narodowosciowe na Litwie. – Warszawa, 1997. – S.27.

З табліцы добра відаць, якая этнічная сітуацыя назіралася ў другой палове XIX ст. на літоўска-беларускіх землях. Нават калі і ёсць хіба, пераважная колькасць беларусаў відавочна. Пётр Эберхардт, каменціруючы вынікі перапісу, адзначыў, што тут заніжана колькасць палякаў і завыша-

на колькасць рускіх. А колькасць літоўцаў на аналізаванай тэрыторыі набліжаецца да 1,0 млн. жыхароў.

На тэрыторыі ўсёй Расійскай Імперыі пасля Х рэвізіі адзначана 1203,8 тыс. літоўскага насельніцтва. У працы В.Кабузана ў месцы, дзе ўпамінаецца аб колькасці літоўскага насельніцтва ў граніцах Расіі, адначасова прадстаўлены на аснове працы П.Кеппена дадзеныя аб колькасці літоўцаў ва Усходняй Прусіі [2, с. 27]. Згодна з гэтай інфармацыяй, у 40-х гадах XIX ст. у Гомбіньскім раёне (Gumbinl) 191,9 ?ыс.літоўцаў, у тым ліку ў павеце Нізіны (Nemunymas) 25,3 тыс., у павеце Тыльжа 22,8 тыс., у павеце Рагнета 21,1 тыс. і г.д. Разам на гэтых тэрыторыях на сярэдзіну XIX ст. пражывалі каля 1,4 млн. літоўцаў. У гэты час распаўсюджанне літоўскай мовы было адносна моцным. У наступныя дзесяцігоддзі, ажно да пачатку XX ст. этнічныя літоўскія тэрыторыі змяншаюцца. З аднаго боку, у выніку інтэнсіўных працэсаў германізацыі пачалі скарачацца тэтыторыі, на якіх жылі літоўцы, ва Усходняй Прусіі. А з Усходу назіраецца ўплыў беларускай і польскай моў, што прыводзіць да славянізацыі літоўскай масы, якая пражывае між сярэднім Неманам і сярэдняй Дзвіной.

Можна сцвердзіць, што скарачэнне літоўскіх этнічных абшараў хутчэй праходзіла ў частцы Усходняй Прусіі. У пачатку XIII ст. сяляне яшчэ карысталіся літоўскай мовай [3, с. 79]. На працягу наступных 200 гадоў моўная граніца набліжаецца да Нёмана. У выпадку Усходняй Прусіі ўлады праводзілі палітыку германізацыі. А праз нямецкамоўную школу і адміністрацыю і наплыў нямецкіх каланістаў адбываўся паступовы працэс знікнення літоўскай мовы. Пачынае ўплываць польскі двор і польскамоўны касцёл. У заходнім напрамку адбываецца экспансія беларускай мовы. Такім чынам, паступова адбывалася славянізацыя сялянскага насельніцтва і знікненне літоўскай мовы. Беларусізацыя часта звязвалася з адначасовым выкарыстаннем двух або трох моў. Пазней сярод літоўскамоўнага насельніцтва нацыянальная палярызацыя адбывалася пад уплывам веравызнанёвай прыналежнасці. Католікі выразна далучалі сябе да палякаў. Праваслаўныя ж, якія карысталіся беларускай мовай, атаясамлялі сябе спачатку з рускімі, а потым з беларускай этнічнай групай. Да сярэдзіны XIX ст. не вялося ў гэтым накірунку ніякіх навуковых даследаванняў. Таму інфармацыя і погляды часам пазбаўлены навуковай сілы. Этнічныя пагранічча, на якія пранікалі ўплывы розных культур, рэлігій ці моў, узбуджалі большае зацікаўленне даследчыкаў. Гэта тычыцца ўсяго літоўска-беларускага пагранічча, а больш канкрэтна Віленшчыны [4, с. 45].

Літоўскі дэмограф П.Гаўчас, у дзвюх сваіх апрацоўках (1983, 1993), зрабіў некалькі статыстычных XIX-вечных прац, якія спрабавалі акрэсліць этнічную структуру літоўска-беларускага пагранічча. Даследчыкі абапіраліся на ўжо ўпамянутыя раней рэвізіі і касцельныя матэрыялы. Але ў гэтых крыніцах шмат памылак. У сярэдзіне XIX ст. грамадская свядомасць сялянскай масы не была яшчэ дастаткова высокай. Адзіным вызначальным крытэрыем была мова, аднак сяляне часта карысталіся мясцовымі дыялектамі ці адначасова дзвюма мовамі.

Першая інфармацыя, якая заслугоўвае ўвагі ў справе падліку этнічнага складу насельніцтва, тычыцца 1857-1858 гадоў і была апублікавана ў 60-я гады XX ст. Тут вялікі ўклад зрабілі даследчыкі, якія знаходзіліся на службе ў расійскіх улад. Статыстычныя аналізы ахоплівалі частку былога Вялікага княства Літоўскага, у тым ліку Віленскую губерню. На іншых літоўска-беларускіх губернях этнічны склад больш стабільны і не падлягаў зменам. Сялянскае насельніцтва Ковенскай і заходняй частцы Віленскай губерні ў пераважнай большасці карысталася літоўскай мовай. Губерні, якія знаходзіліся больш на ўсход, былі заселены праваслаўным беларускамоўным насельніцтвам [2, с. 30].

На аснове звестак, прадстаўленых П.Гаўчасам, польскі гісторык Пётр Эберхардт прадставіў этнічную структуру Віленскай губерні. Статыстычны аналіз рабіўся ў адзін і той час, у 1857-1858 гг., але вынікі вельмі розныя. Працэнтная колькасць літоўцаў вагаецца між 50,0 % (М.Лебедкін) і 23,6 % (П.Бацюшкаў і М.Янжуль), палякаў – паміж 12,3 % (А.Корава) і 24,7 % (Р. дэ Эркерт). Істотная розніца пры падліку беларусаў, якіх паміж 20,2 % налічыў М.Лебедкін і 46,9 % у П.Бацюшкава і М.Янжуля. Р. дэ Эркерт увогуле не выдзяляў беларусаў, бо каталікоў ён далучыў да палякаў, а праваслаўных – да рускіх. Погляд Р. дэ Эркерта аб вялікай сувязі паміж каталіцтвам і ідэнтыфікацыяй сябе палякамі сярод славянскамоўнага сялянства на польска-беларуска-ўкраінскім пагранічча стаіць пад пытаннем, а расійскія этнографы ўвогуле лічаць яго памылковым [2, с. 30].

Такім чынам, этнічны склад разглядаемай Віленскай губерні вельмі супярэчлівы. Этнічная сітуацыя была неўстабілізавана, а будучая эвалюцыя змен яшчэ складаная для акрэслення. Дадзеныя перапісу паказваюць, што на тэрыторыі Віленскай губерні існуе вялікая група палякаў. Губерню можна нават вобразна падзяліць на дзве часткі: літоўскую (заходнюю) і беларускую (усходнюю). Але гэта ўсяго толькі спроба зрабіць аналіз этнічнага складу насельніцтва Віленшчыны ў другой палове XIX стагоддзя на аснове пераважна польскіх і літоўскіх крыніц.

Літаратура і крыніцы

1. Appelebaum A. Mikdzy Wschodem a Zachodem. Przez pogranicza Europy. – Warszawa, 2001.

2. Eberhardt P. Przemiany narodowoњžiowe na Litwie. – Warszawa, 1997.

3. Kurzowa Z. O mowie Poliakyw na kresach wschodnich. – Krakyw, 1993.

4. Stoczewska B. Litwa, Biaioruњ, Ukraina w muњli politycznej Leona Wasilewskiego. – Krakyw, 1998.

С.В. Донских, ГрГУ им. Я.Купалы, г. Гродна

ЗАПАДНОБЕЛОРУССКИЙ РЕГИОН В ИСТОРИЧЕСКОЙ РЕТРОСПЕКТИВЕ: ОПЫТ КУЛЬТУРНО-ИСТОРИЧЕСКОЙ ДЕКОНСТРУКЦИИ

Попытка осмысления феномена западно-белорусского региона в контексте постмодернистских понятий-метафор это не просто дань интеллектуальной моде. В основе данного опыта лежит гипотеза об эвристическом потенциале рассмотрения прошлого/настоящего Западной Беларуси сквозь призму политически детерминированных смыслопорождающих топонимов.

Понятие деконструкции было предложено французским философом Жаком Деррида (1930 – 2004) в рамках его известного проекта «Грамматологии» и получило широкое распространение в различных современных интеллектуальных течениях с приставкой «пост...». Демонстрируя возможности деконструкции, сам мыслитель сознательно не пытался давать ей традиционную «рационализированную» дефиницию. Это вынуждены были сделать исследователи Дерриды, которые породили целый ряд определений деконструкции:

- «В целом деконструкция – это разборка концептуальных оппозиций, поиск «апорий», моментов напряженности между логикой и риторикой, между тем, что текст «хочет сказать», и тем, что он принужден означать»;

- «Деконструкция – это не критика, не анализ и не метод, но художественная транскрипция философии на основе данных эстетики, искусства и гуманитарных наук, метафорическая этимология философских понятий...» [1].

В данном контексте опыт культурно-исторической деконструкции западно-белорусского региона можно рассматривать как попытку выявления тех сознательных и неосознанных смыслопорождающих моментов (связанных с неизбежной интертекстуальностью любого понятия), которые связаны с региональным определением и самоопределением Западной Беларуси. При деконструкции понятия Западной Беларуси нас интересует не означаемая им реальность, но детерминированные самим понятием смыслы и подтексты, которые задают исследовательские подходы и парадигмы.

Понятие Западной Беларуси продукт политических реалий XX века. Его «золотое время» – первая половина этого столетия, точнее 20 – 50-е годы прошлого века. При первом приближении это классический неологизм, результат исторически сложившегося равновесия сил на полпути между Варшавой и Москвой в результате Рижского мира 1921 г. По его итогам и появляется в советской науке понятие «Западной Белоруссии» [2, с.166-167].

Географическая «привязка» с западом позволяет не только локализовать данный регион в пространстве, но связывает его в советском сознании с враждебным Западом – главным противником грядущего коммунизма. Но в словосочетании с Белоруссией это имплицитно закладывает возможность/необходимость «выхода» за существующую границу, ибо за «западно-белорусским» – захваченным/угнетаемым/полонизированным, просматривается идеологический конструкт XIX века – «западнорусский» – отторгнутый/окатоличенный/ополяченный [3]. В обоих случаях вектор актуализации понятия направлен на воссоединение со «своим», исконным – Западной Русью/Западной Белоруссией. Различие лишь в том, что для «западнорусизма» центр тяжести воссоединения лежал в области внутренней политики (польское землевладение, костел, русская школа и т.д.), а для «западнобелорусизма» воссоединение мыслилось как внешняя задача, да еще и с реваншистским подтекстом. В межвоенный период в СССР хорошо помнили, что поход Красной Армии на Берлин был остановлен под Варшавой, похоронив надежды на мировую революцию.

При этом борьба советской власти за воссоединение Западной Белоруссии с БССР выглядит для своего времени достаточно легитимно, учитывая широкое распространение идеи права наций на самоопределение в рамках Версальской системы, и позволяет избежать обвинений в имперских амбициях. Ведь Советское государство борется за «лучшую жизнь» для одного из «малых народов» – белорусов. В то же время Белоруссия фонетически ассоциируется с Россией, что делает задачу «воссоединения Западной Белоруссии» не просто локальной задачей, но почти «общесоюзным» делом. Наконец, понятие Западной Белоруссии позволило окончательно развести эту территорию с Польшей и что особенно важно, Литвой. Ведь еще в 1918 г. для Советской власти граница Литвы и Беларуси не была чем-то самоочевидным (Литовско-Белорусская ССР). Тем самым понятие Западной Белоруссии надолго отсекало для белорусской интеллектуальной традиции возможности опоры/ идентификации с «литвинским/великолитовским» культурно-историческим наследием. Ведь для своего полноценного бытия «западное» неизбежно нуждается в «восточном». «Грамматологически» невозможно «западное западнее запада». Белорусское же «восточное» это БССР в «межвоенном треугольнике» Минск – Витебск – Гомель и своеобразным нормативным центром – Могилевом. Исторически в основе этого белорусского центра эпохи модерна лежало «Белорусское наместничество» 1772 г. [4, с. 306-308], в то время как большая часть Западной Белоруссии много веков соотносилось с полонизированной «исторической Литвой» [5].

После второй мировой войны широко распространенное понятие Западной Белоруссии уходит в тень, становится полуофициальным, но широко распространенным. «Ордодоминантное забвение» Западной Белоруссии не было абсолютным. Понятие признавалось лишь как историческое, ограниченное в своем бытии 20 – 30-ми годами XX века. О нем всегда вспоминали на ежегодных торжествах 17 сентября, посвященных

«воссоединению» трудящихся Западной Белоруссии с БССР и сразу же забывали на следующий день: «Мавр сделал свое дело – мавр может уходить». Акцент делался на нивелировке «западно-белорусского» и «восточно-белорусского». На официальном уровне бытия «здесь и сейчас» было принято говорить не о Западной Белоруссии в целом, но и двух белорусских краях: Гродненской области – «Панямонні» и Брестской области – «Пабужжы».

Однако понятие «Западной Белоруссии» оказалось востребованным на неофициальном, повседневном уровне. Оно оказалось востребованным для демаркации советской «зоны процветания», выгодно отличавшейся даже на фоне «образцово-показательной» советской республики БССР от всего советского пространства с его «хроническим дефицитом». По мере кризиса советской системы, когда все «западное» стало притягательно манящим и идеализированным, понятие «западно-белорусского» стало потенциально опасным. Оно ассоциировалось с более высоким уровнем жизни, культурными стандартами, зримыми свидетельствами «западного, но отнюдь не тлетворного влияния»: первой газетой, парком, железной дорогой, светским женским ученым заведением, каналом, театром, медицинской школой, замками и костелами, представительской демократией и даже возможностью приема иностранного (польского) телевидения!

Явно обнаружившаяся к концу 70-х годов XX века престижность «западно-белорусского» стала вызывать некоторые опасения. Конструкт «западно-белорусского» обнаружил в себе несомненный потенциал для региональной идентификации не только «исконного» белорусского и польского населения, но и русских «внутренних мигрантов». Для последних «западное» обладало притягательным ореолом престижности, а «белорусское»/«почти русское» позволяло успешно ассимилироваться на региональном уровне уже во втором поколении [6, с.26-37].

С превращением БССР в независимую Республику Беларусь понятие «Западной Белоруссии» трансформировалось в Западную Беларусь, а по мере укрепления белорусской государственности появилось и политически корректное для унитарного государства понятие «западного региона Беларуси». Здесь деконструкция обнажает новые аспекты «западнобелорусской» экзистенции. В своем классическом (советском) варианте Западная Белоруссия не имела собственного регионального измерения. Все ее качества определялись внешним образом по отношению к национальному центру. «Западно-белорусское» рассматривалось как деформированный вариант «исконно-белорусского».

В дефиниции «западного региона Беларуси» имплицитно заложен акцент на региональное своеобразие. Латинское «region» (район, область) не случайно этимологически предшествует средневековому «regnum» (королевство). Ведь для средневековой латинской мысли христианизированная, и потому «священная», Римская империя продолжала существовать, несмотря на политическую независимость своих регионов-королевств. Поэтому любой регионализм рано или поздно генетически предрасполо-

жен поставить вопрос о перераспределении властных полномочий. Свидетельством этому является политически активный и влиятельный современный регионализм в рамках Евросоюза.

В контексте современного регионализма модно рассматривать Западную Белоруссию как пограничье, что дает возможность «инокультурному» бытию обрести легитимный статус («свои чужие») [7, с.407-410]. Причем самоосмысление Западной Беларуси как региона-пограничья позволяет встраивать ее в более широкие культурно-исторические контексты, а не ограничиваться только национальными рамками. В рамках регионализма можно пытаться возродить «исконные», близкие к этнополитическим формы локальной идентификации, например – «великолитовской», что вообще выводит нас за рамки собственно «западно-белорусского» дискурса в «донациональный» контекст [8]. Впрочем, последнее пока воспринимается как откровенно маргинальное явление.

Таким образом, понятие Западной Белоруссии возникло в конкретной геополитической ситуации крушения континентальных империй и появления национальных государств по аналогии с понятием Западной Руси российского позднеимперского дискурса «западнорусизма». Первоначально это была лишь «утраченная/отторгнутая» территория. Наложенное на реальность посредством политических и идеологических рычагов понятие Западной Белоруссии стало основой своеобразного регионального самосознания на рубеже XX – XXI в., которое тяготеет к диалогу с популярным в объединенной Европе регионализмом.

Литература и источники

1. Гурко Е. Деконструкция: тексты и интрепретация. Деррида Ж. Оставь этот имя (Поскриптум), Как избежать разговора: денегации. – Мн., 2001; Деррида Ж. О грамматологии. – М., 2000; Маньковская Н.Б. Эстетика постмодерна. – СПб., 2000; Ильин И.П. Постструктурализм. Деконструктивизм. Постмодернизм. – М., 1996; Культурология. XX век Словарь. – СПб., 1997.

2. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мн., 2000.

3. Цьвікевіч А. «Западна-русізм»: Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. – Мн., 352; Черепица В.Н. Михаил Осипович Коялович. История жизни и творчества. – Гродно, 1998.

4. Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края. – Мн., 2004.

5. В дискуссии после данного доклада Э.АМазько отметил существенный для понимания «генеалогия» понятия «Западная Белоруссия» факт: деятели белорусского национального движения на территории Западной Белоруссии в 20-30-х годах XX в. не употребляли этого понятия. Они рассматривали эти земли как собственно белорусскую, исконно белорусскую территорию – «Terra Sacrum» белорусской нации с городами-символами Вильно, Гродно, Новогрудком. Единственным социальным носителем этого понятия была КПЗБ – Коммунистическая партия Западной Белоруссии.

6. Разенфельд У.Д., Бяспамятных М.Н., Кабяк Г.М, Шчалбаніна Г.М. Сацыякультурныя дэтэрмінанты нацыянальнага развіцця (заходні рэгіён Беларусі) //

Этнасацыяльныя і культурныя працэсы ў заходнім рэгіёне Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Мат-лы навук. канферэнцыі. – Гродна, 1998.

7. Донских С.В. Гродненщина в XXI веке: пограничье в условиях глобализации // 60-летие образования Гродненской области: Мат-лы науч. конф. – Гродно, 2004.

8. Куплевіч В. Асноўныя тэзы вялікалітоўскай дзяржаўніцкай ідэі // Yarrava Vвlikaa Litva. – 2001. – № 1.

С.П. Марозаў, ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

МАРАЛЬНА-ПАЛІТЫЧНЫЯ ПОШУКІ СТУДЭНТАЎ ВІЛЕНСКАГА УНІВЕРСІТЭТА І СУДОВАЯ СПРАВА ПРАФЕСАРА ІГНАТА АНАЦЭВІЧА

Пасля разгрому ў Віленскім універсітэце, які ў першай трэці XIX ст. рыхтаваў кадры інтэлігенцыі для Беларусі і Літвы, тайнага студэнцкага таварыства філаматаў новы рэктар ураджэнец Слоніма Венцаслаў (Вацлаў) Пелікан пад эгідай куратара Віленскай навучальнай акругі сенатара Мікалая Навасільцава праводзіў рэформу навучальнай установы з мэтай выкаранення сярод студэнтаў апазіцыйных настрояў і прышчэплівання вернасці трону. Паколькі універсітэт адчувальна ўплываў на інтэлектуальнае і грамадска-палітычнае жыццё значнай часткі ўсходняй і цэнтральнай Еўропы, імператар Мікалай I і правіцель заходніх губерняў вялікі князь Канстанцін Паўлавіч надзялілі іх дзеля барацьбы з «паўсюдна існаваўшым сярод моладзі духам уяўнай свабоды» [1, арк. 102 адв.] шырокімі паўнамоцтвамі. Гэта быў час рэакцыі і пераследу прагрэсіўнай прафесуры і студэнцтва.

Ва універсітэцкае жыццё ўвялі жорсткія правілы і пакаранні за іх парушэнне. Забаранялася без асаблівай прычыны збірацца разам, без дазволу выходзіць за горад, уступаць у таварыствы – каб не распаўсюдзілася сярод студэнцкай моладзі вальнадумства. Да яе ставіліся як да школьнікаў. Практыкаваліся цялесныя пакаранні. За найменшыя правіны студэнтаў выдалялі з універсітэта. Укаранілі сістэму данасіцельства і правакатарства – і любыя «бунтоўныя» намеры студэнтаў адразу станавіліся вядомымі кіраўніцтву. За моладдзю ўстанаўліваўся паўсюдны нагляд: у класе, касцёле, на кватэры, у горадзе [2, арк. 38 адв. – 39, 44–45 адв.]. Універсітэцкая паліцыя не сядзела без справы. Сістэма пераследу, якая надзвычай развілася ў 1826–1827 г., зламала лёс дзесяткам юнакоў таго студэнцкага пакалення.

На змену выдаленай за вальнадумства перадавой, любімай студэнтамі прафесуры, якая адчувала сваю адказнасць за лёс краю і гэтай моладзі, прыйшлі выкладчыкі, невядомыя ў навуцы, абыякавыя да лёсу краю, якія замест павагі выклікалі ў студэнтаў толькі пагарду [3, с. 108–111].

Павел Кукальнік, напрыклад, узведзены на кафедру сусветнай гісторыі, выкладаў «пародыю гісторыі», без найменшага разумення прадмета і велічы свайго прызвання. Замест паказу духу і атмасферы стагоддзяў, народаў і вялікіх асоб ён абмяжоўваўся чытаннем пажоўклых папер або несусветным трызненнем з кафедры, з якой да яго вяшчаў знакаміты і ўсімі любімы Іаахім Лялевель. У сумным становішчы знаходзіўся той студэнт, які пад пагрозай зняволення або выгнання вымушаны быў слухаць П.Кукальніка пасля І.Лялевеля [4, с. 394].

Пагарду і нянавісць моладзі выклікала і новае універсітэцкае кіраўніцтва, якое, не перастаючы пры кожным выпадку дэманстраваць свой клопат пра маральнасць студэнтаў, само не вылучалася высокім маральным узроўнем. Шматлікія раманы В.Пелікана, п'яныя оргіі і карцёжныя гульні з удзелам сенатара М.Навасільцава, саветніка Байкова, прафесараў М.Мяноўскага, Беркмана, братоў Кукальнікаў ведала ўся Вільня. Атрымалі галоснасць фінансавыя злоўжыванні В.Пелікана і яго клікі, якую сучаснік Станіслаў Мараўскі назваў «генерацыяй нягоднікаў» [5, с. 347].

Настроі студэнтаў падтрымлівала віленская публіка, сярод якой увесь час кружылі дражлівыя анекдоты і колкія вершыкі на адрас універсітэцкага начальства. Аўтарам многіх з іх быў паэт Антон Гарэцкі – яго байкі з палітычнымі намёкамі паўтарала ўся Вільня.

Кожны новы факт пераследу студэнтаў – а яны заўсёды станавіліся набыткам галоснасці – ўзмацняў нянавісць да кіраўніцтва. Нябачная рука біла вокны рэктарскай кватэры, раскідвала па горадзе ўлёткі з памфлетамі на яго адрас. Сярод юнакоў знаходзіліся і такія, што, не ўдаючыся ў пралікі наступстваў, задумвалі звольніць моладзь ад праследуючага яе злога генія. Той навадніў вуліцу, на якой жыў, ахоўнікамі, якія сцераглі яго спакой [4, с. 396–397]. Ці не першы ў гісторыі прыклад утрымання аховы пры рэктары, чаго не практыкавалася ні ў адным з універсітэтаў.

У той атмасферы пераследу, нагляду і даносаў студэнтамі была прадпрынята спроба разгарнуць дзейнасць новага тайнага таварыства пад назвай «Патрыёты Айчыны», або «Племя сарматаў» з прэтэнзіяй на працяг справы філаматаў. Гэта быў час, калі псіхоз канспірацыі, здавалася, агарнуў усю Еўропу.

Заснавалі таварыства ў кастрычніку 1827 г. студэнты-першакурснікі Канстанцін Заха з Гродзенскай губерні і Адам Траскоўскі. Кіраўніком арганізацыі прызначылі Іосіфа Гранткоўскага, які быў старэйшым за іх, ужо чалавекам жанатым і карыстаўся даверам астатніх. Пачаўся пошук аднадумцаў. Фелікса Лісоўскага і Юльяна Фіжана першымі ўзмоцнена намаўлялі да сябе далучыцца. У бліжэйшай будучыні планавалася значнае пашырэнне кола змоўшчыкаў, у перспектыве – заснаванне філіялаў арганізацыі ў месцах канцэнтрацыі студэнцкай або вучнёўскай моладзі: гарадах Гродне, Мінску, Брэсце, Беластоку, Львове, Познані, Варшаве, Кракаве, Любліне, Сандаміры.

Галоўнай мэтай сваёй дзейнасці таварыства абвяшчала аднаўленне незалежнай Рэчы Паспалітай у межах да 1772 г. Для дасягнення гэтай

мэты вырашылі супрацоўнічаць з іншымі аналагічнымі таварыствамі. Быў распрацаваны ўстаў арганізацыі, клятва вернасці і клятва маўчання, уведзена сімволіка [6].

Але ў тых умовах студэнцкае таварыства было асуджана. Сістэма даносаў, прышчэпленая ва універсітэце, прывяла да абрыву дзейнасці «сарматаў», або «патрыётаў» – так называлі сябе члены арганізацыі – яшчэ на стадыі яе фарміравання. Яшчэ толькі рыхтаваліся праграмныя дакументы, а ужо правакатар Юльян Фіжан, якому Канстанцін Заха неасцярожна прапанаваў уступіць у саюз, данёс рэктару аб стварэнні новага таварыства і прынёс яго пракламацыю. Два месяцы ішло сакрэтнае назіранне за змоўшчыкамі, падслухоўванне.

К.Заха ў роспачы, што ўсё выкрыта, задумаў адчайны крок – забойства рэктара, а потым уцёкі ў Паўднёвую Амерыку [7, с. 485]. Гэта былі надзвычай дзіцячыя і безразважныя планы.

У пачатку 1828 г. пачаліся арышты і вобыскі. «Патрыётаў» спачатку ўтрымлівалі ва універсітэцкім будынку, пасля перавялі ў кармеліцкі манастыр. Спецыяльна створаная камісія на чале з Байковым вяла сакрэтнае следства. Яна адзначала, што ў падобныя тайныя таварыствы ўваходзяць большай часткай студэнты, «выдатнейшыя ў навуках» [1, арк. 100 адв.]. К.Заха трымаўся на допытах мужна. Не ўвільваў ад адказнасці і А.Траскоўскі. Затое І.Грантоўскі выдаваў ўсё і ўсіх.

Камісія прыгаварыла заснавальнікаў таварыства К.Заху і А.Траскоўскага да пакарання пяцідзесяццю ударамі розаг, Ф.Лісоўскага – дваццацюпяццю. Іх выключылі з універсітэта і аддалі ў салдаты з высылкай ў дзеючую армію на Каўказ. Яшчэ двух студэнтаў, І.Грантоўскага і Ігнатовіча, аддалі на пакаянне ў манастыр, пасля чаго першага выслалі на радзіму, у Валынскую губерню, пад нагляд паліцыі, а другога вярнулі ва універсітэт [1, арк. 4 адв. – 5, 97 адв.].

Выкрыццё «Племя сарматаў» стала фармальнай зачэпкай для расправы з віленскім прафесарам беларускага паходжання, ураджэнцам Малой Бераставіцы Ігнатам Анацэвічам, які цудам уцалеў у час разгрому юрыдычнага факультэта 1823–1824 г. Ён меў вялікі ўплыў на студэнцкую моладзь і быў «шкодным» сваім вальнадумствам і патрыятызмам.

Пры вобыску на кватэры К.Захі быў знойдзены пісаны яго рукой разарваны ліст, адрасаваны універсітэцкаму прафесару, без указання яго прозвішча, з запрашэннем прыняць кіраўніцтва над тайным таварыствам. На допытах «сарматы» паказалі, што да ідэі аднавіць саюз філаматаў іх падштурхнулі лекцыі І.Анацэвіча, прасякнутыя гарачай любоўю да айчыны [4, с. 391], што збіраліся яго праінфармаваць аб закладанні свайго саюза і прапанаваць яму кіраўніцтва арганізацыяй [7, с.484]. На яго пала падазрэнне ў падбухторванні студэнтаў да стварэння тайнага таварыства.

Прафесара ўзялі пад хатні арышт, правялі вобыск на кватэры, канфіскавалі паперы. Следства не знайшло доказаў сувязі Ігната Анацэвіча са студэнцкім таварыствам. Падазрэння, якое заслугоўвала бы ўвагі камісіі, ён не выклікаў. Аднак сумненні наконт яго «добранадзейнасці» засталіся.

Моцна ўражаны, зняважаны хатнім арыштам і вобыскам і, відаць, натхнёны апраўданнем, прафесар кінуў выклік некаторым людзям з універсітэцкага начальства: дэкану медыцынскага факультэта М.Мяноўскаму, сакратару універсітэцкага праўлення Мержаеўскаму, рэктару. І.Анацэвіч западозрыў іх у змове з мэтай пазбавіцца ад яго, бо ён занадта шмат ведаў пра іх фінансавыя злоўжыванні. Абураны прафесар расказваў пра ўжытыя адносна яго рэпрэсіўныя меры ўсім сябрам і знаёмым. Па Вільні пайшлі чуткі пра суд над студэнтамі, які да выканання прыгавору павінен быў трымацца ў сакрэце. Грамадская думка чарговы раз апалчылася супраць рэктара.

Аддаленых вынікаў гэтага свайго кроку Ігнат Анацэвіч, канешне, прадбачыць не мог. Распачаўшы барацьбу, ён наклікаў на сябе такія сілы, перад якімі ён з усёй сваёй эрудыцыяй, аўтарытэтам, энергіяй і сувязямі, аказаўся на першым этапе безабаронным. Распачаўшы як абвінаваўца, ён не толькі развітаўся з універсітэцкай кар'ерай, але і быў кінуты на лаву падсудных.

Абвінавачаны ў нацыяналізме, «заганным ладзе думак» і «шкодным уплыве» на моладзь, І.Анацэвіч быў адхілены ад пасады. 14 мая пад паліцэйскім канвоем яго выдалілі з Вільні і выслалі на радзіму, у Малую Бераставіцу, дзе быў святаром яго брат Міхаіл, пад строгі паліцэйскі нагляд.

Вядомы вучоны, першы беларускі даследчык гісторыі Вялікага княства Літоўскага застаўся без працы і сродкаў існавання. А за спробу абараніць сябе і высланых на Каўказ студэнтаў хадайніцтвам перад высокімі саноўнікамі імперыі яго яшчэ і аддалі пад суд. Гродзенскі гарадскі суд і крымінальная палата апраўдалі прафесара. Віленскі генерал-губернатар іх рашэнне ўхваліў. Але сенатар М.Навасільцаў і вялікі князь Канстанцін Паўлавіч, які глядзеў на справы вачамі М.Навасільцава, з гэтым рашэннем не захацелі згадзіцца. Справа прафесара прайшла шматлікія інстанцыі і з 1832 г. разглядалася ў Пецярбургу: міністрам адукацыі, сенатам, міністрам юстыцыі, Дзяржаўным саветам, імператарам. Толькі ў пачатку 1836 г. сенат вызваліў яго ад адказнасці, фактычна прызнаўшы невінаватым [8, с. 82–96].

Шматгадовая апала, у якую папаў І.Анацэвіч, выбіла яго з жыццёвай каляіны, пазбавіла умоў для навуковай працы. Гэта, разам з канфіскацыяй падчас арышту яго навуковых матэрыялаў, не дало вучонаму магчымасці стварыць капітальную гісторыю Вялікага княства Літоўскага, над даследаваннем якой ён працаваў усё жыццё. Апала вучонага пазбавіла беларусаў і літоўцаў магчымасці ўжо ў першай палове XIX ст. займець сваю уласную раннюю нацыянальную гісторыю.

Літаратура і крыніцы

1. Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 378, 1828 год, спр. 644 «Следственное дело о тайном обществе Сармацкое племя или Приверженцы Отечества, здесь же о магистре Онацевиче, Горецком, Лисовском, Заборовском, Жемойтеле, Цехановиче. Началось 25 марта 1828 года». – 267 арк.

2. Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 721, воп. 1, спр. 775 «О полиции, учрежденной в Виленском университете для надзора за студентами с 1822 по 1833 год». – 222 арк.

3. Onacewicz I. Nota o kuratorii Nowosilcowa, podana na гкск generaia Rosen // Nowosilcyw w Wilnie w roku szkolnym 1823/4. Dol№czona Nota o kuratorii Nowosilcowa, podana na гкск generaia Rosen przez Onacewicza. Wyd. J.Lelewel. – Warszawa, 1831. – S. 93–115.

4. Iwaszkiewicz J. Z pamiкtnikyw H.Klimaszewskiego // Ksiкga pami№tkowa ku uczczeniu 350 rocznicy zaioїenia i X wskrzeszenia Uniwersytetu Wilecskiego. – T. 1. – Wilno: Nakiadem Uniwersyteta Stefana Batorego, 1929. – S. 384–403.

5. Morawski S. Kilka lat miodoњci mojej w Wilnie (1818–1825). – Warszawa: Pacstwowy Instytut Wydawniczy, 1959. – 641 s.

6. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 109. І экспедыцыя. Вопіс 3, 1828 год. Спр. 164 «О студентах Виленского университета Захе, Тржасковском, Гронтовском, Лисовском и других, учредивших тайное общество под названием «Племя сарматов или общество приверженцев Отечества» и о ректоре университета Пеликане и прочих должностных лицах». – 198 арк.

7. Iwaszkiewicz J. «Plemiк sarmatyw». Kartka z dziejyw tajnych zwi№zkyw na Uniwersytecie Wilecskim // Ateneum Wilecski. – 1923. – № 3–4. – S. 481–505.

8. Iwaszkiewicz J. Ignacy Їegota Onacewicz – historyk Litwy: Z dziejyw dawnego Uniwersytetu Wilecskiego / Wydai L.Їytkowicz // Studia i materiaiy z dziejyw nauki polskiej. – Warszawa.1961. – Seria A, zeszyt 4. – S. 41–126.

М.А. Ступакевич, ГрГУ им. Я.Купалы, г. Гродно

СРЕДНЕЕ И ПРОФЕССИОНАЛЬНОЕ ЖЕНСКОЕ ОБРАЗОВАНИЕ В ГРОДНЕНСКОЙ ГУБЕРНИИ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX – НАЧАЛЕ XX в.

Вторая половина XX в. стала временем кардинальных перемен в экономической и общественно-политической жизни Беларуси и всей Российской империи. Это оказало влияние и на развитие народного образования и педагогической мысли. Широкий размах приобрело движение за всесословное женской образование. Важным событием в жизни женской школы всей Российской империи стало открытие в 1858 г. в Петербурге женского училища ведомства императрицы Марии (жены императора Павла I) для приходящих девиц. Мариинское ведомство – это особое ведомство, которое существовало в России с конца XVIII в. и заведовало женскими заведениями (институтами благородных девиц, училищами, сиротскими приютами). Открытие в Петербурге Мариинского училища обратило на себя внимание Виленского военного губернатора В.И. Назимова. 9 августа 1858 г. он подал в Главный совет женских учебных заведений ходатайство об открытии в губернских городах Северо-Западного края, по примеру Петербурга, женских Мариинских училищ. Главный совет дал

согласие, и в начале января 1860 г. после двух лет подготовки Мариинские семиклассные училища для приходящих девиц почти одновременно открылись в трех губернских городах: 7 января – в Гродно, 9-го – в Вильно и 12-го – в Ковно [3, с.28]. Гродненское училище стало первым государственным женским учебным заведением на территории Беларуси. Во время его открытия в четырех классах занималось 59 воспитанниц. В 1862 г. Мариинские женские училища, в том числе и Гродненское, были переименованы в гимназии.

В первые годы своего существования гимназии развивалась слабо и медленно. Они не были популярны в среде польско-белорусского дворянства. Оно относилось к женским гимназиям с недоверием и предубеждением, как к заведениям от правительства. Но постепенно гимназии стали наполняться ученицами, среди которых находились дети состоятельных и бедных родителей различных вероисповеданий. Если в Гродненской гимназии в 1867 г. было 95 учениц, то в 1877 г. – 268, в 1886 г. – 293, в 1882 г. – 352, в 1899 г. – 472, в 1900 г. – 498 учениц [8, д.565, л.22; 14, с. 46-47].

Вопрос развития среднего женского образования был поднят с новой силой общественно-педагогическим движением конца XIX – начала XX в. В начале XX в. количество женских гимназий в Беларуси увеличивается большими темпами. В 1906 г. в Гродно была открыта частная женская гимназия Е.Н.Барковской, в 1909 г. – Волковысская гимназия, в 1910 г. – Слонимская женская гимназия (преобразована из частного учебного заведения). Учреждались также еврейские гимназии и прогимназии (неполные гимназии). На 1909 г. в Гродненской губернии функционировали 1 женская еврейская гимназия (Гродненская Вальдман) и 3 прогимназии [4, с.215].

Учебный курс женских гимназий был рассчитан на семь классов и включал в себя Закон Божий, русский язык и словесность, историю, географию, естествоведение, арифметику, геометрию, физику и космографию, чистописание, рукоделие. Эти предметы считались обязательными. За отдельную плату желающие обучались иностранным языкам (немецкому и французскому), рисованию, пению, танцам, музыке (игре на фортепиано) [5, д. 1152, л. 26]. В начале XX в. в женских гимназиях было введено преподавание латинского языка, домоводства, гимнастики и гигиены. По окончании гимназии выдавался аттестат, на основании которого гимназистка получала свидетельство на звание домашней учительницы тех предметов, по которым имела хорошие успехи. В начале XX в. при женских гимназиях открываются дополнительные педагогические 8-е классы. В Гродненской гимназии он был открыт в 1912 г. После прохождения курса дополнительного класса ученицы получали звание домашней наставницы.

По уставу женских гимназий в данные учебные заведения принимались «девицы всех сословий и вероисповеданий». При нехватке мест, однако, предпочтение должно было отдаваться дочерям лиц, состоящих на

государственной службе и принадлежащих к православному вероисповеданию, хотя их экзаменационные оценки могли быть ниже, чем у других конкуренток. Однако часто это предписание нарушалось, и в гимназии поступало большое число девочек нехристианского вероисповедания. Анализируя сословный и конфессиональный состав учениц гимназий Гродненской губернии, нужно отметить высокий процент учениц из третьего сословия, большинство из которых были еврейками. В Гродненской женской гимназии в 1882 г. обучалось 352 девочки. Из них православных – 122, католичек – 47, лютеранок – 12, магометанок – 2, иудеек –169, учениц из городского сословия 190. В Волковысской гимназия на 1912 г. из 280 учениц православных было 67, католичек – 55, иудеек – 156, магометанок – 2 [10, д.21, л.14]. Аналогичная ситуация наблюдалась и в Слонимской гимназии.

Источниками содержания женских гимназий были пособия из ведомства императрицы Марии или из государственной казны, плата за учение, пожертвования частных лиц, местные пособия. Одним из главнейших источников дохода ведомства учреждений императрицы Марии был сбор с публичных зрелищ и увеселений [9, д.7, л.45]. Размер оплаты за обучение в гимназиях устанавливался по местным условиям попечительскими советами гимназий. В середине XIX в. размер оплаты в Гродненской гимназии составлял 15–20 руб. в год. На протяжении второй половины XIX в. он планомерно повышался, и на начало XX в. обучение стоило в среднем 70–80 руб. [9, д.14, л.53] Плата вносилась за полгода вперед, в случае ее задержки в течение месяца следовало исключение не уплатившей ученицы из гимназии.

Главная цель женских гимназий заключалась, преимущественно, в нравственном воспитании – приучении к «уважению религии, как основе жизни и доброй нравственности, к порядку, законности и честному исполнению долга, чтобы таким образом подготовить их на служение обществу и сделать верными слугами Государя и Отечества». Воспитательным делом в женских гимназиях занимались главные и классные надзирательницы [5, д.1152, л.192].

Наиболее распространенной формой трудового и профессионального обучения девочек на территории Беларуси, в том числе и в Гродненской губернии, было преподавание рукоделия и ремесел при общеобразовательных школах, открытие профессиональных классов. Непосредственно к профессиональным женским учебным заведением в Гродненской губернии можно отнести Гродненскую повивальную школу, открытую 1 октября 1876 г. Основной задачей повивальной школы было «дать местному населению разумную акушерскую помощь в лице опытных, сведущих повивальных бабок» [6, д.633, л.5]. Школа находилась в специально устроенном для нее доме с родильным отделением и содержалась за счет суммы, ежегодно ассигнуемой на содержание сельской врачебной части в губернии. Заведование школой осуществлял Приказ общественного призрения. Высший и общий надзор как за ходом учения, так и за заняти-

ями воспитанниц в родильном отделении больницы нес губернский врачебный инспектор.

В повивальную школу принимались девушки не моложе 18 и не старше 30 лет, умеющие читать и писать по-русски [7, д.79, л.7]. Обучение было бесплатным для запланированного числа «казенных» учениц-пансионерок. В школе обучались также пансионерки от общества или частных лиц. Допускались и «вольноприходящие» девушки при условии оплаты, которая вносилась вперед за каждое полугодие и, если ученицы выбывали со школы раньше этого срока, деньги им не возвращались. Выбор казенных учениц производился врачебным отделением губернского правления по предоставлению местных сельских врачей того уезда, где кандидатки проживали. Кандидатуры учениц утверждались губернатором. Казенные воспитанницы жили в пансионах при школах, где получали полное содержание (пищу, одежду, белье, обувь, учебные и медицинские пособия и др.). Иногородние из приходящих учениц проживали на частных квартирах [7, д.79, л.6].

Большинство учениц повивальной школы принадлежали к крестьянскому и мещанскому сословиям. Обучались также дочки чиновников, священников, дворян и др. По вероисповеданию подавляющие число воспитанниц являлось православными, часть были иудейками и католичками.

Курс обучения в Гродненской повивальной школе длился 2 года, для необразованных девушек существовал подготовительный класс. Учебные занятия в школе начинались 1 сентября и заканчивались 1 июня, учебная неделя длилась 6 дней с четырьмя уроками ежедневно (3 – до обеда и 1 – после обеда). В подготовительном классе Гродненской повивальной школы ученицы обучались чтению, молитвам, понятию о числах и исчислении, устному счету, четырем правилам арифметики, чистописанию, а также первоначальным знаниям по медицине (понятие об акушерских перевязочных материалах, приготовление компрессов, бинтов, пеленок, свивальников, корпии). Во втором и третьем классах изучались непосредственно предметы специализации. Курс акушерства в 1-м классе включал анатомию, изучение беременности, правильных родов, сведения о правильном послеродовом состоянии. Во 2-м акушерском классе ученицы изучали патологию анатомического строения таза и половых органов, болезни матери и ребенка [7, д.79, л.7].

При Гродненской повивальной школе существовало родильное отделении (на 6 кроватей), где воспитанницы получали практические навыки. Со 2-го класса они несли там ежедневное дежурство (а также в женских отделениях больницы). По правилам для учениц Гродненской повивальной школы, девушки были обязаны обходиться с вниманием и заботой с женщинами, принимаемыми в родильное отделение. Во время дежурства ученицы должны были избегать громких разговоров, смеха и всего, что могло мешать роженицам. При уходе за ними ученицы не должны были позволять себе никаких резких слов, крика и т.п., а вести себя кротко и почтительно [6, д.687, л.150-151].

После окончания учебного курса ученицы получали звание сельских повивальных бабок, при выпуске они обеспечивались медицинскими инструментами и некоторыми лекарствами, необходимыми для дальнейшей работы. Выпускницы приводились к присяге и подписывали инструкцию. Казенные воспитанницы распределялись на отработку полутора лет за каждый год обучения в сельскую местность по назначению губернского правления или земства. Для работы в городе выпускницы были обязаны сдать дополнительный экзамен для получения диплома [7, д.79, л.8].

С целью более успешного развития медицинской помощи населению было решено заменить просто акушерок фельдшерицами-акушерками, которые бы больше общались с людьми. В связи с этим в 1910 г. Гродненская повивальная школа была преобразована в фельдшерско-акушерскую школу. Воспитанницы должны были проходить совместный курс с учениками фельдшерской школы и получать вместе аттестаты фельдшериц, после еще годичного курса по акушерству – звание фельдшериц-акушерок. Была расширена учебная программа, введено обучение оспопрививанию, массажу, врачебной гимнастике, помощи при «некоторых внезапных случаях, угрожающих жизни или здоровью», практические занятия в аптеке и др. [11, д.2, л.13].

Гродненская повивальная школа играла важную роль: во-первых, она способствовали обеспечению населения грамотной медицинской помощью, во-вторых, была единственным в Гродненской губернии (и в западном регионе Беларуси) учебным заведением, где девушки могли получить медицинское образование.

Таким образом, вторая половина XIX – начало XX в. стало временем зарождения и развития всесословного среднего и профессионального женского образования на территории Беларуси, в том числе и в Гродненской губернии.

Литература и источники

1. Абраменко М. Н. Низшая профессиональная школа в дореволюционной Белоруссии. – Мн.: «Вышэйшая школа», 1975. – 64 с.

2. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. / М.А.Ткачоў, У.С.Пасэ, Г.Р.Сянькевіч і інш. – Минск: Нар. асвета, 1985. – 464 с.

3. Киприанович Г.Я. К истории женского образования в Западной России: историческая записка ко дню 50-летия Виленской, Гродненской и Ковенской гимназий. 1860 – 1910. – Вильна: Губернская типография, 1910. – 69 с.

4. Мятельский М.С. Школа и педагогическая мысль в Белоруссии с 1895 г. до Великой Октябрьской Социалистической революции: Дис...канд. пед. наук: 13.00.01 / МГПИ им. А..Горького. – Минск,1982. – 215 с.

5. НИАБ в г. Гродно. Ф.1. Оп.13.

6. Там же. Ф.9. Оп. 1.

7. Там же. Ф. 9. Оп. 2.

8. Там же. Ф.14. Оп.1.

9. Там же. Ф. 39. Оп. 1.

10. Там же. Ф. 370. Оп. 1.

11. Там же. Ф. 666. Оп. 1.
12. Новік Н.Я. З гісторыі прафесійнай адукацыі на Беларусі (другая палова XIX – пачатак XX стст.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1998. – №2. – С.80–86.
13. Очерки истории школы и педагогической мысли народов СССР: Конец XIX – начало XX вв. / Под ред. Э.Д. Днепрова, С.Ф. Егорова, Ф.Г. Паначина. – М.: Педагогика, 1991. – 448 с.
14. Памятная книжка Гродненской губернии за 1882 г. Адрес-календарь. Изд. гродн. статистич. комитета. – Гродно: Тип. губерн. правлен., 1883.

І.І. Шаўчук, БрДУ, г.Брэст

АБ КАДРАВЫМ ПАТЭНЦЫЯЛЕ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК БЕЛАРУСІ (1919–1928 гг.)

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. на тэрыторыі Беларусі ніякай сістэматычнай арганізаванай навуковай работы не вялося. Тут мелі месца толькі пошукі асобных вучоных. Гуманітарныя даследаванні ажыццяўляліся навукоўцамі, як правіла, з Расіі і Полыпчы. Прычым плён іх работы меў далёка не заўсёды аб'ектыўны вынік. Тлумачыцца гэта і нацыянальным паходжаннем, і палітычнымі поглядамі прадстаўнікоў навукі, і грамадска-палітычнай сітуацыяй у тагачаснай Расіі, дзе заўсёды мелі месца вельмі моцныя дзяржаўныя (нацыянальныя) уплывы на навуковую дзейнасць. Неспрыяльная сітуацыя ў Беларусі ўзмацнялася яшчэ і тым, што беларуская нацыянальная інтэлігенцыя складала амаль незаўважны працэнт у структуры грамадства. Не палепшылі сітуацыю і наступствы першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Значыць, практычна адсутнічала асноўная крыніца росту шэрагаў навуковых работнікаў. Адсюль на пачатку 20-х гадоў XX ст. ставілася задача стварэння арганізацыйных умоў развіцця навукова-кадравага патэнцыялу рэспублікі. У гэтым рэчышчы праводзілася актыўная работа: пачынаюць сваю працу Беларускі дзяржаўны універсітэт, Камуністычны універсітэт Беларусі, першая комплексная навуковая ўстанова – Інстытут беларускай культуры. Адначасова прадпрымаюцца спробы забяспечыць іх кваліфікаванымі работнікамі. Для гэтага выбіраюць наступныя шляхі: па-першае, прыцягненне на працу даследчыкаў з іншых рэгіёнаў, перадусім з Расіі і Украіны, па-другое, падрыхтоўка сваіх маладых спецыялістаў.

Значны ўклад прыезджымі навуковымі работнікамі быў зроблены ў арганізацыю Беларускага дзяржаўнага універсітэта, пры распрацоўцы статута Інстытута беларускай культуры. Сярод гуманітарыяў назавем толькі некаторыя найбольш вядомыя прозвішчы: М.Доўнар-Запольскі, І.Замоцін, М.Нікольскі, У.Перцаў, М.Байкоў, У.Пічэта, А.Ясінскі, М.Дурнаво, Ф.Турук, М.Янчук і інш. Да канца 1922 г., толькі па дадзеных Беларускай камісіі па паляпшэнні быта вучоных (створаная ў верасні 1922 г.),

налічваліся 107 навукоўцаў. Астатнія былі зарэгістраваныя за адпаведнай Цэнтральнай камісіяй. Колькасць гэтых «астатніх» дакумент не згадвае, але дае магчымасць убачыць тагачасныя кваліфікацыйныя крытэры і адпаведна падзел на ступені кваліфікацыі, чым і займалася Камісія: 0. (ніжэйшая) – 19 чалавек; 1. (пачынаючыя, маюць хаця б адну навуковую работу) – 36; 2. (маюць багата навуковых прац) – 36; 3. (буйныя вучоныя) – 9; 4. (маюць свае навуковыя школы) – 4; 5. (сусветнага маштаба) – 1 [1, арк. 20]. Такім чынам, амаль 50 % зарэгістраваных чалавек мелі ўжо даволі неблагі вопыт працы ў навуцы. І, можна меркаваць, большасць з іх на сталую працу ў БССР прыехала з іншых рэгіёнаў будучага СССР.

І ўсё ж выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў, у т.л. гуманітарнага профіля, перманентна не хапала. Для 1920-х гадоў сітуацыя зразумелая: Віцебскі вышэйшы педагагічны інстытут ліквідаваны ў 1924 г.; Камуністычны універсітэт, створаны ў 1925 г., быў маламоцным і арыентаваўся галоўным чынам на падрыхтоўку партработнікаў і спецыялістаў па гісторыі партыі, дарэчы, пры яго арганізацыі ЦК КП(б)Б прасіў прыслаць ва універсітэт работнікаў камуністаў з падпольным стажам, паколькі ў Беларусі такіх падабраць было немагчыма [2, арк. 350]; БДУ першы свой выпуск зрабіў толькі ў 1925 г.

У сувязі з такім становішчам, у ЦК ВКП(б) бесперапынна ідуць заяўкі аб прысылцы кадраў, галоўным чынам, у вышэйшыя навучальныя ўстановы. Так, у сакавіку 1925 г. М.Галадзед прасіў накіраваць 13 чалавек, у т.л. 7 гісторыкаў, у тым жа годзе – яшчэ 20 асоб, у т.л. 7 па гуманітарных і сацыяльных навуках [3, арк. 526; арк. 146]. Але нават ў другой палове 1920-х гадоў ехалі навукоўцы ў БССР, напрыклад, з Расіі і Украіны не вельмі ахвотна (адсутнасць архіваў, багатых бібліятэк, лабараторый і г.д., нізкія стаўкі аплаты высокакваліфікаваным работнікам). Так, на Украіне ў 1927 г. аплата ніжэйшым катэгорыям навуковых работнікаў складала 180 рублёў, а ў Беларусі – 65-75 [4, арк. 19-20]. Праз два гады зарплата прафесара ў Беларусі, пры нагрузцы большай у два разы, раўнялася зарплаце прафесара ў РСФСР [5, с. 55].

Каб нейкім чынам зняць кадравую напружанасць, вельмі шырока практыкавалася праца па сумяшчэнні. Па інфармацыі старшыні Галоўнавукі С.Некрашэвіча, толькі ў канцы 1928/29 г. навукова-даследчыя ўстановы на 80 % былі ўкамплектаваныя работнікамі ВНУ [6, арк. 13]. Карціна гэтая, з пэўнымі адхіленнямі, характэрная, як для 1920-х, так і для 1930-х гадоў. Ясна, такая масавая праца па сумяшчэнню адмоўна адбівалася на яе выніках. Меркавалася, нават, усталяванне персанальных акладаў для тых, хто рабіў толькі ў адной установе. У 1927 г. С.Вальфсон зусім слушна заклапочана пісаў, што вялікая нагрузка не дазваляе выкладчыкам займацца навуковай работай, адцягвае ад яе іх увагу, а гэта вядзе да дэкваліфікацыі [7, с. 43].

Кадравы дэфіцыт (на 1928 г. ва ўсім Савецкім Саюзе не было замешчана больш 200 кафедраў [8, арк. 60]) з'яўляўся характэрнай рысай навукова-арганізацыйнай сітуацыі і для БССР, асабліва што тычылася сферы

гуманітарных навук. Тым не менш, з другой паловы 1925 г. усё больш з'яўляецца магчымасцяў запаўняць вакантныя месцы выпускнікамі беларускіх ВНУ, якія, аднак, маглі займаць у той час толькі ніжэйшыя прыступкі навуковай лесвіцы – асістэнтаў і аспірантаў.

Навукова-педагагічныя кадры БССР[51]

Год	1 925/26 н.г.		1 926/27 н.г.		1 927/28 н.г.		1 928/29 н.г.	
Кваліфікацыя	лік	%	лік	%	лік	%	лік	%
Прафесары	82	26,8	86	28,0	93	29,7	90	28,1
Дацэнты	82	26,8	76	24,8	93	29,7	89	27,8
Асістэнты	142	46,4	145	47,2	127	40,6	141	44,1
Усяго	306	100	307	100	313	100	320	100

*НАРБ. Ф.7. Воп.1. Спр.386. Арк.110; Ф.4. Воп.7. Спр.156. Арк.12.

Агульная колькасць навукова-педагагічных работнікаў, як мы бачым, у акрэсленыя гады была стабільнай. Абумоўлівалася гэта і згаданымі вышэй прычынамі і тым, што кіраўнічымі органамі БССР у 1924 г. быў узяты курс не на экстэнсіўнае пашырэнне вышэйшай адукацыі, а на паляпшэнне яе якасці. У 1926 г. прадугледжвалася нават памяншэнне колькасці студэнтаў на 13 % [9, с. 156; арк. 30]. Да такога рашэння прымусілі тагачасныя матэрыяльна-тэхнічныя, фінансавыя магчымасці і, ясна, наяўныя кадры. Разам з тым з табліцы мы бачым пэўныя хвалепадобныя працэсы: узаемазалежнае адначасовае павелічэнне і памяншэнне колькасці асістэнтаў і дацэнтаў (выкладчыкаў). Выклікалася такая карэляцыя прасоўваннем першых у дацэнты пры дасягненні нейкай дастатковай іх колькасці і «якасці». Таму можна зрабіць выснову пра адносна невысокі ўзровень навуковай падрыхтоўкі работнікаў у сілу малога навукова-педагагічнага стажа, асабліва дацэнтаў. Сітуацыя турбавала дырэктыўныя органы ўжо ў 1926 г., калі ўказвалася на тое, што 46 % навуковых работнікаў мелі невялікі паслярэвалюцыйны стаж [10, арк. 150]. Менавіта таму і патрабавалася стабілізацыя колькаснага росту – для павышэння кваліфікацыйнага ўзроўня. Да 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі Беларусь мела 403 навуковых работніка (зарэгістраваных у Секцыі навуковых работнікаў). Удзельная вага прадсаўнікоў г.зв. сацыяльна-гістарычных навук складала 15 % – каля 60 чалавек – што ўяўляецца даволі нязначнай, паколькі ў 1920-я гады акцэнт у вывучэнні Беларусі рабіўся менавіта на згаданыя навукі. Для параўнання: на медыцыну прыпадала 35 %, прыкладныя навукі – 28 % усіх навукоўцаў [11, с. 29]. Параўноўваючы дзве вышэй прыведзеныя крыніцы, можна меркаваць аб тым, што ўдзельная вага навукоўцаў-гуманітарыяў да 1928 г. складала прыблізна 15 – 17 % агульнай колькасці навуковых кадраў.

Асноўная маса спецыялістаў па гуманітарных навуках канцэнтравалася ў Белдзяржуніверсітэце і Інстытуце беларускай культуры. Імі закла-

даліся асновы сістэматычнага навуковага вывучэння гісторыі, мовы, літаратуры і г.д. Выдадзеныя былі сборнікі беларускай навуковай тэрміналогіі, даволі грунтоўна даследаваліся гісторыя беларускага мастацтва, гарадоў, фальклор і г.д.

Разам з тым, наколькі важную ролю адыгрывалі іх навуковыя пошукі, гаворыць факт абрання ў ліку першых членаў Беларускай Акадэміі навук (з тых, хто стала працаваў у БССР) 13 гуманітарыяў з 21 вучонага. Прычым, як вядома, і БелАН узначаліў гісторык У.Ігнатоўскі [12, с. 5].

Літаратура і крыніцы

1. НАРБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 130.
2. Тамсама. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 5.
3. НАРБ. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 5.; Воп. 7. Спр. 44.
4. Тамсама. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 381.
5. Канчеев А.А. Материальное положение научных работнников СССР и система их оплаты за два года // Научный работник. – 1929. – №2.
6. НАРБ. Ф. 4. Воп. 7. Спр. 156.
7. Вольфсон С. Белорусская секция научных работников// Научный работник. – 1927. – № 9.
8. НАРБ. Ф. 4. Воп. 7. Спр. 156.
9. Праграма працы НКА (Тэзісы дакладу намНКА т.Баліцкага на пленуме ЦК КП(б)Б, верасень 1924 г. // Асьвета. 1924. №3.; НАРБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 319.
10. НАРБ. Ф. 4. Воп. 7. Спр. 141.
11. Вольфсон С.Я. Культурная рэвалюцыя ў дзянні: нацыянально-культурнае будаўніцтва БССР да XV-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. – Мн., 1932.
12. Национальная Академия наук Беларуси. Персональный состав. 1928 – 1998. – Мн., 1999. – 288 с. У тэксце прыведзена колькасць тых акадэмікаў, якія стала працавалі ў Беларусі.

А.В. Трофимчик, БарГУ, г. Барановичи

ПОДГОТОВКА КВАЛИФИЦИРОВАННЫХ РАБОЧИХ КАДРОВ В ЗАПАДНЫХ ОБЛАСТЯХ БССР В 1939 – 1941 гг.

Присоединение в 1939 г. к БССР Западной Беларуси повлекло за собой оперативные и кардинальные изменения во всех ее общественных сферах. В контексте советизации новых земель развитие профессионального обучения позволяет проследить приоритеты политики советского просвещения.

В польской системе образования на землях «крэсов северо-восточных» существовала довольно плотная сеть специальных ремесленных школ из 75 учебных заведений с 10400 учащимися [1]. На этой основе

после 17 сентября 1939 г. начали создаваться учебные заведения советского типа.

Становление советской системы подготовки квалифицированных рабочих кадров в новых областях БССР произошло достаточно успешно. В первом полугодии 1940 г. начали работать 14 таких заведений, в которых проходили обучение 2365 учащихся [2]. Продолжительность обучения в профессиональных школах не превышала двух лет, но и такие сроки являлись тяжким бременем для их организаторов и не удовлетворяли запросы промышленности. Многие заведения уже изначально испытывали серьезные проблемы с организацией учебного процесса по причине отсутствия необходимого оборудования, учебно-методического материала, ощущалась нехватка преподавателей [2]. Однако проводимая индустриализация требовала увеличения ресурса квалифицированной рабочей силы. Поэтому летом 1940 г. изучались потенциальные возможности значительного роста контингента учащихся имеющихся профессиональных школ и открытия новых учебных заведений, а уже 16 августа 1940 г. СНК БССР и ЦК КП(б)Б принимают совместное постановление «О расширении и организации новых школ фабрично-заводского ученичества», согласно которому число учащихся в республике должно было вырости до 22 тыс. человек [3, с. 351-353].

Однако ни интенсивное, ни экстенсивное уплотнение сети профессиональных школ не помогло достичь необходимых результатов, не удовлетворило потребности индустриализации. Как потом утверждалось советскими исследователями, «школы ФЗУ не справлялись с подготовкой квалифицированных рабочих в новых условиях» [4], но о самих этих условиях историки особо не распространялись, хотя они лежали на поверхности: страна готовилась к войне, поэтому надо было создавать надежный потенциал квалифицированной рабочей силы для промышленности, откуда в скором времени возможен был отток мужчин. Увеличение контингента учащихся профессиональных школ было невозможным без ужесточения законодательства и применения командно-административных методов. И 2 октября 1940 г. Президиум Верховного Совета СССР выдает указ «О Государственных Трудовых Резервах СССР». Согласно ему постановлялось:

- Создать три типа учебных заведений: 1) ремесленные училища с двухлетним сроком обучения, 2) железнодорожные училища с двухлетним сроком обучения, 3) школы фабрично-заводского обучения (ФЗО) с шестимесячным сроком обучения.

- Обучение установить бесплатным. Учащихся в период обучения взять на иждевение государства.

- Обеспечить учащимся бронь и отсрочку от армии во время учебы и до окончания обязательного беспрерывного четырехлетнего срока работы после окончания учебного заведения и др. [5]

При призыве в ремесленные и железнодорожные училища устанавливался образовательный ценз не ниже начальной школы или 4-х классов

средней. В школы ФЗО призывались вне зависимости от общеобразовательной подготовки. Устанавливался строгий режим дня, напоминающий армейский [6].

Сразу после принятия общесоюзных решений СНК БССР выпускает ряд постановлений. Согласно им утверждалась сеть учебных заведений и контингенты учащихся в них, создавалась материальная и учебная база. Определялось обязательное количество призываемых для каждой области республики.

План призыва колхозной и городской молодежи в ремесленные и железнодорожные училища и в школы фабрично-заводского обучения по западным областям БССР [7]

Области	Всего призывается	В том числе колхозной молодежи			В том числе городской молодежи (включая учащихся реорганизуемых ФЗУ)		
		Всего	Из них		Всего	Из них	
			в ремесл. и ж/д училища	в школы ФЗО		в ремесл. и ж/д училища	в школы ФЗО
Барановичская	1100	900	200	700	200	100	100
Белостокская	1085	685	275	410	400	300	100
Брестская	1160	910	400	510	250	200	50
Вилейская	200	200	–	200	–	–	–
Пинская	1625	1325	525	800	300	200	100
Всего по западным областям	5170	4020	1400	2620	1150	800	350
Всего по БССР	33660	26660	14060	12600	7000	4000	3000
В том числе для обучения в БССР	16160	9835	2485	7350	6325	3675	2650

Меньшее число призываемых по западным областям объясняется как меньшей плотностью сети учебных заведений на этих территориях, так и неполной адаптированностью советской, командно-административной методики набора в учебные заведения, которая была непонятна населению и вызывала нежелательные для советской власти настроения.

Ответственность за коммунально-бытовое обслуживание учебных заведений, их учебно-методическую базу, организацию производственного обучения возлаживалась на целый ряд инстанций, начиная с самых высоких. Соответствующей была и пропаганда мобилизации трудовых резервов в средствах массовой информации. Однако сам процесс призыва протекал весьма сложно, существенно отличаясь от приукрашенных газетных сообщений о большом перевыполнении наборов.

По западным областям БССР план по призыву формально был выполнен. Однако уже в первые же дни эта цифра заметно сократилась по причине неявки призывников на учебу (только из Белостока не прибыли 27 человек) и, как сказано в архивном документе, массового ухода их из учебных заведений [8, л. 163-164]. Поэтому уже 28 декабря 1940 г. издается Указ Президиума Верховного Совета СССР «Об ответственности учащихся ремесленных, железнодорожных училищ и школ ФЗО за нарушение дисциплины и за самовольный уход из училища» [9].

Несмотря на опеку каждого учебного заведения несколькими наркоматами и предприятиями, возникали большие трудности в организации учебного процесса и обеспечении учащихся жильем, одеждой и питанием. Помещения во многих училищах не отвечали требованиям; не хватало необходимого для обучения оборудования; медицинское и санитарное обслуживание находилось не на должном уровне; не поступали выделенные средства, запланированные по бюджету, финансирование со стороны предприятий также было слабым [8, л. 165; 10; 11]. Однако такие недостатки не могли воспрепятствовать началу функционирования профессиональных школ, ибо это повлекло бы за собой обвинения в препятствовании проведению государственной политики.

Несмотря на неустроенность учебного процесса, в профессиональных школах с 1 января 1941 г. было решено ввести политическое воспитание и институт заместителей директоров по политической части [12]. Такие действия порождают мнение, что руководство трудовых резервов было более заинтересовано прежде всего в повышении идейного воспитания учащихся училищ и школ ФЗО, а уже потом в их профессиональной подготовке, что подтверждает также введение курса военного дела, осуществление военизированных мероприятий, которые уже к началу 1941 г. приобрели широкий размах [13; 14].

Вскоре организацию обучения решено было преобразовать в экстенсивном (расширить сеть школ ФЗО) и интенсивном порядке (сроки обучения сократить до трех месяцев, усилив подготовку учащихся). Масштабы призыва в 1941 г. планировались гораздо бо?льшие [3, с. 386].

Сведения о подготовке рабочих кадров для сельского хозяйства весьма фрагментарны, но, с другой стороны, многочисленны, из чего можно сделать вывод о переводе в скором времени в массовом порядке всей западнобелорусской деревни на «социалистические рельсы». Огромное внимание уделялось подготовке специалистов из женского населения, особенно трактористов, которое с течением времени только возрастало. О военно-стратегических целях такого обучения официально сообщалось в советских газетах: говорилось, что женщина «в любую минуту сможет заменить брата, мужа, друга, когда их позовет родина с оружием в руках защищать завоевания социализма» [15], т. е. шла подготовка не только к коллективизации, но и к военным действиям.

Таким образом, подготовка квалифицированной рабочей силы в предвоенный период получила стремительное развитие, веским подтвержде-

нием чему является полное гособеспечение школ ФЗО и профучилищ в то время, когда в других учебных заведениях, включая старшие классы средней школы, была введена плата за обучение. Уже в самой дефиниции при организации подготовки квалифицированной рабочей силы подразумевалось то, что молодым рабочим в скором времени придется выйти из «резерва», заменив тех, кто уйдет на фронт.

Литература и источники

1. Национальный архив Республики Беларусь (далее – НАРБ). Ф. 4. Оп. 27. Д. 158. Л. 23.

2. НАРБ. Ф. 4. Оп. 21. Д. 2022. Л. 21, 24, 30-31.

3. Народное образование в БССР. Сборник документов и материалов. Т. 2. 1928 – 1941 гг. – Минск: Народная асвета, 1980.

4. Народное образование в СССР. – М.: Просвещение, 1967. – С. 247.

5. Указ Президиума Верховного Совета СССР «О Государственных Трудовых Резервах СССР» // Правда. – 1940. – 3 октября. – С. 1.

6. Ньleszycski W. Okupacja sowiecka na Biaiostocczyцnie w latach 1939 – 1941. Propaganda i indoktrynacja. – Biaiystok: Agencja Wydawnicza Benkowski, Biaiostockie Towarzystwo Naukowe, 2001. – S. 465.

7. Собрание постановлений и распоряжений правительства Белорусской Советской Социалистической Республики. 1940. – С. 756.

8. Государственный архив общественных организаций Гродненской области (далее – ГАОО ГО). Ф. 2. Оп. 50. Д. 4.

9. Сборник законодательных актов и документов. – М., 1989. – С. 18.

10. ГАОО ГО. Ф. 6195. Оп. 1. Д. 376. Л. 44-45.

11. НАРБ. Ф. 4. Оп. 21. Д. 2030. Л. 16-17.

12. Политическое воспитание учащихся школ ФЗО, Ремесленных и Железнодорожных училищ // Правда. – 1940. – 28 декабря. – С. 1.

13. Дрозд І. У Навагрудскай школе ФЗА // Чырвоная звязда. – 1940. – 27 снежня. – С. 3.

14. Чыгрынаў П. Да абароны Радзімы. Дзейнасць камсамола Беларусі па ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі ў гады трэцяй пяцігодкі (1938 – чэрвень 1941 гг.). – Минск: Беларусь, 1973. – С. 108.

15. Усилить подготовку девушек-трактористок // Сталинская молодежь. – 1940. – 10 декабря. – С. 1.

Д.А. Крывашэй, Інстытут гісторыі НАНБ, г. Мінск

НЯМЕЦКІЯ ШКОЛЫ г.ГРОДНА ПЕРЫЯДУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

У перыяд нямецкай акупацыі ў Заходняй Беларусі пачалі з'яўляцца новыя віды школаў. Асаблівую ўвагу нямецкія акупацыйныя ўлады надавалі адкрыццю і апецы школаў для дзяцей грамадзян Германіі (райхсдойчэ) і дзяцей з сям'яў этнічных немцаў (фольксдойчэ).

8 чэрвеня 1942 г. была адкрыта школа для дзяцей фольксдойчэ ў Гародні, якія да гэтага часу атрымоўвалі прыватныя ўрокі нямецкай мовы ў настаўнікаў польскага паходжання ці фольксдойчэ. Школа размясцілася ў будынку былой прыватнай гімназіі і ліцэя польскага школьнага саюза «Polska Macierz Szkolna» па адрасу Танненбергстрасе, 6. Школа знаходзілася збоку ад вуліцы. Да яе прылягала вялікая пляцоўка, «якой цалкам дастаткова для знаходжання дзяцей падчас школьных перапынкаў, яна выкарыстоўваецца і як пляцоўка для гімнастыкі і адпавядае ўсім іншым патрабаванням. Канструктыўны стан будынку быў бездакорны. У наяўнасці мелася 8 класных памяшканняў на першым і другім паверхах, да гэтага неабходна дадаць яшчэ 2 дапаможных класа ў мансардзе. Да гэтага ж зямельнага ўчастку адносіліся 2 наступных будынкі, якія маглі быць выкарыстаны ў якасці кватэр для выкладчыкаў ці інтэрната для вучняў». [1; арк. 223]. Усяго ў школу першапачаткова былі запісаны 62 вучня ад 6 да 14 гадоў – 26 хлопчыкаў і 36 дзяўчынак. 49 з іх наведвалі раней польскую школу, 13 чалавек толькі ў 1942 г. дасягнулі ўзросту, «магчымага для прыёму ў школу», і з іх быў створаны «падрыхтоўчы клас». Па веравызнанню сярод вучняў было 52 рымскіх каталікі, 6 – праваслаўных і 4 лютэраніна. Аднак на ўроках Закона Божага дзеці не дзяліліся.

Акрамя падрыхтоўчага класа быў створаны I клас (26 вучняў 8–10 гадоў) і II клас (23 вучня 11–14 гадоў). Неабходна адзначыць, што I клас падзяляўся на 1-4 гады навучання, а II клас – на 5–8 гады навучання. Такім чынам, вучыцца ў школе неабходна было 9 гадоў (улічваючы падрыхтоўчы клас). Адным з асноўных патрабаванняў да кандыдатаў на навучанне ў такіх школах было нямецкае паходжанне. Як заўважаў інспектар школьнага савета гродзенскай акругі «дакладнае ўстанаўленне нямецкага паходжання дзяцей, бяспрэчна неабходна. Мэтазгодна выдаліць са школы ўсіх дзяцей, у якіх гэта ўмова адсутнічае». [1; арк. 223 – 223 зв.].

Запіс у класы праводзіўся адпаведна ўзроўню валодання нямецкай мовай, падрыхтаванасці да ўрокаў на нямецкай мовы і ўзроўнем ведаў па тэматыцы школьнай праграмы. Як заўважаў інспектар школьнага савета Д.Рымер, «узровень ведаў нямецкай мовы болынай часткі дзяцей усё яшчэ нязначны, толькі адносна некаторых дзяцей можна дапусціць той факт, што яны дома таксама размаўляюць па-нямецку».

Побач з існаваннем школы для фольксдойчэ ўлетку 1942 г. абмяркоўвалася пытанне аб адкрыцці нямецкай народнай школы ў Гродне. Бургамістр горада ў сваім лісце вярхоўнаму прэзідэнту Грамадзянскага кіравання раёна Беласток адзначаў: «адкрыццё нямецкай народнай школы ў Гродна – неадкладная неабходнасць». У муніцыпалітэт часта прыходзілі бацькі, якія цікавіліся датай адкрыцця такой школы ў горадзе. Яны былі «вельмі заклапочаны школьнай адукацыяй для сваіх дзяцей». З магчымасцю добрага навучання дзяцей (наяўнасцю базавай і сярэдняй школаў) звязвалася канчатковае рашэння аб перасяленні нямецкіх сем'яў у Грод-

на. Улетку 1942 г., па дадзеных бургамістра, у горадзе налічвалася 19 дзяцей, якія па ўзросту і па адукацыі маглі наведваць народную школу. З іх падрыхтоўчы клас – 3 чал., 1 клас – 3 чал., 2 клас – 2 чал., 3 клас – 3 чал., 5 клас – 1 чал., 8 клас – 1 чал., дзяўчынка 13 гадоў школы-надбудовы (для падрыхтоўкі выпускнікоў народных школаў да экзамену на атэстат сталасці), два навучэнца другога класа сярэдняй школы [1; арк. 224]. Да агульнай лічбы бургамістр дадаваў трох вучняў сярэдняй школы, якія не былі ўнесены ў агульны спіс.

Акрамя гэтага, «шэраг дзяцей рэгістраваліся таксама вусна». У іншым лісце (раённага камісара вярхоўнаму прэзідэнту ў Беласток) называлася лічба ад 30 да 40 чалавек толькі з гарадскога раёна Гродна і да 10 чалавек – з сельскай часткі раёна. Да агульнай колькасці неабходна дадаць «ад 20 да 30 дзяцей фольксдойчэ, якія наведваюць цяпер школу для фольксдойчэ і цікавяцца магчымасцю прыняцця ў нямецкую народную школу». [1; арк. 222]. Аднак іх прыняцце «будзе залежаць ад іх поспехаў у вывучэнні нямецкай мовы». Самыя добрыя ўмовы складваліся для самых маленькіх дзяцей, якія, па меркавання бургамістра, «дома, наўрад ці чуюць добрую нямецкую мову, аднак, у школе дэманструюць хуткі рост».

У якасці памяшкання для школы прапаноўваўся той самы будынак па Танненбергштрасе, 6, у якім размяшчалася школа (бургамістр называе не «школа», а «курсы") для фольксдойчэ.

Мэтай школаў для народных немцаў было аб'яднанне дзяцей і садзейнічанне набыццю імі нямецкай самабытнасці» [1, арк. 224]. У будучым прадугледжвалася перавесці ў народную школу ці на вышэйшую ступень народнай школы таксама і дзяцей фольксдойчэ. Аднак падставай для заснавання гэтай школы павінна была быць наяўнасць «сабрыных разам, улічаных і існуючых у дастатковай колькасці дзяцей райхсдойчэ» [1, арк. 225]. Пытанне ў хуткім часе было вырашана. У 1943 г. у Гродне ўжо існавалі народная і прыватная школы для райхсдойчэ [1, арк. 39 зв.]. Прычым аднакласная народная школа для райхсдойчэ знаходзілася ў тым жа будынку, што і двухкласная народная школа для дзяцей фольксдойчэ. Абодва аддзяленні былі разлічаны на 4 гады навучання.

Гродзенская прыватная школа для райхсдойчэ налічвала прыкладна 25 навучэнцаў (вясна 1943 г.). Ёй неадкладна патрабаваліся настаўніцкія кадры. Заняткі ў ёй праводзіла настаўніца-фольксдойчэ. Кіраўніцтву школы быў абяцаны нямецкі выкладчык. У якасці аднаго са шляхоў вырашэння праблемы прапаноўвалася накіраваць у яе для працы школьную памочніцу – дзяўчыну, якая скончыла трохмесячныя педагагічныя курсы Саюза Нямецкіх дзяўчат [1, арк. 39].

Арганізоўвалася пастаўка для школаў навучальных дапаможнікаў для ўсіх прадметаў і класаў. Для школьных памяшканняў набываліся «добрыя партрэты фюрэра і яго саратнікаў. Самыя вядомыя нямецкія казкі прадстаўлены мастацка бездакорнымі малюнкамі» [1, арк. 224].

Для выхаваўчых мэтаў рэкамендавалася «клапаціцца аб вывучэнні звычайных дзіцячых песняў, пры гэтым асабліва ўдзяляць увагу нямецкай нацыянал-сацыялістычнай маладзёжнай песні. Школьныя прадметы павінны запаўняць нямецкія дзіцячыя гульні. У школе для фольксдойчэ, неабходна прадухіліць любое выкарыстанне не нямецкай мовы. Так як у школе выкладаюць выключна жанчыны, урок фізкультуры для хлопчыка павінен аказваць выхаваўчае ўздзеянне і стаць падрыхтоўкай да ўступлення іх у шэрагі імперскага нямецкага рабочага класа» [1, арк. 224].

Асобую ўвагу гродзенскі школьны інспектар звяртаў на «імкненне да ўзрастаючага беспамылковага ўжывання нямецкай мовы». Для гэтага рэкамендавалася павялічыць колькасць вучэбных гадзін з 24 да 28 у тыдзень. «Выкладчыкі павінны па меры магчымасці ўласным прыкладам пабуджаць дзяцей да заўзятай моўнай практыкі, каб прывучыць дзяцей да пастаяннай размовы з захаваннем правільных моўных формаў і па магчымасці больш чыстага вымаўлення» [1, арк. 224].

Падчас інспекцыі дзеці былі праверaны на навыкі вуснай мовы, чытання і ліку. Дзеці райхсдойчэ пры гэтым «дэманстравалі неістотныя памылкі, дзеці фольксдойчэ прадэманстравалі ў размове і чытанні на нямецкай мове пакуль яшчэ недастатковыя навыкі, што можна растлумачыць». [1, арк. 30].

Пастаянныя інспекцыі школ выяўлялі разнастайныя недахопы ў працы. Праблемай заставалася набыццё букваroў, кніг для чытання і падручнікаў па арыфметыцы, дапаможнікаў для выкладчыкаў [1, арк. 224]. Інспекцыя гродзенскай школы выявіла адсутнасць гадавой праграмы навучання, якая б дзяліла вучэбны матэрыял памесячна, а таксама штотыднёвых справаздач па вучэбнай рабоце, недастатковае метадычнае афармленне заняткаў.

Сярод недахопаў навучання адзначалася адсутнасць уніфікаваных навучальных дапаможнікаў для ўсіх дзяцей. Перад кіраўніцтвам школаў ставілася задача імкнуцца да таго, каб у кожнага дзіцяці быў як мінімум адзін уніфікаваны буквар ці кніга для чытання. У якасці замены апошніх рэкамендаваліся лісты для чытання выдавецтваў Хірт, Босл ці Бельц, Ландгензальц.

Інспектары звярталі ўвагу на той факт, што пасля канікулаў у дзяцей гродзенскай школы пачнецца 5 навучальны год. Для яго паспяховага правядзення неабходна было «падумаць аб дастаўцы падручнікаў, якія прадназначаны па крайняй меры для выкладчыкаў гісторыі, геаграфіі, прыродазнаўства і ліку» [1, арк. 30].

У сувязі з тым, што дзеці фольксдойчэ дрэнна размаўлялі па-нямецку прапаноўвалася задзейнічаць кадры, якія могуць размаўляць па-нямецку і па-польску. Настаўнікамі ў гродзенскай школе для фольксдойчэ працавалі 5 жанчын, якія паходзілі з Гродна. Да вайны яны ці працавалі ў польскіх школах, ці давалі прыватныя ўрокі нямецкай мовы. Агульнае

кіраўніцтва школай было ўкладзена на фройляйн Сук – «падрыхтаваную і здольную», якая таксама вяла заняткі па чытанню і пісьму ў класе для пачынаючых і нямецкую мову ў 1 класе. Заняткі па арыфметыцы ў абодвух класах праводзіла пані Дамброўская, якая да пачатку «праўлення балыпавікоў» кіравала гарадской польскай народнай школай для дзяўчатаў. Пані Немчыновіч, полька, былая выкладчыца нямецкай мовы ў польскіх школах, цяпер выкладала прыродазнаўства. Рускай фройляйн Польнер былі даручаны заняткі па геаграфіі, а пані Азімінскай (карэннай аўстрыячцы) – выкладанне музыкі.

Вышэйпералічаным настаўніцам было ад 40 да 62 гадоў. Побач з імі на асобым палажэнні знаходзілася 18-гадовая фройляйн Саваліш, якая вяла ўрокі рукадзелля і ліку ў падрыхтоўчым класе. 3-за яе бездакорнай прыналежнасці да нямецкай народнасці планавалася заняць яе ў якасці выкладчыцы ў нямецкім дзіцячым садзе, які планавалася арганізаваць.

У школе таксама даваў урокі па вывучэнню дзяржавазнаўства інспектар Алцінгер з муніцыпалітэта. Ён жа ажыццяўляў кантроль за школай па даручэнню бургамістра.

Па меркаванню школьнага інспектара, «для школы дастаткова такіх работнікаў, як фройляйн Сук і фройляйн Саваліш у якасці памочніцы настаўніка. Апошняй мэтазгодна папрацаваць некалькі тыдняў у нямецкай школе і дзіцячым садзе. Пані Дамброўскую, пані Немчыновіч, фройляйн Польнер і пані Азімінскую са школы лепей паступова выдаліць. Аднак у сённяшні час яны не могуць прынесці ніякай шкоды, таму што даюць дзецям веды ў галіне нямецкай мовы. Тым не менш, у далейшым для выхавання з дзяцей сапраўдных немцаў, гэтыя кадры з'яўляюцца зусім непадыходзячымі».

Праца настаўнікаў аплачвалася ў памеры 1,50 маркі за кожны ўрок. Школьны інспектар рэкамендаваў прызначыць нямецкага выкладчыка дырэктарам школы. Ён павінен «навучыць выкладчыц вядзенню вучэбнага працэсу (верагодна, ужо падчас канікулаў) з пункту бачання светапогляду і методыкі, а яны ўжо будуць назіраць за уніфікаваным афармленнем вучэбнай праграмы і ўвогуле будуць адказныя за ўсю школу» [1, арк. 30].

Падчас адступлення фашысціх войскаў у 1943–44 гг. амаль усё нямецкае насельніцтва было вывезена ў Полыпчу, а затым у Германію. Апошнія звесткі аб іх адносяцца ды вясны – лета 1944 г. з Беластоку і Гродна. У Гродне фольксдойчэ знаходзіліся на карантыне, пасля чаго іх адсылалі ў Лодзь ці Кёнігсберг.

Крыніцы

1. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф.1. Воп.1. Спр.58

Ю.Г. Бушик, г.Барановичи

ВОЗРОЖДЕНИЕ СИСТЕМЫ ПРОФЕССИОНАЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ В БССР НА ПРИМЕРЕ БАРАНОВИЧСКОЙ ОБЛАСТИ (1944 – 1946 гг.)

Восполнить образовавшуюся брешь в системе народного образования в виде кадровой проблемы частично планировалось благодаря первым послевоенным выпускам учебных заведений по подготовке учителей для различных типов школ. В первую очередь следует отметить восстановление работы Барановичского учительского института. Совет Народных Комиссаров БССР 20 сентября 1944 г. принял соответствующее постановление. Согласно ему предусматривалось функционирование отделений языка и литературы, а также исторического отделения с общим контингентом приема в 180 человек. Бесспорно, один институт не разрешал остро стоящих проблем. Поэтому на территории области также были открыты сразу после войны Новогрудское и Несвижское педагогические училища. Кроме того, СНК БССР, в дополнение к первому постановлению принимает 29 октября 1944 г. новое (№655), в котором предусматривалась подготовка учителей, не имевших педагогического образования. Более того, примерно тогда же утверждается целая сеть заочных отделений как при педагогическом, так и при учительском институтах и педагогических училищах.

Поскольку кадровая проблема была первоочередной, вводилась следующая раскладка подготовки учителей. Так, учителя 1 – 4-х классов должны были быть подготовлены педагогическими училищами до 1 августа 1947 г., учителя 5 – 7-х классов – учительскими институтами до 1 августа 1946 г., а учителя 8 – 10-х классов – педагогическим институтом и университетом, размещены за пределами территории Барановичской области, до 1 августа 1948 г.

Однако, как показывает анализ архивных документов, эти заведения, как и вообще общереспубликанские и общесоюзные заведения по подготовке педагогических кадров, не справились с задачей оперативной подготовки оных для пополнения остро нуждающихся в учителях школ. Квалифицированных педагогических кадров, специалистов с законченным педагогическим образованием по-прежнему не хватало.

Отчет о результатах вступительных экзаменов в высшие учебные заведения, техникумы и другие средние специальные учебные заведения по подготовке специалистов для учреждений Барановичской области за сентябрь 1945 г. свидетельствует о низких наборах и малочисленном составе учащихся по отношению к требованиям государственного плана. Так, в Барановичском учительском институте функционировало уже на то время три факультета, однако на каждом из них наблюдался недобор студентов:

- историко-филологический: на первый курс на запланированных 40 мест поступил лишь 21 человек;

- естественно-географический: соответственно – на 35 мест 24 студента;

- физико-математический: на 40 мест 16 поступивших (таблица 1).

В тяжелом положении находились также заново созданные средние специальные учебные заведения, школы ФЗО, ремесленные и железнодорожные училища. В отчете о результатах вступительных экзаменов в высших учебных заведениях, техникумах и других средних специальных заведениях по подготовке специалистов Барановичской области за сентябрь 1945 г. содержатся сведения о приеме в средние специальные учебные заведения (таблица 2). По сравнению с развитием высшей школы восстановить работу средних специальных учебных заведений было проще. Для набора в них ресурс был богаче, ведь требования при поступлении в последние предъявлялись несравнимо меньшие, чем к абитуриентам вузов.

Слабым по уровню образования был и преподавательский состав в учебных заведениях, о чем свидетельствует уже один факт: высшее законченное образование имели до 42 % преподавателей.

Архивные материалы содержат сведения оперативных донесений о призыве учащихся школ ФЗО, ремесленных и железнодорожных училищ Барановичской и Гродненской областей за март 1946 г. Согласно тем данным, на указанное время всего обучалось 1597 учащихся, а по плану предполагалось 2055 человек. В Барановичской области только Новогрудское ремесленное училище наркомата трудовых резервов превысило план набора учащихся (202 человека при плане в 200), остальные значительно отставали от запланированных показателей. Например, в Березовке Новогрудского района ремесленное училище наркомата легкой промышленности выполнило план только на 47 % (таблица 3).

В целом послевоенное развитие системы профессионального образования происходило довольно неоднозначно. Именно в этой сфере наиболее чередовались успехи и недостатки. Время стабильности здесь наступило нескоро.

Таблица 1

Прием студентов на первый курс Барановичского учительского института в 1946/47 учебном году

Наименование факультета	План набора	Держали вступительные экзамены	Из них выдержало экзамены	Всего зачислены на первый курс
Историко-филологический	40	23	21	21
Естественно-географический	35	27	24	24
Физикоматематический	40	17	16	16

Таблица 2

Прием студентов в 1946/47 учебном году
в средних специальных заведениях Барановичской области

Наименование учебного заведения	Держали вступительные экзамены	Из них выдержали экзамены	Всего зачислены		Из общего количество зачисленных на 1-й курс		Всего учащихся на всех курсах обучения
			На 1-й курс	На старшие курсы	Без вступительных экзаменов	Из них отличников	
Барановичская фельдшерско-акушерская школа	200	136	134	24	18	12	178
Новогрудское педучилище	112	104	23	89	11	11	315
Новогрудский финансовый техникум	31	30	30				185
Новогрудская медицинская школа	69	63	76	3	13	4	140
Слонимская школа медицинских сестер	136	113	114	4	5	5	360
Несвижское педагогическое училище	17	14	31	2	17		60

Таблица 3

Сведения оперативных донесений о движении учащихся школ ФЗО, ремесленных училищ и железнодорожных училищ Барановичской области за март 1946 г.

Наименование заведения	Местонахождение	Комиссариат или ведомство	Количество учащихся	План приема учащихся
ФЗО строителей	Барановичи	НК жилграждстроя	104	120
ФЗО	Слоним	НК комхоз	127	150
ФЗО	Барановичи	НК путей сообщения	122	150
ФЗО	Волковыск	НК путей сообщения	77	120
ФЗО	Волковысский район	НК стройматериалов	75	150
ФЗО строителей	Лида	НК жилграждстроя	70	125
Ремесленное училище	Лида	НК Местпром	144	200
Ремесленное училище	Новогрудок	ГУ Трудовых резервов	202	200
Ремесленное училище	Новогрудский район, м. Березовка	НК легпром	47	100

Н.Л. Ягнешка, ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

ПАДРЫХТОЎКА НАВУКОВЫХ КАДРАЎ ГІСТОРЫКАЎ У ГРОДЗЕНСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ Ў 1994 – 2004 ГАДАХ (статыстычны агляд)

Дасягненні ў любой сферы жыццядзейнасці грамадства ў значнай меры залежаць ад кадравага патэнцыялу, які вызначаецца не толькі колькасцю работнікаў, але і іх адукацыйнай і прафесійнай падрыхтоўкай, асабовымі якасцямі, творчай актыўнасцю і г.д. Менавіта таму ў нашай краіне вялікая ўвага надаецца падрыхтоўцы кадраў. Не выключэннем з'яўляецца і Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.

Асноўная форма падрыхтоўкі навуковых і навукова-педагагічных кадраў –аспірантура. Яна з'яўляецца састаўной часткай адзінай нацыянальнай сістэмы бесперапыннай адукацыі і сучаснай формай планамернай падрыхтоўкі кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі, якая ўключае паглыбленае вывучэнне агульнанавуковых дысцыплін, агульнатэарэтычных курсаў, здачу вызначаных кандыдацкіх экзаменаў і залікаў, авалоданне метадамі і сродкамі навуковых даследаванняў, выкананне навуковых даследаванняў у адпаведнасці з выбранай спецыяльнасцю адпаведнай галіны навукі па актуальнай тэме, сістэматызацыю і абагульненне атрыманых вынікаў з мэтай падрыхтоўкі і абароны дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата навук [4, с.32].

Агульная колькасць аспірантаў-гісторыкаў у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы на 1 студзеня 2004 года складала 28 чалавек, з іх 9 чалавек навучаліся з адрывам ад вытворчасці. У папярэднія гады колькасць гісторыкаў у аспірантуры была наступнай: на 1 студзеня 1995 г. – 12 чал., 1996 г. – 17 чал., 1997 г. – 21 чал., 1998 г. – 22 чал., 1999 г. – 22 чал., 2000 г. – 21 чал., 2001 г. – 24 чал., 2002 г. – 24 чал., 2003 г. – 27 чал. З іх з адрывам ад вытворчасці навучаліся: у 1995 г. – 3 чал., 1996 г. – 4 чал., 1997 г. – 6 чал., 1998 г. – 6 чал., 1999 г. – 11 чал., 2000 і 2001 гг. – па 10 чал., 2002 г. – 8 чал., 2003 г. – 9 чал. Як бачна, толькі з 1995 па 2004 год аб'ём аспірантуры павялічыўся больш чым у 2,3 разы, а навучанне з адрывам ад вытворчасці – у 3 разы.

Прыём у аспірантуру на гістарычныя спецыяльнасці (07.00.02. «Айчынная гісторыя» і 07.00.09. «Гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання") у 1994 г. складаў 4 чал. (з іх 1 – з адрывам ад вытворчасці), 1995 г. – 9 чал. (з іх 2 – з адрывам ад вытворчасці), 1996 г. – 10 чал. (з іх 4 – з адрывам ад вытворчасці), 1997 г. – 6 чал. (з іх 2 – з адрывам ад вытворчасці), 1998 г. – 5 чал. (з іх 3 – з адрывам ад вытворчасці), 1999 г. – 8 чал. (з іх 4 – з адрывам ад вытворчасці), 2000 г. – 9 чал. (з іх 3 – з адрывам ад вытворчасці), 2001 г. – 5 чал. (з іх 2 – з адрывам ад вытворчасці), 2002 г. – 9 чал. (з іх 3 – з адрывам ад вытворчасці), 2003 г. –

6 чал. (з іх 3 – з адрывам ад вытворчасці), 2004 г. – 4 чалавекі (з іх 2 – з адрывам ад вытворчасці).

З 1994 па 2004 год аспірантуру Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы скончылі 48 чалавек: у 1995 г. – 3 чал., 1996 г. – 4 чал., 1997 г. – 1 чал., 1998 г. – 3 чал., 1999 г. – 9 чал., 2000 і 2001 гг. – адпаведна па 5 чал., у 2002 г. – 6 чал., 2003 г. – 5 чал., 2004 г. – 7 чал. З абаронай кандыдацкай дысертацыі аспірантуру скончылі 3 чалавекі – па аднаму чалавеку ў 1998, 1999 і 2002 гадах, што складае толькі 6,25 % ад агульнай колькасці выпускнікоў разглядаемага перыяду. Усяго за 1994 – 2004 гады аспірантамі было абаронена 23 кандыдацкія дысертацыі (падлік зроблены па матэрыялах часопіса «Атэстацыя» за 1994 – 2005 гады): у 1994 – 1997 гадах – ні аднай, у 1998 годзе – 1, 1999 годзе – 3, 2000 годзе – 4, 2001 годзе – 5, 2002 годзе – 1, 2003 годзе – 6, 2004 годзе – 3. Кіравалі аспірантамі Іван Платонавіч Крэнь, Іван Іванавіч Коўкель, Аляксандр Канстанцінавіч Краўцэвіч (кафедра гісторыі Беларусі), Валерый Мікалаевіч Чарапіца (кафедра славянскіх дзяржаў), Дзмітрый Уладзіміравіч Караў, Аляксандр Мікалаевіч Нечухрын (кафедра ўсеагульнай гісторыі). Затым да кіраўніцтва аспірантамі пры кафедры гісторыі Беларусі далучыліся дактары гістарычных навук Святлана Валянцінаўна Марозава і Святлана Яўгенаўна Сяльверстава [3, с.14].

Такім чынам, бачна, што працэс павелічэння колькасці кваліфікаванага ядра гістарычнай навукі ішоў нераўнамерна.

Яшчэ адной формай падрыхтоўкі кадраў гісторыкаў вышэйшай кваліфікацыі ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы – саіскальніцтва. Саіскальнікі прымацоўваюцца на два гады для здачы экзаменаў кандыдацкага мінімума, а затым на тры гады для напісання кандыдацкай дысертацыі. Мэтазгоднасць такой формы падрыхтоўкі гісторыкаў абгрунтоўваецца тым, што амаль палова саіскальнікаў, якія здалі экзамены кандыдацкага мінімума, паступаюць у аспірантуру [5, с.61].

Агульная колькасць саіскальнікаў на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук на 1 студзеня 1995 г. – 15 чал., 1996 г. – 10, 1997 г. – 6, 1998 г. – 12, 1999 г. – 15, 2000 г. – 7, 2001 г. – 6, 2002 г. – 3, 2003 г. – 3, 2004 г. – 5 чал. Трэба адзначыць, што ні воднай кандыдацкай дысертацыі на працягу разглядаемага перыяду абаронена не было.

Дактарантура – таксама форма падрыхтоўкі навуковых кадраў. Нягледзячы на тое, што дактарантура на гістарычным факультэце адсутнічае, але ў ёй у розныя гады ў Мінску, Маскве, Польшчы стацыянарна вучыліся Тамара Барысаўна Блінова, Таццяна Мікалаеўна Мікуліч, Святлана Валянцінаўна Марозава, Святлана Яўгенаўна Сяльверстава (кафедра гісторыі Беларусі), Аляксандр Канстанцінавіч Краўцэвіч (кафедра Беларускай культуры), Вячаслаў Вітальевіч Швед (кафедра славянскіх дзяржаў). Аляксандр Мікалаевіч Нечухрын і Дзмітрый Уладзіміравіч Караў (кафедра ўсеагульнай гісторыі) у 90-я гады XX стагоддзя абаранілі доктарскія дысертацыі без вучобы ў аспірантуры [3, с.14].

Такім чынам, бачна, што ва універсітэце ўдзяляецца шмат увагі падрыхтоўцы навуковых кадраў гісторыкаў.

1. Матэрыялы архіва УА «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы».

2. Матэрыялы бягучага архіва УА «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы».

3. Крэнь І.П. Гістарычны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы: да 50-годдзя з дня заснавання і развіцця // Подготовка педагогических и научных кадров историков и развитие исторической науки в Беларуси: материалы респ. науч. – практ. конф., 30 сент. 2004 г., Гродно / Под ред. Е.А. Ровбы, А.Н.Нечухрина, И.П.Креня. – Гродно: ГрГУ, 2005. – 404 с.

4. Подготовка научных и научно-педагогических кадров в учреждениях Министерства образования (Информационно-аналитический справочник). – Мн., 2003. – 42 с.

5. Текущий архив УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы». Заключение комиссии по итогам аттестации Гродненского государственного университета имени Янки Купалы. – Мн., 2000. – 582 л.

Н.М. Мінаева, ГрДУ імя Я.Купалы, г. Гродна

ДЗЕЙНАСЦЬ ГРАМАДСКІХ ДАБРАЧЫННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ У ЗАХОДНІМ РЭГІЁНЕ Ў 1991 – 2001 гг.

Пачатак 90-х гг. прынёс беларускай дзяржаве не толькі незалежнасць, але і шматлікія праблемы. Беларусь уступіла ў новы этап свайго развіцця – стала суверэннай дзяржавай. Змены, якія адбыліся ў краіне, закранулі ўсе сферы жыццядзейнасці грамадства. У мэтах сацыяльнай абароны сем'яў у пераходны да рыначных адносін перыяд у Беларусі былі створаны розныя дзяржаўныя органы, якія былі закліканы акрэсліваць і каардынаваць сацыяльную палітыку дзяржавы.

Адной з яскравых прыкмет акрэсленага перыяду з'яўляецца стварэнне шматлікіх няўрадавых арганізацый, дабрачынных фондаў, аб'яднанняў і інш. Іх дзейнасць, як і дзейнасць падобных утварэнняў у іншых краінах, была накіравана на аказанне дапамогі тым групам насельніцтва, якія ў гэтым мелі патрэбу. Як правіла, няўрадавыя арганізацыі дзейнічалі ў кантакце з органамі ўлады.

Заходні рэгіён, а дакладней, Гродзенская і Брэсцкая вобласці не быў выключэннем. На тэрыторыі Гродзеншчыны на працягу 1991–2001 гг. існаваў шэраг дабрачынных грамадскіх арганізацый. У 1995 г. у Гродзенскай вобласці дзейнічалі: Гродзенскі абласны фонд інвалідаў і пенсіянераў – вязняў нямецкіх лагераў 1941–1945 гг, Гродзенскае абласное аб'яднанне «Дзіцячы дыябет», Гродзенскае абласное аддзяленне Беларускага дзіцячага фонду, Гродзенская асацыяцыя маці дзяцей-інвалідаў «Вера», Гродзенскі абласны камітэт Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, Карытас, Фонд «Боль Чарнобыля – дзеці», Навагрудскае падраздзяленне Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам [1; 2].

У 1999 г. некаторыя з вышэйпералічаных арганізацый спынілі сваю дзейнасць, але з'явіліся новыя: Абласное грамадскае аб'яднанне «След Чарнобыля» (Навагрудак), Ваўкавыскае грамадскае аб'яднанне апекуноў і дзяцей-сірот «Надзея», Гродзенскае абласное прадстаўніцтва Грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд сацыяльнай падтрымкі дзяцей і падлеткаў «Мы – дзецям» [3].

У 2000 г. спіс дабрачынных арганізацый Гродзеншчыны зноў папоўніўся навічкамі: Ашмянская грамадская дабрачынная арганізацыя «Дзецям Чарнобыля», Ваўкавыскае гарадское грамадскае аб'яднанне бацькоў і дзяцей-інвалідаў, Ваўкавыская раённая арганізацыя Грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам», Гродзенскае абласное аддзяленне Грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд міласэрнасці і здароўя», Гродзенскае абласное пярвічнае аддзяленне Грамадскага аб'яднання «Беларускі камітэт «Дзеці Чарнобыля», Смаргонскае грамадскае аб'яднанне шматдзетных бацькоў [3].

У 2001 г. у вобласці з'явіліся новыя арганізацыі: Гродзенскае грамадскае аб'яднанне шматдзетных бацькоў і сірот, Гродзенскае грамадскае аб'яднанне шматдзетных бацькоў «Сем Я», Гродзенская, Слонімская, Смаргоньская гарадскія арганізацыі Грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам» [4]/

Самымі старэйшымі грамадскімі дабрачыннымі арганізацыямі на тэрыторыі Брэстчыны з'яўляліся: Асацыяцыя бацькоў дзяцей-інвалідаў (1994); Абарона дзяцей Чарнобыля (1995) (Пружаны); Баранавіцкая арганізацыя Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа (1995), Баранавіцкая асацыяцыя былых непаўналетніх вязняў фашызму (1996); Брэсцкая гарадская асацыяцыя маці «У дапамогу дзецям Чарнобыля» (1996); Грамадскае аб'яднанне «Чарнобыль і дзеці» (Жабінка) (1996); Пінская гарадская арганізацыя Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям –інвалідам і маладым інвалідам» (1996), Брэсцкае абласное аддзяленне Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускі дзіцячы фонд» (1997); Баранавіцкае аддзяленне Грамадскага аб'яднання «Міжнародная гуманітарная няўрадавая арганізацыя «Чарнобыль-дапамога» (1997) усе гэтыя арганізацыі дзейнічалі на працягу ўсяго акрэсленага перыяду [–4].

На пачатак 1997 г. былі зарэгістраваны наступныя арганізацыі: Брэсцкае аб'яднанне былых вязняў фашызму, Дабрачыннае таварыства «Дом Міласэрнасці» (1995), Дабрачынны фонд «Дзіцячы адпачынак» (1995), Карытас (Пінск), Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Свет і дзеці Чарнобыля» (1997), але яны праіснавалі нядоўгі час і да 2000 г. ліквідаваліся [1; 2]. У адрозненні ад вышэй пералічаны больш доўгі перыяд дзейнічалі: Грамадская арганізацыя «Рэха Чарнобыля» (1995), Брэсцкае абласное прадстаўніцтва Грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд сацыяльнай падтрымкі дзяцей і падлеткаў «Мы – дзецям» (1996) [1; 2].

У 1999 г. з'явіліся новыя арганізацыі, якія працягвалі сваю дзейнасць і ў пачатку 2002 г.: Баранавіцкае гарадское аддзяленне Грамадскага аб'яд-

нання «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам», Брэсцкае абласное аддзяленне Грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд міласэрнасці і здароўя», Брэсцкае абласное аддзяленне Грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд міру», Брэсцкая абласная арганізацыя Грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя былых непаўналетніх вязняў фашызму», Брэсцкі абласны камітэт Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, Грамадскае аб'яднанне «Беларускае дабрачыннае таварыства «Эмануіл» (Кобрын), Грамадскае аб'яднанне «Бусляня надзеі» (Пінск), Грамадскае аб'яднанне «Дзеці і міласць» (Баранавічы), Грамадскае аб'яднанне «Клопат аб дзецях Чарнобыля» (Камянец), Пружанскае грамадскае аб'яднанне «Абарона дзяцей Чарнобыля», Столінскае аддзяленне Грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям–інвалідам і маладым інвалідам» [3].

Самыя маладыя дабрачынныя аб'яднанні з'явіліся ў Брэсцкай вобласці ў 2000-2001 гг.: Баранавіцкае аддзяленне Грамадскага аб'яднання «Беларускі дабрачынны фонд «Дзецям Чарнобыля» (2000), Лунінецкае раённае пярвічнае аддзяленне Грамадскага аб'яднання «Беларускі камітэт «Дзеці Чарнобыля» (2000), Мікашэвіцкае аддзяленне Грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям – інвалідам і маладым інвалідам» (2000), Камянецкае раённае грамадскае аб'яднанне бацькоў дзецей–інвалідаў і маладых інвалідаў (2001), Грамадскае аб'яднанне «Саюз шматдзетных сем'яў» (2001), Камянецкае грамадскае аб'яднанне «Дапамога дзецям Чарнобыля» (2001), Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Дабрачыннасць дзецям» (2001) [4].

Грамадскія дабрачынныя арганізацыі імкнуліся ахапіць клопатам усе самыя безабароненныя групы насельніцтва. Гродзенскі абласны фонд вязняў нямецкіх лагераў імкнуўся аказваць матэрыяльную, сацыяльна-бытавую і іншую дапамогу пенсіянерам і інвалідам – былым вязням фашысцкіх лагераў. Ён быў створаны 28 верасня 1991 г.

15 студзеня 1992 г. з мэтай выяўлення і рэгістрацыі былых вязняў нямецкіх лагераў, пражываючых на тэрыторыі Мінскай вобласці была вырашана адкрыцць ў г.Мінске аддзяленне Гродзенскага фонду [5;2]. 22 сакавіка 1992 г. – Слонімскае аддзяленне [5; 3]; 12 красавіка 1992 г. – Магілёўскае аддзяленне у г.Магілёве [5; 5]; 31 ліпеня 1992 г. – Віцебскага аддзялення ў г.Наваполацку [5; 15].

Падобныя фонды існавалі ў Брэсцкай вобласці. Гэта Баранавіцкая асацыяцыя былых непаўналетніх вязняў фашызму (1996–2001), Брэсцкае аб'яднанне былых вязняў фашызму (1997–1999), Брэсцкая абласная арганізацыя Грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя былых непаўналетніх вязняў фашызму» (1999–2002),

У 2004 г. Гродзенскае абласное аддзяленне Беларускага Фонду міру адзначыла сваё трыдцацігоддзе [6; 2]. Актыўна дзейнічае Брэсцкае абласное аддзяленне Грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд міру» афіцыйна зарэгістраванае толькі ў 1999 г.

Беларускі дзіцячы фонд – адна з самых знакамітых і найстарэйшых арганізацый у Беларусі. Гродзенскае абласное аддзяленне Савецкага дзіця-

чага фонду імя У.І.Леніна было утворана 29 сакавіка 1988 г. [7, с. 66]. Брэсцкае абласное аддзяленне Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускі дзіцячы фонд» было афіцыйна зарэгістравана ў 1997 г.

У 1991-2001 гг. у заходнім рэгіёне актыўна дзейнічалі грамадскія дабрачынныя арганізацыі. Яны, наколькі маглі, імкнуліся дапамагчы самым безабаронным групам насельніцтва: дзецям, сіротам, інвалідам, пенсіянерам, пацярпеўшым ад ЧАЭС, малазабяспечаным і мнагадзетным сем'ям і інш.

Розныя формы работы дапамагалі аб'яднанням прынесці як мага больш пользы грамадству і кожнаму, хто звярнуўся да іх за дапамогай. Матэрыяльная і грашовая дапамога, лячэнне і адпачынак дзяцей і дарослых як у Беларусі, так і за мяжой, медыцынскія, юрыдычныя, псіхалагічныя паслугі – гэта невялікі пералік таго, чым займаюцца грамадскія дабрачынныя арганізацыі.

Некаторыя з фондаў карысталіся падтрымкай дзяржаўных органаў альбо былі імі створаны, што дапамагло ім праіснаваць даволі доўгі час і актыўна дзейнічаць. Частка дабрачынных арганізацый утварылася на базе былых савецкіх арганізацый. У заходнім рэгіёне вельмі мала арганізацый, створаных замежнымі спонсарамі, у асноўным гэта рэспубліканскія ці міжнародныя фонды.

У пачатку 90-х гг. дабрачынныя ахвяраванні грамадзян і арганізацый складалі большую частку прыбытку аб'яднанняў. З сяр. 90-х гг. з пераходам да рыначных адносін колькасць ахвяраванняў рэзка скарацілася, дабрачынныя арганізацыі пачалі самі зарабляць грошы. Некаторыя аб'яднанні не змаглі прыстасавацца да новых умоў існавання і былі вымушаны самаліквідавацца.

Некаторымі прычынамі скарачэння колькасць грамадскіх дабрачынных арганізацый сталі: асаблівасці менталітэту, неструктураванасць грамадства, адсутнасць шматлікага і уплывовага сярэдняга класу, недастатковае імкненне да самаарганізацыі ў сферы канкурэнтнага бізнесу, змяненне заканадаўства, узмацненне кантролю за дзейнасцю арганізацый, адсутнасць замежнага і іншых форм фінансавання. Колькасць грамадскіх дабрачынных арганізацый скарацілася, але павялічылася якасць дапамогі безабаронным слаям насельніцтва. Арганізацыі старога тыпу знікаюць, на змену ім прыйшлі новыя, якія прадоўжылі лепшыя традыцыі дабрачыннасці.

Літаратура і крыніцы

1. Справочник белорусских общественных объединений / Белорусская республиканская общественная организация «Объединённый путь» Сост.: А.Р.Шибицкая. – Мн.: Агентство САДИ, 1997. – 157 с.

2. Справочник белорусских общественных объединений / Белорусская республиканская общественная организация «Объединённый путь» Сост.: А.Р.Шибицкая. – Мн.: Агентство САДИ, 1998. – 358 с.

3. Даведнік беларускіх грамадскіх аб'яднанняў / Беларуская рэспубліканская грамадская арганізацыя «Аб'яднаны шлях»; Склад. Г.У.Глебка і інш. – 3-е выд., перапр. – Мн.: УП «Новік», 2000. – 339 с.

4. Даведнік беларускіх грамадскіх аб'яднанняў / Беларуская рэспубліканская грамадская арганізацыя «Аб'яднаны шлях»; Склад. І.М.Чырко і інш. – 4-е выд., перап. – Мазыр: ТАА ВД «Белы Вецер», 2002. – 500 с.

5. Дзяржаўны гістарычны архіў грамадскіх арганізацый Гродзенскай вобласці (далей ДГАГАГВ). Фонд 49. Вопіс 1. Справа 1.

6. Райко А.В. «Дело мира – это доброта, благородство и искренность наших сердец» // Гродзенская праўда. – 2004. – 25 лістапада. – С. 2.

7. ДГАГАГВ. Фонд 46. Вопіс 1. Справа 2.

Н.В. Смехович, Институт истории НАНБ, г. Минск

МЕТОДОЛОГИЯ ИСТОРИЧЕСКОГО ИССЛЕДОВАНИЯ В ЗЕРКАЛЕ НАУЧНОЙ ДИСКУССИИ КОНЦА XX ВЕКА

В 90-е годы XX в. российские исследователи провели научную дискуссию по проблемам методологии научного исследования. В 1991 г. исследователи констатировали наличие общего кризиса исторической науки. Они попытались поднять назревшие на тот момент вопросы. Это были вопросы о цивилизации и формации, об отношении к материалистическому пониманию истории, к общеисторической теории (философии истории). Центральную роль, на наш взгляд, в начавшейся дискуссии сыграла статья академика И.Д.Ковальченко «Теорико-методологические проблемы исторических исследований». И.Д.Ковальченко констатировал, что:

• «развитие исторической мысли и исторической науки подошло к такому рубежу, когда их дальнейший прогресс требует преодоления резкой поляризации и поиска путей к синтезу философско-исторических и концептуальных подходов и построений»;

• «следует напрочь исключить какие бы то ни было претензии на возможность создания неких универсальных и абсолютных теорий и методов исторического познания»;

• «любая научная теория... содержит то или иное рациональное зерно и тем самым вносит определенный вклад в развитие общественно-научной мысли»;

• «любой социологической теории и конкретно-исторической концепции изначально присущи определенные ошибки и просчеты»;

• «задача историков, как и других обществоведов, состоит в том, чтобы на основании тщательного анализа выделить из совокупности имеющихся философско-исторических теорий и подходов все то, что позволяет углубить изучение мирового, и российского исторического процесса. Нужен синтез идей и методов» [1, с. 4-5].

Проанализировав данную философско-мировоззренческую тематику, И.Д.Ковальченко сделал следующие выводы:

• «центральной методологической проблемой в многомерной сущностной типологии и периодизации является в настоящее время вопрос о соотношении формационного и цивилизационного подходов в изучении общественно-исторического развития»;

• «основной принцип типизации и периодизации исторического развития должен исходить из того, что субстанциональным содержанием исторического развития является деятельность преследующего свои цели человека. Значит, основой в обобщенном выделении типов и этапов развития должен быть человеческий (антропологический) метод, учет того, каково было положение человека в основных сферах его деятельности в определенном пространстве или в то или иное время» [1, с. 23, 25-26].

Как только исследователь приходит к мысли о том, что любой теории или концепции изначально присущи ошибки или просчеты, он сразу же обозначает свои симпатии к методу фальсификации К.Поппера. Такой подход неизбежно приводит к философскому плюрализму, т.е. попытке примирить сторонников диалектического материализма со сторонниками разных форм идеализма. Идея примирения стала центральной, основополагающей идеей данной дискуссии.

В дискуссии приняли участие В.И.Овсянников, Б.Н.Кудрявцев, Б.Г.Могильницкий, Н.И.Смоленский, Г.Н.Севостьянов, В.Г.Федотова и другие известные российские историки и философы. Участники дискуссии высказали различные точки зрения. В.И.Овсянников в статье «В поисках новых подходов к историческим исследованиям» подчеркнул, что «задача исследователя мне видится в том, чтобы встать на почву того времени, когда происходили изучаемые события, хотя некоторые ученые считают иначе. Ряд ученых измеряет события и факты прошлого мерилом своего времени, поэтому с точки зрения науки, эти события и факты остаются не вскрытыми, а исследователи возвращаются к тем же заклинаниям, за которые критикуют охранительную школу. Иными словами, методически все остается на прежнем уровне» [2, с.83]. В.И.Овсяников школу коммунистической схоластики называет «официально охранительной школой». Он отмечает, что ее интересы были «ограничены сухой схемой социально-экономического развития, внутренней и внешней политикой, борьбой классов» [2, с. 85].

В.Н.Кудрявцев в статье «Об особенностях методологии социальных и гуманитарных наук» отметил, что «единой для всех ученых и тем более обязательной для них методологии науки не существует... Это, однако, не исключает того, что многие методологические приемы, принципы и аксиомы со временем становятся общепризнанными и общеупотребляемыми, закрепляются в исследовательской практике, освещаются в литературе и могут рассматриваться в качестве методологии научного исследования того или иного исторического времени, той или иной научной школы» [3, с. 3].

В.Н.Кудрявцев считает, что в СССР «стремление к истине было только лозунгом, но не действительной целью научного творчества». Он выделил несколько общих черт методологии всех наук:

1) стремление и борьба за достижение истины;

2) признание детерминизма и причинности;

3) проверка теоретических познаний практикой.

В.Н.Кудрявцев констатировал, что «непосредственная проверка практикой большей частью невозможна и в социальных науках, так как общественные события не повторяются. Но если практику понимать в широком смысле слова, как историческую практику, как человеческий опыт, то такого рода практика является, разумеется, достаточно хорошим инструментом проверки наших теоретических знаний» [3, с.4]. Специфика методологии гуманитарных наук, по мнению В.Н.Кудрявцева, заключается в следующем:

• в многофакторности явлений и процессов, изучаемых обществоведами;

• в изменчивости объекта изучения;

• в исключительной роли субъективного фактора;

• в значительном воздействии обратных связей на изучаемые явления и процессы.

«В сфере методологии надо опираться также на многофакторность сценариев развития, строить прогнозы, которые бы предусматривали не один, а несколько путей возможного изменения социальных процессов и событий. И здесь тоже есть новое направление, которое мало нами изучено и используется, так называемая виртуалистика (от латинского virtualis возможный)», – пишет В.Н.Кудрявцев [3, с. 4-7].

Н.И.Смоленский в статьях «Возможна ли общеисторическая теория», «Теоретический плюрализм и проблемы исторической теории», «Проблемы теоретического плюрализма» высказал мнение о том, что «общеисторическая теория (философия истории) возможна и необходима. Но общеисторическая теория, как представляется, в состоянии в качестве главной своей задачи выразить общую логику и направленность исторического процесса, определить стадии (ступени, этапы) этого процесса, выявить движущие факторы, определяющие его характер на каждой из стадий» [4, с. 78]. На взгляд Н.И.Смоленского «плюрализм является естественной формой развития научного исторического знания» [5, с. 9]. Н.И.Смоленский считает, что «в основе плюрализма может быть то, что в качестве предмета исследования избираются разные стороны одного и того же явления или процесса или же явление исследуется с разных позиций. Плюрализм конкурирующих интерпретаций... представляет собой как бы совокупность потоков, впадающих в одно общее русло... При этом научная ценность каждого варианта интерпретации определяется не столько исходя из его соотношения с другими, сколько – и, прежде всего – с предметом исследования... Теоретический плюрализм предполагает взаимодействие разных уровней теоретического осмысления действительности; речь

идет, прежде всего, об уровнях общеисторической и частной исторической теории» [5, с. 11]. Далее Н.И.Смоленский пишет, что «устойчивым признаком плюрализма как философско-исторической доктрины является признание множественности принципиально равнозначных, независимых и несводимых друг к другу факторов исторического развития; в гносеологическом плане это означает признание равноценности любой системы анализа, что подразумевает отрицание единства научного знания как соответствия исторических представлений изучаемым явлениям и процессам... Плюрализм признает множественность действующих в истории факторов... Плюралистическое понимание истории отличается от монистического тем, что в его основе лежит многофакторный подход» [5, с. 13].

Н.И.Смоленский подчеркивает, что различные научные школы, главным образом тяготеющие к позитивизму, но не только они, например, другие направления персонализм, прагматизм, философия жизни стремились реализовывать идею многофакторности подхода к изучению истории, но были непоследовательны в теоретической формулировке основного тезиса доктрины, касавшегося идеи равноценности факторов. Здесь возникает вопрос о соотношении этих факторов. Разрешение этого противоречия Н.И. Смоленский видит в принципе взаимодействия всех факторов [5, с. 15-16].

Р.Г.Ланда в статье «Обновление методологии или откат назад?» выступил с критикой плюралистов. Он пишет: «Если вернуться к проблеме методологии исторических исследований, то совершенно очевидно, что надо прекратить разрушительную, деструктивную деятельность в этой сфере. Надо избегать унаследованной от прежних времен политизации и идеологизации науки... Поэтому бессмысленно отрицать прежнюю методологию истории и отказываться от старого инструментария историков. Еще никто не опроверг, да и вряд ли сможет сделать это, первичности события и вторичности сознания... Очевидно, выход из кризиса – не возврат к прошлому, к дореволюционным и домарксовым схемам и формулам, выход – в обновлении и обогащении нашей методологии истории,..-.основой которой вполне способна служить обновленная и обогащенная марксистская концепция, творчески дополненная достижениями смежных гуманитарных дисциплин» [6, с. 97-99].

В.И.Кузищин выступил в защиту марксистского монизма. Он говорит, что «материалистическое понимание истории, на мой взгляд, органически присуще любому историку, работающему с подлинными историческими фактами, с исторической реальностью. Поэтому уже Геродот и Фукидид, описавшие столь ярко и аргументировано события греко-персидских войн и пелопонесской войны, стояли на почве материалистического понимания истории, конечно, не сознавая этого. Основоположники марксизма придали этой стихийной концепции более определенную философскую форму, законченную структуру, включили ее в более широкий идеологический комплекс» [7, с. 84-85].

В.И.Кузищин считает, что «историк-исследователь имеет право выбирать приемлемую для него историческую теорию и с ее позиций приступать к изучению конкретного материала. Исследования, проведенные с разных позиций, обогащают и расширяют наши знания о конкретной исторической реальности» [7, с. 87].

Б.Г.Могильницкий в статье «Об исторической закономерности как предмете исторической науки» утверждает, что научная результативность исторической теории зависит от ее категориального аппарата. Поэтому задача исторической науки состоит в том, чтобы «найти такую фундаментальную категорию, которая бы характеризовала предмет истории как совокупный результат деятельности человека, мы должны попытаться обнаружить с ее помощью ту формообразующую клеточку, которая как бы стягивает разные концы расширяющейся «исторической вселенной» в единое содержательное целое. Такой категорией может служить категория исторической закономерности», – заключает Б.Г.Могильницкий [8, с. 5].

В дискуссии приняли участие и философы. В.Г.Федотова отметила некоторые проблемы современной методологии истории. Они состоят в том, что:

1. Стадиальные характеристики, выражающие степень развития общества или нахождения его на определенной стадии развития человечества, по-прежнему сохранились и признаны в мире.

2. Расщепленный образ исторической науки обусловлен постмодернизмом в целом. Социальные сдвиги требуют от историка установления связи времен, сохранения и установления идентичности. Кто мы? Куда идем? Как соотносимся со своим прошлым? Что нас ждет в будущем?

3. Историк должен следовать методам своей дисциплины, его интерпретации должны быть адекватными избранной методологии [9, с. 61-63].

Философ К.А.Зуев в статье «О некоторых проблемах методологии истории» показал, что основными методологическими проблемами сегодня являются:

1. Достоверность и полнота описания исторических фактов. Факт и интерпретация.

2. История: единство или множественность? Реальная жизнь человечества, развертывающаяся во времени, является сложной структурой. Ее можно представить в виде сети, каждый узел которой связан с другими множеством каузальных, ситуационных, смысловых связей. Историческая наука выделяет из этой сети отдельные упорядоченные во времени цепи событий, изучая их как истории цивилизаций, регионов, государств, религий, войн и т.п. Принципиальным в методологическом плане является вопрос о критериях выделения таких цепей, обоснование их существенности и значимости.

3. Чему учит история? Этот вопрос сохраняет свою актуальность и в методологическом, и в практическом плане [10, с. 71-72].

Дискуссия, на наш взгляд, позволяет выделить два направления в современных методологических воззрениях российских исследователей-

историков. Первое направление представлено историками, которые в той или иной форме ориентируются на материалистическое понимание истории, признают закономерности, свойственные деятельности людей и историческому процессу (Р.Г.Ланда, В.И.Кузищин, Б.Г.Могильницкий).

Второе направление представлено историками, которые пытаются создать новую методологическую базу исторических исследований (И.Д.Ковальченко, В.Н.Кудрявцев, Н.И.Смоленский). Центральной фигурой этого направления, которое можно определить в качестве **системно-функционального плюрализма**, является Н.И.Смоленский. Сторонники функционального плюрализма считают, что плюрализм как философско-историческая доктрина ориентируется на такие принципы исторического познания как **многофакторность, взаимодействие, разносторонность, интерпретационность, связь с практикой, принцип виртуальности**.

Однако в философском плане данная доктрина является неразработанной. В целом неясно, какая гносеологическая теория лежит в основе функционального плюрализма. Н.И.Смоленский не определил конкретную философскую основу данной доктрины. Ее принципы заимствованы из разных философских течений. Например, принципы интерпретационности, виртуальности, многофакторности уже давно лежат в основе критического рационализма, а принципы взаимодействия, связи с практикой, разносторонности активно используются сторонниками материалистической диалектики. На наш взгляд, функциональные плюралисты не ищут «третьей линии в философии», они пытаются наполнить новым содержанием, синтезировать и превратить в научную систему те методологические принципы и подходы, которые были в исследовательском арсенале историков-марксистов и историков-идеалистов. Для нас очевидно, что остаются открытыми и нерешенными вопросы о взаимоотношении плюрализма с такими факторами, как идеология и проблема истины.

Наряду с вышеизложенными принципами, плюралисты определили и некоторые конкретные методы исторического исследования. К ним они отнесли историко-ситуационныи и историко-ретроспективныи методы, опору на исторический опыт, накопленный обществом.

Выводы философов, принимавших участие в дискуссии, в целом совпадают с позицией историков в том плане, что и в прошлом, и в нынешней социальной реальности в центре внимания методологии исторического исследования были и находятся такие проблемы, как достоверность и полнота описания исторических фактов, объяснение и понимание исторических событий, поиск исторических закономерностей и причинной обусловленности, решение извечной проблемы «чему учит история».

Наше заключение о выводах философов в полной мере можно отнести к первой четверти XX века, времени, когда «гістарычная навука пра Беларусь вылучалася у самастойную галіну ведаў» [11, с.37]. Самостоятельность белорусской исторической науки была обусловлена, на наш взгляд, той теоретико-методологической базой, которую использовали

В.Ю.Ластовский, В.М.Игнатовский, М.В.Довнар-Запольский, В.И.Пичета – исследователи, положившие начало новому периоду в национальной историографии. П.Т.Петриков называет этот период «научно-диалектическим» [11, с. 37].

Такое определение он обосновывает тем, что в XX веке «падмуркам навуковасці станавіліся погляды на гістарычны працэс, філасофію гісторыю і гнасеалогію Карла Маркса, Фрыдрыха Энгельса, Уладзіміра Леніна» [11, с.38]. Мы полагаем, что классификация национальной историографии должна иметь четкие научно-обоснованные критерии, быть конкретно-исторической, а не философско-обобщающей. Классификация историографии должна принадлежать научной школе, а не философскому учению. Н.И.Кареев под исторической школой понимал «умственное взаимодействие между самими историками, читающими сочинения одни других, обменивающимися друг с другом своими мыслями, вступающими в полемику, предпринимающими коллективные работы» [12, с. 314].

